**ББК 63.3 (Беі)**

**Рэдакцыйная рада**

Аляксандр Краўцэвіч (рэдактар)
Алесь Смалянчук (намеснік)
Сяргей Токць
Валянцін Голубеў
Павел Лойка

Сакратар: Ірына Кітурка
Вёрстка: Вадзім Родчанка

**Адрас рэдакцыі: вул. Будзёнага, 48а**
**230023 Гародня**
**Беларусь**
**Тэл./факс (+152) 44 22 90**
**Root @ratusha.belpak.grodno.by**

Падпісана да друку 15.11.2000
Афсетны друк
Фармат 60х90/16
Наклад 200 асобнікаў.

Надрукавана пры падтрымцы Гарадзенскага грамадскага аб'яднання "Ратуша".

**Навуковыя артыкулы рэцэнзуюцца.**

**"Гістарычны альманах", 2000**

*БЕЛАРУСКАЕ ГІСТАРЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА*

**ГІСТАРЫЧНЫ АЛЬМАНАХ 1999 том 2**
**Навуковы гістарычны і краязнаўчы часопіс**

## У НУМАРЫ

### ГІСТОРЫЯ

*Смалянчук Алесь* (Гародня). Да пытання аб ролі палітычнай ідэалогіі ў развіцці беларускага нацыянальнага руху ў 19-пачатку 20 ст.

*Рудовіч Станіслаў* (Менск). "…Беларускі дзеяч з вялікіх паноў". Эпізоды палітычнай біяграфіі Рамана Скірмунта.

*Токць Сяргей* (Гародня). Сялянскае насельніцтва Гарадзенскай пушчы: дэмаграфічнае, гаспадарчае і сацыяльнае развіццё ў пачатку – 60-ыя г. 19 ст.

### ДЫСКУСІЯ

Да праблемы генезісу Вялікага Княства Літоўскага. *(Краўцэвіч Аляксандр, Спірыдонаў Міхаіл)*.

### ДАКУМЕНТ

Антон Луцкевіч аб жыцці і дзейнасці Зыгмунта Нагродскага (1865-1937) *(Смалянчук Алесь)*.

### РЭЦЭНЗІІ

Эберхардт П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1897-1989. Менск: Беларускі фонд Сораса, 1997. - 278 с. *(Смалянчук Алесь)*

Міранковіч Я. Навейшая гісторыя Беларусі. Беласток, 1999. - 270 с. *(Карнялюк Віталь)*.

М.Біч. Гісторыя Беларусі. Канец 18 ст. - 1917 г. Вучэбны дапаможнік для 8 класа агульнаадукацыйнай школы. Пад рэд. акадэміка Я.Бабосава. Мінск: "Народная асвета", 1998. - 288 с.; В.А.Мілаванаў. Гісторыя Беларусі. Канец 18 ст. - 1917 г. Вучэбны дапаможнік для 8 класа агульнаадукацыйных школ. Мінск: "Народная асвета", 1998. - 176 с. *(Смалянчук Алесь)*.

………………………………………..

### НАВУКОВАЯ ХРОНІКА

Навуковыя чытанні і канферэнцыі (Смалянчук Алесь, Караў Дзмітры, Кітурка Ірына, Токць Сяргей).

Кніжны анонс.

### КРАЯЗНАЎСТВА

*Супрун Васіль* (Слонім). Археалагічныя даследаванні ў басейне ракі Шчары.

*Валеры Шэйфер* (Гародня). Мяцеж ці паўстанне? Выступ Міхала Глінскага падчас вайны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ у 1507-1508 гг.

*Шылабрыт Тадэвуш* (Гародня). Штрыхі да партрэта гісторыка Юзафа Ярашэвіча (1793-1860).

*Шоцік Ванда* (Гародня). Юзаф Ядкоўскі і яго роля ў стварэнні кнігазбору Гарадзенскага гісторыка-археалагічнага музея.

## Гісторыя

# Да пытання аб ролі палітычнай ідэалогіі ў развіцці беларускага нацыянальнага руху ў 19 - пачатку 20 ст.

**Алесь Смалянчук (Гародня)**

Беларускі нацыянальны рух пачатку 20 ст. не ажыццявіў сваёй галоўнай задачы – утварэння незалежнай дзяржавы. Абвешчаная 25 сакавіка 1918 г. Беларуская Народная Рэспубліка рэальнай незалежнасці не мела. Амаль усё 20 ст. існавала створаная бальшавікамі Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка як сурагат беларускай дзяржаўнасці, цалкам залежны ад камуністычнай Масквы. Пытанне, чаму беларускае нацыянальна-культурнае Адраджэнне не завяршылася ўтварэннем нацыянальнай дзяржавы, застаецца адным з галоўных у беларускай гістарычнай навуцы.

У якасці гіпотэзы паспрабуем падысці да гэтага пытання, трактуючы беларускую нацыю не як этнакультурную арганізацыю, а як пэўнае палітычнае аб'яднанне, галоўным крытэрыем прыналежнасці да якога з'яўляецца ўсведамленне Беларусі (або "гістарычнай Літвы") як сваёй Радзімы, прысутнасць пачуцця пэўнай беларускай грамадзянскасці. Адпаведна паняцце беларускасці пашыраецца на дзейнасць людзей, якія ўспрымалі Беларусь (або "гістарычную Літву") як самабытны рэгіён, як суб'ект гісторыі і працавалі дзеля яе пераўтварэння ў суб'ект палітычнага жыцця. У сувязі з гэтым не мае прынцыповага значэння пытанне, ці лічылі гэтыя людзі сябе беларусамі. Палітычная трактоўка нацыі прымушае звярнуць увагу на пытанне пра значэнне палітычнай ідэалогіі ў нацыянальных працэсах.

Нацыянальнаму руху папярэднічаў працяглы этап "культурнага накаплення", вынікам якога было станаўленне беларускай культурнай традыцыі.

На пачатку 20 ст. яшчэ не існавала адзінай назвы для беларускага этнасу і тэрыторыі яго пражывання. Назва "Беларусь" замацавалася толькі за ўсходнімі губернямі – Магілёўскай, Віцебскай і часткай Смаленскай, – сярод насельніцтва якіх была шырока распаўсюджана саманазва "беларусы". Заходнія губерні – Менская, Гарадзенская і Віленская – называліся "Літвою", а іх насельніцтва – "ліцвінамі". У грамадска-культурным жыцці панавала польская мова. На развіццё этнічнай самасвядомасці "беларусаў-ліцвінаў" пасля ліквідацыі уніяцкай царквы ў 1839 г. адмоўна ўплываў раскол па веравызнанні на праваслаўных і каталікоў. Прычым праваслаўе трактавалася ўладамі ў якасці "рускай веры", а каталіцызм – "польскай".

Расійская афіцыйная навука разглядала Беларуска-літоўскі край як "исконно русския земли", а "беларусаў-ліцвінаў" як сапсаваную палякамі частку рускага народа. З іншага боку, некаторыя польскія навукоўцы імкнуліся давесці, што беларуска-літоўскія землі з'яўляюцца часткай Польшчы, а іх славянскія жыхары – этнаграфічнай групай польскага этнасу. У выніку ў першай палове 19 ст. не існавала ўласна беларускай культурнай традыцыі. Працэс беларускага культурнага накаплення адбываўся на двух шляхах, якія ўмоўна можна назваць "ліцвінскай" і "заходнерускай" культурнымі традыцыямі.

Ліцвінская культурная традыцыя, паводле Святланы Куль-Сяльверставай[1], грунтавалася на гістарычных і культурных традыцыях ВКЛ, пэўнай тэндэнцыі дэмакратызацыі, якая праяўлялася ў цікавасці да народнай культуры, на ўсведамленні этнакультурнай адметнасці як ад рускіх, так і ад палякаў з этнічнай Польшчы. Трэба дадаць, што яна была часткай т.зв. "Рэчпаспалітаўскага патрыятызму", хаця і адрознівалася высокай ступенню аўтаномнасці. Па сваёй канфесійнай прыналежнасці большасць прадстаўнікоў гэтай традыцыі з'яўляліся вернікамі каталіцкага касцёла, а па саслоўнаму складу належалі да шляхты. Літаратурныя і публіцыстычныя творы ў межах гэтай традыцыі ствараліся на польскай, літоўскай і беларускай мовах. Апошняя перадавалася на пісьме лацінкай. Цэнтрам ліцвінскай традыцыі з'яўлялася Вільня.

Ля вытокаў беларускага культурнага накаплення ў межах ліцвінскай традыцыі стаяла група прафесараў гісторыі, славістыкі і права Віленскага універсітэта. Працы Міхала Баброўскага, Ігната Даніловіча, Юзафа Ярашэвіча і інш. пашыралі ўсведамленне беларуска-літоўскага краю як суб'екта гістарычнага працэсу. Традыцыі гэтай гістарычнай школы пазней працягвалі Яўстах Тышкевіч, Тэадор Нарбут і Адам Кіркор.

Працэсу беларускага культурнага накаплення спрыяла таксама літаратурная творчасць Адама Міцкевіча, Яна Баршчэўскага, Яна Чачота, Аляксандра Рыпінскага, Уладзіслава Сыракомлі (Людвіка Кандратовіча), Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Апошняму суджана было стаць першым у 19 ст. класікам беларускай літаратуры.

У канцы 50-ых гадоў 19 ст. расійскія ўлады нанеслі адчувальны ўдар па беларускім культурным накапленні ў межах ліцвінскай традыцыі. У 1859 г. Галоўнае ўпраўленне цэнзуры прыняло пастанову, якая забараняла друкаванне беларускіх твораў на лацінцы ці, як адзначылі цэнзары, "польскім шрыфтам"[2]. Гэтая забарона прычынілася да крызісу ліцвінскай традыцыі. Дарэчы, ужо ў творчасці В.Дуніна-Марцінкевіча назіраўся пэўны адыход ад яе асноўных прынцыпаў. Пісьменнік і драматург шырока выкарыстоўваў тэрміны "беларусы" і "Беларусь", ужываў запазычанні не толькі з польскай, але і з рускай мовы. Некаторыя свае творы В.Дунін-Марцінкевіч пісаў кірыліцай.

Беларускае культурнае накапленне адначасова адбывалася на шляху развіцця заходнерускай культурнай традыцыі. Яе характэрныя рысы на пачатку 19 ст. – усведамленне самабытнасці Беларусі як "Заходняй Русі", апеляцыя да гістарычных традыцый Полацкага княства, высокая ацэнка ролі праваслаўнай царквы ў гісторыі "заходнярускіх зямель", антыпольскасць і антыкаталіцкасць. Па канфесійнай прыналежнасці большасць прадстаўнікоў заходнярускай традыцыі – уніяты, а пасля 1839 г. – вернікі праваслаўнай царквы. Многія належалі да праваслаўнага духавенства, займалі дзяржаўныя ці вайсковыя пасады або былі звязанымі з расійскімі магнатамі. Літаратурныя і публіцыстычныя творы пісаліся па-руску і па-беларуску. Беларуская мова, якую звычайна называлі "заходнярускай гаворкай", перадавалася кірыліцай. Заходнеруская традыцыя ў першай палове 19 ст. развівалася пераважна на Гомельшчыне і Магілёўшчыне. Яе прадстаўнікоў Аляксандр Цвікевіч назваў

[1] Выступленне на VII Міжнароднай канферэнцыі "Polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe" (Беласток, 1999).
[2] Біч М. Гістарыяграфічныя "навацыі" у навучальнай літаратуры // Беларускі гістарычны агляд.Т.5. Сш.2 (9). Менск, 1999. С. 496.

"беларусафіламі ў расейскай культуры"[3].

Сярод тых, хто, нават не ўсведамляючы гэтага, прычыніўся да працэсу беларускага культурнага накаплення варта згадаць імя заснавальніка беларускай археаграфіі Івана Грыгаровіча, гісторыка Міхала Без-Карніловіча, этнографа і журналіста Паўла Шпілеўскага. Апошні ў 1845 г. склаў "Слоўнік беларускай гаворкі" і "Кароткую граматыку беларускай мовы". Аснову беларускага алфавіта складала кірыліца грамадзянскага шрыфту. Улады не дазволілі выдаць граматыку. Тым не менш, заходнярускaя культурная традыцыя па сваёй знешняй форме не пярэчыла расійскай афіцыйнай ідэалогіі, аснову якой складала вядомая формула графа Уварава: "православие, самодержавие, русская народность".

Працэс культурнага накаплення, у межах якога адбывалася фармаванне нацыянальнай свядомасці, не быў ізаляваны ад развіцця палітычнай ідэалогіі. У першай палове 19 ст. у грамадскай думцы Беларусі і Літвы дамінавалі лібералізм і кансерватызм. Паводле гісторыка Марыны Сакаловай, пад кансерватызмам першай паловы 19 ст. трэба разумець такі тып палітыкі, у адпаведнасці з якім асноўнымі ўмовамі функцыянавання грамадства лічыўся парадак і сацыяльная збалансаванасць, супрацоўніцтва розных саслоўяў і класаў, захаванне традыцыйных асноў грамадскага жыцця і адвечных чалавечых каштоўнасцяў, абмежаванае (саслоўнае) выбарчае права, моцны ўрад. Вялікае значэнне надавалася рэлігіі і саслоўна-карпаратыўным формам грамадскага жыцця. Лібералы Беларуска-літоўскага краю ў гэты перыяд сваёй мэтай лічылі дасягненне свабоды асобы і забеспячэнне сацыяльнага прагрэсу. Пад апошнім разумелася свабода сумлення, вызваленне асобы ад дзяржаўнай апекі, адмена саслоўных прывілеяў, устанаўленне палітычных свабод. Першымі крокамі павінны былі стаць адмена прыгоннага ладу і судовая рэформа. Ажыццяўленне гэтых мер стварала магчымасці для нацыянальна-культурнага Адраджэння беларускага і літоўскага этнасаў[4].

Характэрныя для кансерватыўнай ідэалогіі такія формы рамантычнага правідэнцыяльнага нацыяналізму як расійская тэорыя афіцыйнай народнасці (формула графа Уварава) і польскі месіянізм у большай ступені былі разнавіднасцямі дзяржаўніцкай ідэалогіі. Працэсы беларускага і літоўскага культурнага накаплення кансерватарамі ігнараваліся.

А вось з лібераламі ўсё было інакш. Ліберальны рух не быў аднародным. Ужо ў першай трэці 19 ст. у ім пачала вызначацца памяркоўная і радыкальная плыні. На думку М.Сакаловай, лініяй падзелу сталі адносіны да дэмакратыі. Памяркоўныя лібералы бачылі ў дэмакратыі толькі сродак вырашэння сацыяльных канфліктаў праз дасягненне кампрамісу. Галоўныя надзеі яны звязвалі з культурна-асветніцкай працай. Радыкалы разумелі дэмакратыю як кіраванне дзяржавай пры ўдзеле ўсяго народу. Дзеля стварэння справядлівага "дэмакратычнага" грамадства яны імкнуліся да знішчэння існуючага ладу шляхам народнай рэвалюцыі. Радыкалы актыўна спрабавалі пашырыць свае ідэі сярод сялян і рамеснікаў.

Усё гэта было характэрна для дзейнасці Франца Савіча, Юліяна Бакшанскага і асабліва Канстанціна Вікенція Каліноўскага, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863-64 гг.

---

[3] Цвікевіч А. "Западнoруссизм". Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў канцы XIX і пачатку XX в. Менск, 1993. С. 54.

[4] Сакалова М. Кансерватызм у Беларусі ў XIX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 1997 №1. С. 23; Яна ж. Пачатак ліберальнага руху ў Беларусі. (рукапіс).

у Беларусі і Літве. У 1862 г. ён наладзіў выданне першай беларускай газеты „Мужыцкая праўда”, на старонках якой выступаў за палітычнае і духоўнае вызваленне беларускіх сялян, праводзіў ідэю стварэння дэмакратычнай народнай дзяржавы. Спроба К.Каліноўскага спалучыць ідэалогію радыкальнага лібералізму з этнакультурнымі элементамі аказалася досыць удалай. Пастаянная апеляцыя да гістарычных, культурных і рэлігійных традыцый, спроба ўзняць грамадскі прэстыж беларускай мовы паспрыялі актыўнаму далучэнню беларускага сялянства Віленшчыны і Гарадзеншчыны да паўстання.

Падзеі першай паловы 60-ых г. 19 ст. моцна паўплывалі на далейшую эвалюцыю працэсу культурнага накаплення. Адмена прыгоннага ладу і паўстанне прыспешылі працэс дэмакратызацыі грамадства Беларусі, які, паводле Міхала Ромэра[5], генетычна звязаны з нацыянальным Адраджэннем. Маніфест 19 лютага 1861 г. нанёс моцны ўдар па саслоўнай структуры грамадства. Паўстанне 1863-1864 гг. паспрыяла палітычнай актывізацыі сацыяльных нізоў незалежна ад таго, на чыім баку яны знаходзіліся. Яно ж прыспешыла працэс ліквідацыі прыгонніцтва ў Беларусі і Літве. Аднак дэмакратызацыя адбывалася ва ўмовах рэзкага ўзмацнення палітыкі русіфікацыі. Адзінай магчымасцю легальнай грамадскай дзейнасці станавіўся ўдзел у гэтай палітыцы. Частка сацыяльных нізоў насельніцтва Беларусі пайшла па гэтым шляху. А вось большасць мясцовай шляхты ў сваіх культурных патрэбах пачала арыентавацца на Польшчу, г.зн., што палітычная паланізацыя гэтай часткі грамадства больш актыўна дапаўнялася паланізацыяй культурнай. Усё гэта прычынілася да выразнага крызісу ліцвінскай традыцыі. Затое заходнеруская традыцыя атрымала нават урадавую падтрымку.

Расійскія ўлады дзеля ўмацавання ўласных пазіцый актыўна разыгрывалі “беларускую карту”. Напрыканцы 60-ых гадоў 19 ст. яны дазволілі друкаваць на беларускай мове кірыліцай этнаграфічныя зборнікі. Пашыралася ўжыванне тэрміна “Беларусь”. Прычым да “беларускіх” зямель улады пачалі адносіць ужо і Менскую губерню. Распаўсюджвалася ідэя вызначэння этнічнасці па мове, што цалкам адпавядала інтарэсам расійскага афіцыёзу, які лічыў беларускую мову толькі дыялектам рускай.

Апафеозам гэтай палітыкі стала выпрацоўка ў 70-ыя гады 19 ст. т.зв. “тэорыі заходнерусізму”. Паводле яе, Беларусь з’яўлялася культурнай і дзяржаўнай часткай Расіі, а беларусы – адгалінаваннем рускага этнасу. Этнаграфічныя асаблівасці беларусаў тлумачыліся польскімі ўплывамі і падлягалі ліквідацыі. Апошнім тэорыя заходнерусізму істотна адрознівалася ад заходнярускай культурнай традыцыі. Зрэшты не ўсе “заходнярусы” падзялялі ідэю знішчэння этнаграфічных асаблівасцяў. Як гэта часта бывае ў гісторыі, рэальныя наступствы пэўных дзеянняў не адпавядалі намерам тых, хто іх здзяйсняў. У першую чаргу гэта адносіцца да вынікаў этнаграфічных даследаванняў 60-90-ых г. 19 ст. Яны павінны былі ўмацаваць тэорыю заходнерусізму, але на самой справе іх вынікі толькі пацвярджалі факт існавання самастойнага беларускага этнасу.

Працэс беларускага культурнага накаплення, які адбываўся ў межах ліцвінскай і заходнерускай культурных традыцый, ва ўмовах дэмакратызацыі грамадства

[5] Römer M. Litwa. Studium odrodzenia narodu litewskiego. Lwów, 1908. S. 224

паспрыяў паступоваму афармленню ўласна **беларускай культурнай традыцыі**. Непасрэднае дачыненне да гэтага мелі мясцовыя ліберал. Але не толькі яны.

У канцы 70-ых – пачатку 80-ых гадоў 19 ст. беларускія народнікі выступілі з тэарэтычным абгрунтаваннем існавання беларусаў як “асобнай галіны славянскага племені”. Упершыню выпрацоўка нацыянальнай ідэалогіі аказалася звязанай з сацыялістычнай ідэяй у яе народніцкім варыянце. У народніцкіх выданнях (“Пісьмы пра Беларусь. Пісьмо першае” Данілы Баравіка, “Пасланне да землякоў беларусаў” Шчырага беларуса, у двух нумарах гектаграфічнага часопіса “Гомон” і інш.)[6]. адначаліся спецыфічныя кліматычныя, прыродна-геаграфічныя, гістарычныя і этнаграфічныя ўмовы, якія адрознівалі Беларусь ад Расіі, Польшчы і Украіны. Падкрэслівалася адметнасць беларускай мовы. Народнікі сцвярджалі, што беларускі народ адчувае сваю арганічную еднасць і адрознівае ўласныя інтарэсы ад польскіх і вялікарускіх. Аўтары публікацый прапанавалі лозунг “Беларусь для беларусаў”. Пры гэтым беларускі этнас успрымаўся імі як выключна плябейскі, сялянскі. Такая абмежаваная трактоўка ў далейшым прывядзе да этналінгвістычнай і сацыяльнай абмежаванасці беларускай культурнай традыцыі.

Ідэю самастойнасці беларускага этнасу адстойвалі таксама аўтары публікацый у легальнай газеце ”Минский листок“, якая была цэнтрам групоўкі беларускіх памяркоўных лібералаў. Гісторык Мітрафан Доўнар-Запольскі ў сваіх артыкулах (1888) даказваў існаванне беларускай нацыі, падкрэсліваючы самабытнасць беларускай гісторыі і мовы.

На канчатковае афармленне беларускай культурнай традыцыі моцна паўплывала літаратурная дзейнасць Францішка Багушэвіча (1840-1900). У прадмове да “Дудкі беларускай”, выдадзенай у Кракаве ў 1891 г. на лацінцы, паэт абвясціў пра існаванне самастойнай і паўнацэннай беларускай мовы, акрэсліў тэрыторыю яе распаўсюджання, папярэдзіў, што страта роднай мовы прывядзе да знікнення беларускага этнасу. Паэт з гонарам згадваў мінулае Беларусі, калі яна разам з Літвой баранілася ад крыжацкіх нападаў, а пасля ўтварэння дзяржавы Гедыміна апынулася ў сярэдзіне Літвы як “тое зярно ў гарэху”[7]. Упершыню ў гэтай прадмове ўсе этнічныя беларускія землі былі названыя Беларуссю.

На старонках “Мужыцкай праўды”, у творах Ф.Багушэвіча, у публікацыях “Минского листка” прысутнічалі пэўныя праявы нацыянал-кансерватызму (тэрмін Н.Недасека[8]). Маецца на ўвазе, ідэя захавання культурных традыцый, абароны ўласнай культурнай адметнасці ад поўнай дэнацыяналізацыі. Менавіта гэтая ідэя прыцягнула да беларускай культурнай дзейнасці такіх прадстаўнікоў вышэйшых колаў грамадства як Аляксандр Ельскі і Эдвард Вайніловіч.

Ёсць усе падставы лічыць беларускіх народнікаў і Францішка Багушэвіча “піянерамі” ўласна беларускага Адраджэння. Менавіта яны, у першую чаргу, прычыніліся да афармлення “палітычнага” этапа беларускага нацыянальнага руху, які распачынаецца напрыканцы 19 – пачатку 20 ст. Хаця ва ўмовах Расійскай імперыі, дзе дзяржава была найперш інструментам гвалту, нават літаратурная творчасць станавілася палітычнай дзейнасцю.

---

[6] Публицистика белорусских народников. Сост. С.Александрович, И.Александрович. Минск, 1983.
[7] Багушэвіч Ф. Творы. Укл. Я.Янушкевіч. Мінск, 1998. С. 22.
[8] Недасек Н. 1917-47 // Спадчына. 1997. №3.

Такім чынам, можна адзначыць, што да афармлення ўласна беларускай культурнай традыцыі моцна прычынілася як ідэалогія лібералізму ў яе беларуска-літоўскім варыянце, так і сацыялістычная ідэалогія ў выглядзе народніцкіх ідэй. У беларускай гісторыі праявілася агульнаеўрапейская тэндэнцыя, якую адзначыў яшчэ Эрык Хабсбаўм. Вядомы даследчык прыйшоў да высновы, што нацыяналізм на працягу амаль усяго 19 ст. быў звязаны менавіта з ліберальнымі і радыкальнымі рухамі[9].

У 80-90-ыя г. 19 ст. у Беларусі і Літве пачала распаўсюджвацца сацыял-дэмакратычная мадэль сацыялістычнай ідэалогіі, якая хутка набывала нацыянальную афарбоўку. Найбольш уплывовымі сацыялістычнымі партыямі ў Беларусі і Літве на пачатку 20 ст. былі Польская сацыялістычная партыя (ППС) і Жыдоўскі рабочы саюз (БУНД). Апошні фактычна манапалізаваў рабочы рух. Пашыраліся ўплывы велікарасійскіх сацыялістычных партый (РСДРП і ПСР).

Першай палітычнай беларускай арганізацыяй стала Беларуская рэвалюцыйная партыя, заснаваная Вацлавам Івано ўскім. Праіснавала яна нядоўга. У 1903 г. на змену ёй прыйшла Беларуская рэвалюцыйная Грамада. Абедзьве гэтыя арганізацыі больш нагадвалі інтэлігенцкі клуб, чым партыю[10]. Пераўтварэнню “клуба” ў сапраўдную палітычную партыю спрыяла рэвалюцыя 1905-1907 гг., у якой яна дзейнічала пад назвай Беларускай сацыялістычнай Грамады (БСГ).

Ля вытокаў палітычнага этапа беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння стаялі Вацлаў Іваноўскі, браты Іван ды Антон Луцкевічы, Алесь Бурбіс, Францішак Умястоўскі і Вацлаў Ластоўскі. Звычайна з БСГ звязваюць першыя крокі беларускага сацыял-дэмакратычнага руху. Аднак аналіз тэарэтычных пазіцый і практычнай дзейнасці БСГ у перыяд рэвалюцыі сведчыць пра іншае. БСГ працягвала традыцыі беларускіх народнікаў. Сацыял-дэмакратызм гэтай партыі “насіў фрагментарны характар, выяўляўся хутчэй у тэндэнцыях”[11]. Спалучэнне сацыялістычнай ідэалогіі, заснаванай на тэорыі марксізму, з беларускім нацыянальным рухам было амаль немагчымым, таму што ў Беларусі не сфармаваўся нацыянальны пралетарыят. Беларускія сацыялістычныя арганізацыі непазбежна зыходзілі на народніцкія пазіцыі, паколькі маглі арыентавацца толькі на сялянства, асабліва на яго бяднейшую частку.

У перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг. у дзейнасці БСГ спалучаліся сацыяльныя і нацыянальныя пытанні. Але выразна дамінаваў сацыяльны кампанент. Нацыянальнае пераважна было толькі формай для прапаганды сацыяльных ідэй.

На другім з’ездзе ў студзені 1906 г. БСГ абвясціла сябе “партыяй працавітай беднаты Беларускага краю без адрознення нацыянальнасцяў”. Гэтая перамена была выклікана дамінаваннем класавага падыходу. Але не толькі ім. З улікам далейшай дзейнасці кіраўнікоў БСГ праграмныя змяненні можна ахарактарызаваць як пэўную эвалюцыю разумення нацыі ў накірунку ад этнакультурнай арганізацыі да палітычна-тэрытарыяльнага аб’яднання. Магчыма, дачыненне да гэтага мелі т.зв. “краёўцы”, якіх можна лічыць прадаўжальнікамі ліцвінскай традыцыі.

Краёвая ідэалогія нарадзілася ў асяроддзі ліцвінскай шляхты, прадстаўнікі якой адчувалі сваю прыналежнасць адначасова да розных этнасаў. Галоўным пастулатам

---

[9] Хобсбаум Э. Век империи. 1875-1914. Ростов-на-Дону, 1999. С. 210.

[10] Turonek J. PPS wobec białoruskiego ruchu rewolucyjnego w latach 1902-1906 // Studia polsko-litewsko-białoruskie. Pod red J. Tomaszewskiego i in. Warszawa, 1988. S. 106; ten że. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi. Warszawa, 1992. S. 25-34.

[11] Кароль А. Ля вытокаў беларускай сацыял-дэмакратыі // Беларуская мінуўшчына. 1996. № 5. С. 15.

краёвай ідэалогіі быў пастулат палітычнай нацыі. На думку краёўцаў, усе, хто ўсведамляў сябе “грамадзянамі Краю”, належалі да адзінай нацыі незалежна ад этнічнага паходжання і культурнай прыналежнасці. Падобнае ўсведамленне не перашкаджала адэптам краёвасці працаваць у рэчышчы розных этнічных рухаў[12]. Усё гэта дазваляе для перыяду 1907-1915 гг. ужываць тэрміны “беларускія” або “польскія краёўцы”. Сацыяльна-палітычная свядомасць краёўцаў грунтавалася на ідэях лібералізму.

Адным з ідэолагаў беларускіх краёўцаў быў Раман Скірмунт, чые погляды набліжаліся да праграмы кансерватыўна-ліберальнай партыі “Союз 17 октября”. У І Дзяржаўнай думе Р.Скірмунт разам з князем Геранімам Друцкім-Любецкім, біскупам Эдвардам фон дэр Ропам, Баляславам Ялавецкім і інш. утварылі т.зв. “Тэрытарыяльнае кола”, якое адстойвала інтарэсы Беларуска-літоўскага краю. Аналіз іх дзейнасці дазволіў Янку Запрудніку заявіць пра беларускасць гэтых дзеячоў[13]. Безумоўна, як краёўцы яны працавалі і для Беларусі.

У 1907-1908 гг. Р.Скірмунт спрабаваў стварыць Краёвы Саюз, які павінен быў аб’яднаць беларускую, польскую і літоўскую нацыянальныя партыі. Аднак сацыяльны радыкалізм кіраўніцтва БСГ не спрыяў палітычным кантактам з беларускімі краёўцамі. Спроба стварэння беларускай ліберальнай партыі аказалася перадчасовай. Тым не менш ва ўмовах спаду рэвалюцыйнага руху менавіта лібералізм стаў палітычнай асновай для наладжвання адносін паміж рознымі плынямі беларускага руху.

Пасля самароспуску БСГ у 1906 г. цэнтрам беларускага руху стала штотыднёвая газета “Наша Ніва”. Яе галоўнай задачай была барацьба за нацыянальна-культурнае Адраджэнне Беларусі, захаванне і збіранне ўсіх нацыянальных сіл. У камбінацыі сацыяльнага і нацыянальнага на першы план пачаў выходзіць нацыянальны кампанент. Радыкалізм былых кіраўнікоў БСГ, якія цяпер узначальвалі рэдакцыю “Нашай Нівы”, адышоў у мінулае. Аналіз публікацый галоўнай беларускай газеты ў перыяд 1907-1915 гг. сведчыць, што ў новых умовах іх погляды па агульнапалітычных пытаннях і нават па аграрнай праблеме прынцыпова не розніліся ад поглядаў беларускіх краёўцаў – прыхільнікаў памяркоўнага лібералізму[14].

Лібералізацыя поглядаў былых кіраўнікоў БСГ стварала магчымасці для палітычных кантактаў дзеля кансалідацыі ўсіх нацыянальных сіл. У міжрэвалюцыйны перыяд у доме княгіні Марыі Магдалены Радзівіл, фундатаркі шматлікіх беларускіх і літоўскіх культурных праектаў, адбыліся сустрэчы і перамовы паміж Раманам Скірмунтам, з аднаго боку, і братамі Луцкевічамі, Вацлавам Іваноўскім і Аляксандрам Уласавым з другога[15]. Гэтыя кантакты спрыялі пэўнаму паразуменню на грунце нацыянальна-культурнага Адраджэння. У прыватнасці, яны забяспечылі фінансавую падтрымку беларускіх культурных ініцыятываў з боку прадстаўнікоў арыстакратычных колаў Беларусі.

Імкненне да кансалідацыі нацыянальных сіл, спалучанае з прапагандай лібералізму, спрыяла далейшай эвалюцыі разумення нацыі як палітычнай катэгорыі.

---

[12] Смалянчук А. “Краёвасць” у беларускай і літоўскай гісторыі // Беларускі гістарычны агляд. Менск, 1997. Т.4. Сш. 1-2 (6-7).
[13] Запруднік Я. Дваранства і беларуская мова // Беларусіка. Кн.2, Менск, 1992. С. 29-36.
[14] Конан У. “Наша Ніва” // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.5. Мінск, 1999. С. 315.
[15] Łatyszonek O., Zięba A. Radziwiłłowa z Zawiszów // Polski Słownik Biograficzny. T. 30. S. 398-399.

Пра гэта сведчыць тайнае выданне беларусамі ў Вільні штодзённых рускамоўнай “Вечерней газеты” (1911-1915) і польскамоўнага “Kuriera krajowego” (1912-1914)[12]. Кіраўнікі беларускага руху зразумелі, што сацыяльная прастора беларускамоўнай прапаганды абмежавана галоўным чынам вёскай. Прапаганда беларускай ідэі на рускай і польскай мовах пашырала сацыяльныя і культурныя межы нацыянальнага руху. Паступова пераадольвалася этналінгвістычная і сацыяльная (сялянская) абмежаванасць разумення беларускай нацыі.

Можна выказаць меркаванне, што менавіта палітычная трактоўка нацыі давала беларускай нацыянальнай ідэі шанс знайсці масавую падтрымку сярод насельніцтва Беларусі. Справа ў тым, што працэс мадэрнізацыі грамадства (у Э.Хабсбаўма: дэмакратызацыі), які ламаў традыцыйную саслоўную структуру і рыхтаваў грамадскасць да прыняцця новых ідэалогій (у т.л. і нацыянальнай), у Беларусі адбываўся вельмі марудна. Яго затрымлівала захаванне шэрагу абмежаванняў у сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сферах, уведзеных яшчэ Міхаілам Мураўёвым. Расійскія ўлады, як быццам, спрабавалі “закансерваваць” грамадства Беларускага краю. Міхал Ромэр, які на пачатку 20 ст. параўноўваў Беларусь і “этнаграфічную” Літву, заўважыў, што ў апошняй “у сто разоў менш саслоўнасці, чым у яе ўсходняй суседкі – Беларусі, дзе не развіваецца ні буйная прамысловасць, ні моцная сярэдняя зямельная ўласнасць”[16]. Замаруджанасць працэсу мадэрнізацыі затрымлівала фармаванне т.зв “сярэдняга класа”, які ў другой палове 19 ст. з’яўляўся галоўным апірышчам нацыянальных рухаў у Еўропе[17]. Беларуская нацыянальная эліта абаперціся на гэтую сацыяльную сілу не магла. Тым не менш, развіццё нацыянальнага руху працягвалася.

У т.зв. “нашаніўскі перыяд” (1906-1915) беларускае Адраджэнне дасягнула значных поспехаў. У гэты час аформіліся тры з чатырох, паводле Энтані Сміта[18], асноўных кампанента нацыяналізму. Гэта ідэя самабытнай беларускай гісторыі, усведамленне прыналежнасці да адметнага культурнага тыпу, дзе асабліва важную ролю адыгрывае беларуская мова, і ўяўленне пра тэрытарыяльныя межы рассялення нацыі. Чацвёрты кампанент - уласная нацыянальная палітыка – прысутнічаў толькі часткова.

Умацаванне палітычных пазіцый стрымлівалася адсутнасцю беларускай палітычнай партыі. “Наша Ніва” цалкам замяніць партыю не магла. Палітычны кантакт з шырокімі коламі насельніцтва быў страчаны. Месца сацыяльна-палітычнай праграмы беларускага руху заняла праграма нацыянальная. Між тым толькі спалучэнне нацыянальнай ідэалогіі з папулярнымі сацыяльнымі лозунгамі дазваляла разлічваць на стварэнне шырокай сацыяльнай базы беларускага руху. Лібералізм, які спрыяў далучэнню да беларускага Адраджэння прадстаўнікоў вышэйшых колаў грамадства, не мог стаць асновай масавага руху, паколькі ў Беларусі, як ужо адзначалася, так і не сфармаваўся моцны сярэдні клас. Кансерватыўная ідэалогія толькі эпізадычна мела дачыненне да беларускага руху. Што датычыць сацыялізму, які хутка павялічваў колькасць сваіх прыхільнікаў, то ў Беларусі сацыялістычная ідэалогія распаўсюджвалася пераважна як польская, жыдоўская і вялікаруская.

[12] Смалянчук А. Краёвец Антон Луцкевіч // Гістарычны альманах. Гародня, 1998. № 1. С. 27-44.
[16] Römer M. Litwa… S. 55.
[17] Хобсбаум Э. Век империи… С. 237.
[18] Сміт Э. Нацыяналізм у ХХ ст. Менск, 1995. С. 12-13

Сацыялістычны рух быў прадстаўлены ППС, БУНДам, меншавікамі і бальшавікамі. Гэтыя партыі разам з вельмі ўплывовай Партыяй сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ПСР) праблему беларускага нацыянальна-культурнага і палітычнага Адраджэння ігнаравалі. Адсутнасць беларускай партыі, якая б паспрабавала спалучыць папулярныя сацыялістычныя лозунгі з нацыянальнай ідэяй, рабіла беларускі рух аўтсайдэрам у міжпартыйным і міжнацыянальным спаборніцтве за ўплывы сярод насельніцтва.

Беларускі сацыял-дэмакратычны рух фактычна распачаўся ў 1915 г. утварэннем у Вільні Беларускай сацыял-дэмакратычнай работніцкай групы. Яе ўзначаліў Антон Луцкевіч. З'яўленне гэтай арганізацыі, магчыма, было вынікам пэўнага расчаравання беларускіх дзеячоў расійскім лібералізмам, які ад пачатку вайны заняў вялікадзяржаўныя пазіцыі.

Падзеі першай сусветнай вайны прычыніліся да тэрытарыяльнага раз'яднання беларускага руху. Пасля акупацыі Вільні нямецкімі войскамі цэнтрам руху на захад ад фронта стаў Беларускі народны камітэт, які ўзначаліў Антон Луцкевіч. На ўсходзе ролю кіраўнічага органа адыгрываў Менскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Ягоным кіраўніком з канца 1916 г. быў Раман Скірмунт. На тэрыторыі, дзе гаспадарылі расійскія ўлады, спробы арганізацыі сацыялістычнай партыі (у выглядзе аднаўленай БСГ) распачаліся толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

Ліквідацыя самадзяржаўя выклікала актывізацыю нацыянальных рухаў. На чале Расіі апынуўся ўрад лібералаў, што адразу ўзмацніла ліберальную тэндэнцыю ў беларускім руху. У сакавіку 1917 г. у Менску адбыўся з'езд беларускіх арганізацый, дзе яны аб'ядналіся на платформе лібералізму. Прадстаўнікі БСГ, якая хутка аднаўляла свае ўплывы ў беларускім руху, пагадзіліся на кіраўніцтва з боку лібералаў. Утвораны на з'ездзе Беларускі Нацыянальны камітэт узначаліў Р.Скірмунт. Дэлегаты спадзяваліся, што ён здолее дамовіцца з расійскімі лібераламі аб аўтаноміі Беларусі. Аднак Часовы ўрад не пажадаў абмяркоўваць беларускае пытанне.

Перыяд паміж лютым і кастрычнікам 1917 г. быў часам хуткай радыкалізацыі шырокіх масаў насельніцтва, якія далучаліся да актыўнай палітычнай дзейнасці. Для большасці насельніцтва Беларусі ідэя сацыяльнай рэвалюцыі была значна больш прыцягальнай, чым ідэя нацыянальнага самавызначэння. Гэта было адным з вынікаў дамінавання сацыялістычных лозунгаў у вялікарускай афарбоўцы. Наступаў час панавання кан'юнктурных сацыяльна-палітычных праграм, разлічаных пераважна на пашырэнне партыйных уплываў і доступ да ўлады. Вясновыя сялянскія з'езды і летнія выбары ў гарадскія думы паказалі, што палітычнымі лідэрамі ў Беларусі з'яўляюцца эсэры, меншавікі, бундаўцы і бальшавікі. Пазіцыі агульнарасійскіх палітычных партый яшчэ больш узмацніліся пасля ўваходжання сацыялістаў у Часовы ўрад.

У беларускім руху на першыя пазіцыі паступова выйшла БСГ. У чэрвені адбылася партыйная канферэнцыя, якая абвясціла галоўнай мэтай устанаўленне сацыялізму шляхам рэвалюцыі. У сярэдзіне 1917 г. колькасць сяброў БСГ дасягнула 5000 чалавек[19]. На ліпеньскім з'ездзе беларускіх арганізацый прадстаўнікі БСГ дамагліся роспуску БНК і ўтварэння новага кіраўнічага органа, які складаўся толькі з сацыялістаў. Яны спадзяваліся на падтрымку ідэі палітычнай самастойнасці Беларусі расійскімі сацыялістамі. Аднак удзел беларускіх прадстаўнікоў у Дзяржаўнай і

[19] Біч М., Рудовіч С. Беларуская сацыялістычная грамада // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мінск, 1993. Т.1. С.412.

Дэмакратычнай нарадах (жнівень і верасень 1917) паказаў беспадстаўнасць гэтых надзей[20].

У кастрычніку 1917 г. уладу ў Расіі захапілі бальшавікі. Яны хутка ўмацоўвалі свае пазіцыі і ў Беларусі. Абвастрэнне палітычнага супрацьстаяння, унутраныя супярэчнасці, нарэшце, розніца ў адносінах да бальшавіцкага перавароту прывялі да расколу БСГ. Частка беларускіх сацыялістаў пакіравала ў бок бальшавікоў, хаця тыя адназначна варожа ставіліся да беларускага нацыянальнага Адраджэння. Насуперак абвешчанаму праву нацый на самавызначэнне бальшавікі, фактычна, занялі вялікадзяржаўныя пазіцыі.

Пасля паражэння кандыдатаў ад беларускіх арганізацый на выбарах ва Устаноўчы сход задача яднання беларускіх нацыянальных сіл ізноў стала ў парадак дня. Глебай для яднання стала ідэя незалежнай Беларускай дзяржавы. На пачатку 1918 г. гэтую ідэю падтрымлівалі як сацыялісты, так і ліберылы, аб'яднаныя ў Менскім Беларускім Прадстаўніцтве[21], якое ўзначаліў Раман Скірмунт.

25 сакавіка 1918 г. была абвешчана незалежная Беларуская Народная Рэспубліка. Аднак ідэя БНР не атрымала масавай падтрымкі. Нацыянальная праграма, нават спалучаная з сацыялістычнай (у варыянце БСГ) ідэалогіяй, аказалася менш прывабнай, чым прапаганда расійскіх бальшавікоў або эсэраў.

Такім чынам, у 19 ст. палітычная ідэалогія, у першую чаргу, лібералізм і сацыялізм у народніцкім варыянце, паспрыялі станаўленню беларускай культурнай традыцыі. У ідэалогіі беларускага культурнага накаплення адчуваліся таксама пэўныя элементы кансерватызму, што спрыяла далучэнню да беларускага культурнага Адраджэння асобных прадстаўнікоў вышэйшых колаў грамадства.

На рубяжы стагоддзяў беларуская нацыя (у палітычным сэнсе) знаходзілася толькі на пачатку свайго фармавання. Яна існавала, галоўным чынам, як пэўная тэндэнцыя ідэйных пошукаў нацыянальнай эліты. Народны протанацыяналізм (тэрмін Эрыка Хабсбаўма[22]) як пачуццё калектыўнай прыналежнасці да нацыі быў досыць слабым. Нават саманазва "беларусы" яшчэ не мела ўласна нацыянальнага зместу і выкарыстоўвалася часцей як тапонім. Значная частка жыхароў паўночна-заходняй і цэнтральнай Беларусі называлі сябе "тутэйшымі"[23]. Тутэйшасць уяўляла сабой досыць цікавы феномен масавай свядомасці насельніцтва Беларусі эпохі нацыянальных рухаў. Яго можна трактаваць як падсвядомае імкненне пазбегнуць нацыянальнага самавызначэння, але захаваць пачуццё ўласнай адметнасці ад палякаў і рускіх. Пераважалі сацыяльныя і канфесійныя формы самаідэнтыфікацыі.

У гэтай сітуацыі з улікам працэсу дэмакратызацыі грамадства пашырэнне нацыянальнай ідэі гарантавалася яе спалучэннем з папулярнымі палітычнымі ідэалогіямі або кан'юнктурнымі сацыяльна-палітычнымі праграмамі. Ролю каталізатара нацыянальнага руху на рубяжы стагоддзяў магла адыграць сацыял-дэмакратычная мадэль сацыялістычнай ідэалогіі або, па меншай меры, сацыялістычныя лозунгі. І ўжо на пачатку 20 ст. з'яўляецца беларуская палітычная партыя, у назве якой ужываецца слова "сацыялістычная". Аднак ва ўмовах адступлення рэвалюцыі, адчуваючы слабасць уласных палітычных пазіцый і

[20] Рудовіч С. Пошукі шляхоў да беларускай дзяржаўнасці (1917)// Беларускі гістарычны часопіс. 1995 №4. С. 36.
[21] Гадлеўскі В. Зь беларускага палітычнага жыцьця ў Менску.1917-1918 // Спадчына. 1997. № 5.
[22] Хобсбаум Э. Нации и национализм. После 1870 г. Санкт-Петербург, 1998. С. 75-80.
[23] Церашковіч П.,Чаквін І. Беларусы// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мінск, 1994. Т.1. С. 472.

ўсведамляючы незавершанасць этапа культурнага накаплення, беларускія патрыёты галоўную ўвагу звярнулі на культурную дзейнасць. Менавіта нацыянальная праграма, спалучаная з ідэалогіяй лібералізму, павінна была, на іх думку, аб'яднаць усе беларускія элементы грамадства і па "вертыкалі", і па "гарызанталі". Газета "Наша Ніва" стала сімвалам беларускага культурнага Адраджэння. Аднак для "нашаніўскага перыяду" характэрна пэўная недаацэнка ролі палітычнай працы сярод шырокіх колаў насельніцтва.

Задачы кансалідацыі нацыянальных сіл па сацыяльнай "вертыкалі" найбольш адпавядала ідэалогія лібералізму. Яе пашырэнне сярод нацыянальнай эліты і сапраўды паспрыяла пэўнаму поспеху ў вырашэнні гэтай задачы. Сярод эліты расло разуменне нацыі як палітычнага саюза (аб'яднання) тых, хто звязваў сваю будучыню з Беларуссю. Аднак распаўсюдзіць палітычнае разуменне нацыі, якое непазбежна прыводзіла да ідэі незалежнай нацыянальнай дзяржавы, сярод шырокіх масаў насельніцтва не атрымалася. Аказалася немагчымым арганізаваць масавы беларускі рух толькі з дапамогай нацыянальных лозунгаў. Не паспрыяла гэтаму і палітычная ідэалогія. Не мог беларускі рух разлічваць і на такую мабілізуючую шырокія масы сілу як рэлігія. Пераважная большасць каталіцкага і праваслаўнага духавенства была настроена супраць беларускага Адраджэння.

Напярэдадні вызначальнага перыяду 1917-1918 гг. беларуская нацыянальная ідэя не была спалучана ні з рэлігіяй, ні з папулярнай сацыяльна-палітычнай праграмай. У выніку нешматлікія беларускія арганізацыі па ступені рэальнага ўплыву на масы не былі ў стане канкурыраваць ні з агульнарасійскімі партыямі, ні з польскімі або жыдоўскімі партыйнымі арганізацыямі. Адсутнасць масавай падтрымкі беларускай ідэі не дазволіла выкарыстаць выгадную геапалітычную сітуацыю дзеля дасягнення незалежнасці.

# "…Беларускі дзеяч з вялікіх паноў". Эпізоды палітычнай біяграфіі Рамана Скірмунта

**Станіслаў Рудовіч (Менск)**

Сярод "сыноў і пасынкаў" Беларусі асоба Рамана Скірмунта - адна з цяжкадаступных для сённяшняга разумення. Спроба разгледзець постаць вядомага "краёўца" ў беларускім кантэксце зроблена пакуль толькі ў артыкуле Алеся Смаленчука, прысвечаным пачатковаму этапу палітычнай біяграфіі Рамана Скірмунта[24]. Абставіны яго трагічнай гібелі сталі вядомымі дзякуючы пінскаму журналісту Вячаславу Ільянкову[25]. Тым часам апагей "беларускай кар'еры" Рамана Скірмунта – 1917-1918 гады – фактычна застаецца "за кадрам" гістарычнай літаратуры.

Да апошняга часу невядомы быў нават дзень нараджэння аднаго з лідэраў Беларускай Народнай Рэспублікі. Крыніцы называлі толькі год – 1868-ы. Зараз, дзякуючы гісторыку У.Вяроўкіну-Шэлюце[*], які адшукаў фармулярны спіс Рамана Скірмунта, мы можам назваць дакладную дату – 25 красавіка (7 мая) 1868 г.[26]

Нашчадак старадаўняга шляхецкага роду Раман-Мар'ян Скірмунт выхоўваўся ў бацькоўскім маёнтку Парэчча на Піншчыне, сярод васьмі сваіх братоў і сясцёр. Пра яго дзіцячыя і юнацкія гады дакладныя звесткі невядомыя. Можам толькі ўявіць сабе атмасферу добраўпарадкаванага дваранскага гнязда з багатай бібліятэкай і калекцыяй рарытэтаў, насычаную рамантычнай аўрай паданняў аб слаўных дзеях продкаў.

А разам з гэтым штодзённыя клопаты пра тое, каб зладжана, прыбыткова функцыянаваў вялікі шматгаліновы маёнтак, знакаміты не толькі інтэнсіўнай сельскай гаспадаркай, але і некалькімі прадпрыемствамі, сярод якіх прызнанымі поспехамі вылучалася суконная фабрыка – прадмет асаблівага гонару прадпрымальнікаў Скірмунтаў[27].

Паведамляючы ў адным з лістоў (1917 г.) пра сваё паходжанне, Раман Скірмунт пісаў: "Я сам ураджэнец беларускага Палесся, нашчадак літоўскай сям'і, са старажытных часоў, спакон вякоў аселай у гэтым краі, і мае продкі да 17 ст. карысталіся беларускай мовай як хатняй"[28]. Апошняя заўвага ўскосна сведчыць пра тое, што ў часы жыцця Рамана беларуская мова ў сямейным ужытку Скірмунтаў ужо не вяршэнствавала. У гэтай сям'і, як і сярод усёй спаланізаванай шляхты, прыярытэт аддаваўся, натуральна, польшчызне. Але не падлягае сумненню і тое, што гаспадары маёнтка Парэчча нядрэнна ведалі мову навакольных сялян і шырока карысталіся ёю ў зносінах з вяскоўцамі, як гэта практыкавалася і ў іншых панскіх дварах[29]. Паводле

24

[25] Ильенков В. Трагедия Скирмунтов // Пінскі веснік. 25 сакавіка 1992; Он же. Скирмунты: из истории рода // Пінскі веснік. 27 студзеня 1993.

[26] НГАБ у Менску, ф. 319, воп. 3, ад.з. 286, арк. 15-16.

[27] Киштымов А. Скирмунты: династия предпринимателей // Деловой вестник. 1994. № 9/10. С. 31-33.

[28] Из переписки Р.А.Скирмунта с Е.С.Канчером // Чырвоны шлях. 1918. № 1/2. С. 12.

[29] Гл.:Wojniłłowicz E. Wspomnienia. 1847-1928. Cz. 1. Wilno, 1931. S. 210; Pawlikowski M.K. Mińszczyzna. // Pamiętnik Wileński. Londyn. 1972. S. 301; Туронак Ю. Ваша национальность? // Неман. 1992. № 12. С. 158.

сведчання ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага, Скірмунт "добра ўладаў беларускай моваў (трохі з палескім акцэнтам: "шо, шчо")"[30].

У светапоглядзе будучага прэм'ера БНР адчуваецца значны ўплыў яго бацькі Аляксандра Скірмунта, вядомага ў Беларусі ў другой палове 19 ст. грамадскага і гаспадарчага дзеяча. Разумеючы непазбежнасць сацыяльных перамен, найперш у адносінах паміж памешчыкамі і сялянамі (ён засведчыў гэта актыўным удзелам у скасаванні прыгону), А.Скірмунт быў праціўнікам гвалтоўнай ломкі ўстаялага ладу жыцця. У духу еўрапейскага пазітывізму ён лічыў, што прагрэсу трэба дамагацца ўпартай "арганічнай" працай, пазітыўнай дзейнасцю на ніве гаспадаркі і культуры[31]. Шанаванне традыцыі, цяга да рэальнай справы ў процівагу смелым, але часам легкаважным дэкларацыям радыкалаў былі характэрныя і для ўчынкаў сына.

На шырокую грамадскую арэну Раман Скірмунт выступіў у якасці старшыні Таварыства па распрацоўцы сельскагаспадарчых і эканамічных патрэбаў Палесся. Праблемы гаспадарчага дабраўпарадкавання роднага Палесся стануць яго пастаянным клопатам на ўсё жыццё. У гэтай працы ён выявіць шмат энергіі і дзелавой ініцыятывы. Паводле ягоных разлікаў, палескія балоты маглі б даць 4 млн. дзесяцін найлепшых лугоў і выпасаў. Між тым, расійскі ўрад "быў мачыхай гэтаму краю і не дбаў аб яго інтарэсах". Таму ў 1918 годзе новапрызначаны прэм'ер-міністр БНР Раман Скірмунт выкажа надзею на прыцягненне германскага капіталу і тэхнікі для асушэння Палесся, што, на яго думку, паспрыяла б хуткаму развіццю жывёлагадоўлі і дазволіла б нават ажыццяўляць вытворчасць кармоў на экспарт[32].

Па слядах бацькі Раман Скірмунт увайшоў і ў кіраўніцтва Менскага таварыства сельскай гаспадаркі, дзе працаваў да апошніх гадоў існавання арганізацыі і зарэкамендаваў сябе як "чалавек цвёрдых перакананняў, сур'ёзны і дзейсны". Менавіта па яго прапанове дзеля захавання добрых адносін шляхты з сялянствам на прынцыпах традыцыйнага патэрналізму таварыства пачало прымаць у свае шэрагі сялян на ільготных умовах[33].

Але поруч з гаспадарчай дзейнасцю ў жыцці Рамана Скірмунта, якое прыпала на эпоху грандыёзных сацыяльна-палітычных узрушэнняў, вялізнае месца займала палітыка. Вінцэнт Гадлеўскі прыгадваў, што "палітыцы ён быў адданы целам і душою, не шкадаваў для яе ні фізічных, ні маральных трудоў"[34].

Якімі ж былі палітычныя перакананні Рамана Аляксандравіча? Зафіксаваныя ў крыніцах яго выказванні (на жаль, не вельмі шматлікія) і практычныя крокі ў палітыцы сведчаць, што падмурак яго светапогляду складала сістэма кансерватыўных каштоўнасцяў: абарона традыцыйных асноў грамадства, імкненне да сацыяльна-класавай гармоніі, палітычнай стабільнасці, абачлівасць у дачыненні да радыкальных навацый. Такога кшталту здаровы кансерватызм (зусім не тоесны рэакцыйнаму абскуратызму, рэтраградскім памкненням захаваць у непарушнасці аджылыя формы быцця) пабуджаў шукаць такія спосабы ўладкавання сацыяльна-палітычнай рэчаіснасці, якія задавальнялі б інтарэсы розных класаў і нацыянальнасцяў пры

[30] Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця ў Менску ў 1917-18 гг. // Спадчына. 1997. № 5. С. 20. (Цытаты з беларускамоўных крыніцаў даюцца з захаваннем усіх асаблівасцяў арыгіналу. -*С.Р.*).
[31] Gejsztor J. Pamiętniki z lat 1857-1865. Wilno, 1913. T.1. C. 402.
[32] Беларускі шлях. 29 мая 1918; Дзянніца. 7 ліпеня 1918.
[33] Первая Государственная дума. Алфавитный список и подробные биографии и характеристики членов Государственной думы. Москва, 1906. С. 109.
[34] Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця … С.22.

найменшых выдатках.

Акунаючыся ў часы першай расійскай рэвалюцыі ў вір палітычных калізій, 37-гадовы памешчык выкладае сваё крэда ў бліскуча напісанай польскамоўнай брашуры "Голас мінуўшчыны і патрэба моманту" – своеасаблівым ідэйна-этычным маніфесце[35].

Аўтар выступае з пазіцый свайго класа, патомнай шляхты яго роднага краю, і звяртаецца да яе з палымяным заклікам: выкарыстаць сітуацыю, калі ва ўмовах рэвалюцыі пахіснулася "духоўная Бастылія з-над Нявы", каб абудзіцца ад летаргіі пасля "кровапускання 1863 года" і стаць на шлях свайго палітычнага і нацыянальнага самавызначэння. Якім павінен быць накірунак гэтага шляху? Ці скіраваць погляды на Польшчу, якая шмат каму здаецца "роднай матуляй", ці спадзявацца на "расійскую ласку", ці лепш сэрца і душу аддаць справам сваёй меншай (ściślejszej) Айчыны, свайго краю?

Правільны, на думку Рамана Скірмунта, будзе накірунак, зададзены самой гісторыяй. Каб распазнаць яго, публіцыст робіць разгорнуты экскурс у мінулае і прыходзіць да высновы, што народ, сярод якога ён жыве –"русіны" – мае ўласную гісторыю і самабытныя традыцыі, не згаслыя да сённяшняга дня. "Русіны" – гэта нашчадкі спрадвечнай, пачатковай Русі ("Rusi właściwej"), у адрозненне ад вялікарусаў – нашчадкаў больш позняй Русі Маскоўскай ("надвалжанскай", "славяна-фінскай"). У сярэднявеччы "русіны" разам са сваімі гістарычнымі пабрацімамі "ліцвінамі" стварылі супольнае Вялікае Княства Літоўскае, дзе "русінская" мова была дзяржаўнай. Пазней, у часы уніі Княства з Каралеўствам Польскім, край апынуўся ў арэале магутнага ўздзеяння польскай мовы і культуры. Выхаваны на традыцыях гэтай культуры і каталіцкай рэлігіі, Скірмунт не хавае сваіх сімпатый да польскасці: "З Польшчы струменілася ў Літву праўдзівае святло веры. Адтуль разлівалася на ўвесь край святло заходняй культуры". Гэты паток, аднак, не ператварыў тутэйшых жыхароў у бездапаможных эпігонаў Захаду. Наадварот, ён "мог толькі ўмацаваць у нас прыроджаную любоў да свабоды, засведчаную гістарычнымі подзвігамі ліцвінаў, прыроджанае імкненне ўсіх да самастойнага вызначэння і ўладкавання патрэбаў краю, агіду да аўтакратычнага кіравання, з якога нараджаецца ўсемагутнасць бюракратыі"[36].

Польскасць закранула ў краі толькі шляхетныя вярхі. З пашырэннем асветы сярод ніжэйшых саслоўяў вырасла іх роля ў грамадстве, і ўжо "не шляхта і нешматлікая інтэлігенцыя надаюць афарбоўку краёвым сцягам, а толькі люд"[37]. У этнічнай Літве і ў Паўднёвай Русі абудзілася пачуццё нацыянальнай самастойнасці. У Белай Русі - гэта пытанне найбліжэйшай будучыні. Каб не апынуцца ў становішчы выгнанцаў на роднай зямлі, тутэйшая спаланізаваная шляхта, па перакананні Рамана Скірмунта, мусіць павярнуцца тварам да свайго народа, з якім яе лучыць агульнае паходжанне і гісторыя і працаваць разам з ім дзеля дабра ўсяго краю. Насельнікі краю павінны цяпер "больш чым калі-небудзь яшчэ, адчуваць, мысліць і працаваць дзеля сябе саміх, адкідаючы імпартныя натхненні, з якіх бакоў свету яны б ні паходзілі"[38].

Такім чынам, з самага пачатку сваёй палітычнай дзейнасці Раман Скірмунт выяўляе сябе патрыётам роднага краю, фармулюе асноўныя палажэнні т.зв. краёўства. Гэтая грамадска-палітычная плынь грунтавалася на гістарычнай традыцыі ВКЛ,

[35] Romunt. [Skirmunt R.]. Głos przeszłości i potrzeba chwili. Stanowisko szlachty na Litwie i Rusi. Lwów, 1905.
[36] Тамсама. S. 9-10.
[37] Тамсама. S. 29-30.
[38] Тамсама. S. 7.

трактавала абшар гэтай былой дзяржавы (Край) як інтэгральную тэрытарыяльную, эканамічную і культурную цэласнасць і імкнулася адстойваць яго спецыфічныя інтарэсы, адрозныя ад інтарэсаў як Расіі, так і Каралеўства Польскага[39]. Раман Скірмунт быў носьбітам характэрнай для "краёўцаў" складанай этнакультурнай і нацыянальна-палітычнай самасвядомасці, якую даследчыкі вызначаюць як шматузроўневую.

Самы шырокі яе пласт увасабляўся ў найменні "паляк" як сімвале знаходжання ў геапалітычнай прасторы ўсёй колішняй Рэчы Паспалітай і далучанасці да польскай культуры. Другі ўзровень абазначаўся тэрмінам "ліцвін", г.зн. жыхар Вялікага Княства Літоўскага, чалец шматэтнічнай "нацыі ліцвінаў" (у дзяржаўна-палітычным сэнсе). Нарэшце, трэці ўзровень адлюстроўваў уяўленне аб сваім паходжанні, кроўнай лучнасці з той або іншай этнічнай супольнасцю (літоўцамі, беларусамі, габрэямі і г.д.). Прычым межы паміж узроўнямі не былі выразнымі, і нярэдка ў адной і той жа асобы на розных этапах жыцця ці ў розных абставінах на першы план вылучалася якая-небудзь адна з гэтых граняў самаідэнтыфікацыі[40].

Такі няўстойлівы стан нацыянальнай свядомасці паказваў на яе "недасфармаванасць", але, з іншага боку, у пэўныя моманты (скажам, пры рэзкіх гістарычных пераменах) адзначаная рухомасць, шматаблічнасць магла спрыяць большай гнуткасці ў палітыцы, пакідала прастору для шырэйшага манёўру. Біяграфія Рамана Скірмунта, здаецца, можа служыць у гэтым сэнсе прыкладам.

У рамках краёвага патрыятызму адбываліся інтэнсіўныя пошукі сваёй этнічнай тоеснаці. Паводле назіранняў даследчыкаў, большасць "краёўцаў" эвалюцыянавала ў бок польскасці. Але самаідэнтыфікацыя Рамана Скірмунта пайшла ў іншым накірунку. Відаць, зыходнай пазіцыяй для яго было ўсведамленне свайго паходжання адусходнеславянскай часткі насельніцтва даўнейшай Рэчы Паспалітай – "русінаў".

Пры гэтым звяртае на сябе ўвагу, што аўтар "Голасу мінуўшчыны…" не лакалізуе арэал іх пражывання толькі на тэрыторыі Беларусі. Паводле яго ўяўлення, "русіны" жывуць і на Заходняй Дзвіне, і ў Запарожжы, і ў Галіцыі. Ураджэнец беларуска-ўкраінскага памежжа, Раман Скірмунт, як бачна, напачатку не надаваў вялікага значэння гістарычнай і этнакультурнай дыферэнцыяцыі паміж двума народамі. Пра гэта сведчыла ў 1906 г. газета "Kurier Litewski": "... жывучы сярод беларусаў і ўкраінцаў, ён лічыць іх адзіным народам і называе "рускімі". Праўда, тут жа сцвярджалася і іншае: "Раман Скірмунт лічыць дастаткова моцным беларускі народ і яго імкненне развіваць нацыянальную культуру"[41].

Такая дваістасць назіралася і ў прапанаваных Раманам Скірмунтам варыянтах назвы палітычнай партыі, якую ён намагаўся арганізаваць. У лістападзе 1905 г. яна фігуравала як Краёвая партыя Літвы і Русі (тэрмін "Русь" ужыты тут яўна не ў афіцыйным імперскім сэнсе), а ўжо праз два месяцы як Краёвая партыя Літвы і Белай Русі[42].

Відавочна, гэтая варыятыўнасць адлюстроўвае важны момант эвалюцыі этнічнай

[39] Jurkiewicz J. Rozwój polskiej myśli politycznej na Litwie i Białorusi w latach 1905-1922. Poznań, 1983. S.48.
[40] Bardach J. Polacy litewscy a inne narody Litwy historycznej. Próba analizy systemowej // Belarus. Lithuania. Poland. Ukraine. Lublin-Rome. 1994. S. 364, 366-367, 373-374; Gomółka K. Między Polską a Rosją. Bialoruś w koncepcjach polskich ugrupowań politycznych. 1918-1922. Warszawa, 1994. S. 14; Смалянчук А. "Краёвасць" у беларускай і літоўскай гісторыі // Беларускі гістарычны агляд. Менск, 1997. Т.4. Сш. 1-2 (6-7). С. 20-24.
[41] Цыт. па: Смалянчук А. Раман Скірмунт… С. 7.
[42] Тамсама.

самасвядомасці Рамана Скірмунта: пераадоленне анахранічнай для пачатку XX ст. ідэнтыфікацыі сябе з "русінамі" як нерасчлянёнай беларуска-ўкраінскай супольнасцю і выбар адной з яе складовых частак, якія ператвараліся ў самастойныя нацыі.

Увогуле, паходжанне і этнаграфічныя ўяўленні Рамана Скірмунта дапускалі магчымасць выбару на карысць як беларусаў, так і ўкраінцаў. Нават значна пазней, у 1918 годзе, ён называў пінскіх палешукоў, сярод якіх вырас, нашчадкамі абодвух народаў: "Паводле мовы яны больш украінцы, паводле ўкладу і побыту – беларусы"[43].

Шлях этнічнага самаўсведамлення Рамана Аляксандравіча праходзіў як бы праз некалькі раздарожжаў. І тут паўстае вельмі істотны для характарыстыкі яго асобы і чымсьці фенаменальны факт: замест таго, каб разам з сабратамі па шляхецкім саслоўі аддаць сябе магутнаму польскаму Адраджэнню ці, у крайнім выпадку, прыхіліцца да ўкраінства, багаты пінскі памешчык горнецца ўрэшце да самай няпэўнай, найменш у тых умовах перспектыўнай справы – Адраджэння Беларусі. Не без лёгкага здзіўлення адначаў гэты феномен В.Гадлеўскі: "Чалавек, бясспрэчна, з вялікай духовай культурай, шырокім светапоглядам, Скірмунт належаў у тыя часы да групы тых рэдкіх абшарнікаў Беларусі, для каторых беларускі селянін быў бліжайшы за селяніна, а нават шляхціца з этнаграфічнай Польшчы і каторыя пачуваліся да нейкай і маральнай, і фізічнай сувязі з народам беларускім"[44].

Праўда, палітычны выбар на карысць беларускасці будзе зроблены ім пазней – у 1917-1918 гг. Пакуль жа, на пачатку 20 ст., зрух у гэтым накірунку закрануў толькі адзін, так бы мовіць, "этнічны" пласт яго самасвядомасці і яшчэ не вызначаў аблічча Скірмунта-палітыка. У першае дзесяцігоддзе яго палітычнай дзейнасці на пярэднім плане ўстойліва фігураваў агульнакраёвы патрыятызм, прыярытэт інтарэсаў усяго абшару былога ВКЛ перад інтарэсамі асобных этнасаў і сацыяльных груп.

У 1906 г. землеўладальнікі Менскай губерні выбіраюць Рамана Скірмунта ў першы парламент Расійскай імперыі – Дзяржаўную думу 1-га склікання. Па яго ініцыятыве дэпутаты-"краёўцы" з літоўска-беларускіх губерняў (апрача Скірмунта, сярод іх былі такія вядомыя постаці, як Эдвард Роп, Аляксандр Лядніцкі, Геранім Друцкі-Любецкі, Пётр Масоніўс і інш.) увайшлі не ў Польскае кола, а аб'ядналіся ў т.зв. Групу заходніх ускраін (Кола дэпутатаў Літвы і Русі, Тэрытарыяльнае кола).

Па эканамічных і агульнапалітычных праблемах Група заходніх ускраін часта галасавала разам з кансерватыўна-ліберальным Саюзам 17 кастрычніка ("акцябрысты"), але ў нацыянальным пытанні займала больш левыя пазіцыі, збліжалася з канстытуцыйнымі дэмакратамі (кадэтамі) і нават "трудавікамі"[45]. Разам з прадстаўнікамі іншых народаў і краёў Група ўвайшла ў парламенцкую фракцыю Саюза аўтанамістаў, якая выступала за дэцэнтралізацыю кіравання, аўтаномію краёў, выкарыстанне мясцовых моваў у адукацыі і грамадска-палітычным жыцці, за скасаванне нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў[46]. Дамагаючыся аўтаноміі для "Паўночна-Заходняга краю", памешчыкі-краёўцы, безумоўна, разлічвалі і на тое, што гэта засцеражэ Літву і Беларусь ад кардынальнай ломкі аграрных адносін, чым пагражала расійская рэвалюцыйная "смута".

---

[43] Дзянніца. 7 ліпеня 1918.
[44] Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця… С. 20.
[45] Семенюта П.П. Первая Государственная дума, её жизнь и смерть. Санкт-Петербург, 1907. С. 98.
[46] Представители Государственной думы. 1906 г. 27 апреля – 8 июля. Санкт-Петербург, 1906. С. 135.

Перспектывы ўладкавання зямельнай справы, абмеркаванне якой заняло цэнтральнае месца ў 1-й Думе, натуральна, моцна хвалявалі дэпутата Рамана Скірмунта, уладальніка багатага маёнтка. Таму ён актыўна ўключыўся ў працу думскай аграрнай камісіі, а 16 мая 1906 г. выступіў на пленарным паседжанні з крытыкай кадэцкага праекта зямельнай рэформы. Галоўнай яго заганай дэпутат лічыў дапушчэнне абавязковага адчужэння прыватнаўласніцкай зямлі (за выкуп). Скірмунт расцаніў гэта як замах на прынцып прыватнай уласнасці наогул, што, на яго думку, магло пацягнуць за сабой ланцуговую рэакцыю адчужэння іншай маёмасці, капіталаў і г.д. Гэта азначала “новую эканамічную і сацыяльную авантуру”, тым больш недапушчальную пасля авантурнай вайны Расіі з Японіяй і выкліканай “нядбайствам і грахамі ўрада” рэвалюцыйнай міжусобіцы. Прынцыпова запярэчыў Раман Скірмунт супраць таго, каб адчужаныя землі паступалі ў дзяржаўны зямельны фонд, г.зн., каб імі распараджаліся чыноўнікі. Тут ён убачыў небяспеку поўнага засілля бюракратыі (“Эльдарада для бюракратаў”)[47].

Пры ўсім тым Раман Скірмунт прызнаваў неабходнасць пашырэння сялянскага землеўладання, у тым ліку і за кошт памешчыцкай зямлі, але лічыў магчымым ажыццявіць гэта паступова, шляхам мірнага абнаўлення эканамічных адносін, без нагнятання міжкласавых канфліктаў.

Такімі ж матывамі была прадыктавана і ягоная думская прамова 4 ліпеня 1906 г. супраць прамога звароту дэпутатаў да народа па аграрным пытанні. Дэпутацкая апеляцыя да народа па пытанні, не высветленым да канца ў самой Думе, магла, на яго думку, выклікаць непрадказальны ўсплёск анархіі там, “дзе непадзельна пануе ўлада цемры, дзе нашы няпоўныя, невыразныя меркаванні будуць тлумачыцца ў вясковай глухамані самазванымі, не заўсёды добразычлівымі і добрасумленнымі каментатарамі”. “Дзеля мірнага абнаўлення краіны” ён заклікаў дэпутатаў засяродзіцца на пазітыўнай працы, г.зн. на падрыхтоўцы законаў, якія б закладвалі новы прававы падмурак грамадства[48].

Скіроўваць сацыяльныя працэсы ў прававое рэчышча, дамагацца вяршэнства закона – у гэтым, наколькі можна меркаваць, бачыў Раман Скірмунт адзіны прымальны падыход да вырашэння наспелых праблем, які прадухіляў бы разбуральныя катаклізмы. Таму абачлівы кансерватызм адносна эканамічных пераўладкаванняў спалучаўся ў яго з гатоўнасцю да дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця. У праект праграмы Краёвай партыі Літвы і Беларусі Скірмунт уключыў пункты аб паступовым увядзенні палітычных свабодаў, роўнасці грамадзян перад законам, нацыянальным раўнапраўі, магчымасці атрымліваць адукацыю на роднай мове[49].

У Дзяржаўнай думе буйны памешчык, радавіты дваранін аказваецца сярод дэмакратычнай часткі дэпутатаў, якія выступаюць за законы аб грамадзянскай роўнасці, што азначала, між іншым, адмену саслоўных прывілеяў дваран і абмежаванняў сялян, а таксама іншых форм нераўнапраўя. Яго подпіс стаіць пад 7 дэпутацкімі запытамі ў абарону ахвяр паліцэйска-чыноўніцкага свавольля, у тым ліку супраць утрымання ў менскай турме вядомага сацыял-дэмакрата П.В.Жабы - аднаго з

---

[47] Государственная дума. Стенографические отчеты. 1906 год. Сессия первая. Санкт-Петербург, 1906. Т. 1. С. 409-411.
[48] Государственная дума. Стенографические отчеты. 1906 год. Сессия первая. Т. 2. Санкт-Петербург, 1906. Т. 2. С. 1962-1966.
[49] Смалянчук А. Раман Скірмунт … С.7.

арганізатараў рэвалюцыйных выступленняў у Менску ў 1905 годзе[50].

Але ў той жа час, дэманструючы законапаслухмянасць, Раман Скірмунт не падтрымаў дэпутатаў, што пратэставалі супраць роспуску царом у ліпені 1906 г. Дзяржаўнай думы[51].

Спроба атрымаць у наступным годзе дэпутацкі мандат у II Думу разбілася аб сцяну неразумення і падазронасці, што вырасла вакол Рамана Скірмунта ў асяроддзі шляхты пад уздзеяннем польскіх нацыянальнык дэмакратаў, чый недальнабачны шавінізм ён не саромеўся асуджаць адкрыта і рэзка.

Не ажыццявілася належным чынам і вынашаная ім задума стварэння агульнакраёвай партыі як міжнацыянальнага саюза самастойных партыйных арганізацый – польскай, літоўскай і беларускай. Афармленая ў чэрвені 1907 г. на з'ездзе ў Вільні Краёвая партыя Літвы і Беларусі фактычна стала арганізацыяй польскіх паноў і не знайшла падтрымкі з боку літоўскага ды беларускага рухаў, якія разгортваліся не толькі пад нацыянальнымі, але і сацыяльнымі лозунгамі[52].

Зрэшты, узаемадачыненні Рамана Скірмунта з лідэрамі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў перыяд да 1917 года застаюцца недаследаванымі. Вядома хіба, што газета "Наша Ніва", як неафіцыйны орган Беларускай сацыялістычнай грамады, вельмі непахвальна адгукнулася аб дзейнасці краёўцаў у 1-й Дзяржаўнай думе з-за іх кансерватызму ў аграрным пытанні[53]. Безумоўна, гэтая крытыка найперш адрасавалася Раману Скірмунту. З іншага боку, ёсць інфармацыя аб падтрымцы ім "Нашай Нівы"[54].

Дзесяцігоддзе паміж рэвалюцыямі 1905-1907 гг. і 1917 г. не было спрыяльным для шырокай палітычнай дзейнасці. Паслярэвалюцыйная рэакцыя хоць і змянілася праз некалькі гадоў некаторым змякчэннем рэжыму (што, у прыватнасці, у Беларусі адначылася ў 1911 г. увядзеннем земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Менскай губернях), але затым гэты працэс перапыніла першая сусветная вайна. Аднак і ў такіх умовах Р.Скірмунт імкнуўся максімальна выкарыстаць легальныя магчымасці для ўдзелу ў грамадскім жыцці.

У кастрычніку 1910 г. яго абралі ад Менскай губерні ў Дзяржаўны савет Расіі – верхнюю заканадаўчую палату імперыі. Праўда, праз тры месяцы дэпутат Скірмунт быў вымушаны адмовіцца ад пасады[55]. Ад Пінскага павета ён увайшоў у склад Менскага губернскага земства, дзе, паводле ўспамінаў Эдварда Вайніловіча, падчас дыскусій "сілаю красамоўства і доказаў прыцягваў увагу сходу і часта атрымліваў перамогу"[56].

У жніўні 1914 г. Менскае земства выбрала яго на адказныя пасады ў новую няўрадавую арганізацыю, створаную на пачатку вайны, ва Усерасійскі земскі саюз дапамогі хворым і параненым воінам (УЗС)[57]. У студзені 1917 г. віцэ-старшыня Менскага таварыства сельскай гаспадаркі, таварыш (намеснік) урадавага

[50] Государственная дума. Стенографические отчёты. 1906 год. Сессия первая. Т. 1. С. 378-379, 629-630, 743-744; Т. 2. С. 1572-1577, 1618, 1757-1758, 1801-1802, 1845-1846.
[51] Jurkiewicz J. Rozwój polskiej myśli… S. 57-58.
[52] Смалянчук А. "Краёвасць" … С. 25-26.
[53] Запруднік Я. Справа аўтаноміі Беларусі ў першай Думе і "Наша Ніва" // З гісторыяй на "Вы": Артыкулы, дакументы, успаміны. Мінск, 1994. Вып. 3. С. 326.
[54] Wysłouch S. Białorusini na Ziemi Wileńskiej // Wilno i Ziemia Wileńska. Wilno, 1930. T. 1. S. 251.
[55] НГАБ у Менску, ф. 319, воп. 3, ад.з. 286, арк. 15-16.
[56] Wojniłłowicz E. Wspomnienia… S. 88.
[57] Вестник Минского губернского земства. 1914. № 9. С. 38-39.

ўпаўнаважанага для Менскай губерні па харчаванні Раман Скірмунт уваходзіць яшчэ і ва ўправу Віленскага зямельнага банка[58].

Якраз тады, на трэцім годзе сусветнай вайны, памешчык-краёвец з прабеларускімі настроямі выступае на гістарычную сцэну ў іпастасі ўласна беларускага дзеяча. На пэўны час ён становіцца адной з ключавых постацяў маладой беларускай палітыкі. Кропкай адліку для Рамана Скірмунта з'явілася далучэнне да працы ў адзінай у Менску дазволенай уладамі беларускай арганізацыі – Менскага аддзелу Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны.

Управа таварыства, утворанага вясной 1915 г., засталася ў акупаванай немцамі Вільні, і Менскі аддзел фактычна ператварыўся ў самастойную ўстанову. Афіцыйным накірункам яе дзейнасці была дабрачынная дапамога беларускім бежанцам. Але ў гэтай працы аддзел натрапіў на перашкоду, традыцыйную для беларускіх арганізацый – хранічны недахоп сродкаў. З-за гэтага па аб'ему дабрачыннасці беларускае таварыства саступала аналагічным польскаму, літоўскаму, габрэйскаму і г.д. Аркадзь Смоліч – у той час адзін з актывістаў таварыства – пісаў: "Усе іншыя арганізацыі такога кшталту ствараліся багатымі і ўплывовымі людзьмі. Беларусы ж не мелі ў сваім асяроддзі ні тых, ні іншых, і таму ім не ўдавалася ні атрымаць дапамогі ад ураду, ні сабраць дастаткова ахвяраванняў"[59]. Гэта і прымусіла маладых беларускіх адраджэнцаў запрасіць у сваё кола багатага памешчыка і прадпрымальніка Скірмунта.

На той час яго нацыянальная самасвядомасць ва ўмовах вайны, калі германская акупацыя Літвы і заходняй часткі Беларусі на няпэўны перыяд парушыла цэласнасць "Паўночна-Заходняга краю", набыла, відавочна, яшчэ больш выразную беларускую афарбоўку. У выніку ў студзені 1917 г. Раман Аляксандравіч узначаліў беларускую адраджэнцкую арганізацыю. Ён стаў старшынёй Менскага аддзелу Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Цікава, што ва ўправу поруч з ім уваходзяць будучы прыхільнік нацыянал-бальшавізму ("беспартыйны марксіст") Усевалад Фальскі як намеснік старшыні, У.Голуб (пісьменнік і тэатральны дзеяч Уладзіслаў Галубок) як сакратар арганізацыі і Зоська Верас (Людвіка Сівіцкая) як скарбнік[60].

Роўна праз месяц падзеннем цара Мікалая II пачалася новая расійская рэвалюцыя. Яна прынесла шырокія свабоды, адмену нацыянальных і рэлігійных абмежаванняў, якія закраналі і Рамана Скірмунта як "асобу польскага паходжання", усяляла надзею на пазбаўленне ад уладнага дэспатызму і беззаконня. Усё гэта не магло яму не імпанаваць як чалавеку адукаванаму, носьбіту еўрапейскай культуры. Але як багатага памешчыка, палітыка кансерватыўнага складу, Скірмунта непакоіла (і ён не ўтойваў гэтага), каб у выніку ўвядзення выбарчага права па 4-членнай формуле (усеагульнае, роўнае, прамое пры тайным галасаванні) ды хуткага пашырэння сацыялістычных ідэй не страцілі пазіцый "культурныя элементы" і не былі разбураны традыцыйныя асновы цывілізаванага побыту, сярод якіх найважнейшы для яго – прынцып прыватнай уласнасці, у тым ліку на зямлю[61].

Рэвалюцыйная завіруха неспадзявана выносіць узначаленую Раманам Скірмунтам малапрыкметную арганізацыю ў авангард руху беларусаў за сваё

---

[58] НГА РБ у Менску, ф. 700, воп. 1, ад.з. 128, арк. 85; Минская газета. 26 января 1917; Минский голос. 26 января 1917.
[59] Л.Б. [Смолич А]. Из истории белорусского движения // Белорусская рада. 29 ноября 1917.
[60] Минский голос. 29 января 1917.
[61] Wojniłłowicz E. Wspomnienia... S. 197-198.

нацыянальнае самасцвярджэнне. Знаходзячыся ў Менску, ваенна-палітычным цэнтры той часткі Беларусі, што засталася пад юрысдыкцыяй Расіі, яна натуральнай ходою падзей пераключылася на палітычную працу сярод насельніцтва і абвясціла сябе часовым Беларускім камітэтам. Камітэт пачаў выконваць каардынацыйныя функцыі ў дачыненні да беларускіх нацыянальных сіл, расцярушаных вайною па абшарах імперыі Раманавых[62].

Р.Скірмунт як кіраўнік арганізацыі выявіў на новым полі дзейнасці прыкметную актыўнасць. Адна з першых публічных акцый камітэта – наладжаны 12 сакавіка 1917 г. дзень беларускага значка ў Менску. Як паведамлялі газеты, у гэты дзень на вуліцах горада прадаваліся "значкі нацыянальных колераў Беларусі – чырвонага з белым. Упершыню забытая мова забытай беларускай вёскі дамінавала ўсюды: на вуліцах, у кавярнях, кінематографах"[63].

Цэнтральнай падзеяй акцыі стаў шматлюдны беларускі мітынг пад старшынствам Рамана Скірмунта ў кінатэатры "Гігант". Сярод прамоўцаў, апрача Скірмунта, быў і даўні аднадумец, паважны ўзростам доктар філасофіі Пётр Масоніўс, і 25-гадовы новы паплечнік Павел Аляксюк, і таксама маладыя, радыкальна настроеныя прыхільнікі сацыялістычнай ідэі Аркадзь Смоліч, Лявон Заяц, Фабіян Шантыр.

Нядоўга яны будуць ісці разам з Раманам Скірмунтам. Але пакуль што ўсе яны побач, выступаюць сугучна, хоць і з розным тэмпераментам. "Калі Скірмунт, – успамінаў пазней Макар Краўцоў, – у кожнае слова стараўся ўлажыць праграму, дык Шантыр спяваў гімны рэвалюцыі проста за тое, што яна ўжо сталася, што яна ёсць. Абодва яны былі тады разам, за адным столікам прэзідыуму"[64]. Без пярэчанняў, аднагалосна была прынятая рэзалюцыя мітынгу, якая акрэсліла асноўны праграмны тэзіс беларускіх адраджэнцаў падчас расійскай рэвалюцыі 1917 года – пажаданне краёвай аўтаноміі Беларусі[65].

Спыняючыся на прамоўніцкіх здольнасцях старшыні Беларускага камітэта, прывядзем яшчэ сведчанне Вінцэнта Гадлеўскага. Ён прыгадваў, што выступленні Р.Скірмунта на беларускіх сходах "выдзяляліся і зместам і формай. Яны былі заўсёды высокапатрыятычныя з беларускага пункту гледжання і часам нават проста рэвалюцыйныя, што выклікала ў прысутных буру воплескаў"[66].

Зразумела, не апошняй была роля Рамана Скірмунта пры скліканні Беларускім камітэтам у Менску з'езда нацыянальных арганізацый, які адбыўся 25-27 сакавіка 1917 г. З'езд мусіў стаць своеасаблівым аглядам нацыянальнага руху і арганізацыйна аформіць яго як самастойную палітычную сілу. З-за розных прычын дэлегатаў з'ехалася не вельмі шмат (каля 150 чалавек), але яны рэпрэзентавалі розныя погляды – ад памяркоўных, хрысціянска-дэмакратычных да радыкальных, сацыялістычных. У працы з'езда, які, па сутнасці, упершыню ў гісторыі наважыўся выказацца ад імя беларускай нацыі як асобнай этнасацыяльнай супольнасці, Раман Скірмунт удзельнічаў досыць актыўна. Яго прозвішча фігуруе ў спісах трох камісій з сямі.

На другі дзень з'езда яго выбралі ў прэзідыум і даручылі старшынстваваць.

[62] Падрабязней гл.: Рудовіч С. Утварэнне каардынацыйнага цэнтра беларускага нацыянальнага руху ў Менску (сакавік 1917 г.) // Спадчына. 1996. № 3. С. 21-26.
[63] Минская газета. 13 марта 1917.
[64] Краўцоў М. [Касцевіч М.]. Усебеларускі з'езд 1917 г. // Беларускі звон. 9 верасня 1921; Тое ж // Наша ніва. 20 кастрычніка 1997.
[65] Минский голос. 14 марта 1917.
[66]Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця… С.20.

Гэтым, як патлумачыў пазней Зміцер Жылуновіч, дэлегаты імкнуліся прадухіліць раскол, што намеціўся ў першы дзень працы[67].

З'езд паспяхова дабраўся да фінішу, распрацаваўшы разгорнутую праграму дзеяння. Ён выказаўся за аўтаномію Беларусі ў складзе агульнарасійскай федэрацыі. Ядром беларускай тэрыторыі вызначаліся Менская, Магілёўская, Віцебская, Гарадзенская і Віленская губерні. Было вырашана дамагацца найхутчэйшай рэформы пачатковай і сярэдняй школы, паступовага ўвядзення ў навучанне роднай мовы. Выказвалася пажаданне аб адкрыцці ў Беларусі універсітэта. З вуснаў левых дэлегатаў, якія тут жа, у дні працы з'езда, абвясцілі аб адраджэнні Беларускай сацыялістычнай грамады, гучала таксама радыкальная пастаноўка аграрнага пытання, але гэта не адлюстравалася ў выніковых рэзалюцыях[68].

Для кіравання працай па намечанай праграме з'езд сфармаваў Беларускі нацыянальны камітэт, які на бліжэйшыя месяцы стаў органам палітычнага прадстаўніцтва беларускага руху. Працяглую дыскусію выклікала пытанне пра тое, хто павінен узначаліць БНК. Урэшце пасля вострых спрэчак старшынёй Нацыянальнага камітэта (па сутнасці, лідэрам усяго руху) быў абраны Раман Скірмунт. Яму ж даручылі ўзначаліць і выбраную з'ездам дэлегацыю для перамоваў з Часовым урадам.

Чаму менавіта яму, буйному памешчыку, чалавеку кансерватыўных поглядаў, даверылі рэпрэзентаваць пераважна сялянскую Беларусь у момант, калі яна была ўцягнута ў працэс кардынальнай ломкі традыцыйнага ладу жыцця? Верагодную логіку гэтага выбару перадаў у шматразова цытаваных ужо намі ўспамінах ксёндз В.Гадлеўскі, які сам быў дэлегатам з'езда і ўвайшоў у склад Беларускага нацыянальнага камітэта. "Трэба ведаць, – пісаў ён – што на пачатку расійскай рэвалюцыі ніхто не спадзяваўся, што яна будзе паглыбляцца штораз далей, аж да камунізму. Людзі думалі, што ўрады князя Львова, а потым Керанскага будуць трывалымі, што расійскі лібералізм і дэмакратызм, які дайшоў да ўлады, будзе дэцыдаваць аб будучым дзяржаўным строю Расеі, што кадэты, а потым і эсэры, якія стаялі на чале ўлады, не аддадуць яе нікому. А ў гэтых людзей, асабліва ў кадэтаў, асоба Скірмунта як вядомага палітычнага дзеяча і сябра 1-й Дзяржаўнай думы, мела сваё значэнне"[69].

Выбранню Скірмунта паспрыяла, мабыць, і тое, што ён, паводле сведчання сучаснікаў, дэманстраваў у часы рэвалюцыі большую, чым раней, гнуткасць у дачыненні да сацыяльных праблем[70].

Ва ўзначаленым Раманам Скірмунтам Беларускім нацыянальным камітэце (выбраны ў складзе 18 чалавек), як і на з'ездзе, знайшлося месца для выразнікаў розных грамадска-палітычных поглядаў і арыентацый. Разам з памяркоўнымі Р.Скірмунтам, П.Алексюком (намеснік старшыні), В.Гадлеўскім суседнічалі радыкалы-сацыялісты У.Фальскі (таксама намеснік старшыні), З.Жылуновіч, Ф.Шантыр. З прыхільнікамі "заходняй" арыентацыі В.Іваноўскім, Л.Дубейкаўскім – "усходнікі" Я.Канчар, М.Кахановіч і г.д. Гэта быў кааліцыйны орган, заклікань

[67] Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25-27 марца 1917 г. // Спадчына. 1990. № 4. С. 31; З.Ж. [Жылуновіч З.]. З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25 сакавіка 1917 г. // Полымя. 1925. № 6. С. 205.
[68] Рудовіч С. Утварэнне… С. 28-31.
[69] Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця… С. 21.
[70] Историк Роман Александрович Скирмунт // Чырвоны шлях. 1918. № 1/2. С. 12; З.Ж. [Жылуновіч З.]. З'езд…С. 205.

ўвабраць увесь спектр поглядаў і настрояў, што мелі месца ў тагачасным беларускім грамадстве на ўсход ад лініі расійска-германскага фронту.

Пасада старшыні БНК, паводле назіранняў Зміцера Жылуновіча, “вельмі імпанавала” Раману Скірмунту, “і трэба прызнацца, ён працаваў у ім старанна, хілючы, вядома, умела і здатна сваю буржуазную лінію”[71]. Аднак сітуацыя для яго была не вельмі простай. У адпаведнасці з раскладкай сіл у беларускім руху Р.Скірмунт апынуўся на яго правым флангу, хаця для лідэра больш пажаданым было б цэнтрысцкае становішча. З самага пачатку ён адчуў неабходнасць умацаваць свае пазіцыі. У гэтым заключалася непасрэдная прычына намаганняў Р.Скірмунта далучыць да беларускага руху класава і палітычна блізкіх да сябе абшарнікаў Эдварда Вайніловіча, Геранiма Друцкага-Любецкага, Станіслава Радзівіла і іншых.

На думку Вінцэнта Гадлеўскага, кіраўнік камітэта імкнуўся стварыць падчас рэвалюцыі 1917 г. “беларускую абшарніцкую партыю”[72], што цалкам верагодна. Гэта магла быць новая спроба рэалізаваць сваю даўнюю ідэю аб краёвай палітычнай арганізацыі, цяпер, магчыма, з больш яскравай беларускай афарбоўкай.

Апеляцыя Скірмунта да буйных аграрыяў знайшла пэўны водгук. Яшчэ да сакавіцкага з’езда Э.Вайніловіч і С.Радзівіл поруч з даўняй мецэнаткай беларускага руху Марыяй Магдаленай Радзівіл ахвяравалі на яго патрэбы значныя сродкі[73]. Пасля ўтварэння БНК (якому з’езд надаў права кааптацыі) яны бывалі на яго паседжаннях, і часам стваралася ўражанне, што “буйныя землеўласнікі на Беларусі пачынаюць пазнаваць самі сябе і варочацца да таго народу, з каторага яны выйшлі”[74]. Вядома, дэманструючы час ад часу гатоўнасць пайсці за Р.Скірмунтам па шляху да беларускасці, абшарнікі кіраваліся не толькі сентыментальна-рамантычным “поклічам продкаў”. Разважаючы пазней над гэтай з’явай, газета беларускіх хадэкаў “Krynica” у прамалінейнай форме выказалася так: “… Мусіць, побач са сваім краёвым нахілам і спагаднасцю да беларускай ідэі яны думалі выслужыцца перад беларускім народам, каб ён пакінуў ім маёнткі”[75]. Але, незалежна ад тых ці іншых суб’ектыўных матываў, сімптомы некаторага набліжэння мясцовых аграрыяў-кансерватараў да беларускай ідэі можна разглядаць як праявы аб’ектыўнай гістарычнай тэндэнцыі да збалансавання традыцыйнага ў беларускім руху перакосу ўлева ўмацаваннем яго правага крыла.

Што да самога Скірмунта, то, як дасведчаны палітык, не пазбаўлены, відаць, памкненняў на агульнанацыянальнае лідэрства, ён выяўляў гатоўнасць да ўзаемадзеяння і з іншымі, магчыма, непрымальнымі для яго асабіста, але рэальна існуючымі і ўплывовымі сіламі. Пра гэта сведчыць успамін Лявона Зайца аб тым, як ён 4 сакавіка 1917 г. на паседжанні Беларускага камітэта (тады яшчэ ў абліччы Менскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны) менавіта па настаянні Рамана Скірмунта, “старога палітыка і далёкабачнага буржуя”, быў абраны дэлегат для кантактаў з Менскім Саветам рабочых дэпутатаў. Сувязь гэтая, праўда, была непрацяглай[76]. Пазней, ужо ў ролі старшыні пастаяннага БНК, ён угаворваў не

---

[71] З.Ж. [Жылуновіч З.]. З’езд… С. 205

[72] Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця… С. 22.

[73] Минский голос. 18 марта 1917; М.К. [Коханович М.]. Белорусский съезд в Минске // Могилевский вестник. 19 апреля 1917.

[74] Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця… С. 22. Гл. таксама: З.Б. [Бядуля З.]. Менск у тыя дні: люты 1917 г. // Савецкая Беларусь. 12 сакавіка 1925.

[75] Krynica. 11 studzienia 1925.

[76] Заяц Л. Абмылковы крок (Менскі Савет рабочых дэпутатаў і Беларускі нацыянальны камітэт) // Савецкая Беларусь. 20

выходзіць з камітэта свайго палітычнага антыпода Я.Канчара (народнага сацыяліста, безаглядна арыентаванага на Расію), "таму што пункт гледжання Канчара ў камітэце патрэбны"[77].

Адным з прыкметных крокаў Рамана Скірмунта на пасадзе старшыні БНК стала яго паездка ў красавіку 1917 г. у Петраград на чале беларускай дэлегацыі. Яна вартая ўвагі не столькі з-за яе практычных наступстваў (яны не былі ўнушальнымі), колькі таму, што мела пэўны знакавы сэнс: упершыню (шмат што тады адбывалася упершыню!) у найвышэйшых уладных інстанцыях Расіі было афіцыйна заяўлена пра нацыянальна-палітычныя інтарэсы беларускага народа. На стол міністра-старшыні Часовага ўрада Г.Я. Львова лягла дакладная запіска за подпісам Скірмунта і астатніх сяброў дэлегацыі аб патрэбе для Беларусі аўтаноміі, неабходнасці дэмакратызацыі мясцовага самакіравання і сістэмы адукацыі, кампенсацыі стратаў насельніцтва ад вайны[78].

Беларускія дэлегаты наведалі таксама некаторыя міністэрствы, обер-пракурора Сінода, каталіцкага архіепіскапа, Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Як і можна было чакаць, галоўнае дамаганне дэлегацыі – аб наданні Беларусі аўтаномнага статусу – не знайшло падтрымкі ў Часовым урадзе, дзе галоўную ролю адыгрывалі тады кадэты, перакананыя праціўнікі дзяржаўна-палітычных утварэнняў на нацыянальнай аснове. У высокіх кабінетах адразу ж запыталі: "Якая рэальная сіла стаіць за дэлегацыяй?" Адказ, што "за ёй стаіць вялікая маральная сіла", натуральна, не прыспешыў кадэцкіх палітыкаў пайсці насустрач пажаданням беларусаў. Урад, праўда, згадзіўся наладзіць з БНК пастаянную сувязь, для чаго былі прызначаны адмысловыя ўпаўнаважаныя[79].

Кіраўніцтва БНК само добра ўсведамляла недастатковасць сілаў беларускага руху для таго, каб змусіць расійскія ўлады згадзіцца на нейкую самастойнасць Беларусі. Таму яшчэ па дарозе ў Петраград беларуская дэлегацыя вырашыла ў пошуку саюзніка звярнуцца ў Літоўскі нацыянальны савет, які рэпрэзентаваў у сталіцы Расіі інтарэсы літоўскага насельніцтва краіны. У якасці матываў для гэтага супрацоўніцтва беларусы сцвярджалі: "а) даўнейшую супольную лучнасць у форме дзяржавы – гістарычнай Літвы; в) цяперашнюю адміністрацыйную супольнасць у форме "Северо-Западного края"; с) лучнасць палітычных і эканамічных інтарэсаў Літвы і Беларусі"[80]. Гэтыя пункты – не што іншае, як асноўныя пастулаты ўсё таго ж "краёўства". Ідэю непадзельнасці літоўска-беларускага краю, такім чынам, не толькі заўзята эксплуатавалі беларускія актывісты на акупаванай немцамі тэрыторыі[81], але ўсё яшчэ не скідвалі з рахунку і кіраўнікі беларускага руху на ўсход ад лініі фронту, узначаленыя "краёўцам" Р.Скірмунтам. Аднак, як і ў Вільні, літоўскія палітыкі ў Петраградзе адхілілі прапанову аб узаемадзеянні на "краёвай" платформе, бо гэта супярэчыла іх курсу на пабудову ўласна літоўскай нацыі-дзяржавы.

Гісторыя настойліва скіроўвала на такі шлях і беларускі нацыянальны рух.

---

сакавіка 1927.

[77] Канчер Е. Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов. Москва, 1918. С. 15; То же // Неман. 1993. № 1. С. 147.

[78] Революционное движение в России после свержения самодержавия. Москва, 1957. С. 746-747.

[79] Минская газета. 22 апреля 1917; Вольная Беларусь. 21 ліпеня 1917.

[80] Sławucič W. Bielarusy i litoŭcy ŭ 1917 hodzie // Krynica. 18 studzienia 1925.

[81] Гл.: Рудовіч С. Покліч эпохі. Праблема дзяржаўнасці Беларусі ў рэвалюцыю 1917 г. // Полымя. 1987. № 8. С. 221-222, 230-234.

Прычым разлічваць прыходзілася на ўнутраныя сілы, на падтрымку ўласнага народа. Як цэнтральны орган гэтага руху, кіруемы Скірмунтам БНК прыкладваў пэўныя намаганні дзеля пашырэння сацыяльнай базы, імкнуўся прапагандаваць нацыянальную ідэю сярод насельніцтва.

Былі спробы камітэта арганізаваць пад сваёй эгідай сялянства, завязваліся стасункі з беларусамі-вайскоўцамі. З удзелам БНК у маі 1917 г. было заснавана Таварыства беларускай культуры, на правах секцыі якога працавала Першае таварыства беларускай драмы і камедыі. Гастролі апошняга па Беларусі сталі моцным імпульсам для абуджэння нацыянальнай самасвядомасці. У тым жа месяцы БНК пачаў выдаваць у Менску газету "Вольная Беларусь". У канцы чэрвеня 1917 г. адначасова ў краі і па-за яго межамі камітэтам былі арганізаваны Дні вольнай Беларусі. У рамках гэтай шырокай грамадскай акцыі, прымеркаванай да свята Купалля, паўсюдна распаўсюджваліся лістоўкі БНК, чыталіся лекцыі па гісторыі Беларусі, дэманстравалася нацыянальнае мастацтва. Безумоўна, старшыня БНК Р.Скірмунт, чалавек энергічны, дзелавы і нябедны, меў прамое дачыненне да арганізацыі гэтых і іншых спраў.

Аднак як палітык-кансерватар з набытай яшчэ ў рэвалюцыю 1905-1907 гг. рэпутацыяй цвёрдага прыхільніка памешчыцкага землеўладання, Раман Скірмунт не прыносіў беларускаму руху палітычных дывідэндаў. Рэвалюцыя ўцягвала ў палітыку шырокія сацыяльныя нізы, у тым ліку сялян, што прагнулі зямлі і пад уплывам сацыялістычнай прапаганды ўсё больш радыкалізаваліся. Для іх асоба Скірмунта не магла быць прыцягальнай. Узнікшую калізію імгненна скарысталі шматлікія вялікадзяржаўніцкія сілы, апантаныя праціўнікі беларускага самавызначэння: чыноўніцкая бюракратыя, службоўцы розных установаў па абслугоўванні фронту, якіх безліч наплыло ў край у часе вайны, функцыянеры агульнарасійскіх партый ды розныя дамарослыя групоўкі, што стаялі на пазіцыях "заходнерусізму". З іх боку постаць Скірмунта стала аб'ектам палітычных спекуляцый. Яе стараліся ператварыць у пудзіла для нацыянальна дэзарыентаванага беларускага селяніна ды гарадскога абывацеля, каб выпрацаваць у іх трывалы імунітэт супраць самой беларускай ідэі[82]. Гэты "накат", у прыватнасці, прычыніўся да таго, што сялянскія з'езды, праведзеныя ў беларускіх губернях вясной – летам 1917 г., адхілілі прапановы БНК адносна будучага статусу Беларусі.

Недастатковая выніковасць працы Беларускага нацыянальнага камітэта, няўдачы спробаў аб'яднаць вакол ідэі аўтаноміі Беларусі ўплывовыя палітычныя сілы краю выклікалі незадаволенасць у беларускіх арганізацыях на месцах, якія звычайна арыентаваліся на Беларускую сацыялістычную грамаду. Узмоцнілася антыскірмунтаўская апазіцыя з боку грамадоўцаў і ў самім БНК. Факт знаходжання на чале камітэта дзеяча з такім рэнамэ, як у Скірмунта, станавіўся ў тых умовах адной з перашкод для ператварэння беларускага руху ў сур'ёзную палітычную велічыню. Нельга тут не пагадзіцца з трапнай заўвагай Арсеня Ліса: "Як на прадстаўнічую дэлегацыю ў Петраград да Часавога ўрада з беларускімі патрабаваннямі, то былы член Думы, імпазантны Скірмунт, пэўна, падыходзіў. Але штосьці іншае было - дзейна весці беларускую работу ў свеце, які імкліва радыкалізаваўся, ды ўнутры БНК, у асяроддзі

---

[82] Л.Б. [Смолич А.]. Из истории белорусского...; Цвикевич А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. Киев, 1918. С. 7–8; Краўцоў М. [Касцевіч М.]. Усебеларускі...; Жылуновіч З. Уступалі да Акцябра // Полымя.1923..№ 7/8. С.86-87.

маладых сацыялістаў”[83].

Беларуская сацыялістычная грамада настаяла на правядзенні ў ліпені 1917 г. у Менску новага з’езда нацыянальных арганізацый. Яго рашэннем БНК быў скасаваны. Разам з гэтым страціў сваю пасаду ў беларускім руху і Р.Скірмунт. У адпаведнасці з дамінуючымі ў грамадстве настроямі было абвешчана, што новы каардынацыйны орган руху – Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый – грунтуецца на прынцыпах “поўнага дэмакратызму”, перадачы ўсёй зямлі без выкупу працоўнаму народу і абароны інтарэсаў рабочых[84].

З лета 1917 да лютага 1918 г. постаць Рамана Скірмунта знікае з бачнага далягляду беларускага Адраджэння. Тым часам за гэтыя паўгода беларускі рух зрабіў істотныя крокі наперад. Прыкметна пашырыліся шэрагі яго ўдзельнікаў, удасканальваліся арганізацыйныя формы. Рэй у гэтых справах вялі беларускія сацыялісты. Яны ж дамінавалі і на Усебеларускім з’ездзе ў снежні 1917 г., першым у гісторыі агульнанацыянальным форуме беларусаў, рашэнні якога сталі прававым грунтам для абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і ад якога вялі радавод яе вярхоўныя органы. Несумненна, былы старшыня БНК працягваў трымаць руку на пульсе беларускага нацыянальнага жыцця, але непасрэднага ўдзелу ў ім на гэтым этапе вядомыя нам крыніцы не фіксуюць.

Тым не менш, кіпучая натура неўтаймоўнага памешчыка з-пад Пінска не ведала спакою. Да ранейшых яго абавязкаў у розных грамадскіх ды гаспадарчых арганізацыях далучаюцца новыя. З канца сакавіка 1917 г. ён займае клопатную пасаду загадчыка аддзела па забеспячэнні ў новаўтвораным Менскім губернскім харчовым камітэце[85]. У жніўні ўрад Аляксандра Керанскага запрашае яго як былога дэпутата Думы ў Маскву на Дзяржаўную нараду, скліканую дзеля пошуку выхаду краіны з крызісу[86]. Восенню ён балатуецца ў дэпутаты Усерасійскага Устаноўчага сходу, узначальвае кандыдацкі спіс Саюза зямельных уласнікаў Менскай губерні[87]. Тады ж, у кастрычніку 1917 г., літаральна за тыдзень да бальшавіцкага паўстання, Раман Скірмунт ад’язджае ў Петраград для ўдзелу ў паседжаннях Часовага савета Расійскай рэспублікі (Перадпарламента), куды яго дэлегавала Менскае таварыства сельскай гаспадаркі[88].

Падобна, што ў тыя “векапомныя дні” беларускі абшарнік, будучы прэм’ер-міністр БНР, апынуўся якраз у эпіцэнтры “галоўнай падзеі 20 стагоддзя”. Мы не маем дакументальных звестак аб рэакцыі Рамана Скірмунта на захоп улады бальшавікамі ды іх ашаламляльную палітыку. Але нескладана ўявіць, якім магло быць стаўленне буйнога аграрыя, прадпрымальніка, нацыянальна арыентаванага памяркоўнага палітыка да звышрызыкоўных эканамічных эксперыментаў, накшталт сацыялізацыі зямлі, адзяржаўлення банкаў, да бальшавіцкага гвалту над палітычнымі апанентамі, разгону нацыянальных з’ездаў і арганізацый і г.д.

Параліч прамысловасці і гандлю, хаос на транспарце, небывалае абвастрэнне харчовай праблемы ў гарадах… Ад усяго гэтага цярпелі не адны памешчыкі і

[83] Ліс А. Цяжкая дарога свабоды // Полымя. 1994. № 2. С. 201.
[84] Турук Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов. Москва, 1921. Прилож. 10. С. 88.
[85] Новое Варшавское утро. 25 и 28 марта 1917.
[86] Вестник Минского губернского комиссариата. 6 и 9 августа 1917.
[87] Тамсама. 18 октября.
[88] Минская жизнь. 21 октября 1917.

буржуазія. Таму не толькі яны, але і значная частка шэрагоівага жыхарства, заморанага бальшавіцкім валюнтарызмам, з палёгкай уздыхнула, калі ў лютым 1918 г. камісары з Аблвыкамзаху і СНК Заходняй вобласці і фронту пакінулі Менск, уцякаючы ад наступаючых немцаў. З'яўленне ў горадзе праз некалькі дзён педантычных кайзераўскіх генералаў і афіцэраў на чале дысцыплінаваных яшчэ, малайцаватага выгляду нямецкіх салдат хоць і не выклікала, натуральна, асаблівай радасці, але многімі было ўспрынята як знак таго, што настане хоць нейкі парадак.

Сярод "айцоў горада", якія прыбылі 21 лютага 1918 года на Віленскі вакзал Менска для перамоваў з камандаваннем першага германскага эшалона, быў таксама Раман Скірмунт. Ен звярнуўся да нямецкіх афіцэраў на іхняй мове і атрымаў у адказ запэўніванні, што германскія войскі не маюць зламысных намераў адносна цывільнага насельніцтва[89]. Істотны для палітычнага партрэта Рамана Скірмунта штрых: калі газеты распаўсюдзілі звесткі, быццам ён сустракаў немцаў як паляк, ён рашуча гэта абверг і заявіў, што быў у складзе дэлегацыі менскіх грамадскіх дзеячаў "як прадстаўнік беларусаў"[90].

Кантакты Р.Скірмунта ў 1918 годзе з акупацыйнымі нямецкімі ўладамі – факт, які немагчыма абмінуць. Як да яго паставіцца? Носьбіты масавай расійска-савецкай ментальнасці адназначна ўбачаць у ім недаравальны крымінал, нешта накшталт "здрады Радзіме". Справа, аднак, у тым, што дзяржава, якая ўвязалася ў 1914 годзе ў самазабойчую вайну з немцамі, запаланіўшую і беларускую зямлю, – імперыя Раманавых – не з'яўлялася для Р.Скірмунта Радзімай у поўным сэнсе гэтага слова. Яна таксама была заваёўнікам, "заборцам" яго гістарычнай радзімы Вялікага Княства Літоўскага. Тым больш не магла стаць для яго Радзімай імперыя бальшавікоў, якіх ён не выбіраў і якім не прысягаў, але якія пачалі бязлітасна разбураць вякамі асвечаны парадак у яго родным краі.

Гісторыя павярнулася так, што адзінай перашкодай, якая ўзнікла на шляху татальнага разбурэння, сталіся акупацыйныя войскі Германскай імперыі. Вядома, яны прыйшлі сюды не з цывілізатарскай місіяй. Галоўнае для іх – выпампаваць як мага больш прыродных і гаспадарчых рэсурсаў краю дзеля патрэб германскай эканомікі і арміі. Менавіта з гэтай мэтай прускія юнкеры і заможныя бюргеры ў генеральскіх і афіцэрскіх мундзірах аднаўляюць адзіны прымальны для іх, выпрабаваны часам стары лад жыцця. Але тым самым яны ліквідуюць катастрафічныя наступствы рэвалюцыйных катаклізмаў. Таму, лічыць Р.Скірмунт, трэба цярпліва вытрымаць цяжар акупацыі (гэтае непазбежнае ліха кожнай вайны), па магчымасці раўнамерна размеркаваўшы яго ў кантакце з акупацыйнымі ўладамі паміж усімі класамі народа[91].

Да таго ж гаспадаранне германскіх вайскоўцаў не абяцае быць доўгім. У змаганні з Антантай ваеннае шчасце яўна адвярнулася ад кайзера Вільгельма ІІ. Ягоная імперыя наўрад ці здолее ўтрымаць за сабой занятыя тэрыторыі, у тым ліку ва Усходняй Еўропе. Але пасля сябе, натуральна, немцы пастараюцца пакінуць у гэтым рэгіёне такую геапалітычную сістэму, якая максімальна адпавядала б іх стратэгічным інтарэсам. Яны, па ўсім бачна, імкнуцца стварыць тут пад сваім пратэктаратам пояс адносна невялікіх маладых краін, якія сталі бы буферам паміж Польшчай і Расіяй, у патэнцыяле вядучымі дзяржавамі славянскага свету, спрадвечнага антаганіста

---

[89] Утренняя Минская газета. 9 (22) февраля 1918.
[90] Минский голос. 22 февраля (7 марта)1918; Беларускі шлях. 8 сакавіка 1918.
[91] Дзянніца. 4 жніўня 1918.

тэўтонаў. Германія ўжо прызнала незалежнасць Украінскай Народнай Рэспублікі (студзень 1918 г.), да гэтага ж ідзе справа і ў Літве. Паміж імі выступае ў выглядзе кліна Беларусь, і Раман Скірмунт быў перакананы, што немцы не дапусцяць, каб яна заставалася часткай Расіі[92].

Ёсць усе падставы спадзявацца на падтрымку Германіяй дзяржаватворчых намаганняў Беларусі. Трэба выкарыстаць гэты гістарычны шанс, бо без спрыяння хаця б адной вялікай дзяржавы ніякая нацыя не можа цвёрда стаць на самастойны шлях. Але сітуацыя ўскладнялася тым, што ініцыятыва будавання беларускай дзяржаўнасці была перахоплена сацыялістамі, значная частка якіх да таго ж мела прарасійскія настроі. Таму выведзеная імі з падполля Рада Усебеларускага з'езда ды спешна арганізаваны Народны сакратарыят Беларусі на чале з грамадоўцам Язэпам Варонкам наўрад ці дамогуцца належнага ўзроўню адносін з германскімі ўладнымі інстанцыямі, дзе вяршэнствуюць кансерватары і лібералы. "Партыйны склад [беларускіх органаў], на якім да гэтых часоў засноўваліся, зусім не адпавядае ні моманту, ні становішчу", - заяўляе Раман Скірмунт[93]. Тэрмінова патрабуецца іншы цэнтр нацыянальнага прадстаўніцтва, які рэальна стаў бы ў новых умовах зародкам беларускай дзяржаўнасці.

Такая прыкладна логіка праглядаецца ў дзеяннях Р.Скірмунта з першых дзён нямецкай акупацыі 1918 года. Ужо 25 лютага з мэтай "прадстаўляць інтарэсы беларускага народа і быць нацыянальным цэнтрам" у Менску паўстае ўзначаленая ім новая арганізацыя – Беларускае народнае прадстаўніцтва (Менскае беларускае прадстаўніцтва). Апрача Р.Скірмунта (старшыня) у кіруючае ядро арганізацыі ўвайшлі А.Уласаў (віцэ-старшыня), П.Аляксюк (сябар прэзідыуму), генерал К.Кандратовіч, протаіерэй Кульчыцкі, ксёндз В.Гадлеўскі, В.Чавусаў, Р.Зямкевіч, Э.Русецкі[94].

Гэтыя людзі ўвасаблялі тыя струмені беларускай палітычнай думкі, што былі рэпрэзентаваны ў 1917 г. у Беларускім Нацыянальным Камітэце, але зараз не мелі прадстаўніцтва ў Выканаўчым камітэце Рады Усебеларускага з'езда. Друкаваным органам новай арганізацыі стала газета "Беларускі шлях", якую з другога нумара рэдагаваў Аляксандр Прушынскі (Алесь Гарун).

Сваёй галоўнай мэтай Беларускае народнае прадстаўніцтва абвясціла "адбудаванне беларускай дзяржаўнасці ў граніцах рассялення беларускага племені"[95]. "Беларускі шлях" пісаў пра патрэбу незалежнасці Беларусі "на грунце непадзельнасці беларускага народу ў яго этнаграфічных рубяжох"[96]. Гэта была ідэя беларускай нацыі-дзяржавы, заснаваная на этнічным прынцыпе. Але зноў з ёй мудрагеліста спалучаўся стары "краёвы" праект рэанімацыі гістарычнай Літвы як поліэтнічнага дзяржаўнага ўтварэння. Другім пунктам праграмнай адозвы Прадстаўніцтва значылася: "Урэгуляванне беларуска-літоўскіх дзяржаўна-народных адносін на аснове супольнага будаўніцтва і звязку з Курляндыяй дзеля аднаўлення старых гандлёвых шляхоў да мора"[97] (падкрэслена мною. - *С.Р.*)

*У* адной з перадавіц "Беларускага шляху" адназначна гаварылася, што

---

[92] Дзянніца. 7 ліпеня 1918; Известия ВЦИК. 19 июля 1918.
[93] Беларускі шлях. 29 мая 1918.
[94] Тамсама. 8 сакавіка, 6 красавіка 1918.
[95] Тамсама. 26 сакавіка.
[96] Беларускі шлях. 8 сакавіка 1918.
[97] Тамсама. 26 сакавіка.

Прадстаўніцтва "стала за саюз з Літвой і Курляндыяй, адраджэнне старой Беларуска-Літоўскай дзяржаўнасці з тарговымі натуральнымі дарогамі да Балтыкі праз Лібаву, Рыгу і Нёман"[98]. (Падкрэслена мною. – *С.Р.*). Такім чынам, наступным крокам пасля дасягнення незалежнасці Беларусі Р.Скірмунт і яго паплечнікі лічылі яе ўваходжанне ў больш шырокае дзяржаўна-палітычнае аб'яднанне з суседзямі ў рамках былога ВКЛ. Гэта, аднак, не перашкаджала кіраўнікам Беларускага народнага прадстаўніцтва пратэставаць супраць прэтэнзій палякаў і літоўцаў на часткі Віленшчыны і Гарадзеншчыны, а ўкраінцаў – на паўднёвыя паветы Беларусі[99].

У першыя месяцы створаная Скірмунтам арганізацыя знаходзілася ў рэзкай апазіцыі да Рады і Народнага сакратарыята Беларускай Народнай Рэспублікі, якія яна лічыла вузкапартыйнымі (грамадоўскімі) органамі. 28 сакавіка 1918 г., г.зн. праз тры дні пасля абвяшчэння Радай незалежнасці БНР, Менскае прадстаўніцтва прыняло рашэнне склікаць у канцы красавіка канферэнцыю беларускіх арганізацый, якія падзяляюць яго погляды. На ёй меркавалася разгледзець пытанні нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі (дакладчык Р.Скірмунт), арганізацыі асветы (В.Гадлеўскі), эканамічнага адбудавання краю (А.Уласаў) і стварэння шырокага нацыянальнага прадстаўніцтва (П.Аляксюк)[100].

Каменціруючы апошні пункт, "Беларускі шлях" растлумачыў, што гаворка пакуль не ідзе пра ўладу, бо рэальная ўлада, давала зразумець газета, ва ўмовах акупацыі немагчымая. Яе не мае ніводная беларуская арганізацыя. На думку публіцыста "Беларускага шляху", галоўная задача моманту – не ганяцца за ўладай, як гэта робіць Рада і Народны сакратарыят, а весці "арганічную працу" над згуртаваннем народу, збіраць разрозненыя нацыянальныя сілы для стварэння "моцнага, адналітнага па духу і аўтарытэтнага **нацыянальнага прадстаўніцтва**"[101] (выдзелена у арыгінале. – *С.Р.*).

Паміж Беларускім народным прадстаўніцтвам і вярхоўнымі органамі БНР, кіруемымі грамадоўцамі, нарастала канфрантацыя, якая пагражала поўным расколам у стане і без таго нешматлікіх беларускіх сіл. Сярод іншага да гэтага, безумоўна, спрычыніўся прадэклараваны Радай БНР у Другой Устаўной грамаце (9.03.1918 г.) услед за бальшавікамі намер скасаваць прыватную ўласнасць на зямлю, з чым Р.Скірмунт прынцыпова не мог пагадзіцца.

Але трэба аддаць належнае пэўнай гнуткасці гэтага палітыка-кансерватара. Падчас перамоў з дэлегацыяй Віленскай Беларускай рады на чале з братамі Іванам ды Антонам Луцкевічамі ён здолеў успрыняць іх довады, што Менскае прадстаўніцтва "павінна не канкураваць аб уплыве на немцаў з Радай Рэспублікі, а павінна ўліцца ў склад апошняе і, нягледзячы на розніцу ў сацыяльных поглядах, у гэты выключны момант будаваць Бацькаўшчыну супольна з сацыялістамі, паклаўшымі першы камень пад гэту будоўлю"[102].

Усе ўрэшце рэшт сышліся на тым, што ствараць аўтарытэтны нацыянальны цэнтр трэба не шляхам фармавання паралельных структур, а выкарыстаннем для гэтага ўжо існуючых. У выніку 12 красавіка 1918 г. усё кіраўнічае ядро Беларускага народнага

[98] Тры цэнтры // Беларускі шлях. 11 красавіка 1918.
[99] Вольная Беларусь. 24 сакавіка 1918.
[100] Беларускі шлях. 30 сакавіка, 6 красавіка 1918.
[101] Тры цэнтры// Беларускі шлях. 11 красавіка 1918.
[102] Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў (1903–1928). Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацыяў. Мінск., 1991. С. 51.

прадстаўніцтва (10 чалавек) было кааптавана ў склад Рады БНР, заняўшы там месцы земскай групы, якая пакінула Раду ў знак нязгоды з актам 25 сакавіка[103]. Пытанне аб скліканні скірмунтаўскай арганізацыяй асобнай канферанцыі само па сабе адпала.

Выказваючы пазіцыю фракцыі Менскага прадстаўніцтва, вызначаную, несумненна, найперш самім Раманам Скірмунтам, "Беларускі шлях" пісаў, што перад Радай БНР ляжыць задача "мудрай нацыянальнай палітыкай злучыць усю Беларусь у адну Беларускую дзяржаву". Для гэтага трэба мабілізаваць і стройна арганізаваць усе сілы. "Словы не так будуць патрэбныя, як арганічная праца, безабмылковая тактыка і палітычная вытрыманасць"[104].

Акцэнтаванне ўвагі на канкрэтных справах ("арганічная праца") замест гучных дэкларацый, напэўна, рабілі ўражанне на паседжаннях Рады БНР. Так ці інакш, але ўплыў Рамана Скірмунта прыкметна ўзрастаў. Менавіта па яго ініцыятыве (калі верыць В.Гадлеўскаму) 25 красавіка 1918 г. была прынята вядомая тэлеграма кайзеру Вільгельму II, у якой Рада выказвала падзяку за вызваленне краю ад чужога ўціску і анархіі ды прасіла падтрымкі ў справе ўмацавання цэльнай і непадзельнай Беларусі ў звязку з Германскай імперыяй[105].

Гэты непапулярны дыпламатычны крок з'яўляўся відавочнай спробай паставіць беларускую справу на больш шырокі міжнародны грунт. Ажыццявілася яна ў форме, якую дазваляла тагачасная канкрэтна-гістарычная сітуацыя. "Злашчасная", паводле вызначэння Тамаша Грыба, тэлеграма выклікала раскол Беларускай сацыялістычнай грамады і чарговы крызіс у Радзе БНР. Адтуль у знак пратэсту выйшла гарадская група і прадстаўнікі габрэйскіх сацыялістычных партый[106]. У выніку Рада некалькі "паправела", што яшчэ больш умацавала пазіцыі Р.Скірмунта.

Ягонаму вылучэнню на першы план спрыяла таксама ацэнка кіраўнікамі БНР знешнепалітычнай кан'юктуры. Пасля прызнання незалежнасці Украіны Германія ў сакавіку 1918 г. зрабіла аналагічную заяву адносна Літвы. Час ад часу з боку прадстаўнікоў германскіх вайсковых колаў паступалі абнадзейлівыя сігналы і наконт Беларусі[107]. Аднак да афіцыйнага прызнання беларускай дзяржаўнасці справа ўсё не даходзіла.

Гэта можна было расцэньваць як адзнаку непрымальнасці для немцаў сацыялістычнага паводле партыйнай афарбоўкі Народнага сакратарыяту Беларусі. Такое меркаванне, здавалася, красамоўна пацвярджалі весткі з Украіны, дзе ў канцы красавіка сацыялістычная Цэнтральная Рада і сфармаваны ёю Генеральны сакратарыят не без удзелу немцаў былі звергнуты, і ўсталяваўся кансерватыўна-аўтарытарны рэжым гетмана П.Скарападскага. Відавочна, каб апярэдзіць падобнае развіццё падзей у Беларусі, Рада БНР сама ажыццяўляе захады па аслабленні пазіцый левых і рэарганізацыі Народнага сакратарыяту "ў сэнсе цэнтралізацыі ўлады ў руках адной асобы, якая будзе прынята немцамі як пажаданая"[108].

У выніку 14 мая 1918 г. Народны сакратарыят Беларусі на чале з Язэпам

---

[103] НА РБ, ф. 325, воп. 1, ад.з. 21, арк. 119; Вольная Беларусь. 21 красавіка 1918.; К.Е. [Канчер Е.]. Белорусская Народная Республика // Чырвоны шлях. 1918. № 1/2. С. 10-11.
[104] Беларускі шлях. 16 красавіка 1918.
[105] Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця… С. 34, 35; Турук Ф. Белорусское… Прилож. 25. С. 124.
[106] Грыб Т. Змаганне за незалежнасць Беларусі // НА РБ, ф. 458, воп. 1, ад.з. 22, арк. 7.
[107] Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мінск, 1993. С. 22-23; Беларускі шлях. 7 красавіка 1918.
[108] НА РБ, ф. 325, воп. 1, ад.з. 19, арк. 205; Минский голос. 29 апреля (12 мая) 1918; Р. Об ориентации // Чырвоны шлях. 1918. № 1/2. С. 3.

Варонкам заяўляе аб сваёй адстаўцы, а фармаванне новага кабінета Рада даручае Раману Скірмунту[109]. У "беларускай кар'еры" палітыка, які за тыдзень да гэтага пераступіў 50-гадовы рубеж свайго ўзросту, настала кульмінацыйная стадыя.

Пачаў яе Р.Скірмунт дыпламатычна і шляхетна. На словы Я.Варонкі: "Судзіце нас за памылкі нашы ... ", – ён, пакінуўшы ўбаку свае непаразуменні з сацыялістамі, пранікнёна адказаў: "Суд над вамі – гэта суд над намі ўсімі; нас будуць судзіць гісторыкі. Не судзіць, а дзякаваць мы павінны вам, першым носьбітам і ўвасабляльнікам ідэі незалежнасці Беларусі"[110].

Гэта была не проста даніна ветлівасці. Новы (другі па ліку) прэм'ер-міністр БНР прыступіў да фармавання ўрада з перакананнем, што кабінет павінен быць кааліцыйным. Ён спадзяваўся аб'яднаць у супольнай працы разам са сваімі аднадумцамі (генералам К. Кандратовічам, менскім гарадскім галавой С.Хржанстоўскім і іншымі) і выхадцаў з БСГ – таго ж Я.Варонку (якому прапанаваў пасаду свайго намесніка), Я.Лёсіка, А.Аўсяніка[111]. Але ідэя кааліцыі аказалася неажыццявімай. Левыя, не адхіляючы магчымасці супрацоўніцтва ў прынцыпе, адмовіліся ўвайсці ва ўрад Р.Скірмунта[112].

Па гэтай прычыне фарміраванне новага складу Народнага сакратарыяту Беларусі затрымалася (яго функцыі працягваў выконваць кабінет Я.Варонкі), а сам Раман Скірмунт у канцы мая ў якасці надзвычайнага прадстаўніка БНР накіраваўся на Украіну. Звесткі пра гэтую паездку ў даступных нам крыніцах вельмі фрагментарныя. З іх можна, аднак, зразумець, што поруч з наладжваннем "правільных і прыязных" беларуска-украінскіх адносін Р.Скірмунт імкнуўся заручыцца падтрымкай гетманскага ўрада Украіны ў справе прызнання незалежнасці Беларусі Германіяй[113]. У Кіеве адбыліся таксама сустрэчы з "баявымі прафесарскімі беларускімі сіламі", якія запэўнілі Р.Скірмунта, што гатовы пераехаць на радзіму дзеля працы на ніве беларускай адукацыі і культуры[114].

Пасля вяртання ў канцы чэрвеня ў Менск Раман Скірмунт прадоўжыў кансультацыі аб фармаванні кабінета. На гэты раз у аснову быў пакладзены "дзелавы прынцып" – персанальнае запрашэнне дзеячаў, дасведчаных і ўплывовых у пэўных галінах дзяржаўнага жыцця і эканомікі. Але і пры такім падыходзе новапрызначаны прэм'ер–міністр сутыкнуўся з вялікімі цяжкасцямі.

Прычыну іх раскрыў у сваіх даволі цікавых развагах Я.Канчар. Будучы паводле перакананняў поўнай процілегласцю палітыку-кансерватару, ён тым не менш лічыў, што ў справе беларускага дзяржаўнага будаўніцтва Р.Скірмунт мог быць вельмі карысным "як вялікі знаток і практык, як чалавек вялікага розуму і як беларус". Але драма гэтага дзеяча заключаецца ў тым, што яму няма на каго абаперціся: выхадцы з сацыяльных нізоў за ім не ідуць, а сярод маёмасных класаў няма арганізаваных ці хаця б асобных яркіх элементаў, якія ўсведамлялі б сябе беларусамі[115].

Новы склад Народнага сакратарыяту Беларусі, які нарэшце ўдалося скамплектаваць, выглядаў наступным чынам: Р.А.Скірмунт – старшыня Сакратарыяту

[109] Беларускі шлях. 17 мая 1918.
[110] НА РБ, ф. 325, воп. 1, ад.з. 1, арк. 156.
[111] Тамсама, ад.з. 19, арк. 202 адв.; Беларускі шлях. 17 мая 1918; Минский голос. 26 мая 1918.
[112] НА РБ, ф. 325, воп. 1, ад.з.. 21, арк. 163.
[113] Тамсама, ад.з. 8, арк. 50; ад.з. 19, арк. 235; Известия ВЦИК. 8 июля 1918.
[114] Дзянніца. 9 жніўня 1918.
[115] Канчер Е. Мысли // Чырвоны шлях. 1918. № 1/2. С.8.

і сакратар міжнародных спраў, К.А.Кандратовіч – сакратар унутраных спраў, С.Б.Хржанстоўскі – сакратар фінансаў, Р.К.Астроўскі – сакратар асветы, П.П.Аляксюк – загадчык справамі[116].

9 ліпеня 1918 г. Раман Скірмунт выступіў на сесіі Рады БНР з праграмнай дэкларацыяй свайго кабінета. Яна зыходзіла з цвярозай ацэнкі становішча. Пакуль гаворка магла ісці пра ўрад "ідэальнай Беларускай дзяржавы, каторую трэба давесці мудрай працай да рэальнай формы". Абвешчаная незалежнасць не мела пакуль пад сабой трывалага палітычнага і эканамічнага грунту. Яго яшчэ неабходна было стварыць[117].

Дзеля гэтага ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва праграма Скірмунта найважнейшай задачай вызначала пераўтварэнне Народнага сакратарыята Беларусі ў сапраўдны цэнтр улады, які павінен кіраваць усімі існуючымі ў краі дзяржаўнымі ўстановамі, ажыццяўляць кантроль над органамі мясцовага самакіравання.

У эканамічным раздзеле прызнавалася неабходнасць аграрнай рэформы, але новы кабінет меўся праводзіць яе паводле "рацыянальнай здаровай заходнееўрапейскай тэорыі", пазбягаючы "ўсялякіх навыварат-радыкальных мераў". Р.Скірмунт згаджаўся з тым, што "трэба даць магчымасць сельскаму насельніцтву пашырыць грунты малазямельных уласнікаў за рахунак буйных землеўласнікаў". Ён жа папярэджваў: "Культурныя гаспадаркі не павінны руйнавацца і за зямлю павінна быць заплочана па справядлівай ацэнцы".

Прыкладам разумнага ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў ен называў Ірландыю, дзе на пачатку стагоддзя зямельная рэформа "здаволіла землеробаў і не пакрыўдзіла землеўласнікаў"[118]. У Беларусі такі падыход ён лічыў магчымым рэалізаваць шляхам "добраахвотнага выкупу, а дзе трэба – і прымусовага адчужэння" зямлі ў буйных уласнікаў і набыцця яе сялянамі праз спецыяльна створаны для гэтага зямельны парцэляцыйны банк. Асновай эканамічных адносін у сельскай гаспадарцы заставалася прыватная ўласнасць на зямлю.

Шэраг мер быў накіраваны на развіццё асветы і культуры: вяртанне ў Беларусь эвакуіраваных навучальных устаноў, адкрыццё ў Менску Беларускага універсітэта, дзяржаўная падтрымка выдавецтваў, тэатраў і г.д. Дзяржаўнай мовай павінна была стаць беларуская, але ўводзіць яе належала паступова, "бо, як паказала практыка, прымусовым распараджэннем адразу дасягнуць гэтага немагчыма". Гербам Беларускай дзяржавы прызнавалася "Пагоня"[119].

Найважнейшай умовай выканання новай урадавай праграмы было міжнароднае прызнанне Беларусі. Узначалены Раманам Скірмунтам Народны сакратарыят імкнуўся "да поўнай самастойнасці" Беларускай дзяржавы. У перспектыве, аднак, не выключалася ўступленне Беларусі ў саюзніцкія адносіны з суседзямі, але "толькі як вольная з вольным і роўная з роўным". Такі падыход пакідаў прастору для самых розных камбінацый, у тым ліку, безумоўна, і на фундаменце гістарычнай традыцыі беларуска-літоўскай дзяржаўнасці.

Знешнепалітычнай задачай нумар адзін для кабінета Скірмунта было "правільнае" тэрытарыяльнае размежаванне з Літвой, Польшчай, Украінай і Расіяй.

[116] НА РБ, ф. 325, воп. 1, адз. 8, арк. 82; Беларускі шлях 13 ліпеня 1918.
[117] Беларускі шлях. 20 красавіка, 13 і 19 мая 1918.
[118] Тамсама. 29 мая 1918.
[119] НА РБ, ф. 325, воп. 1, адз. 10, арк. 77-77адв.; Беларускі шлях. 10 і 11 ліпеня 1918.; Дзянніца. 4 і 9 жніўня 1918.

Іншымі словамі, гаворка ішла пра ўз'яднанне беларускай этнічнай тэрыторыі, падзеленай германа-савецкім Берасцейскім дагаворам на некалькі частак. Без аднаўлення тэрытарыяльнай цэласнасці, што на практыцы азначала перагляд адпаведных умоў Берасцейскага міру, само існаванне Беларусі як дзяржаўнай адзінкі было немагчымае.

У канчатковым выніку перспектывы міжнароднага прызнання Беларусі аказваліся цалкам залежнымі ад пазіцый Расіі і Германіі. Дамовіцца з Расіяй у бліжэйшы час Р.Скірмунт лічыў нерэальным, "ды і няма з кім там зараз весці перагаворы". Таму галоўная стаўка рабілася на "зацікаўленнасць Германіі ў стварэнні Беларускай дзяржавы"[120].

Аднак разлікі на яе падтрымку не спраўдзіліся. Церпячы паражэнне на Заходнім фронце, Германія не жадала ствараць сабе праблемы ва ўзаемадачыненнях з Савецкай Расіяй і строга выконвала Берасцейскі дагавор, разглядаючы беларускае пытанне як унутрыпалітычную праблему Расіі[121]. Верагодна, па гэтай прычыне акупацыйныя ўлады нават забаранілі друкаваць дэкларацыю Скірмунта ў менскіх рускамоўных і беларускамоўных газетах[122].

У Радзе БНР дэкларацыя не выклікала прынцыповых пярэчанняў, за выключэннем вострай крытыкі з боку фракцыі беларускіх эсэраў. А вось персанальны склад прапанаванага Раманам Скірмунтам кабінета быў западозраны ў паланафільстве і сустрэты насцярожана. Пры галасаванні ён усе ж атрымаў большасць, але ў значнай меры дзякуючы таму, што вялікая частка левага крыла Рады на паседжанні адсутнічала[123]. Гэта не абяцала новаму кабінету палітычнай устойлівасці.

Без энтузіязму было ўспрынята з'яўленне Р.Скірмунта на чале ўрада БНР і ў шырокіх беларускіх колах, як у краі, так і па-за яго межамі. Па сутнасці, паўтаралася сітуацыя 1917 г., калі постаці Рамана Скірмунта і яго паплечнікаў са шляхецкага асяроддзя адштурхоўвалі ад палітычнага цэнтра беларускага Адраджэння сялянскую масу і народжаную ёю інтэлігенцыю, схільную да сацыяльнага радыкалізму і часцяком арыентаваную на Усход.

Настроі, што бытавалі тады сярод беларускай грамадскасці, выдатна перадаў Сцяпан Некрашэвіч, адзін з кіраўнікоў беларускай калоніі ў Адэсе. Пасля паездкі ўлетку 1918 года ў Менск ён пісаў у адной з адэскіх газет, што Р.Скірмунт як буйны памешчык і каталік "для многіх з'яўляецца неразгаданым сфінксам", а прапанаваныя ім кандыдаты на пасады народных сакратароў – гэта асобы "з вельмі сумніўнай нацыянальнай афарбоўкай". "Між тым, – працягваў С.Некрашэвіч, – у цяперашні час, калі будаўніцтва беларускай дзяржаўнасці яшчэ знаходзіцца ў стадыі свайго развіцця, на чале дзяржавы безумоўна павінны стаяць асобы, далёкія ад усялякага падазрэння ў іх адданасці інтарэсам нацыі. Вось чаму буржуазна-дзелавы кабінет, вылучаемы п.Скірмунтам, непазбежна будзе правалены, бо гэты кабінет не можа адлюстраваць нацыянальных спадзяванняў большасці чальцоў Рады ..."[124].

Прадказанне гэта збылося раней, чым можна было чакаць. Рэзка апазіцыйная да кабінета Рамана Скірмунта фракцыя беларускіх эсэраў, падтрыманая дэлегатамі ад

---

[120] Дзянніца. 7 ліпеня 1918.
[121] НА РБ, ф. 325, воп. 1, адз. 19, арк. 235.
[122] Дзянніца. 4 жніўня 1918.
[123] НА РБ, ф. 325, воп. 1, адз. 8, арк. 82-84
[124] Тамсама, адз. 19, арк. 237 (машынапісная копія артыкула С.Некрашэвіча).

павятовык радаў, учыніла яму ў Радзе БНР фактычную абструкцыю. Як пісаў (магчыма, некалькі утрыруючы) Зміцер Жылуновіч, эсэры "не давалі вольна дыхнуць сваім ворагам [на чале] з кіраўнікам Скірмунтам, каб сапхнуць [яго] з пасады старшыні кабінету беларускіх міністраў. Чаго-чаго яны ні рабілі! Крычалі на засяданнях Рады, стукалі кулакамі па сталу, ахвяравалі сябе на арышт, грозячы ім ад Скірмунта. А за спіною Рады нават строілі згаворы з губернскімі і павятовымі земствамі, у якіх усе члены варожа глядзяць не толькі на нацыянальнае пытанне, пастаўленае ў парадку другіх важных пытанняў расейскаю рэвалюцыяй, але [выступаюць] і супраціў сацыяльна-палітычнага [пытання]"[125]. З процілеглага флангу супраць кабінета Р.Скірмунта павялі атаку правыя велікарускія шавіністы на чале з менскім архіярэем[126].

Усё гэта практычна паралізавала працу Народнага сакратарыята Беларусі, і ўжо 20 ліпеня 1918 г. кабінет Р.Скірмунта пайшоў у адстаўку[127]. Яго падзенне адбылося пры поўным неўмяшальніцтве нямецкіх акупацыйных уладаў[128]. Новы урад БНР неўзабаве ўзначаліў сацыяліст Янка Серада[129].

Зрыў другой спробы стаць ля стырны беларускай палітыкі даваў Р.Скірмунту ўсе падставы лічыць гэтую справу бесперспектыўнай і скіраваць сваю энергію на служэнне іншай ідэі. Расчараванне наконт ажыццявімасці ў той час беларускіх дзяржаватворчых памкненняў, пэўна, урэшце рэшт і наступіла. Але здарылася гэта не адразу.

Раман Скірмунт заставаўся ў складзе Рады БНР, працаваў у яе міжнароднай камісіі[130]. Восенню 1918 г. падчас адыходу немцаў з Беларусі ён падтрымліваў ініцыятыву генерала К.Кандратовіча па арганізацыі беларускіх узброеных фармаванняў[131]. Актыўна ўдзельнічаў у спробах кіраўніцтва БНР выкарыстаць зігзагі сусветнай палітыкі дзеля таго, каб юная беларуская дзяржава стала на ногі і сцвердзіла сябе ў міжнародным супольніцтве. У лістападзе 1918 г. Раман Скірмунт у складзе надзвычайнай дэлегацыі БНР накіроўваецца ў Берлін. Там беларускіх пасланцаў заспяваюць буйныя гістарычныя падзеі – Лістападаўская рэвалюцыя, якая скасавала ўладу кайзера і ўстанавіла рэспубліку, і капітуляцыя Германіі ў вайне. Затым місія накіроўваецца ў Швейцарыю, перадае ў Берне ноты Рады БНР швейцарскаму ўраду і паслам краін Антанты – Англіі, ЗША, Францыі, Італіі – каб давесці пераможцам у сусветнай вайне факт нараджэння ва Усходняй Еўропе самастойнай дзяржавы беларусаў[132]. Ёсць таксама звесткі, што ў канцы 1918 г. Раман Скірмунт разам з Язэпам Варонкам наведаў Лондан[133].

Тым часам новы гаспадар становішча ў Еўропе і ў свеце – усемагутная Антанта – адмовілася падтрымліваць маладыя нацыянальныя дзяржавы, што паўставалі на абломках Расійскай імперыі. Без такой падтрымкі незалежнасць Беларусі, магчыма, стала выглядаць у вачах Р.Скірмунта справай нерэальнай. Дылема, якая ўзнікла цяпер

---

[125] Беларус камуніст [Жылуновіч З.]. Беларуская партыя с[ацыялістаў]-р[эвалюцыянераў] // Дзянніца. 7 лістапада 1918.
[126] Дзянніца. 9 жніўня 1918.
[127] НА РБ, ф. 325, воп. 1, ад.з. 21, арк. 243.
[128] Шчырыбеларус [Жылуновіч З.]. Ігра цягнецца // Дзянніца. 14 жніўня 1918.
[129] Чырвоны шлях. 1918. № 7/8. С. 25.
[130] Тамсама. № 5/6. С. 21; НА РБ, ф. 325, воп. 1, ад.з. 19, арк. 177.
[131] Собственноручные показания А.И. Луцкевича 30 октября 1939 г. // Нёман. 1995. № 1. С. 143-144.
[132] Дзянніца. 19 і 25 лістапада 1918.
[133] НА РБ, ф. 4 (Белнацком), воп. 1, ад.з. 96, арк. 229.

перад краем, бачылася такой: альбо далучэнне да Савецкай Расіі з усімі жудаснымі для памешчыка і кансерватыўнага палітыка наступствамі, альбо ўваходжанне разам з суседнімі народамі ў II Рэч Паспалітую, абрысы якой пачалі вымалёўвацца ў выніку намаганняў "начальніка" новапаўсталай Польскай дзяржавы Юзафа Пілсудскага. Выбар на карысць другога варыянта быў для Рамана Скірмунта ў той сітуацыі адзіна магчымым.

У 1919-1920 гг. Р.Скірмунт – актыўны функцыянер грамадска-палітычных і гаспадарчых арганізацый памешчыкаў з беларускіх "крэсаў" у Варшаве. Намаганні гэтых арганізацый зводзіліся да таго, каб, не дапусціўшы падзелу Беларусі паміж Польшчай і Савецкай Расіяй, уключыць край цалкам у склад II Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. на ўмовах уніі ці шырокай аўтаноміі, і каб зямельнае ўладкаванне ў краі было праведзена з мінімальнымі выдаткамі для буйных абшарнікаў[134].

Грамадская думка пэўны час працягвала ўспрымаць Рамана Скірмунта як актывіста беларускага нацыянальнага руху. У маі 1919 г. адна з віленскіх беларускіх газет паведамляла: "Як мы чулі, на гэтым тыдні ў Вільню прыедзе з Варшавы беларускі дзеяч з вялікіх паноў Раман Скірмунт"[135].

Тады ж разам з такімі асобамі як Эдвард Вайніловіч, Канстанцін Гардзялкоўскі, Павел Аляксюк, Бранiслаў Тарашкевіч і іншымі ён увайшоў у склад заснаванага ў Варшаве па ініцыятыве Лявона Дубейкаўскага Польска-Беларускага таварыства. Яно выступала за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. як супольнасці раўнапраўных народаў, заснаванай на прынцыпе "вольныя з вольнымі і роўныя з роўнымі", і асуджала намеры польскай адміністрацыі асіміляваць беларусаў[136]. Калі ў 1930 г. немаладога ўжо, але, відаць, яшчэ энергічнага памешчыка з Палесся Р.Скірмунта выбяруць дэпутатам Сената, ён далучыцца там да Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам, які, сярод іншага, таксама будзе выступаць супраць асіміляцыі этнічных меншасцяў[137].

Увогуле ж у міжваенны час Раман Скірмунт не выяўляў актыўнасці ў палітыцы. Жыццё ў асноўным праходзіла ў родным Парэччы, было запоўнена гаспадарчымі клопатамі.

Закончылася зямная дарога былога дзеяча Беларускай Народнай Рэспублікі трагічна. 7 кастрычніка 1939 г. на 72-м годзе жыцця Раман Скірмунт быў забіты ў лесе непадалёку ад Парэчча мясцовымі прыслужнікамі савецкай улады. Паводле падання, перад смерцю ён прамовіў: "Я нічога дрэннага людзям не рабіў..."[138].

І сапраўды, старажылам тых мясцін уладальнік Парэчча запомніўся як спагадлівы, добры пан, які дапамагаў бедным, даваў збожжа падчас неўраджаю, фінансаваў школы[139]. Адчуванне кроўнай сувязі з народам, сярод якога жыў, ідэя

[134] Wojniłłowicz E. Wspomnienia…S. 235, 240, 242, 252, 254, 298-299, 300-301, 311, 316.
[135] Беларуская думка (Вільня). 5 мая 1919.
[136] Звон (Мінск). 13 кастрычніка 1919.; Wojniłłowicz E. Wspomnienia…S. 248; Jurkiewicz J. Rozwój polskiej myśli… S. 214-215.
[137] Смалянчук А. "Краёвасць"… С. 31.
[138] Brzoza Cz., Stepan K. Skirmunt Roman // Polski Słownik Biograficzny. T. XXXVIII/2. Zesz. 157. Warszawa, 1998. C. 187; Ильенков В. Трагедия Скирмунтов…
[139] Свабода. 1992. № 7/8.

патэрналісцкага апекавання над сялянамі, напэўна, не пакідала яго ўсё жыццё.

Магчыма, такім жа клапатлівым, мудрым папячыцелем Раман Скірмунт марыў стаць і для ўсіх беларусаў. Але ягоная мадэль грамадскага ўладкавання не ўпісалася ў сістэму каштоўнасцяў эпохі, калі яму давялося жыць. Шмат у чым памыляўся ён, шмат у чым памылялася і эпоха... У любым выпадку, сення ніхто не зможа адмовіць, што ў гістарычным падмурку беларускай дзяржаўнасці ёсць непадобная на іншыя цагліна, пакладзеная рукой знатнага шляхціца Рамана Скірмунта.

KAMUNIKAT.org

## Сялянскае насельніцтва Гарадзенскай пушчы: дэмаграфічнае, гаспадарчае і сацыяльнае развіццё ў пачатку – 60-ыя г. 19 ст.

**Сяргей Токць (Гародня)**

Адным з цікавейшых накірункаў у сучаснай еўрапейскай гістарыяграфіі стала комплекснае вывучэнне мікрарэгіёнаў. Аналіз культурных, сацыяльных, гаспадарчых, дэмаграфічных працэсаў на ўзроўні парафіі, воласці, маёнтка дазваляе гісторыку па-новаму ацаніць з'явы і працэсы глабальнага характару, паспрабаваць убачыць іх вачыма звычайнага селяніна, прыходскага святара ці дробнага гандляра, параўнаць значэнне ў жыцці тагачасных людзей лакальных сувязяў і глабальных працэсаў. Усё гэта часта дае гісторыкам магчымасць скарэкціраваць ужо стаўшыя традыцыйнымі погляды. Яно ж з'яўляецца добрымі лекамі ад празмернага захаплення абстрактнымі схемамі.

У дадзеным даследаванні намі зроблена спроба прааналізаваць дэмаграфічнае, гаспадарчае і сацыяльнае развіццё ў 19 ст. сялянскага насельніцтва Гарадзенскай (Берштаўскай) пушчы, якая ўваходзіла ў склад Гарадзенскай губерні і павета. З пункту гледжання гісторыка гэта надзвычай цікавы мікрарэгіён. Тут праходзіла памежжа беларускага і літоўскага этнасаў. Паводле канфесійнай прыналежнасці мясцовае насельніцтва прыкладна пароўну падзялялася на каталікоў і праваслаўных. У сярэднявеччы пушча была месцам палявання і адпачынку вялікіх князёў літоўскіх. У галоўнай пушчанскай вёсцы – Берштах, адбываліся сеймы, на якія прыязджала шляхта і магнатэрыя з усёй дзяржавы, тут выдаваліся многія прывілеі Вялікага князя. Пазней пушчанскія вёскі ўвайшлі ў склад Гарадзенскага каралеўскага лясніцтва. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўключэння заходнебеларускіх земляў у склад Расійскай імперыі яны былі далучаны да дзяржаўных валоданняў, падпарадкаваных ведамству губернскай казённай палаты.

Адным з найбольш цікавых пытанняў у даследаванні мікрарэгіёна з'яўляецца вывучэнне **дэмаграфічных працэсаў**, якія ў значнай ступені адлюстроўваюць развіццё сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця. На пачатку 19 ст. на абшарах Гарадзенскай пушчы мясцілася 27 вёсак, якія былі падзелены на тры кватэры: Берштаўскую, Матыльскую і Сабалянскую. Паводле рэвізскага перапісу 1811 г., у пушчанскіх вёсках налічвалася 1226 жыхароў мужчынскага полу[140]. Самым вялікім населеным пунктам у пушчы была вёска Бершты. Адносна гэтай вёскі захаваліся таксама дадзеныя рэвізіі 1795 г., першай пасля ўваходжання заходнебеларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Тады тут налічылі 233 душы мужчынскага полу. За 16 гадоў паміж перапісамі 1795 г. і 1811 г. мужчынскае насельніцтва Берштаў вырасла на 40 чалавек (17%) і склала 273 душы. За гэты перыяд з ліку жыхароў, зафіксаваных перапісам 1795 г., памерлі 54 чалавекі, 10 маладых хлопцаў было ўзята рэкрутамі ў царскае войска, 14 чалавек перасяліліся ў іншыя вёскі (пайшлі ў прымакі ці наняліся работнікамі), а 4 проста

[140] НГАБ у Гародні, ф. 27, воп. 7, ад.з. 26, арк. 124 адв.

збеглі, магчыма за мяжу. Такім чынам, страты мужчынскага насельніцтва дасягнулі 82 чалавека. Аднак нарадзіліся за гэты час 122 хлопчыкі, што забяспечыла даволі высокі прырост насельніцтва.

Узроставая структура мужчынскага насельніцтва Берштаў на 1811 г. выглядала наступным чынам: ад 1 да 9 гадоў – 106 чалавек, ад 10 да 19 – 47, ад 20 да 29 – 35, ад 30 да 39 – 22, ад 40 да 49 – 19, ад 50 да 59 – 10, ад 60 да 69 – 17, ад 70 да 79 – 11, ад 80 да 89 – 4, ад 90 да 99 – 1. Як вынікае з вышэй прыведзеных лічбаў, вельмі высокай была дзіцячая смяротнасць, паколькі больш за палову дзяцей не дажывалі да 10 гадоў. Такое становішча было характэрным на той час для Беларусі і ўсёй Усходняй Еўропы ўвогуле. Разам з тым сустракаліся і выпадкі доўгажыхарства. Так, Рыгор Касцевіч, які памёр у 1811 г., меў 107 гадоў. 104 гады пражыў Варфаламей Васілевіч. Ва ўзросце 99 гадоў памёр Мацей Хвілон. У 1795 і 1811 г. у Берштах налічвалася 66 сялянскіх двароў. Значыцца ў сям'і было ў сярэднім па 2-3 мужчыны, а склад сярэдняй сям'і дасягаў 5-6 чалавек.

Вайна 1812 г. мела трагічныя наступствы для жыхароў Берштаў і іншых пушчанскіх вёсак. Аб гэтым яскрава сведчаць вынікі рэвізскага перапісу 1816 г. Паводле рэвізіі, сялянскае насельніцтва пушчы складала 833 мужчынскія душы і 946 жаночых[141]. Колькасць мужчын зменшылася на 32% у параўнанні з 1811 г. У Берштах у 1816 г. налічваліся 192 душы мужчынскага полу і столькі ж жаночага. У параўнанні з дадзенымі пяцігадовай даўніны страты мужчынскага насельніцтва склалі 81 чалавек ці амаль 30%.

Як вынікае з дадзеных гаспадарчага інвентара 1844 г., насельніцтва Гарадзенскай пушчы дасягнула 1442 мужчынскіх душ і 1647 жаночых[142]. У параўнанні з 1816 г. колькасць жыхароў павялічылася ў 2,6 раза. Гэта вельмі высокі паказчык дэмаграфічнага росту за 28 гадоў. У Берштах налічвалася 718 жыхароў. У параўнанні з 1816 г. насельніцтва вёскі вырасла ў 1,6 раза.

У 1850 г. пры пераводзе сялян на грашовы аброк на тэрыторыі Гарадзенскай пушчы было ўтворана некалькі сельскіх грамадаў. У склад самай вялікай – Берштаўскай, увайшлі 17 вёсак. Часовы аброчны інвентар налічыў 1320 мужскіх душ і 1478 жаночых, апроч таго 22 душы так званых "посторонних" – стражнікі, утрымальнікі корчмаў і г.д.[143] Адносна веравызнання жыхары падзяляліся наступным чынам: 1714 каталікоў і 1106 праваслаўных. Што тычыцца этнічнай прыналежнасці сялян, то ў дзяржаўных дакументах узгадак аб гэтым няма. Але, паводле матэрыялаў даследчыка Гарадзенскай губерні святара Рыгора Парчэўскага ў 1848 г. шэраг пушчанскіх вёсак (Баўташы, Верхдуб'е, Кабялі, Мустэйкі, Сабаляны, Санава, Шумы, Язяркі, Яскялевічы) насялялі этнічныя літоўцы[144]. У саміх Берштах было 779 жыхароў, з іх 369 мужчын і 410 жанчын. У параўнанні з 1844 г. прырост насельніцтва вёскі склаў 8,5%.

У 1851 г., згодна дадзеным IX рэвізіі, у Берштах налічвалася 815 жыхароў, з іх 391 мужчына і 424 жанчыны [145]. У параўнанні з 1816 г. колькасць насельніцтва вырасла ў 2,1 раза альбо на 112%. У параўнанні з 1795 г. прырост мужчынскага

[141] НГАБ у Гародні, ф. 24, воп.7, ад.з. 31, арк. 3.
[142] Тамсама, ф. 1143, воп. 1, ад.з. 51, арк 81-82.
[143] Тамсама, ф. 1143, воп. 1, ад.з. 52, арк. 1.
[144] Материалы для географии и статистики России, собранные фицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. Сост. П.Бобровский. Санкт-Петербург, 1864. С. 158-159.
[145] НГАБ у Гародні, ф.1, воп. 28, ад.з. 584, арк. 11.

насельніцтва ў вёсцы склаў 67,8%, альбо, іншымі словамі, колькасць мужчын павялічылася ў 1,7 раза. Можна дапусціць, што такія ж прыблізна лічбы існавалі адносна тэмпаў росту ўсяго насельніцтва вёскі.

Сялянскіх двароў у Берштах у 1851 г. было 85, альбо у 1,3 разы болей, чым у 1795 г. Такім чынам, прырост насельніцтва апярэджваў рост колькасці сем'яў. Сярэдняя сям'я складалася з 9-10 чалавек. Трэба адзначыць, што двор, які з'яўляўся адзінкай падаткаабкладання, не заўсёды супадаў з сям'ёй. Здаралася, што некалькі сем'яў аб'ядноўваліся ў адзін дым ці двор, каб сумесна плаціць падатак за цяглы ўчастак зямлі.

Як ужо адзначалася, у 1851 г. вёска Бершты была цэнтрам казённага маёнтка і грамады дзяржаўных сялян, у склад якой пасля некаторых зменаў уваходзілі 13 вёсак і некалькі ўрочышчаў Гарадзенскай пушчы. Насельніцтва іх паводле IX рэвізіі дасягала 3202 чалавек, з іх 1568 мужчын і 1634 жанчыны[146]. Колькасць двароў склала 351, г. зн., што на 1 двор прыпадала ў сярэднім 9 душ.

У сярэдзіне 50-х гадоў у выніку голаду і эпідэмічных захворванняў адбываецца скарачэнне насельніцтва. Рэвізскі перапіс 1858 г. зафіксаваў у маёнтку Бершты 2497 чалавек, з іх 1187 мужчын і 1310 жанчын[147]. У параўнанні з 1851 г. страты склалі 705 чалавек ці 22%. Сялянскіх двароў у маёнтку налічвалася 299, г. зн. на 1 двор у сярэднім прыходзілася 8-9 душ.

Наступны перапіс насельніцтва Берштаўскай воласці, у склад якой цалкам увайшоў былы маёнтак Бершты з усімі вёскамі, быў праведзены ў 1869 г. Праўда, нам удалося адшукаць толькі звесткі пра мужчынскае насельніцтва. Яно ў 1869 г. дасягнула 1882 чалавек[148]. У параўнанні з 1858 г. прырост склаў 58,6%. У самой вёсцы Бершты мужчынскае насельніцтва за гэтыя гады вырасла на 115 чалавек, ці на 36,5% і дасягнула колькасці 439 чалавек. Сялянскіх двароў налічвалася 98. У сярэднім на 1 двор прыходзілася 4-5 мужчын, г. зн. сярэдняя сям'я складалася з 8-9 чалавек.

У апошняй трэці 19 ст. працягваўся дынамічны рост насельніцтва. Паводле дадзеных за 1896 г. у Берштах налічваліся 1223 жыхары, з іх 621 мужчына і 572 жанчыны[149]. Такім чынам, з 1795 па 1896 г. колькасць мужчынскага насельніцтва вёскі вырасла амаль у 2,7 раза. Прыкладна такім жа быў прырост і ўсяго насельніцтва. Два дэмаграфічныя спады былі абумоўлены вайной 1812 г. і голадам з масавымі эпідэмічнымі захворваннямі ў сярэдзіне 50-х гадоў 19 ст. Пасля гэтага назіраецца ўжо ўстойлівы дэмаграфічны рост.

Адна з важнейшых праблем у даследаванні гісторыі вёсак – **сялянскае землекарыстанне**. Асноўнымі крыніцамі для яго вывучэння з'яўляюцца інвентарныя вопісы. У першай палове 19 ст. вёскі Берштаўскай пушчы ўтваралі некалькі казённых маёнткаў, якія аддаваліся ў арэнду мясцовым памешчыкам. У 1815 г. быў складзены інвентар Гарадзенскага лясніцтва для перадачы ў арэнднае валоданне княгіні Чацвярцінскай. Паводле гэтага дакумента агульная плошча карыснай для земляробства зямлі, якая знаходзілася ў карыстанні сялян, налічвала каля 315 валокаў[150]. У Берштаўскай кватэры меліся 183 валокі, у Стрыеўскай –

[146] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 2410, арк. 17.
[147] Тамсама.
[148] Тамсама, арк. 4.
[149] Тамсама, ф. 14, воп. 1, ад.з. 118.
[150] Тамсама, ф. 1143, воп., адз. 50, арк. 38адв-39.

93, Матыльскай – 39,5. Сялянскіх двароў ці дымоў налічвалася 274. На 1 дым, які з'яўляўся адзінкай падаткаабкладання, выходзіла ў сярэднім трохі больш за валоку зямлі. Прычым гэтая зямля падзялялася на розныя катэгорыі. Да вёскі Берешты, напрыклад, належала 26 валокаў. З іх 3 валокі ўваходзілі ў фальварак, 1 аддавалася пад карчму, 1/2 знаходзілася пад зараснікамі. У непасрэдным карыстанні сялян была 21 валока, якія размяркоўваліся паміж 62 сем'ямі, што складала ў сярэднім па 0,34 валокі на сям'ю. 14,5 валок называліся сядзібнай зямлёй. За карыстанне ёю сяляне павінны былі адпрацоўваць паншчыну. Каля 7 валокаў уваходзілі ў катэгорыю прыёмных земляў, за якія сяляне плацілі грашовы чынш. У сярэднім на двор прыходзілася 1/4 валокі сядзібнай зямлі і 1/8 валокі прыёмнай. Адна валока налічвала прыкладна 20 дзесяцін ці 21,36 га. Значыцца, уяўная сярэдняя сям'я ў Берштах апрацоўвала каля 7 дзесяцін, а па ўсёй пушчы гэты паказчык складаў меней 20 дзесяцін.

У Берштах самы вялікі зямельны ўчастак быў у Данілы Русілкі, які апроч 1/4 валокі сядзібнай зямлі меў яшчэ 3/8 прыёмнай валокі. Праўда, у яго была і самая вялікая ў вёсцы сям'я – 12 душ. Вялікі ўчастак зямлі быў таксама ў карыстанні Міхала Васілевіча – 7/12 валокі, хаця яго сям'я складалася ўсяго з 4 чалавек. Аднак магчыма, што далёка не ўсе землі, якія апрацоўваліся сялянамі, былі паказаны ў інвентары.

У 1839 г. у Расійскай імперыі пачалася рэформа казённай вёскі ("рэформа Кісялёва"), якая складалася з трох асноўных кірункаў: фармаванне новай сістэмы кіравання, пашырэнне "апякунскай" ролі дзяржавы і "люстрацыя дзяржаўных маёмасцей". У снежні 1839 г. былі выдадзены царскія ўказы, якія вызначалі парадак рэалізацыі рэформы на беларускіх і літоўскіх землях[151] . Згодна гэтым законам спецыяльныя люстрацыйныя ўстановы складалі інвентары казённых маёнткаў дзеля ўпарадкавання павіннасцей і сялянскага землекарыстання. У 1844 г. быў складзены новы інвентар маёнткаў Гарадзенскай пушчы[152]. З гэтага дакумента вынікае, што землекарыстанне жыхароў пушчанскіх вёсак істотна не змянілася. Так, у сялян вёскі Бершты па-ранейшаму знаходзілася 21 валока зямлі ці ў сярэднім – 0,28 валокі на двор. Калі ўлічваць рост насельніцтва ў параўнанні з 1815 г., то ў разліку на 1 рэвізскую душу назіралася даволі істотнае скарачэнне зямлі.

Наступным этапам рэалізацыі рэформы Кісялёва стаў перавод сялян з паншчыны на грашовы аброк. Паводле часовага аброчнага інвентара 1850 г. у карыстанні сялян Берштаўскага маёнтка, у які ўваходзілі 17 вёсак Гарадзенскай пушчы, налічвалася 200 дзесяцін сядзібнай зямлі ( з гэтага часу пад сядзібнай зямлёй у інвентарах разумеліся зямельныя ўчасткі вакол жытла сялян – *С.Т.*), 5839,6 дз. ворыва і 798 дз. сенакосу. У разліку на 1 двор гэта складала 0,6 дз. сядзібнай зямлі, 17,9 дз. ворыва і 2,45 дз. сенакосу[153].

У вёсцы Бершты, згодна дадзеным інвентара, налічвалася 53,5 дз. сядзібнай зямлі, 2390,5 дз. ворыва і 216 дз. сенакосаў. Цяглых і паўцяглых сялянскіх двароў было 69. У сярэднім на адзін двор прыходзілася 38,5 дз. карыснай для апрацоўкі зямлі. Такім чынам, у параўнанні з 1844 г. у Берштах, паводле дадзеных інвентара

---

[151] Полное собрание законов Российской империи. Собр. 2, Т. 14, № 13035, 13036.
[152] НГАБ у Гародні, ф.1143, воп. 1, ад.з. 51.
[153] Тамсама, ф. 1143, воп. 1, ад.з. 52, арк. 8-33.

1850 г., назіралася пяціразовае павелічэнне плошчы сялянскага землекарыстання. Адкуль узяліся такія неверагодныя лічбы? У астатніх вёсках пушчы сялянскія зямельныя надзелы змяніліся за гэты час незначна. Магчыма, прычына ў тым, што ў першай палове 19 ст. жыхары Берштаў больш займаліся ляснымі промысламі, кантрабандай і вырошчваннем хмелю, чым зерневай гаспадаркай. Аб гэтым размова пойдзе ніжэй. А ў час пераводу на аброк дзяржаўныя люстратары прырэзалі сялянам усе прыдатныя, на іх думку, для земляробства землі, плошча якіх служыла падставай для вылічэння грашовага аброка.

Больш дакладны ўлік зямельных угоддзяў быў праведзены ў час люстрацыі 1853 г.[154] На гэты час пасля пэўных тэрытарыяльных зменаў у склад Берштаўскай сельскай грамады і аднайменнага маёнтка ўваходзілі 13 вёсак і 5 урочышчаў, а агульная плошча ўсёй зямлі дасягала 24 118 дзесяцін, з якой зручная для земляробства зямля складала 12186 дз., нязручная – 1341, лес – 9869. Зямля пад аброчнымі артыкуламі (корчмы, азёры і г.д.) займала плошчу 721 дз. Апроч гэтага 190 дз. знаходзілася ў прыватным валоданні і яшчэ 440 дз. лічыліся спрэчнымі, таму што на іх прэтэндавалі суседнія памешчыкі. З ліку зручнай для апрацоўкі зямлі ў карыстанні сялян знаходзілася 7130 дз. ці 58,5%.

Усіх сялянскіх двароў было ў маёнтку 351, з іх 161 цяглы, 186 паўцяглых і 4 агародных. Цяглыя двары мелі поўныя зямельныя надзелы і дзве пары валоў, паўцяглыя – палавінныя і адну пару валоў. Агароднікі мелі толькі хаты з сядзібнай зямлёй. Яшчэ ў маёнтку было 35 бабылёў, у якіх не было ні зямлі, ні хаты. У разліку на адну мужчынскую рэвізскую душу сярэдняя колькасць зямлі складала 4,3 дз., а на двор – 20,5 дз. У 1848 г. паводле падлікаў вядомага гісторыка Мікалая Улашчыка сярод прыватнаўласніцкіх сялян Гарадзенскай губерні на адзін двор прыходзілася 15,9 дз., а на душу – 3,8. Такім чынам, забяспечанасць зямлёй сялян Берштаўскай грамады была адносна някепскай, але трэба ўлічваць нізкую якасць зямлі, якая давала невысокія ўраджаі.

Фальваркі, якія звычайна знаходзіліся ў часовым валоданні арандатараў, займалі 421 дз. ці 3,45% ад усёй зручнай для апрацоўкі зямлі. У параўнанні з панскім ворывам у прыватнаўласніцкіх маёнтках гэта быў вельмі нізкі паказчык. Разам з тым значная колькасць зямлі, як вынікае з інвентару, увогуле не апрацоўвалася альбо апрацоўвалася сялянамі тайна, каб не выконваць за гэта павіннасцей. У інвентары гэтая зямля (4483 дз.) была названа “запасной”. Яшчэ 152 дз. знаходзіліся ў карыстанні “стражнікаў”, якія загадвалі аховай лесу і лясной гаспадаркай.

У цэлым зямля маёнтка была кепская. Ворыўнай “посредственной” зямлі, паводле прынятай міністэрствам дзяржаўных маёмасцей тэрміналогіі, было ўсяго 312 дз. Такая зямля давала ўраджай 3,5 чвэрці жыта з адной дзесяціны і прыносіла ва ўмовах Берштаў прыбытак 1 руб.70 кап. “Плохой” зямлі налічвалася 2203 дз. Ураджай яна давала ўсяго 1 чвэрць з дзесяціны, што прыносіла прыбытак 21-27 кап. А “неўраджайнай” зямлі налічвалася аж 6107,7 дз. Прыбытак з дзесяціны такой зямлі складаў толькі 5-7 кап.

Трохі лепшай была справа з лугамі і сенакосамі. Праўда “посредственной” лугавой зямлі было толькі 15 дз. Укос з яе дасягаў 50 пудоў з дзесяціны, а пуд

[154] Тамсама, ф. 31, воп. 2, ад.з.-856.

такога сена каштаваў 5 кап. Чысты прыбытак складаў 83 кап. Пераважала "плохая" балотная зямля, плошча якой складала ажно 989,3 дз. Укос з дзесяціны дасягаў 30 пудоў, а чысты прыбытак – 30 кап.

Лугавой пашы было усяго 66,3 дз. Чысты прыбытак з дзесяціны складаў 25 кап. А пераважала "плохая" паша (582,9 дз.), якая прыносіла прыбытак 15 кап. з дзесяціны[155].

Чыноўнікі люстрацыйнай камісіі прапанавалі "для уравнительного наделения крестьян" утварыць 236 поўных і 109 палавінных участкаў зямлі. Поўны ўчастак мог складаць ад 9 да 40 дз. у залежнасці ад якасці зямлі і 5 дз. сенакосу. Люстратар таксама лічыў патрэбным разгараць землі на ўскрайках лесу, дзе былі сядзібы, сенакосы і паша. Па выніках люстрацыі ў маёнтку Бершты ўсяго налічвалася сядзібнай зямлі 286, ворыўнай – 2523, ворыўнай неапрацаванай – 86, неўраджайнай апрацаванай – 6108, неўраджайнай неапрацаванай – 199, сенакоснай – 1031, неапрацаванай – 581, пашы – 721дз. Акрамя таго 103 дз. знаходзіліся ў карыстанні лясных "стражнікаў". Уся плошча прыдатнай для земляробства зямлі маёнтка дасягала 11462 дз. Землі пад аброчныя артыкулы займалі 722 дз. У іх лік уваходзілі: корчмы і шынкі – 8, жалезаробчы завод – 0,02, рыбныя азёры – 721, вуліцы і дарогі – 289, грамадскія пабудовы – 1,27, могілкі з капліцай – 22, сыпучыя пяскі – 35,6, сухі бор – 41,5, яры і ямы – 4,7, рэкі – 140, тэлеграф – 0,27, балоты – 245 дз. Нязручная для апрацоўкі зямля дасягала 1074 дз., лесу – 10758 дз. Увесь абшар маёнткаскладаў 24015 дз.

Паводле пастановы люстрацыйнай камісіі ў карыстанне сялян было перададзена 3020 дз. зямлі, што амаль на палову павялічвала іх зямельныя надзелы. Але за нарэзаныя землі трэба было выплочваць пазямельны падатак і гэта рэзка павялічыла падатковы ціск. Многія з зямельных участкаў сяляне тайна апрацоўвалі і раней, карыстаючыся слабым кантролем з боку дзяржаўных чыноўнікаў. Пасля рэформы Кісялёва кантроль значна ўзмацніўся, што мела і адмоўныя наступствы для жыцця пушчанскіх вёсак.

У 1859 г. была праведзена праверачная люстрацыя і складзены новы інвентар Берштаўскай сельскай грамады[156]. Паводле яго ў маёнтку налічвался 10328 дз. ворыва, нязручнай зямлі – 1332 дз., лесу – 10131 дз. Люстратар прапанаваў перадаць сялянам таксама "вакантную" (ачышчаную ад лесу) зямлю – 1179 дз.

Па маёнтку налічвалася паводле праверкі 279,5 поўных сялянскіх участкаў: 235 дз. сядзібнай зямлі, 7790 дз. ворыва, 1801 дз. сенакосаў, 619 дз. пашы. У параўнанні з люстрацыяй 1853 г. плошча сялянскай зямлі вырасла з 9956 да 11135 дз. А ў пераліку на адну рэвізскую душу з 6,32 да 8,35 дз., альбо на 2 дз. Усяго ў маёнтку на 1859 г. налічвалася 445 сялянскіх двароў, г. зн. у сярэднім на 1 двор прыпадала прыкладна 25 дз. зямлі.

У вёсцы Бершты ў 1859 г. двароў было 85 і сярэдні надзел на двор складаў 0,77 дз. сядзібнай зямлі, ворыва – 42 дз., сенакосу – 5 дз., пашы – 1,8 дз. Гэтыя лічбы значна пераўзыходзілі сярэднія паказчыкі па губерні. Аднак нельга забывацца на нізкую якасць зямлі.

Адна з прапаноў люстрацыі 1859 г. гучала так: "земли имения поделить на отдельные участки (особняки) при многопольном севообороте от 20 до 50 дес.

[155] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 856, арк.21.
[156] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 1218.

пропорции и соответственно этому колониальное устройство деревень проводить постепенно па мере убеждения крестьян в полезности такой системы хозяйствования”[157]. Гэтая прапанова люстратара апярэджвала ў некаторых момантах добра вядомую сталыпінскую рэформу.

Наступная люстрацыя адбылася праз 10 гадоў – у 1869 г.[158] За гэты час кардынальна змянілася юрыдычнае становішча ўсяго беларускага сялянства, у т.л. і дзяржаўнага. У адпаведнасці з рэформай 1867 г. казённыя сяляне Беларусі пераходзілі на выкуп і фактычна станавіліся ўласнікамі сваіх зямельных участкаў. Па выніках люстрацыі ў надзел сялянам вёскі Бершты было выдзелена 6372 дз. зямлі, сярод якой было 5206 дз. зручнай для апрацоўкі і 1166 дз. нязручнай[159]. У параўнанні з 1859 г. плошча зручнай для карыстання зямлі вырасла ў 1,5 раза. На адзін сялянскі двор (усіх двароў без уліку салдацкіх налічвалася 98) прыходзілася 53 дз. зямлі. У параўнанні з 1859 г. прырост склаў 25%. Усёй сядзібнай зямлі было 76 дз., ворыва – 3422 дз., сенакосаў – 472,32 дз., пашавых сервітутаў – 1112 дз.. Яшчэ 113 дз. пашы знаходзілася ў карыстанні адстаўных салдат. На 1 сялянскі двор сядзібнай зямлі прыходзілася 0,8 дз., ворыва – 35, сенакосу – каля 5 дз. На адну рэвізскую душу гэта складала амаль 12 дз. зручнай зямлі. У 1859 г. на адну душу было каля 11 дз. Невялікі душавы прырост зямлі ў параўнанні з прыростам агульнай плошчы тлумачыўся значным павелічэннем за 10 гадоў колькасці насельніцтва.

За кошт чаго вырасла плошча сялянскай надзельнай зямлі? На нашу думку, гэта адбылося дзякуючы расчысткам лесу пад зямельныя ўчасткі. Адыграла ролю пэўная пераарыентацыя сялян з пазаземляробчых заробкаў на зернявую гаспадарку, аб чым гаворка пойдзе ніжэй. Безумоўна, мелі значэнне і наступствы паўстання 1863 г., пасля якога царскі ўрад значна ахвотней ішоў на саступкі сялянам, у т.л. і ў справе надзялення іх зямлёй. У цэлым землекарыстанне берштаўскіх сялян было ўраўняльным. Новыя землі прыразаліся сялянскім дварам адпаведна колькасці душ і якасці глебы. Хаця зямельныя надзелы маглі вельмі істотна адрозніваецца сваёй велічынёй. Так, напрыклад, гаспадар Юры Токць, сям’я якога складалася з 8 чалавек, меў 1,5 дз. сядзібнай зямлі, 63 дз. ворыва і 8,1 сенакосу, што ў суме складала 75,5 дз. Гэта быў адзін з найбольшых зямельных надзелаў у Берштах. Яго сваяк Георгі Токць, які жыў адзін, меў 0,2 дз. сядзібнай зямлі, 21 дз. ворыва і 2,7 дз. сенакосу, а ўсяго разам – 24 дз. А самы вялікі зямельны надзел у Берштаўскай воласці мела сям’я Траяновічаў з літоўскай вёскі Кабялі. Гэтая сям’я, што складалася з 6 душ, мела ў карыстанні надзел плошчай 110,1 дз.

Такім чынам, рэфармаванне дзяржаўнай вёскі 40-60-ых гадах 19 ст., прывяло ў цэлым да павелічэння землекарыстання берштаўскіх і астатніх пушчанскіх сялян. Вялікую ролю тут адыгралі падзеі 1863 г., аб чым сведчыць асабліва хуткі рост памераў сялянскіх земляў у 60-ыя гады.

---

[157] Тамсама, арк. 5адв.
[158] НГАБ у Гародні, ф.31, воп. 2, ад.з. 2410.
[159] Тамсама.

**Табліца 1.**
**Землекарыстанне сялян вёскі Берфты у 1815-1869 гг.(удз.)**

| | 1815 г. | 1844 г. | 1850 г. | 1859 г. | 1869 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Агульная плошча | 448,6 | 448,6 | 2660,7 | 3431,2 | 5206,5 |
| На двор | 7,7 | 8,1 | 38,5 | 49,6 | 53 |
| На муж. рэв.душу | 2,3 | 1,3 | 7,2 | 10,9 | 11,86 |

Крыніцы: НГАБ у Гародні, ф. 31, воп.2, ад.з. 2410; ф.31, воп. 2, ад.з. 1218; ф.31, воп.2, ад.з. 856; ф. 31, воп. 2, ад.з. 1218; ф. 1143, в. 1, ад.з. 50; ф. 1143, воп. 1, ад.з. 51; ф.1143, воп. 1, ад.з. 52.

Сяляне пушчанскіх вёсак мусілі выконваць шматлікія грашовыя і натуральныя **павіннасці** на карысць арандатара і плаціць падушны падатак дзяржаве. Паводле інвентара 1815 г., павіннасці сялян Гарадзенскай пушчы вызначаліся так: кожны селянін (меўся на ўвазе галава сям'і), які апрацоўваў чвэрць аседлага грунту (1/4 валокі), павінен быў у тыдзень адслужыць тры дні паншчыны пешай ці коннай, 12 дзён у год адпрацаваць гвалты і аблавы "do żniwa i do innych robot z czem Dwor nakaże", тыдзень на год адбыць варту[160]. Паўцяглыя двары, якія мелі асьміну грунту (1/8 валокі), выконвалі на палову менш павіннасцей. Сяляне мусілі ў час паншчыны і гвалтаў працаваць летам ад усходу да заходу сонца, а зімой – ад святла да змроку. Асочнікі, ці стральцы, якія ахоўвалі казённы лес ад крадзяжоў, плацілі фальварку даніну, у якую ўваходзіла адна курыца, два фунты смалы-жывіцы, вясло пражы.

У 1815 г. сяляне пушчы выплочвалі грашовыя павіннасці на суму 9484,4 зл. ці 34,6 зл. на адзін двор. Азначаныя выплаты падзяляліся на падарожчыну – 1465 зл., чынш – 1740 зл., зямяншчыну – 2754 зл., даніну – 322 зл. Зямяншчыну сяляне плацілі ўзамен паншчыны. Такім чынам, можна меркаваць, што на фальварках пушчанскія жыхары працавалі няшмат. Сяляне вёскі Берфты плацілі 1188 зл. зямяншчыны, ці 19,8 зл. на двор. Усяго ж берштаўцы выплочвалі 1901 зл. грашовых павіннасцей, што складала 29,2 зл. на двор ці дым.

Паводле інвентара 1844 г. жыхары Берштаў плацілі ў год 29,1 руб. чыншу і 78,6 руб. падарожчыны, што складала 1,9 руб. на адзін двор[161]. У інвентары не адзначана, ці выплочвалі сяляне зямяншчыну замест паншчыны.

Апроч феадальных павіннасцей за карыстанне казённай зямлёй жыхары пушчанскіх вёсак уносілі ў павятовае казначэйства таксама дзяржаўны падушны падатак. Так, у 1816 г. сяляне Гарадзенскай пушчы плацілі на карысць дзяржавы 2499 рублёў асігнацыямі, ці ў разліку на мужчынскую рэвізскую душу – 3 рублі. Лясная варта, ці інакш – палясоўшчыкі, плацілі 882 рублі, таксама па 3 рублі з душы[162]. Але недабор падаткаў быў з'явай вельмі частай. Пры пераводзе на аброк у 1850 г. , як вынікае з дадзеных казённай палаты, недабор дзяржаўных падаткаў

[160] НГАБ у Гародні, ф. 1143, воп. 1, ад.з. 50.
[161] Тамсама, ад.з. 51.
[162] Тамсама, ф. 24, воп. 7, ад.з. 31.

складаў па Берштаўскаму маёнтку 5629,5 рублёў, а агульных земскіх павіннасцей – 2005 рублёў[163]. Прычым часта дзяржаўная адміністрацыя мусіла спісваць гэты недабор з прычыны немагчымасці яго спагнаць.

Падчас пераводу маёнтка Бершты з гаспадарчага кіравання на аброк у 1850 г. апошні быў установулены з усіх вёсак маёнтка ў памеры 1673,5 руб., што складала 5,1 руб. на 1 двор. З вёскі Бершты аброк быў вызначаны ў памеры 430,35 руб. Сума яго вылічвалася на аснове мяркуемых прыбыткаў, што павінны былі прынесці аддадзеныя сялянам у карыстанне землі. Напрыклад, дзесяціна ворыўнай пасрэднай зямлі па падліках чыноўнікаў давала ўраджай азімага жыта 2 чвэрці 5 чэкаў. Кошт чвэрці жыта быў установулены ў памеры 2 руб. Такім чынам, даход з дзесяціны азімага жыта складаў 5,25 руб., яравога – 3,34 руб., а за тры гады пры трохпольнай сістэме – 9 руб.18 кап. У выніку гадавы даход з такой зямлі ўстанаўліваўся ў памеры 3 руб. 6 кап., а падатак дзяржаве – 1 руб. 2 кап. Па такой жа сістэме разлічваўся падатак з астатніх земляў – сядзібных, пераложных, сенакосаў і пашы. Але звычайна гэтыя разлікі перавышалі рэальныя даходы сялян са сваіх участкаў, што прадвызначала ў будучым хранічныя недаборы падаткаў.

Трэба адзначыць, што напярэдадні 1850 г. маёнтак Бершты знаходзіўся ў арэндным валоданні памешчыка з Сакольскага павета Імбры, які плаціў у казну 1715 руб. штогод. Паводле часовага аброчнага інвентара даход з маёнтка складаў 2950 руб. За выняткам 601 руб. віннай пошліны і 578 руб. грамадскага збору чысты прыбытак мусіў дасягаць 1831,5 руб. А ўвесь прыбытак ад маёнтка афіцыйна ацэньваўся сумай 1895 руб.[164] “Вакантныя” землі былі аддадзены ў 1850 г. у арэнду таму ж Імбры за 85 руб. у год па 1855 г. Ён жа ўзяў у арэнднае карыстанне 17 корчмаў маёнтка з гадавым даходам 462 руб., млын, жалезавытворчы завод і рыбныя ловы.

Як вынікае з архіўных матэрыялаў, сяляне Гарадзенскага лясніцтва былі пераведзены з гаспадарчага становішча на аброчнае 12 красавіка 1850 г. За 7 месяцаў 1850 г. сяляне Берштаўскай грамады заплацілі ў казну 900,5 руб. аброку. За 1851 г. сума гэтая дасягнула 1265 руб. Заможныя сяляне выплочвалі па 7 руб. 25 кап., а агароднікі і бабылі – па 2 руб. серабром. Апроч таго, сяляне плацілі дзяржаве падушны падатак. Паводле акладнога ліста палаты дзяржаўных маёмасцей, насельніцтва казённага маёнтка Бершты разам з лясной вартай складала на той час 1768 мужчынскіх душ. Падушны падатак дасягаў 1988 руб., ці 1 руб. 12,5 кап. з рэвізскай душы. Такім чынам, калі сярэдняя сялянская сям’я налічвала 5 мужчын, падушны падатак дасягаў амаль 5,5 руб. Дадаўшы сюды пазямельны збор, атрымаем суму 12-13 руб., заплаціць якую было зусім няпроста.

У 1852-53 гг. чыноўнікамі палаты дзяржаўных маёмасцей у маёнтку была праведзена люстрацыя[165]. Згодна з часовым аброчным інвентаром сялянскія двары падзяляліся на наступныя разрады: 212 цяглых, 93 паўцяглых, 34 агародных і 10 бабылёў. На момант правядзення люстрацыі цяглых двароў налічвалася ўжо ўсяго 161, паўцяглых – 186, агародных – 4 і бабылёў – 35. Гэтыя лічбы сведчаць аб збядненні сялян і нежаданні многіх з іх выконваць павіннасці за поўны цяглы надзел зямлі. У выніку люстрацыі прадугледжвалася “для уравнительного

[163] Тамсама, ф. 1143, воп. 1, ад.з. 52.2.????
[164] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 856, арк. 27.
[165] Тамсама.

наделения крестьян” утварыць 236 поўных і 109 палавінных зямельных участкаў. Павіннасці сялян маёнтку новы інвентар вызначаў наступным чынам: за сядзібныя землі – 223 руб., за ворыва і сенакосы – 1212 руб., за землі “требующие улучшения” – 129 руб., за пашу – 25 руб. Агульная сума грашовых павіннасцей за зямлю склала 1591 руб. На 28 беззямельных агароднікаў і бабылёў быў накладзены асабісты аброк па 1 руб. 50 кап., што ў суме склала 51 руб. Усе разам павіннасці дасягнулі такім чынам 1642 руб. На поўную сялянскую гаспадарку сярэдні аброк складаў 5 руб. 77 кап., а на адну рэвізскую душу – 1 руб. 4 кап. Звыш таго, кожны сялянскі двор мусіў адпрацаваць у год 6 будаўнічых дзён і ссыпаць у запасны хлебны магазін пэўны аб’ём яравога і азімага зерня.

Вынікі люстрацыі ацэньваліся дзяржаўнымі чыноўнікамі наступным чынам:

а) сяляне атрымалі зямлі на 3019,78 дз. болей, чым мелі раней;

б) павіннасці зменшыліся на 202,5 руб.;

в) чысты прыбытак з маёнтка вырас на 788 руб. альбо на 40% адносна арэнднага інвентара і на 813 руб. ці на 42% адносна часовага аброчнага.

Высновa аб змяншэнні павіннасцей сялян не адпавядала рэальнасці, паколькі грашовыя выплаты казне ў параўнанні з фактычным станам рэчаў напярэдадні люстрацыі выраслі. І даволі імклівы рост павіннасцей, прынамсі паводле гаспадарчых дакументаў, назіраўся ў наступныя гады. Аб гэтым сведчыць параўнанне дадзеных люстрацыі 1853 г. і паверкі 1859 г.[166] Пазямельны аброк у 1853 г. складаў па маёнтку Берпты 1565,5 руб., а ў 1859 г. – 3116 руб. Такім чынам, рост грашовых выплат дасягнуў 1551 руб., ці амаль 100%. З аднаго цяглага ўчастка зямлі аброк вырас з 5,5 да 11,5 руб., а з адной рэвізскай душы ад 99 кап. да 2 руб. 62 кап. Такім чынам, у разліку з адной рэвізскай душы пазямельны аброк павялічыўся амаль у тры разы. Асабісты аброк па ўсяму маёнтку таксама вырас ад 51 руб. да 70 руб. 50 кап. Пасля правядзення праверачнай люстрацыі галоўны люстратар, разумеючы нерэальнасць спагнаць азначаную суму, нават прапанаваў зменшыць грашовыя выплаты сялян маёнтку Берпты на 45%. Агульная сума пазямельнага аброку пасля гэтага склала 1714 руб., што на 148 руб. усё роўна перавышала паказчык 1853 г. З цяглага ўчастка аброк склаў 6 руб. 15 кап., што было на 62 капейкі больш, чым у 1853 г., а з рэвізскай душы – 1 руб. 44 кап. ці на 45 капеек больш, чым у 1853 г.

Наколькі цяжкімі былі для берштаўскіх сялян гэтыя павіннасці? Паводле Мікалая Улашчыка, працоўны дзень селяніна з канём ацэньваўся ў той час у Гарадзенскай губерні ад 30 да 50 капеек[167]. Такім чынам, каб выплаціць 11 рублёў у год, мужчыны адной сям’і мусілі адпрацаваць 22-30 працоўных дзён з канём ці парай валоў. Аднак неабходна падкрэсліць абстрактнасць нашых разважанняў. Праблема заключалася ў тым, як зарабіць гэтыя грошы, паколькі зерневая гаспадарка ў Берштах была развіта вельмі слаба і не патрабавала шмат наёмнай рабочай сілы. Патрэбна было выходзіць на гарадскі рынак, дзе кошт чвэрці жыта па Гарадзенскай губерні вагаўся ў 50-х гадах 19 ст. ад 4 да 10 рублёў. Карова каштавала 15-18 руб.

Звычайна жыхары пушчы зараблялі грошы на выплату падаткаў з дапамогай лясных промыслаў. Архіўныя матэрыялы сведчаць, што ў 1846 г. берштаўскія

[166] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 1218.

[167] Улащик Н.Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. Минск, 1965. С. 347.

сяляне, каб пакрыць недабор падаткаў, заключылі кантракт з гарадзенскімі яўрэямі на сплаў да Гародні 300 штук будаўнічага лесу і 300 сажняў дроў[168]. І хутчэй за ўсё такія заробкі былі рэгулярнымі.

Так ці інакш, але пушчанскія сяляне былі не ў стане спраўна выплочваць падаткі дзяржаўнай казне. У галодныя 1855-56 гг. недабор падаткаў склаў па вёсцы Бершты 424,5 руб. У 1859 г. да гэтай лічбы дадаліся яшчэ 394 руб., што ў суме склала 819 руб.[169] У некаторых сем'ях недабор аброчных выплат дасягаў 7 рублёў.

У 1869 г. сяляне Берштаўскай воласці, якая цалкам супадала з памерамі ранейшай сельскай грамады, плацілі ў казну 2671 руб.[170] Аднак гэтая сума ўсё ж была меншай, чым напярэдадні паверачнай люстрацыі 1859 г. – 3117 руб. Такім чынам, можна гаварыць аб некаторым змяншэнні падатковага ціску на працягу 60-ых гадоў 19 ст., тым болей, што насельніцтва за 10 гадоў вырасла ад 1205 да 1882 душ (Табліца 2.).

**Табліца 2.**
**Грашовыя павіннасці за карыстанне зямлёй сялян вёскі Бершты ў 19 ст. (у руб. серабром)**

| | 1815 г. | 1844 г**. | 1850 г. | 1853 г. | 1859 г. | 1869 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Агульная сума | 292,5* | 107,7 | 430,35 | - | - | 576,3 |
| На двор | 4,9* | 1,9 | 6,2 | 5,51*** | 11,15*** | 5,9 |
| На муж. рэв. душу | 1,6* | 0,33 | 1,17 | 0,99*** | 2,62*** | 1,3 |

*пералічана са злотых у разліку 1 руб. серабром за 6,5 зл.
** не ўлічвалася зямяншчына.
***браўся сярэдні паказчык па ўсёй Берштаўскай грамадзе.
Крыніцы: НГАБ у Гародні, ф.31, воп. 2, ад.з. 2410; ф.31, воп. 2, ад.з. 1218; ф.31, воп. 2, ад.з. 856; ф. 31, воп. 2, ад.з. 1218; ф. 1143, воп. 1, ад.з. 50; ф. 1143, в. 1, ад.з. 51; ф. 1143, воп. 1, ад.з. 52.

Магчыма змены ў падатковай палітыцы ўрада былі выкліканы і палітычнымі прычынамі – паўстаннем 1863 г. і страхам царскіх уладаў перад масавымі сялянскімі выступленнямі. Паводле люстрацыі 1869 г. сяляне вёскі Бершты плацілі ў казну 576 руб. У пераліку на рэвізскую душу гэта складала 1 руб. 31 кап., на 1 двор – 5 руб. 88 кап. Найбольшы падатак у вёсцы Бершты плаціла сям'я Франца Будзькі (8 рэвізскіх душ ) – 8 руб. 40 кап. і Юры Токця (8 рэвізскіх душ ) – 8 руб. 38 кап. Пазямельны падатак сям'і Івана Павайба з урочышча Краснае (16 рэвізскіх душ) дасягаў аж 17 руб. 15 кап. А найбольшы памер падатку ў разліку на

[168] НГАБ у Гародні, ф. 1, воп. 2, ад.з. 524, арк. 36.
[169] Тамсама, ф. 31, воп. 2, ад.з. 24, арк. 17.
[170] Тамсама, ф. 31, воп. 2, ад.з. 2140, арк. 4.

адну рэвізскую душу выплочвала сям'я Траяновічаў (6 рэвізскіх душ) з літоўскай вёскі Кабялі – 11 руб. 88 кап.

Пра развіццё **гаспадаркі, маёмаснае становішча і асаблівасці побыту** пушчанскіх сялян у 19 ст. звестак у архіўных матэрыялах, на жаль, няшмат. Аднак і тое, што захавалася, дазваляе скласці пэўную карціну аб гаспадарчым і грамадска-сацыяльным жыцці пушчанскіх жыхароў у тыя часы. Найбольш падрабязныя звесткі ўтрымліваў першы аброчны інвентар 1850 г. Станоўчыя і адмоўныя бакі гаспадаркі пушчанскіх вёсак у гэтым дакуменце ацэньваліся так: "Выгоды имения составляют большое количество леса и близкое разстояние оного – к неудобствам следует отнести худую почву земли и отдаленность таковой в мелких участках по лесам состоящих, которых по неплодородию своему обделывают перелогами большое пространство, а в том числе и лесного ведомства за особо платимый оброк". І далей: "Поля разделяются по качеству, тощия, песчаныя, на восем смен, прочия на три смены, обрабатываются обыкновенною сохою – с упряжью волов и деревянною бороною в одну лошадь, которой однакож на тощей песчаной земле не употребляют – засеваются предпочтительно ржою и гречихою – а на лучших землях овсом"[171]. Не вельмі добра складальнік інвентара характаразаваў саміх сялян: "Замечательнейшие пороки крестьян суть беспечность и леность".

Паводле інвентара 1852-53 гг., становішча сялян маёнтка Бершты таксама ацэньвалася як "менее, чем посредственное"[172]. Галоўнымі недахопамі маёнтка, на думку дзяржаўных чыноўнікаў, з'яўляліся: неўраджайнасць земляў, пашкоджанне агародаў і лепшых палёў сыпучымі пяскамі, знясільванне ворыва, аддаленасць ад рынкаў збыту. Галоўнымі выгодамі былі багацце лясоў і лугоў.

Паказчыкам энергазабяспечанасці сялянскай гаспадаркі была наяўнасць хатняй жывёлы, найперш рабочай. Паводле інвентара 1815 г., у вёсках Берштаўскай пушчы налічвалася 139 коней (прыкладна 1 на 2 двары), 505 валоў (прыкладна па 2 на двор), 289 кароў (1 на двор), 287 цялушак (1 на двор), 652 авечкі (2-3 на двор), 459 свіней (1-2 на двор)[173]. Натуральна, што ў гэты час гаспадарка сялян яшчэ не залячыла стратаў вайны 1812 г. У 1844 г. забеспячэнне сялян жывёлай выглядае значна лепш: коней – 235 (1 на двор), валоў – 706 (3 на двор), кароў – 403 ( амаль па 2 на двор), цялушак – 323 (1-2 на двор), авечак – 785 (па 3 на двор), свіней – 459 (па 2 на двор). Апроч гэтага сяляне пушчы ў 1844 г. мелі 31 пчаліную борць[174].

У 1850 г. на абшарах пушчы, як ужо гаварылася вышэй, былі праведзены пэўныя тэрытарыяльна-адміністрацыйныя змены. Разам з арганізацыяй сялянскага самакіравання былі ўтвораны тры сельскія грамады, самай вялікай з якіх была Берштаўская. Паводле інвентара 1850 г. сяляне гэтай грамады мелі: коней – 225 (прыкладна 1 на 2 двары), валоў – 646 (па 2 на двор), кароў – 523 (1-2 на двор), дробнай жывёлы – 1694 (па 5 галоў на двор), борцяў – 129[175]. Такім чынам, назіраецца пэўнае пагаршэнне паказчыкаў забяспечанасці хатняй жывёлай у параўнанні з дадзенымі за 1844 г. Гэта было абумоўлена тым, што некалькі

---

[171] НГАБ у Гародні, ф. 1143, вјg. 1, ад.з. 52, арк.1адв.
[172] НГАБ у Гародні, ф. 21, воп. 2, ад.з. 856, арк. 23.
[173] Тамсама, ф. 1143, воп. 1, ад.з. 50, арк. 38-39.
[174] Тамсама, воп. 1, ад.з. 51, арк. 81-82.
[175] Тамсама, воп. 1, ад.з. 52, арк. 8-33.

найбольш багатых пушчанскіх вёсак не ўвайшлі ў Берштаўскую грамаду. У час правядзення люстрацыі 1853 г. рабочай жывёлы ў сялян маёнтка налічвалася 832 галавы. У разліку на сялянскія цяглыя і паўцяглыя двары гэта складала ў сярэднім 2-3 галавы на двор. Усяго ж хатняй жывёлы налічвалася 3186 галоў або ў сярэднім 12 галоў на двор.

Па выніках рэвізіі 1853 г. люстратар для паляпшэння гаспадарчага стану маёнтка прапанаваў наступнае: 1) перабудаваць корчмы і шынкі, знесці млын; 2) аднавіць жалезавытворчы завод; 3) пабудаваць новы будынак сельскай управы; 4) знесці большасць былых фальварачных пабудоў; 5) дзеля лепшага ўладкавання вёсак прызначыць новае размяшчэнне сядзібаў і паступовую забудову на іх жылых і гаспадарчых пабудоў згодна планам і прыгаворам сялян; 6) засадзіць вербамі сыпучыя пяскі; 7) скласці праект абмену церазпалосных зямель з суседнімі памешчыкамі; 8) выселіць 5 двароў сялян з малазаселеных вёсак[176].

Але наступныя гады прынеслі жыхарам Берштаў не паляпшэнне гаспадарчага становішча, а сапраўдную катастрофу. Яскравай выявай гэтага стала істотнае скарачэнне насельніцтва. Калі ў 1853 г. у маёнтку налічваліся 1573 рэвізскія душы мужчынскага полу, дык у 1859 г. – 1187. Таксама скарацілася і колькасць жаночых душ – ад 1634 да 1310. Колькасць цяглых сялянскіх двароў зменшылася з 212 да 174. Колькасць галоў рабочай жывёлы скарацілася з 832 да 707, буйной рагатай жывёлы (кароў) - з 734 да 660, дробнай жывёлы – з 1620 да 772[177].

Што ж сталася з пушчанскімі сялянамі за гэтыя гады? Часткова адказ мы можам знайсці ў матэрыялах люстрацыі Берштаў за 1859-1869 гг.[178] У гэтай архіўнай справе прыведзены дадзеныя пра ўраджаі азімага хлеба ў канцы 40-х і 50-х г. 19 ст.(Табліца 3.) Яны сведчаць пра катастрафічнае скарачэнне плошчы пасеваў і падзенне ўраджайнасці пачынаючы з 1854 г. У 1848-1850 гг. ураджайнасць у Берштах складала сам-4, што было вышэй за сярэдні паказчык па ўсёй Беларусі. Але з 1851 г. пачынаецца зніжэнне. У 1855-1856 гг. ураджай складаў сам-1, а плошча пасеваў скарацілася больш, чым удвая. Гэта значыць, што сяляне ў гэты год сабралі з палеткаў збожжа столькі ж, колькі і пасеялі вясной. Цікава, што пагаршэнне гаспадарчай сітуацыі супала з адменай паншчыны, якая, праўда, не была ў Берштах асабліва вялікай. Тым не менш, у 1850 г. сяляне Берштаўскай пушчы атрымалі большую свабоду ў вырашэнні сваіх праблем і самі, а не арандатар, неслі адказнасць за выплату падаткаў дзяржаўнай казне. Але атрыманне гэтай свабоды, як мы ўжо адначылі, супала з пагаршэннем гаспадарчай сітуацыі, што з’яўляецца нетыповым прыкладам у святле высноў беларускай гістарыяграфіі гэтай праблемы.

---

[176] Тамсама, ф. 21, воп. 2, ад.з. 856, арк. 25адв.
[177] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 1218, арк. 6адв.
[178] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 2410.

**Табліца 3.**
**Зборы азімага хлеба ў вёсках Берштаўскай грамады ў 1847-1858 гг.**

| Год | Пасяўная плошча(дз.) | Збор (у чвэрцях) | Ураджай |
|---|---|---|---|
| 1847 | 1300 | 991 | сам-3 |
| 1848 | 1303 | 1129 | сам-4 |
| 1849 | 1306 | 977 | сам-4 |
| 1850 | 1313 | 977 | сам-4 |
| 1851 | 1298 | 970 | сам-3 |
| 1852 | 1338 | 1159 | сам-3 |
| 1853 | 1343 | 1163 | сам-3 |
| 1854 | 1258 | 1092 | сам-2 |
| 1855 | 500 | 422 | сам-1 |
| 1856 | 685 | 568 | сам-1 |
| 1857 | 862 | 611 | сам-2 |
| 1858 | 874 | 622 | сам-2 |

Крыніца: НГАБ у Гародні, ф.31, воп.2, ад.з. 2410.

Святло на прычыны гэтай "нетыповасці" пралівае адна з архіўных спраў канцылярыі гарадзенскага губернатара. Да начальніка Гарадзенскай губерні ўвосень 1854 г. дайшлі чуткі, "что в казенной деревне Бершты по нерадению старшины Ханевича и писаря Кригера крестьяне не имели вовсе хлеба и питались липовою корою и папоротником и что в этой деревне умерли от голода около ста человек"[179]. Начальнік губерні даў загад чыноўнікам праверыць звесткі. У кастрычніку 1854 г. засядальнік губернскай палаты крымінальнага суда Наглоўскі паведамляў губернатару: "Прибыл я в эту деревню под другим предлогом, спрашивал между прочим многих крестьян, каковы урожаи у них в нынешнем году, будет ли достаточно хлеба до нового урожая, не терпели ли они в прошлом году голода и прочее. На таковые вопросы все согласно отвечали, что в прошедшее лето они терпели большой недостаток в продовольствии, что собирали известные им питательные травы и древесную кору, толкли её и примешивая к муке пекли хлеб и этим питались, что действительно в одной деревне Бершты умерло до ста человек от разных болезней, лихорадки, горячки и холеры, продолжавшихся у них более двух месяцев, что урожая нынешнего недостаточно до нового хлеба, и что они в предыдущее лето ожидают такого же недостатка как и в прошедшее"[180].

У маі 1855 г. тлумачальную запіску аб прычынах цяжкага становішча берштаўскіх сялян даслаў віленскаму генерал-губернатару старшыня палаты дзяржаўных маёмасцей Кажэўнікаў: "Крестьяне Берштовского и Соболянского обществ поселенные с давнего времени среди лесов Гродненской пущи имеют

[179] НГАБ у Гародні, ф. 1, воа. 28, ад.з. 584, арк. 1.
[180] Тамсама, арк. 2адв.

земли самые бесплодные, песчаныя, тощия, и местами низменныя, болотистыя, первоначально быт их поддерживался не хлебопашеством, которое не могло их обеспечить, но самовольными расчистками леса, контрабандою и разведением хмеля, две первые промышленности, как незаконные, мерами строгости и бдительности прекращены, разведение же хмеля значительно уменшилось само собою, по случаю упадка и сокращения винокурения. Эти промыслы привязали крестьян к неблагодарной почве, доставшейся им в удел; для увеличения нормы надела угодиями, по люстрации предложено было им назначить выселение, по нескольку семейств из каждого селения, что и они признали необходимым, но как правительству неугодно было ссудить выселяющихся денежным пособием, то они по своей малозажиточности не могли на это решиться и за тем переселение не возымело действия... по люстрации крестьяне были наделены землёй по удвоенной пропорции, но и этого мало. Палата государственных имуществ составила особый проект и запросила ссуду на выселение 150 семейств"[181].

Па заключэнні палаты дзяржаўных маёмасцей насельніцтва вёскі Берштьі на гэты момант налічвала 85 двароў, 391 душу мужчынскага полу і 424 жаночага: "Убыль 100 душ происходила в течение двух лет, в 1853 г. они (сяляне – *С.Т.*) кроме лихорадки и горячки поражены были и холерою, а в 1854 г. повсеместный тифус оставил у них следы своей свирепости"[182]. Прадстаўнікі палаты дзяржаўных маёмасцей сцвярджалі, што імі былі прыняты ўсе меры для ратавання сялян ад голаду: апошнім быў выдадзены ўвесь хлеб з запаснога хлебнага магазіна і таксама падзвезена зерне з суседніх вёсак і сельскіх грамадаў дзяржаўных сялян. Палата таксама абараняла служачых сялянскага самакіравання: "сельский старшына Ханевич принадлежащий к лучшим хозяевам всего общества по порядочному образу жизни, трезвому поведению и усердной заботливости пользуется уважением крестьян... а сельский писарь при распорядительности Ханевича никакого веса и тем менее власти не имеет"[183].

Такім чынам, з дадзенай архіўнай справы вынікае, што вялікую ролю ў жыцці берштаўскіх сялян адыгрывалі ў першай палове 19 ст. розныя промыслы, найперш лясныя, а таксама заняткі кантрабандай. Узмацненне дзяржаўнага апарату, утварэнне палаты дзяржаўных маёмасцей і яе акруговых упраўленняў, прывяло да ўзмацнення кантролю за дзейнасцю сялян і абмежавала іх незаконныя, з пункту гледжання дзяржавы, заняткі. Апроч таго, як ужо гаварылася вышэй, пасля пераводу на аброк пачалі хутка расці грашовыя павіннасці. Магчыма, што ўсё гэта разам аслабіла жыццёвыя рэсурсы лясных вёсак і неўраджай сярэдзіны 50-х гадоў, які выклікаў успышку эпідэмічных захворванняў, агульную дарэчы для ўсёй Усходняй Еўропы, забраў жыцці мноства сялян, пераважна дзяцей.

Важнай крыніцай прыбыткаў ад Берштаўскага маёнтка з'яўляліся рыбныя ловы. Тут налічвалася 20 азёр. Паводле інвентара 1853 г. яны прыносілі ў год 174 рублі[184]. Са студзеня 1857 г. рыбныя ловы былі перададзены сялянам. Але ў жніўні 1858 г. берштаўскае сельскае ўпраўленне скардзілася губернскім уладам, што палавінаю азёр Матора і Карп карыстаюцца яўрэй Берка і ксёндз

[181] Тамсама, арк. 9адв-10.
[182] Тамсама, арк. 11адв.
[183] Тамсама, арк. 7адв.
[184] НГАБ у Гародні, ф. 1, воп. 2, адз. 2409.

Навадворскага касцёла Райцэвіч, у той час, як падатак за гэтыя азёры выплочваюць сяляне[185].

У Гарадзенскай пушчы здаўна жыхары займаліся выплаўкай балотнай руды і вытворчасцю жалезных прыладаў працы. На пачатку 19 ст. рудаплавільным промыслам яшчэ працягвалі займацца сяляне вёсак Старая і Новая Руда, якія плацілі за гэта асобы падатак. Аднак канкурэнцыя з боку фабрычных вырабаў паступова прыводзіла да заняпаду жалезаробчай справы. Паводле люстрацыі 1853 г., ужо толькі ў суседняй з Берштамі вёсцы Новая Руда значыўся жалезавытворчы завод, які прыносіў у год 30 руб.[186] Пасля правядзення люстрацыі завод гэты быў перададзены ў арэнду памешчыку Імбры за 10 руб. у год. Але на самай справе завод ужо не працаваў. У лістападзе 1857 г. сяляне Новай Руды пісалі ўпраўляючаму палаты дзяржаўных маёмасцей Кажэўнікаву: “... в деревне нашей Новой Руде находился было кузнечный завод на реке, к которому принадлежало 9 уволок земли пахотной, за что платилось в доход казны аренды 64 руб. серебром 50 кап. В настоящее время кузня разрушилась, чтобы одновить нужно 500 руб., работа в ней 5 лет уже не проводится”[187].

Паўстанне 1863 г. прымусіла царскую ўладу ўнесці карэктывы ў палітыку адносна беларускага сялянства. У выніку рэалізацыі палажэнняў аграрнай рэформы сяляне Беларусі палепшылі сваё становішча. Гэта датычыла ў пэўнай ступені і дзяржаўных сялян, хаця яны былі вызвалены ад паншчыны і атрымалі саслоўнае самакіраванне раней, чым прыватнаўласніцкія. Дадзеныя люстрацыі 1869 г. сведчылі аб паляпшэнні ў цэлым зямельнага і матэрыяльнага становішча берштаўскіх сялян. Гэта пацвярджаецца і даволі істотным павелічэннем колькасці насельніцтва.

Пра жытло і гаспадарчыя пабудовы жыхароў Берштаў і навакольных вёсак захаваліся нешматлікія звесткі. Паводле інвентара 1850 г. у сялян Берштаўскага маёнтка налічвалася 331 жылая пабудова ( 1 на двор) і 1049 гаспадарчых (3 на двор)[188]. У верасні 1863 г. у селяніна Берштаў Франца Будзькі ад коміну адбыўся пажар, у выніку ягога ў гэтага гаспадара, а таксама ў суседзяў – Лаўрэна Ханевіча і Юрыя Токця згарэлі хаты і амбары, у Хрыстафора Вераб’я – хата, а ў Хрыстафора Русілкі – амбар. Агульная сума страт склала паводле падлікаў дзяржаўных чыноўнікаў 1012 рублёў. Палата дзяржаўных маёмасцей выдала сялянам 290 руб., а таксама па 20 будаўнічых бярвенняў і 15 жэрдак на будоўлю. У дапамогу пагарэльцам быў прызначаны шарварак[189].

У студзені 1863 г. ад невядомай прычыны адбыўся таксама пажар у селяніна вёскі Зубрава Якуба Сакалоўскага, ў выніку якога згарэў хлеў з жывёлай. Страты склалі 20 руб., а палата выплаціла пагарэльцу толькі 8[190].

Нягледзячы на невысокі ўзровень гаспадаркі, сяляне Гарадзенскай пушчы тым не менш падтрымлівалі непасрэдныя **сувязі з рынкам** і актыўна займаліся **лясным промысламі.** Адным з найбольш пашыраных спосабаў заробку для іх быў сплаў лесу. У 1846 г. берштаўскія сяляне сплавілі куплены прадпрымальнікам

[185] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 858, арк. 100.
[186] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 856, арк. 25адв.
[187] Тамсама, арк. 73.
[188] НГАБ у Гародні, ф. 1143, воп. 1, ад.з. 52, арк. 8-33.
[189] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 4, ад.з. 31, арк. 1.
[190] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 4, ад.з. 21.

Мендзелем Собалем лес у Гародню. М.Собаль разам з яўрэям з Вільні Борухам Рындзюнскім у 1833 г. заключыў кантракт на пабудову ў Гародні казармы для расійскага войска. Для выпальвання цэглы даверааны чалавек М.Собаля Берка Флет купіў у Гарадзенскім лясніцтве лес і заключыў кантракт з берштаўскімі сялянамі на суму 314 руб., каб сплавіць па рацэ Котры яго ў Гародню[191]. Аднак пазней Мендзель Собаль адмовіўся плаціць сялянам па кантракту нібыта з прычыны адсутнасці свайго даверанага Ноткі Рындзюнскага, у ягога знаходзіліся рахункі. З рапарта гарадской паліцыі ад 3 траўня 1850 г. вынікала, што Мендзель Собаль ужо сцвярджаў, быццам ён увогуле не меў ніякіх спраў з берштаўскімі сялянамі і Рындзюнскі не быў яго даверанай асобай. Чыноўнікі палаты дзяржаўных маёмасцей ў сваю чаргу сцвярджалі, што Собаль неаднаразова заяўляў у прысутнасці сялян і служачага палаты аб сваёй гатоўнасці расплаціцца. Потым Собаль раптам абвясціў, што сяляне не выканалі ўмовы кантракта і з'ехаў па сваіх справах у Санкт-Пецярбург. Па загаду губернатара гарадзенская паліцыя спагнала ўсё ж такі 307 рублёў на карысць берштаўцаў з Беркі Флета, які і падпісваў той кантракт з сялянамі. Тады яўрэйскія прадпрымальнікі звярнуліся са скаргай у вышэйшую судовую ўстанову Расійскай імперыі, у Сенат. У студзені і чэрвені 1952 г. там двойчы разглядалася гэтая справа. Сенат прыняў рашэнне, што губернскія ўлады незаконна спагналі грошы з купцоў і рэкамендаваў перадаць справу на разгляд у губернскія судовыя ўстановы. Чым усё гэта завяршылася з архіўных дакументаў невядома. Аднак, відавочна, што зарабляць грошы ляснымі і іншымі промысламі сялянам было даволі няпроста з прычыны іх непісьменнасці і недасведчанасці ў судовых і бюракратычных справах.

У выніку рэалізацыі палажэнняў рэформы казённай вёскі дзяржаўныя сяляне Гарадзенскай пушчы былі арганізаваны ў грамады і атрымалі права на ўласнае **сялянскае самакіраванне,** на якое ўскладалася вырашэнне самых розных пытанняў мясцовага жыцця, у т.л. спрэчак і цяжбаў паміж сялянамі. Тэрытарыяльна грамады звычайна супадалі з казённымі маёнткамі. На сходах гаспадароў сяляне выбіралі са свайго асяроддзя старшыню, сельскіх старастаў, суддзяў і зборшчыкаў падаткаў. Трэба адзначыць, што і раней ў казённых вёсках былі войты, солтысы, баснякі, якія прызначаліся звычайна ўпраўляючымі маёнткаў. Але і пасля рэформы выбарныя асобы падпадалі пад поўны кантроль дзяржаўных чыноўнікаў, што аднак не перашкаджала ім часта выкарыстоўваць свае пасады дзеля ўласнага ўзбагачэння.

У красавіку 1851 г. некаторыя берштаўскія жыхары скардзіліся ў палату дзяржаўных маёмасцей, а таксама губернатару на сваё выбарнае сельскае начальства – старшыню Канстанціна Ханевіча, зборшчыка падаткаў Казіміра Ушкевіча і пісара Крыгера[192]. Выконваючы абавязкі гарадзенскага губернатара Сымон Парай-Леанткоўскі прызначыў следства па гэтай справе. Паводле паказанняў сялян палясоўшчык Казімір Ушкевіч спаганяў з іх падаткі і не заводзіў пры гэтым ніякіх рэгістраў: "... поэтому неизвестно с кого сколько взято"[193]. Часовае паліцэйскае судовае аддзяленне пастанавіла, каб кожны

[191] НГАБ у Гародні, ф. 1, воп. 21, ад.з. 1002, арк. 19-20.
[192] НГАБ у Гародні, ф.1, в.20, а.524, а.7адв.
[193] Тамсама, а.16.

гаспадар быў забяспечаны аркушам паперы, у які “акуратно” запісваў плату за палі і лугі. Казімір Ушкевіч быў адхілены ад пасады зборшчыка падаткаў.

У студзені 1852 г. берштаўскія сяляне Рыгор Васілевіч, Якаў Будзька і Фёдар Касцевіч ізноў скардзіліся на сваё сельскае начальства. Паводле іх скаргі ў 1841 г. Казіміру Ушкевічу і Фёдару Касцевічу былі аддадзены казённыя лугі ў арэнду за 462 руб. у год. Але гэтыя лугі прыняў адзін Казімір Ушкевіч і разам са старшынёй Ханевічам пакрываў арэндную плату за кошт казённых падаткаў. Навакольныя азёры былі аддадзены сельскім начальствам, паводле скаргі, у арэнду яўрэям без права лову для сялян. Яўрэі “с согласия старшины Ханевича запрещают крестьянам эту выгоду”. Сяляне таксама скардзіліся, што размешчаныя ў вёсках карчмы аддадзены ў арэнду яўрэям, а старшыня прымушае вяскоўцаў іх рамантаваць. За недабор падаткаў ён быццам бы выганяў сялян на розныя работы, але атрымліваючы за іх грошы, не ўносіў у казначэйства для пагашэння доўга. Апроч таго, сельскае начальства несправядліва, паводле скаргі, карала некаторых вяскоўцаў дубцамі.

Аднак вынікі расследавання, праведзенага дзяржаўнымі чыноўнікамі, былі на карысць сельскага кіравання. Яно тлумачылася тым, што ўсе аброчныя артыкулы Гарадзенскага лясніцтва 15 красавіка 1850 г. былі аддадзены ў арэнду памешчыку Імбры, які таксама ў сваю чаргу меў права аддаваць на водкуп трэцім асобам карчмы, млын, рыбныя ловы і іншыя аброчныя артыкулы. І на кожнае абвінавачванне сельскае начальства падавала свае тлумачэнні. Кіраўніцтва палаты дзяржаўных маёмасцяў палічыла іх дастаткова абгрунтаванымі і старшыня Ханевіч быў пакінуты на сваёй пасадзе.

У чэрвені 1852 г. сяляне Берштаў Іван Ушкевіч, Сямён і Міхал Сяргейчыкі, Фёдар Касцевіч і Лаўрэн Саковіч зноў пішуць скаргу з просьбай выдаліць яго і пісара Крыгера з пасады, а таксама прыслаць для правядзення следства жандарскага афіцэра і чыноўніка для асобых даручэнняў[194]. Дарэчы, Ханевіч займаў сваю пасаду з 1840 г. З тых архіўных дакументаў, што захаваліся па гэтай справе, цяжка высветліць, на чыім баку была праўда. Магчыма, выбухнуў канфлікт паміж вясковай беднатой і заможнай сялянскай вярхушкай (“багатырамі”), якія захапілі ўладу ў мясцовым кіраванні і імкнуліся перакласці цяжар павіннасцей на бяднейшую частку сялян. Яны карысталіся пры гэтым падтрымкай чыноўнікаў палаты дзяржаўных маёмасцей. Цікава, што сяляне, у большасці сваёй непісьменныя, карысталіся ў час судовых цяжбаў паслугамі адукаваных гараджан, якіх яны наймалі ў якасці перакладчыкаў. Праўда, асабістыя подпісы сялян на дакументах сведчаць пра тое, што некаторыя з іх умелі пісаць па-польску.

У 1861 г. у Расійскай імперыі была праведзена сялянская рэформа, паводле якой адмянялася прыгоннае права. Аднак для дзяржаўных сялян гэта не мела істотнага значэння. Больш істотны ўплыў на ўмовы жыцця жыхароў пушчы аказала, як мы ўжо адзначалі, **паўстанне 1863 г.** У Гарадзенскай губерні паўстанцамі кіраваў Канстанцін Каліноўскі, які на беларускай мове заклікаў мясцовых сялян падтрымаць паўстанне. У ваколіцах Берштаўскай пушчы дзейнічалі партызанскія атрады Лянкевіча і Нарбута. Да паўстанцаў далучыліся некаторыя сяляне Берштаўскай воласці. Так, 5 кастрычніка 1863 г. віленскі

---
[194] НГАБ у Гародні, ф.1, в.20, с.521, а.40-41.

генерал-губернатар граф Мураўёў загадаў выслаць у Астраханскую губерню разам з сем'ямі сялян вёскі Шумы Івана Сяргейчыка, Казіміра Гудачэўскага і Аўгуста Малевіча. Сяргейчык і Малевіч мелі поўныя зямельныя надзелы, а Гудачэўскі быў беззямельным бабылём. У вёсцы пасля гэтага засталося 8 сем'яў. Улады прызналі карысным пасяліць у Шумах "несколько семейств руских землепашцев"[195]. Аднак гэтая задумка так і не была рэалізаваная.

У 1864 г. былі выселены са сваёй вёскі сяляне Зубрава за тое, што быццам бы хавалі ў сябе паўстанцаў. Па даносу валаснога пісара Галецкага іх рассялілі ў розных вёсках Берштаўскай воласці. У лютым 1858 г. выселеныя зубраўскія сяляне звярнуліся з просьбай да гарадзенскага губернатара дазволіць ім вярнуцца ў родную вёску. Сваю віну яны адмаўлялі. Прашэнне падпісалі 11 гаспадароў: Міхал, два Сямёны, Ігнат і Іван Сяргейчыкі, Ігнат Грык, Андрэй Багдзевіч, Антон Мышкевіч, Варфаламей Сакалоўскі, Якаў Павядайка, Рыгор Швед і Сямён Мілінкевіч. Напісаў за сялян яго валасны фельчар Сысой Сладкоўскі, а за добрыя іх паводзіны паручыліся члены валаснога праўлення. Гарадзенскі губернатар паслаў запыт у Краснаярск з просьбай да Енісейскага губернскага праўлення прыслаць паказанні па гэтай справе палітычнага ссыльнага Якава Сакалоўскага, які разам з сям'ёй быў высланы з Берштаўскай воласці ў студзені 1864 г. Але гэтыя паказанні ў справе адсутнічалі і фінал яе нам невядомы.

Падчас паўстання ў пушчанскіх сялян была канфіскавана ўся агнястрэльная зброя. Гэта ў сваю чаргу прывяло да імклівага размнажэння ваўкоў. У кастрычніку 1863 г. палата дзяржаўных маёмасцей пісала гарадзенскаму губернатару: "Государственные крестьяне деревень, расположенных при Гродненской пуще, как то: Берштъ, Новой Руды, Глушнево, Кобель, Сухаров, Новоселок, Якубович, Пиловня, Зуброва, Замостян и Мотылей являясь в сельское правление жаловались что за отнятием у них ружей размножились в казённом лесу хищных зверей до той степени, что волки почти всякую ночь приходят в деревню, подкапываются под сараи и вытаскивают по несколько штук разного скота, а днем нападают на стада пасущегося рогатого скота, свиней, овец и лошадей, хватают добычу и уносят в лес, посему крестьяне не имея средств к истреблению волков и испытывая от них с каждым днём все более вреда, просят дозволить им приобрести хотя бы по три ружья на деревню, для ограждения их от причиняемых волками значительных убытков, как равно для обеспечения их к безопасному отбыванию ими ночных караулов при деревенских заставах"[196]. Рэакцыя гарадзенскага губернатара на гэтую просьбу таксама нам невядомая. Але, як бачым, забраўшы ў сялян зброю, царскія ўлады разам з тым прымушалі іх начамі вартаваць дарогі і затрымліваць паўстанцаў.

Такім чынам, на працягу 19 ст. у жыцці сялян Гарадзенскай пушчы адбыліся даволі значныя змены. Узмацніўся кантроль з боку дзяржавы за іх жыццём, што мела як станоўчыя, так і адмоўныя аспекты. Адмоўным было павелічэнне падатковага ціску, абмежаванне свабоды гаспадарчых дзеянняў у казённым лесе і г.д. Праўда, пад уздзеяннем падзей 1863 г. расійскі ўрад пайшоў на істотныя саступкі сялянству ў пытаннях землекарыстання і падаткаабкладання. Таксама станоўчым было наладжванне ў вёсках медыцынскай службы, арганізацыя

---

[195] НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 2409, арк. 107.

[196] НГАБ у Гародні, ф. 1, воп. 6, ад.з. 361, арк. 1

пачатковага школьніцтва і г.д. Ужо ў канцы 50-х гадоў у Берштаўскай сялянскай грамадзе працаваў фельчарскі пункт. Прыкладна ў 1862 г. была заснавана пачатковая школа, у якой выкладаў настаўнік Харлампові́ч. Іншымі словамі, дзяржава ў дадзеным выпадку выступала ў якасці інструмента мадэрнізацыі патрыярхальнага сялянскага грамадства пушчанскіх вёсак. Найбольш выразнымі праявамі наступстваў гэтай мадэрнізацыі былі паскораны дэмаграфічны рост насельніцтва (т.зв. дэмаграфічная трансфармацыя – *С.Т.*) і пэўнае паляпшэнне матэрыяльнага становішча сялянства.

**Дадатак.**
**Дэмаграфічныя змены ў вёсцы Берштыы на працягу XIX ст.**

| | 1795 | 1811 | 1815 | 1844 | 1850 | 1853 | 1859 | 1869 | 1896 | 1905 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Мужчын | 233 | 273 | 184 | 328 | 369 | 391 | 315 | 439 | 621 | - |
| Жанчын | - | - | 162 | 390 | 410 | 424 | - | - | 572 | - |
| Разам | - | - | 346 | 718 | 779 | 815 | - | - | 1223 | 1470 |
| Сем'яў | 66 | 66 | 62 | 81 | 78 | 85 | 85 | 106 | 173 | - |
| На сям'ю душ | - | - | 5,6 | 8,9 | 10 | 9,6 | - | - | 7 | - |

Крыніцы: НГАБ у Гародні, ф. 31, воп. 2, ад.з. 2410; ф.31, воп. 2, ад.з. 1218; ф. 31, воп. 2, ад.з. 856; ф. 31, воп. 2, ад.з. 1218; ф. 1143, воп. 1, ад.з. 50; ф.1143, воп. 1, ад.з. 51; ф. 1143, воп. 1, ад.з. 52.

KAMUNIKAT.org

## ДЫСКУСІЯ

### Да праблемы генезісу Вялікага Княства Літоўскага

Беларуская гістарычная навука сёння перажывае складаны этап станаўлення ўласнай нацыянальнай школы. Адметнасцю гэтага працэсу з'яўляецца тое, што ён праходзіць у неспрыяльных умовах крызісу сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Цяперашняя ўлада імкнецца змусіць гісторыкаў да абслугі ідэалагічных патрэбаў пануючага антыбеларускага па сваёй сутнасці рэжыму. Сярод гісторыкаў пазначыўся выразны падзел на тых, якія разглядаюць Беларусь як суб'ект уласнай гісторыі і тых, хто працуе на замову ўлады. Сітуацыя ўскладняецца тым, што абсалютная большасць гісторыкаў-прафесіяналаў занята ў дзяржаўных установах і так ці інакш залежыць ад улады. Акрамя таго ўсе мы родам з Савецкага Саюза. Спадчына савецкіх часоў дае пра сябе знаць мноствам састарэлых метадалагічных і ацэначных стэрэатыпаў, якімі перагружана гістарычная свядомасць беларускай нацыі.

Дыскусыйныя матэрыялы, змешчаныя ў гэтым нумары, датычацца адной з ключавых праблемаў беларускай гісторыі, менавіта, утварэння ВКЛ. Яны звязаны з палемікай, якая распачалася вакол працы Аляксандра Краўцэвіча "Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага" падчас абароны яе ў якасці доктарскай дысертацыі (афіцыйная назва дысертацыі "Вялікае Княства Літоўскае ў другой палове 13-пачатку 14 ст.: Генезіс дзяржавы па пісьмовых і археалагічных крыніцах") у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі 4 снежня 1998 г. Акрамя трох афіцыйных апанентаў (двое з іх ацанілі працу станоўча – С.Александровіч з Універсітэта імя Мікалая Каперніка ў Торуні і Я.Юхо з БДУ, адзін - Л.Побаль з Інстытута гісторыі НАН Беларусі – адмоўна) выступілі яшчэ сем вядомых гісторыкаў і археолагаў: М.Спірыдонаў, Л.Казлоў, В.Насевіч, Ю.Бохан, Г.Штыхаў, П.Лысенка, У.Палуян. Адны з іх падтрымалі станоўчую ацэнку працы (Л.Казлоў, Ю.Бохан, Г.Штыхаў), астатнія выступілі з рэзкай крытыкай.

Дыскусія працягнулася на старонках часопіса "Беларускі гістарычны агляд", дзе В.Насевіч апублікаваў крытычную рэцэнзію на названую працу (БГА, т. 5, сш. 1(8), с. 210-226), тэкст якой блізкі па змесце ягонаму выступу пад час абароны. У наступным нумары БГА быў змешчаны адказ А.Краўцэвіча і заключная рэпліка В.Насевіча (БГА, т. 5, сш. 2(9), с. 448-454 і 455-456).

Вядомы спецыяліст па гісторыі Беларусі часоў ВКЛ М.Спірыдонаў згадзіўся прадоўжыць дыскусію ў нашым часопісе і перадаў у рэдакцыю пісьмовы тэкст свайго выступу 4 снежня 1998 г. у Інстытуце гісторыі. Нам падаецца, што змест, аргументацыя апанентаў і сам характар спрэчкі па праблеме пачаткаў беларуска-літоўскага гаспадарства з'яўляецца ў нейкім сэнсе адлюстраваннем сённяшняга становішча беларускай гістарычнай навукі.

Матэрыялы пададзены ў наступным парадку: спачатку змешчаны тэкст даклада дысертанта на абароне, які ўяўляе сабой сціслы канспект манаграфіі, потым выступ-рэцэнзія М.Спірыдонава (з захаваннем аўтарскага стылю) і адказ на яе, падрыхтаваны А.Краўцэвічам.

**Д А К Л А Д**
**А.К.Краўцэвіча на пасяджэнні савета па абароне дысертацый 4 снежня 1998 г.**

На сённяшні дзень у свеце вядомыя дзве канцэпцыі ўтварэння ВКЛ. Першая, якую можна назваць яшчэ агульнапрынятай, сягае сваімі вытокамі ў легендарную частку беларуска-літоўскіх летапісаў 16 ст. Гэтая легенда, канчаткова афармленая ў першых дзесяцігоддзях 16 ст., апавядае пра рымскае паходжанне кіруючай у ВКЛ дынастыі, прадстаўнікі якой прыбылі да Нёмана з Рыма і пачалі кіраваць у Літве. Пазней яны занялі спустошаныя татарамі рускія землі, адбудавалі на іх гарады і паспяхова абаранілі ад татараў.

Навуковае афармленне названая канцэпцыя атрымала ў апошнія дзесяцігоддзі 19 ст. у працах расійскіх і польскіх даследчыкаў Уладзіміра Антановіча, Юлюша Ляткоўскага, Мацея Любаўскага і інш. Распрацаваная і дэталізаваная польскімі гісторыкамі ў міжваенны перыяд, найперш у працах Генрыка Пашкевіча і Генрыка Лаўмяньскага, гэтая канцэпцыя (т. зв. балцкая) была мадыфікаваная ў 50-я гады савецкім расійскім гісторыкам Уладзімірам Пашутам і дажыла да нашага часу, перацярпеўшы нязначныя змены.

Знамянальнай рысай гэтай канцэпцыі з'яўляецца стабільнасць яе галоўнай тэзы. Большасць гісторыкаў канца 20 ст., як і іх калегі з канца 19 ст. бачаць **утварэнне ВКЛ** як **вынік унутранага развіцця балцкага этнасу пад назвай "летувісы".** Паводле сённяшняга варыянта гэтай версіі, у канцы 12 – першых дзесяцігоддзях 13 ст. утварылася раннелетувіская дзяржава (саюз ці канфедэрацыя земляў), якая сфармавалася незалежна (ці амаль незалежна) ад славянскіх суседзяў на тэрыторыі, населенай балцкімі плямёнамі. Цэнтрам дзяржавы вызначана адна з балцкіх земляў, меўшая назву "Літва". Апошняя ў агульных рысах лакалізуецца па сярэднім цячэнні Віліі, дзе з 4 па 13 ст. існавала культура ўсходнелітоўскіх курганоў. У першай палове – сярэдзіне 13 ст. гэтая дзяржава (саюз ці канфедэрацыя) шляхам заваёвы (далучэння) суседніх усходнеславянскіх земляў ператварылася ў ВКЛ.

Канцэпцыя гэтая з'яўляецца інтэрнацыянальным навуковым прадуктам, вынікам шматгадовай працы расійскіх, польскіх, нямецкіх, летувіскіх даследчыкаў. Многія з прац замежных гісторыкаў, гэтаксама як і выданні некаторых пісьмовых крыніц, да нядаўняга часу былі практычна недаступны беларускім даследчыкам. Вывучыць гэтыя працы і прасачыць фармаванне агульнай канцэпцыі мне ўдалося дзякуючы магчымасці выезду ў лепшыя бібліятэкі Польшчы, найперш у бібліятэку Ягелонскага універсітэта ў Кракаве. За магчымасць такой працы на працягу амаль паўтара гадоў выказваю тут шчырую ўдзячнасць польскім калегам.

Другую версію ў канцы 80-х гадоў 20 ст. прапанаваў Мікола Ермаловіч. Гэты даследчык лічыць, што ўтварэнне ВКЛ адбылося па ініцыятыве ўсходнеславянскіх (беларускіх) феадалаў з Навагрудка. Яны запрасілі на навагрудскі стол літоўскага князя-перабежчыка Міндоўга, пацярпеўшага паражэнне ў міжусобнай барацьбе і вымушанага ўцякаць у Навагрудак (у апошняй працы гісторык гаворыць пра паходжанне Міндоўга з роду полацкіх князёў). Атрымаўшы грошы і войска, Міндоўг заваяваў і падпарадкаваў Навагрудку Літву – востраў балцкага насельніцтва ў беларускім абшары, размешчаны прыблізна паміж Навагрудкам і Менскам. Такім

чынам, паводле Ермаловіча, летапісная Літва з'яўляецца гістарычнай вобласцю Беларусі, а ВКЛ ад пачатку было беларускай дзяржавай.

На сённяшні дзень першая версія распаўсюджана па ўсім свеце, а канцэпцыя Ермаловіча набыла пэўную папулярнасць на Беларусі. На першы погляд гэтыя дзве канструкцыі здаюцца кардынальна процілеглымі, аднак на самай справе яны маюць шмат агульных рысаў. Па-першае, у іх падобная храналагічная (13 ст.) і геаграфічная (басейн Нёмана) лакалізацыя працэсу дзяржаваўтварэння. Па-другое, пачатак уласна ВКЛ звязваецца з адной і той жа гістарычнай асобай - Міндоўгам (адзінае выключэнне - Пашкевіч). Па-трэцяе, абедзве канцэпцыі маюць выразную ідэалагічную афарбоўку, якая бачна ў імкненні давесці канкрэтную этнічную прыналежнасць дзяржавы (летувіскую ці беларускую) з самага яе пачатку. Тут навідавоку механічны перанос на сярэднявечча канцэпцыі дзяржавы, уласцівай новаму і навейшаму часу, менавіта, разуменне дзяржавы як механізма рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў. Па-чацвёртае, у абедзвюх версіях прысутнічае **тэза аб балта-славянскай канфрантацыі на тэрыторыі Панямоння.** Менавіта гэтая апошняя тэза з'яўляецца іх асновай, падмуркам. Таму ўтварэнне ВКЛ падаецца як вынік перамогі аднаго з супернікаў у шматвекавым "змаганні за тэрыторыі" (акрэсленне Ахманьскага).

Аднак менавіта гэтая падмуркавая тэза знаходзіцца ў супярэчнасці з вынікамі дэталёвых спецыяльных даследаванняў археолагаў і моваэнаўцаў, якія звяртаюць увагу на пераважна мірны характар балта-славянскіх адносін на тэрыторыі Беларусі. Галоўнай ідэяй маёй працы стала вывучэнне праблемы ўтварэння ВКЛ праз яго ўзаемасувязь з буйнейшай гістарычнай з'явай на Панямонні – працэсам балта-славянскіх кантактаў. Рэалізацыя гэтай ідэі аказалася магчымай дзякуючы таму, што за апошнія паўстагоддзя навукоўцы (археолагі, лінгвісты, этнографы) сабралі агромністую колькасць матэрыялаў і стварылі нават асобную галіну гістарыяграфіі па гэтаму працэсу (варта прыгадаць маскоўскія зборнікі "Балто-славянские исследования"). Сумненняў адносна сувязі двух названых працэсаў не ўзнікала, бо абедзве гэтыя гістарычныя з'явы звязаны з арганізацыяй жыццядзейнасці буйных чалавечых супольнасцей і ў пэўны момант яны супалі ў часе і прасторы.

Адной з падстаў для ўзнікнення тэзы канфрантацыі стаў рэальны факт актывізацыі ваенна-рабаўнічай дзейнасці летапісных літоўцаў, пачынаючы з 80-х гадоў 12 ст. Аб'ектамі рабаўнічых нападаў сталі далёкія і блізкія суседзі літоўцаў. Пісьмовыя крыніцы (усходнеславянскія летапісы, польскія і нямецкія хронікі) зафіксавалі дзесяткі рабаўнічых паходаў літоўцаў амаль ва ўсіх кірунках: на польскія, галіцка-валынскія, чарнігаўскія, смаленскія, ноўгарадскія, пскоўскія землі, на Лівонію і землі эстаў. У той жа час да Аўкштоты і Жамойці амаль з усіх бакоў прылягалі "мірныя" тэрыторыі. Яны складаліся як з балцкіх (Яцвягія, Прусія), так і бліжэйшых усходнеславянскіх земляў: Наваградчына, Гарадзеншчына, Полацкая і Турава-Пінская землі. Даследчыкам не ўдалося знайсці прамых ці ўскосных вартых даверу сведчанняў пра напады летапісных літоўцаў на Навагрудак, Гародню, Ваўкавыск, Менск, Полацк і іншыя гарады будучай Беларусі. І, наадварот, маюцца прамыя сведчанні крыніц пра полацка-літоўскае, пінска-літоўскае, наваградска-літоўскае супрацоўніцтва. У 1198 і 1258 г. палачане разам з літоўцамі хадзілі паходам на Смаленшчыну. У 1238 г. у паходзе на Мазовію бралі ўдзел Міндоўг і Ізяслаў Наваградскі. У 1245 г. пінскі князь патаемна папярэджвае літоўскі атрад пра надыход валынскага войска. У 1265 г. Пінск і Наваградак узброенай рукой падтрымліваюць Вайшэлка ў навядзенні парадку ў

Літоўскай зямлі. Апісаныя крыніцамі выпадкі прыходу балцкіх князёў на сталы ўсходнеславянскіх гарадоў адбыліся мірным шляхам праз запрашэнне (напрыклад Таўцівіл у Полацку ці Даўмонт у Пскове).

Другой падставай для ўзнікнення тэзы пра балта-славянскую канфрантацыю на Панямонні сталі палітычныя рэаліі канца 19 – пачатку 20 ст., калі ствараліся першыя навуковыя працы па генезе ВКЛ. Гістарыяграфія ВКЛ у гэты час фармавалася ва ўмовах бурнага развіцця нацыянальных рухаў і барацьбы за ўтварэнне нацыянальных дзяржаў, а таму гісторыкі аналізавалі сітуацыю 13 ст., зыходзячы з рэалій сваёй эпохі. З гэтай, напэўна, прычыны Панямонне 13 ст. уяўлялася ім арэнай барацьбы між дзвюма буйнымі этнічнымі групамі. Імператыў ідэі міжэтнічнай барацьбы задаў накірунак развіцця ўсёй далейшай гістарыяграфіі ВКЛ. Аднак у пасляваенныя дзесяцігоддзі даследаванні археолагаў, мовазнаўцаў, этнографаў паказалі, што сярэднявечныя балта-славянскія ўзаемаадносіны на Панямонні (як і па ўсёй тэрыторыі сучаснай Беларусі) мелі характар не варожы, а мірны.

Кантакт між балтамі і славянамі на тэрыторыі Верхняга і Сярэдняга Панямоння (гістарычнае ядро ВКЛ) распачаўся ў другой палове 1 тыс. н.э. Ён стаў часткай буйнога працэсу балта-славянскага ўзаемадзеяння (працягласцю ў паўтара тысячагоддзя), ахапіўшага тэрыторыю сучаснай Беларусі і прылеглыя раёны суседніх дзяржаў. Сутнасцю працэсу было пранікненне славян на землі, занятыя балтамі і асіміляцыя апошніх. Важнейшай яго адметнасцю даследчыкі бачаць **мірны характар балта-славянскіх узаемаадносін.**

На Панямонні названы працэс актывізаваўся ў канцы 10 – пачатку 11 ст. (на Падзвінні і Падняпроўі ён у гэты час быў ужо блізкі да завяршэння) і працягваўся амаль усё II тысячагоддзе. Паміж этнічнымі масівамі не было лінеарнай мяжы, існавала вялікая кантактная зона, размешчаная прыблізна ў прасторы між Менскам і Вільняй. На гэта выразна паказвае картаграфаванне выяўленых археалагічных помнікаў, інтэрпрэтаваных археолагамі як балцкія ці славянскія.

Славяне і балты тут жылі ўперамешку, больш-менш кампактнымі “плямамі”. Гарады ў гэтай зоне: Гародня, Наваградак, Ваўкавыск, Слонім, Здітаў, падобна і Вільня, былі ўсходнеславянскімі, але з'яўляліся гандлёва-рамеснымі і адміністрацыйнымі цэнтрамі для ўсёй балта-славянскай ваколіцы. Доўгатэрміновае суіснаванне прыводзіла да паступовай асіміляцыі балцкага насельніцтва славянскім, якое ў сваю чаргу пераймала ад тубыльцаў многія элементы матэрыяльнай і духоўнай культуры. Гэтая кантактная зона стала месцам нараджэння ВКЛ, ядром і цэнтральнай вобласцю дзяржавы. Яе назва “Літва” захоўвалася да канца 19 – пачатку 20 ст. Цікава, што да сярэдзіны 16 ст. (да Люблінскай уніі) працэс русізацыі (беларусізацыі) ахопліваў усе сацыяльныя слаі балтаў, ад сялянства да магнатэрыі і кіруючай дынастыі.

Важнай часткай праблемы генезы ВКЛ з'яўляецца лакалізацыя гістарычнай Літвы. Даследчыкі не выпрацавалі ўзгодненага падыходу да вырашэння гэтай праблемы і прапаноўваюць розныя варыянты такой лакалізацыі. Генрык Лаўмяньскі ў 30-я гады, а ў сённяшні час Эдвардас Гудавічус бачаць Літоўскую зямлю на поўнач ад Гародні, летувіскія археолагі называюць Літвой (11-12 стст.) усю тэрыторыю Аўкштоты. Мікола Ермаловіч прапанаваў уласную лакалізацыю Літвы паміж Менскам, Наваградкам і Слонімам. Прычым ніхто з гэтых даследчыкаў не тлумачыць якім чынам у 14-16 стст. панццце Літвы ахоплівала як этнічна беларускія, так і этнічна

балцкія землі, менавіта Наваградчыну, Гарадзеншчыну, Віленшчыну і частку Меншчыны. Такі склад гістарычнай Літвы агульнапрыняты, ён быў вызначаны яшчэ М.Любаўскім і некалькі гадоў назад дэталёва правераны і пацверджаны М.Спірыдонавым.

Між тым аказалася магчымым праз параўнанне пісьмовых і археалагічных даных прапанаваць лакалізацыю пачатковай Літвы, якая не супярэчыць вядомым гістарычным звесткам і адпавядае меркаванню, выказаннаму М.Любаўскім яшчэ ў канцы 19 ст. – сярэдняе цячэнне Віліі. Разам з тым, праз прыняцце ідэі іерархічна-храналагічнай эвалюцыі тэрміна “Літва” можна зразумець як адбывалася яго развіццё ва ўсіх значэннях. Тэрмін “Літва” ў ходзе свайго развіцця набыў тры сэнсавыя значэнні: 1. палітонім ці абазначэнне ўсёй дзяржавы – ВКЛ. 2. харонім ці “Літва ў вузкім сэнсе” (тэрмін уведзены М.Любаўскім) – гістарычны цэнтр дзяржавы. 3. Літва ў сэнсе этнаграфічным (этнаграфічна балцкім).

У пісьмовых крыніцах 10-12 стст. (усходнеславянскіх летапісах, нямецкіх хроніках) тэрмін “Літва” выступае як назва памежнай з усходнімі славянамі балцкай вобласці і як агульная назва некалькіх роднасных балцкіх земляў. З сярэдзіны-другой паловы 13 ст. у выніку ўтварэння ВКЛ на першае месца ў пісьмовых крыніцах выступае харонім, ці “Літва” як назва пачатковай тэрыторыі, цэнтра дзяржавы (тэрыторыі са змешаным балта-славянскім насельніцтвам: Наваградчына, Гарадзеншчына, Віленшчына, частка Меншчыны). Адначасова на другім плане, як сведчаць крыніцы, існавала ўсведамленне і балцкаэтнічнага напаўнення тэрміна (мова, свядомасць этнічнай блізасці часткі Літвы да Жамойці). Толькі ў 20 ст. пасля ўтварэння балцкай дзяржавы, прыняўшай назву “Літва” (Lietuva), на першае месца зноў выступіла этнічна-балцкае значэнне тэрміна, і аб Літве на Гарадзеншчыне нам напамінаюць зараз толькі этнаграфічныя матэрыялы ды сведчанні рускіх падарожнікаў 19 ст.

Даказаны мірны характар балта-славянскіх адносін ставіць пад сумненне асноўную падмуркавую тэзу традыцыйнай канцэпцыі генезы ВКЛ, а таксама яе люстранога адбітку – версіі М.Ермаловіча. Доказ тэзы мірных балта-славянскіх кантактаў дазваляе вытлумачыць існаванне шэрагу гістарычных фактаў, якія былі даўно вядомыя гісторыкам, аднак ігнараваліся як не адпаведныя традыцыйнай канцэпцыі генезы ВКЛ. Напрыклад, стала ясна, чаму гістарычнае ядро дзяржавы (харонім “Літва”: Віленшчына, Наваградчына, Гарадзеншчына і частка Меншчыны) складалася як з этнічна балцкіх, так і ўсходнеславянскіх земляў. Стала зразумелым, чаму ніводная пісьмовая крыніца не зафіксавала выпадкаў ваенных канфліктаў паміж летувіскімі і беларускімі насельнікамі Панямоння. У святле высноў археолагаў і лінгвістаў маўчанне пісьмовых крыніц пра балта-славянскія канфлікты на Панямонні выглядае сапраўды красамоўным.

Другім трывалым стэрэатыпам гістарыяграфіі генезы ВКЛ з’яўляецца этнічны імператыў у матывацыі дзейнасці арганізатараў ВКЛ. Ад пачатку прымаецца, што Міндоўг і яго наступнікі мелі мэтай стварыць дзяржаву абавязкова этнічна балцкую ці этнічна славянскую. Аднак шматлікія гістарычныя аналагі і само далейшае развіццё ВКЛ паказваюць памылковасць такога падыходу. Арганізатары ВКЛ будавалі дзяржаву ў біэтнічным балта-славянскім рэгіёне, карыстаючыся даступнымі матэрыяламі і сродкамі. Кіруючая дынастыя, хоць і мела балцкае паходжанне, тым не менш не спрабавала спыніць працэс асіміляцыі балтаў усходнімі славянамі, а,

наадварот, спрыяла яму, прыняўшы ўсходнеславянскую сістэму дзяржаўнай арганізацыі і старабеларускую мову ў якасці дзяржаўнай. На першым і найбольш складаным этапе пабудовы дзяржавы самымі надзейнымі саюзнікамі балта Міндоўга і яго сына Вайшэлка аказаліся славянскія гарады Панямоння (таксама Пінск збройнай рукой падтрымаў Вайшэлка), а этнічна блізкія жамойты, яцвягі і некаторыя аўкштоцкія кунігасы ваююць супраць Міндоўга на баку славянскай Галіцка-Валынскай дзяржавы.

Урэшце даводзіцца прызнаць, што супярэчнасці між т.зв. "канфрантацыйнымі" версіямі генезы ВКЛ (традыцыйнай летувацэнтрысцкай і беларусацэнтрысцкай Ермаловіча) у межах названых канцэпцый вырашыць немагчыма. Таму непазбежнай уяўляецца адмова ад іх.

Важнай часткай традыцыйнай канцэпцыі з'яўляецца тэза пра ўтварэнне яшчэ ў канцы 12 – пачатку 13 ст. папярэдніцы ВКЛ - раннефеадальнай летувіскай дзяржавы. Аднак пра названую дзяржаву (саюз ці канфедэрацыю летувіскіх земляў) нічога невядома. Пісьмовыя крыніцы не захавалі звестак пра яе. Дзе была яе сталіца? Якая сістэма адміністрацыйнага падзелу, сістэма кіравання, права, падаткаабкладанне і г.д.? Калі такая дзяржава існавала і мела ўласную сістэму кіравання, чаму ў ВКЛ была прынята сістэма іншая – усходнеславянская? Пра гэтую таямнічую дзяржаву нічога не ведаў такі надзейны аўтар як Генрых Латвійскі, які пісаў сваю "Хроніку Лівоніі" каля 1227 г. Даследчыкі заўважылі, што літоўскіх правадыроў храніст называе гэтаксама як галоўных людзей іншых мясцовых плямёнаў - "князямі і старэйшынамі літоўцаў" ("princeps ac seniores"), а ў той жа час рускіх князёў тытулуе каралямі ("reges, regulus"), ставячы іх на адзін узровень з каралямі Даніі і Швецыі. Полацкага і Ноўгарадскага князя часам называе magnus rex.

Князі, пералічаныя ў дамове з Валынню 1219 г., невядомыя Генрыху Латвійскаму. Генрых у сваю чаргу паведамляе пра магутнага літоўскага кунігаса Даугерутэ, аб якім нічога не ведае Галіцка-Валынскі летапіс. Яшчэ ў сярэдзіне 40-х гадоў 13 ст. адныя кунігасы ваююць з Валынню (Айушна Рушкавіч, Лонькогвен), другі – Міндоўг выступае як яе актыўны саюзнік – дасылае туды ваенную дапамогу.

Надзейна ўстаноўлены толькі факт сацыяльнай дыферэнцыяцыі балцкіх плямёнаў, у тым ліку літоўцаў. Яе паскарала ваенна-рабаўнічая дзейнасць. Асобныя ўдачлівыя правадыры – арганізатары рабаўнічых паходаў засяроджвалі ў сваіх руках значныя матэрыяльныя багацці. Выдзяляецца праслойка т.зв. нобіляў, што пацвярджаюць археалагічныя матэрыялы. Аднак з'яўленне племянной арыстакратыі яшчэ не доказ існавання дзяржавы.

Падобна, тэза пра раннефеадальную балцкую дзяржаву – даніна савецкім ідэалагічным стэрэатыпам, унесеным у гістарыяграфію генезы ВКЛ Уладзімірам Пашутам. Манфрэд Хэльман у крытычным артыкуле на працы Пашуты заўважыў, што апошняму ад пачатку патрэбна было давесці, што летувісы перажылі тыя ж фазы развіцця, якія савецкая гістарыяграфія лічыла абавязковымі для ўсіх іншых еўрапейскіх народаў.

Адной з задач маёй працы стала распрацоўка версіі дзяржаваўтварэння, якая не пярэчыць вядомым сённяшняй навуцы гістарычным фактам. У 13 ст. на момант пачатку генезы ВКЛ на Панямонні ўсходнія славяне і балты мелі ўжо больш чым двухвекавы вопыт мірнага супрацоўніцтва. У рэгіёне ўсталявалася адносна стабільная этна-культурна-палітычная сістэма, спецыфікай якой была яе біэтнічная аснова.

Дынамічная раўнавага ў сістэме трымалася на мірным суіснаванні ўсходнеславянскіх гарадоў-дзяржаў і балцкіх тэрытарыяльна-племянных аб'яднанняў. Панямонская сістэма магла існаваць яшчэ доўгі час у працэсе паступовай эвалюцыі, аднак надзвычайныя падзеі сярэдзіны 13 ст. зрабілі гэты шлях немагчымым. Мангола-татарскае нашэсце разбурыла палітычную сістэму Русі і стварыла рэальную пагрозу існаванню рэгіянальнай сістэмы ў Панямонні. Другой рэальнай пагрозай з паўночнага і заходняга кірункаў стаў Тэўтонскі ордэн.

У такіх умовах наступнай ступенню балта-славянскага сімбіёзу на Панямонні стала стварэнне арганізацыі для абароны сваёй жыццёвай прасторы. Для нас важна высветліць, што было адпраўным пунктам працэсу, унутрысістэмным штуршком, паклаўшым пачатак працэсу ўтварэння дзяржавы. Аналіз наяўных пісьмовых крыніц, дапоўнены вынікамі археалагічных і лінгвістычных даследаванняў, дазваляе адказаць на гэтае пытанне наступным чынам: **пачаткам ВКЛ стаў палітычны саюз двух галоўных рэгіянальных сіл – усходнеславянскіх гарадоў-дзяржаў з некаторымі найбольш моцнымі правадырамі балцкіх плямёнаў.** Яшчэ больш канкрэтна – саюз важнейшага горада рэгіёна – Наваградка з мацнейшым з суседніх кунігасаў – Міндоўгам. Гэты саюз парушыў дынамічную раўнавагу сілаў на Панямонні, даў саюзнікам перавагу і пры адпаведных знешніх абставінах паклаў пачатак працэсу дзяржаваўтварэння.

Уяўляецца магчымым акрэсліць прыблізную дату стварэння саюза. Вядома, што галіцка-валынскія князі ад 1219 г. знаходзіліся ў прыязных адносінах з Міндоўгам (сведчанні 1238 г., 1245 г.). Калі ў 1248 г. Міндоўг просіць Раманавічаў не прымаць уцёкшых ад яго на Валынь пляменнікаў, то ён звяртаецца да сваіх сталых саюзнікаў. Аднак Раманавічы ідуць на парыў даўняга (амаль 30 гадоў) міру, падтрымліваюць выгнанцаў, ствараюць супраць Міндоўга магутную кааліцыю ў складзе Лівонскага ордэна, жмудзінаў, яцвягаў і распачынаюць вайну. І вось у 1249/50 г. галіцка-валынскія князі ідуць у паход **супраць Міндоўга на Наваградак.** Такім чынам, прыходзім да высновы, што гэты паход у Літву на Наваградак – першая фіксаваная звестка пра балта-славянскі палітычны саюз. Першай рэальнай праявай гэтага саюза, першым крокам да стварэння новай дзяржавы, верагодна, была вайсковая аперацыя, праведзеная пад кіраўніцтвам Міндоўга, у выніку якой, па словах летапісца, "поимана бъ вся земля Литовьская". Верагодны час правядзення гэтай акцыі – **1248 г. прапануецца прыняць за пачатак утварэння ВКЛ.**

Такім чынам, у выніку праведзеных даследаванняў аўтар прыйшоў да наступных высноў, якія і прапаноўваюцца да абароны:

1. Утварэнне ВКЛ праходзіла ў цеснай узаемасувязі з развіццём буйнейшай гістарычнай з'явы на Панямонні другой паловы 1 - 2 тыс. н.э. - працэсам балта-славянскіх кантактаў. Даследаванні археолагаў, лінгвістаў, этнографаў даказалі агульны **мірны,** а не **варожы** характар кантактаў між балтамі і ўсходнімі славянамі і, такім чынам, сцвердзілі недакладнасць існуючых канцэпцый утварэння ВКЛ (як "балцкай" так і М.Ермаловіча), паколькі апошнія заснаваныя на тэзісе балта-славянскай канфрантацыі.

2. Першасным тэрытарыяльным ядром ВКЛ стала балта-славянская кантактная зона, менавіта басейн Верхняга і Сярэдняга Нёмана (харонім "Літва").

3. Тры значэнні тэрміна "Літва" (палітонім, харонім, этнонім) прайшлі ў 2 тыс. н.э. складаную іерархічна-храналагічную эвалюцыю. З утварэннем ВКЛ у 13 ст. на

першае месца выступае харонім “Літва”, якім абазначалася цэнтральная вобласць дзяржавы, утвораная як з усходнеславянскіх, так і з балцкіх тэрыторый. Этнічнае значэнне названага тэрміна ў гэты час адступае на другі план.

4. Утварэнне ВКЛ у кантактнай зоне між балцкім і славянскім этнічнымі масівамі не спыніла і не змяніла ходу працэсу балта-славянскіх кантактаў, сутнасцю якога было пранікненне ўсходніх славян на землі, занятыя балтамі і паступовая асіміляцыя апошніх.

5. Існаванне папярэдніка ВКЛ у выглядзе монаэтнічнага балцкага раннефеадальнага дзяржаўнага ўтварэння (саюз ці канфедэрацыя летувіскіх земляў) нельга лічыць даказаным.

6. Асновай ВКЛ стаў палітычны саюз двух важнейшых сіл рэгіёна: усходнеславянскіх гарадоў-дзяржаў і найбольш значных правадыроў мясцовых балцкіх плямёнаў, створаны на аснове векавога вопыту балта-славянскага супрацоўніцтва на Панямонні. Штуршком да ўзнікнення названага саюза паслужыла знешняя небяспека з боку мангола-татараў і Тэўтонскага ордэна. Першым праяўленнем саюза было пагадненне ўсходнеславянскага горада-дзяржавы Наваградка з балцкім нобілем Міндоўгам, якое аформілася каля 1248 г.

4 снежня 1998 г. А.К.Краўцэвіч

**Выступленне М.Ф.Спірыдонава.**

Шаноўныя члены савета!

Паважаныя калегі!

У адрозненне ад шаноўных афіцыйных апанентаў я не лічу сябе спецыялістам па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага і далей (ВКЛ) 13 ст. Аднак, даследуючы больш 30 гадоў розныя праблемы гісторыі ВКЛ 14-16 стст., дазволім сабе выказаць некалькі меркаванняў аб некаторых прынцыповых палажэннях дадзенай дысертацыі. Але, паколькі водгукі афіцыйных апанентаў маюць пераважна панегірычны характар, мы спынімся галоўным чынам на яе істотных недахопах. Як гаворыцца: “Платон мне друг, але ісціна даражэй!”.

У 1992 г. паважаны А.К.Краўцэвіч у артыкуле “Патрабуецца міф” (ЛіМ. 17.04.1992) заклікаў гісторыкаў “для масавага спажывання” неадкладна стварыць папулярны варыянт нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі ці міф. І, як бясспрэчна смелы гісторык, адразу ж узяўся за справу – распрацоўку новай канцэпцыі генезісу ВКЛ. Як вядома, дадзеная праблема – найбольш важная і складаная навуковая праблема гісторыі не толькі Беларусі.

Агульнае і галоўнае наша ўражанне: дысертацыя з’яўляецца больш-менш прафесійнай, але вельмі тэндэнцыйнай усходнеславянскай (беларускай) у значнай ступені кампіляцыяй папярэдніх даследаванняў пачатковай гісторыі ВКЛ. З усіх частак дадзенай працы карыснымі для гісторыкаў уяўляюцца асвятленне пытання аб эвалюцыі тэрміна “Літва” (с.72-73, 97-119 рукапісу), агляд асноўных падзей 13 ст. у Верхнім Панямонні (с.131-163), а таксама слушная крытыка асноўных прынцыповых меркаванняў папулярызатара пачатковай гісторыі Беларусі пісьменніка М.Ермаловіча аб месцазнаходжанні “Старажытнай Літвы” (с.60, 111-113), аб заваяванні беларусамі

Літвы і стварэнні такім чынам беларускай дзяржавы – ВКЛ (с.66). Аб іх бяздоказнасці яшчэ ў 1985 г. пісаў М.М.Улашчык (Беларускі гістарычны агляд. 1996. Т.3. Сш.1. С. 100-101).

На жаль, большасць прынцыповых палажэнняў дысертацыі, на наш погляд, не з’яўляюцца ні арыгінальнымі, ні пераканаўча абгрунтаванымі. Спынімся на некаторых з іх.

1. Аўтар неаднаразова падкрэслівае свой тэзіс аб мірным характары міжэтнічных кантактаў (с.7, 8, 14, 24, 30, 32, 92-97), які служыць падмуркам яго новай канцэпцыі генезісу ВКЛ. Галоўнай падставай такога меркавання ён лічыць адсутнасць у крыніцах звестак аб ваенных канфліктах у 13 ст. паміж усходнеславянскім насельніцтвам Навагародчыны і літоўцамі. Магчыма, што яны - з’ява папярэдняга перыяду, не знайшоўшая канкрэтнага адлюстравання ў тагачасных крыніцах. Аднак дастаткова нагадаць звесткі “Слова аб палку Ігаравым”, Джаванні Плана Карпіні, “Слова аб пагібелі Рускай зямлі”, храніста Генрыха Латвійскага і іншых крыніц аб жаху, які наводзілі ваенныя паходы літоўскіх дружын на суседзяў. Дарэчы, Аляксандр Канстанцінавіч ігнаруе падлікі такіх паходаў у 1201 - 1236 гг. вядомага польскага гісторыка Е.Ахманьскага: 4 - на Польшчу, 14 - на Русь, 22 - на Латвію (Historia Litwy. Wyd. 3. 1990. S. 44). Ігнаруе аўтар і меркаванне Ю.А.Заяца аб разбурэнні Заслаўля ў сярэдзіне 13 ст. у сувязі менавіта з захопам яго літоўцамі (Заславль в эпоху феодализма. 1995. С. 118). Як вядома, большая частка тэрытарыяльных набыткаў ВКЛ у 14 ст. - вынік ваенных захопаў. Добра вядома таксама і агульная заканамернасць: у Еўропе ўсе аднаэтнічныя і рознаэтнічныя адзіныя дзяржавы ствараліся ці пераважна, ці толькі ваенным шляхам.

Наогул, у сярэднявеччы амаль усе праблемы вырашаліся звычайна шляхам насілля, але не абавязкова толькі зброяй. Варта таксама дадаць, што, ігнаруючы факты літоўска-”рускай” канфрантацыі ўнутры ВКЛ у далейшым, якіх больш чым хапала, аўтар ігнаруе гістарычную перспектыву, а тым самым і сапраўдны характар узаемаадносін розных этнасаў у ВКЛ. Аднак яны супярэчаць тэндэнцыйнай канцэпцыі аўтара, таму, ён лічыць, іх не было: нібыта такая канфрантацыя - толькі адзін са стэрэатыпаў ідэалагічнага характару “расейска-савецкай гістарыяграфіі”.

Прыняць на веру па сутнасці бяздоказную няпэўную гіпотэзу Аляксандра Канстанцінавіча аб толькі мірным шляху стварэння ВКЛ, значыць адкрыць раней невядомы ў гісторыі новы шлях утварэння адзінай рознаэтнічнай дзяржавы, якой з самага пачатку было ВКЛ.

2. Адным з асноўных метадалагічных прыёмаў крытыкі папярэднікаў аўтар абраў звычайна дэкларатыўнае або прымітыўна абгрунтаванае аб’яўленне тых поглядаў, што супярэчаць яго канцэпцыі, няпэўнымі (“сумніўнымі”).

Напрыклад, крытыкуючы абгрунтаваны вывад класіка літуаністыкі выдатнага польскага гісторыка Г.Лаўмяньскага аб колькаснай перавазе літоўскага баярства над “рускім”, Краўцэвіч абапіраецца на адпаведныя, не вельмі карэктныя падлікі А.П.Грыцкевічам феадалаў толькі Беларусі, г.зн. “беларускіх” паветаў ВКЛ, але чамусьці без Полацкага ваяводства, па даных перапісу войска 1528 г. Аднак тэндэнцыйна замест 78,5 % феадалаў-”беларусаў” (1634 з усіх 2083) аўтар дысертацыі знайшоў, што “беларуская шляхта складала 80 % усёй шляхты ...” ВКЛ (с.44-45). Па больш поўных і дакладных падліках В.С.Мянжынскага, артыкула якога, дарэчы, няма ў спісах літаратуры ні машынапісу дысертацыі, ні амаль адэкватнай ёй кнізе, у 1528 г.

шляхта этнічнай Літвы (4722 феадала) складала 46,4 %, а Беларусі (2562 феадала) толькі 25,2 % усіх 10178 феадалаў ВКЛ (Менжинский В.С. Структура феодального землевладения в Великом княжестве Литовском (По материалам Переписи войска 1528 г.) // История СССР. 1987. № 3. С. 168 і інш.). У дадзеным выпадку "сур'ёзны сумніў" аўтара таксама вельмі шкодзіць навуковай вартасці яго дысертацыі.

3. Характарызуючы адпаведныя погляды класіка літуаністыкі выдатнага рускага гісторыка М.К.Любаўскага (с.36-38), аўтар, як гэта нядзіўна, не заўважыў таго, што ён, па сутнасці ў галоўным з'яўляецца яго эпігонам, хаця і карыстаецца сучаснай тэрміналогіяй (с.39). Бо "Літоўска-Рускую дзяржаву" Любаўскага на больш познім этапе развіцця ВКЛ сёння можна назваць і "Літоўска-Беларуска-Украінска-Рускай", або "квадрыэтнічнай", бо ў той час і беларусы, і ўкраінцы афіцыйна лічыліся толькі асаблівымі часткамі рускіх. Толькі ў адрозненне ад Любаўскага ВКЛ у Краўцэвіча ў пачатку яго ўзнікнення не "квадрыэтнічная", а "біэтнічная балта-славянская дзяржава з дамінаваннем усходнеславянскага элемента" (с.166).

4. Аўтар аб'яўляе ненавуковым "стэрэатыпам" меркаванні папярэднікаў аб літоўскім характары ВКЛ, спрабуючы абгрунтаваць гэты тэзіс, у прыватнасці, тым, што нібыта "... невядома ніводнага факта, які б сведчыў, што дзяржаўная ўлада ў ВКЛ забяспечвала панаванне літоўцаў над русінамі" (с.48). Аднак такія факты вядомы. Дастаткова нагадаць рэлігійную палітыку вялікіх князёў літоўскіх да і асабліва пасля заключэння Крэўскай уніі 1385 г.

5. Аўтар, крытыкуючы погляд У.Пашуты на ВКЛ як літоўскую дзяржаву (с.50-53), на жаль, не адзначыў яго вельмі канструктыўную ідэю сінтэзу грамадскіх інстытутаў літоўцаў і "рускіх". Як нам падаецца, нягледзячы на іншы тэрмін ("сімбіёз". С.130), які ўжывае Краўцэвіч, абодва тэрміны маюць на ўвазе адно і тое ж: узаемакарыснае ўзаемадзеянне вярхоў розных этнасаў.

6. Краўцэвіч упамінае аб "рэзка адмоўнай", але на наш погляд, грунтоўнай рэцэнзіі вядомага літоўскага гісторыка Э.Гудавічуса на асноўную працу М.І.Ермаловіча. Аднак, на жаль, яго цалкам слушнае абвяржэнне канцэпцыі заваявання Літвы беларусамі ён зусім не раскрывае (с.60).

7. На нашу думку, безпадстаўнымі прэтэнзіямі на прыярытэт і тэндэнцыйнасцю абумоўлены і нігілізм Краўцэвіча (с.60 - 62, 65) да навуковай, хаця і без спасылак на крыніцы, працы вядомага даследчыка гісторыі сярэднявечнай Беларусі В.Л.Насевіча "Пачаткі Вялікага княства Літоўскага": Падзеі і асобы" (Мінск, 1993). Насевіч нетэндэнцыйна і нетрадыцыйна прафесійна асвятліў працэс стварэння ВКЛ, шмат у чым істотным апярэдзіўшы асноўныя "адкрыцці" дысертанта.

Знаёмства з усімі іншымі часткамі дадзенай дысертацыі дазваляе сцвярджаць, што навукова абгрунтаваных прынцыпова новых палажэнняў у ёй няма. Усюды кідаецца ў вочы упартае жаданне аўтара тэндэнцыйна ігнараваць адны факты і трактаваць іншыя ў зададзеным беларускім накірунку і выдаваць гэта за навуковыя адкрыцці.

У машынапісу дадзенай дысертацыі, акрамя адзначаных некаторых недахопаў прынцыповага характару, маюцца шматлікія паўторы думкі, моўныя навацыі, ігнараванне гістарычных і сучасных форм напісання геаграфічных назваў і іншыя адхіленні ад агульнапрынятых норм.

Такім чынам, на наш погляд, важная навуковая праблема на належным навуковым узроўні не вырашана. Аднак чарговы міф – няпэўная нацыянальная

канцэпцыя стварэння ВКЛ створаны: веліч мінулага Беларусі адроджана! Паколькі такія міфы пэўным колам грамадства патрабуюцца, сёння можна будзе павіншаваць яго аўтара з прысуджэннем вучонай ступені доктара гістарычных навук. Калі гэта адбудзецца, то новы Дзяржаўны гімн Беларусі можа загучаць у адпаведнасці з новым міфам: "Мы, беларусы, з братняй Летувою...".

Я шчыра жадаю паважанаму А.К.Краўцэвічу сапраўды навуковых дасягненняў у далейшай творчай працы!

4.12.1998.

4.12.1999.

М.Ф.Спірыдонаў, старшы навуковы супрацоўнік Аддзела спецыяльных гістарычных навук Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук

**Адказ М.Ф.Спірыдонаву**

Тэкст выступу М.Спірыдонава, перададзены ў рэдакцыю "ГА", фактычна з'яўляецца рэцэнзіяй на маю кнігу "Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага". У ім выразна выдзяляюцца два кантэксты: навуковы і ідэалагічны. Напачатку адкажу на аргументацыю навуковага характару. М.Спірыдонаў не проста крытыкуе, а фактычна адвяргае ўсе асноўныя высновы маёй працы, згрупаваўшы свае аргументы ў сямі пунктах. Паспрабуем разгледзець іх па парадку.

1. Апанент настойвае на варожым характары сярэднявечных балта-славянскіх кантактаў на Панямонні і як доказ прыводзіць прыклады, якія не маюць дачынення да Панямоння. Плана Карпіні пісаў пра літоўскія набегі на Кіеўскую зямлю, Генрых Латвійскі - на Лівонію, "Словы..." не гавораць пра бітвы на Панямонні, 14 паходаў на Русь, вылічаных Е.Ахманьскім, таксама не тычаць Панямоння, а меркаванне Ю.Заяца адносіцца да Заслаўя і пакуль застаецца толькі меркаваннем, а не фактам.

Відавочна, што апанент знаходзіцца пад уплывам ідэі "спрадвечнага адзінства Русі", якая з'яўляецца прадуктам расійскай імперскай ідэалогіі. Таму для яго напад старажытных літоўцаў на нейкую частку Русі з'яўляецца варожым актам і для іншых рускіх тэрыторый. Як прафесіянал М.Ф. не можа не ведаць, што рускага адзінства ў тыя часы (12-15 ст. і пазней) не было. Мела месца разуменне культурнай агульнасці, але не існавала адзінства палітычнага. Пскоў змагаўся з Вялікім Ноўгарадам у саюзе з немцамі, палачане прапускалі літоўцаў рабаваць Смаленскую зямлю (і пры нагодзе самыя да іх далучаліся). Масквічы рэзаліся з разанцамі і цверычамі, іхнія князі наводзілі на землі суседзяў-суайчыннікаў татараў і самыя ішлі разам з паганымі забіваць рускіх.

А чым апанент можа абвергнуць высновы лінгвістаў і археолагаў пра агульны мірны характар балта-славянскіх адносінаў на Беларусі? Гэта застаецца невядомым, бо ён гэтыя высновы, заснаваныя на агромністым корпусе эмпірычнага матэрыялу, проста ігнаруе. Сцвярджаючы, што "фактаў літоўска-"рускай" (маецца на ўвазе, напэўна – "беларускай" - *А.К.*) канфрантацыі ўнутры ВКЛ... больш чым хапала", М.Спірыдонаў не прыводзіць ні аднаго канкрэтнага прыклада. Мне такія факты невядомы.

2. Апанент настойвае на тэзе пра колькасную перавагу летувіскага баярства над беларускім у 16 ст. Дзіўна, што пры гэтым прафесіянал узроўню М.Спірыдонава

дапускае такія элементарныя недакладнасці ў спасылках на працы, непасрэдна звязаныя з аб'ектам яго даследаванняў. Спецыяльна прагледзеўшы яшчэ раз артыкулы А.Грыцкевіча і В.Мянжынскага, я пераканаўся, што мая спасылка на высновы А.Грыцкевіча дакладная ("80 % беларускай шляхты"[197]). У артыкуле В.Мянжынскага разглядаецца маёмасны падзел між феадаламі і ўвогуле няма мовы пра этнічны склад шляхты ВКЛ (таму гэтая праца і адсутнічае ў маім спісе літаратуры).

Яшчэ большае здзіўленне выклікае тое, што М.Спірыдонаў супярэчыць уласным высновам са сваёй жа спецыяльнай працы пра межы Літвы і Русі. Цытую: "Выкладзеныя даныя дазваляюць сцвярджаць, што ў 16 ст. сучаснікі адносілі да Літвы перш за ўсё этнічна летувіскія Віленскі, Вількамірскі, Ковенскі, Троцкі і Упіцкі паветы, а таксама поўнасцю ці часткова "беларускія" паветы ВКЛ: Браслаўскі, Віленскі, Ваўкавыскі, Гарадзенскі, Лідскі, заходнюю частку Менскага, большую частку Наваградскага, амаль увесь Ашмянскі і Слонімскі"[198]. Такім чынам вынікае, што на думку М.Спірыдонава, большую частку Літвы ў 16 ст. складалі этнічна беларускія землі. Аднак пры падліках колькасці баярства ў тым самым 16 ст. той жа аўтар чамусьці ўсіх баяраў з Літвы лічыць этнічнымі летувісамі.

Навідавоку цікавы прыклад дэфармацыі навуковага мыслення, калі ўкладзены ў галаву са школьнай парты стэрэатып (што сярэднявечная Літва і сённяшняя Летува - адно і тое ж, менавіта, Аўкштота + Жамойць) падаўляе ў гісторыка ўласныя мыслiўныя канструкцыі, пабудаваныя на аснове навуковага аналізу. Гэта той выпадак, калі два ўзроўні свядомасці існуюць аўтаномна, а пераход ад аднаго да другога адбываецца па прынцыпу дзеяння рэле.

3. Не зразумелы папрок у эпігонстве з прац Мацея Любаўскага. Праўда, апанент сам дэзавуіруе яго ў апошнім сказе абзаца. Сапраўды, у маёй працы гаворка ідзе найперш пра этнічны характар ВКЛ на пачатку яго існавання, а не на "больш позным этапе развіцця". Вялікі знаўца Вялікага Княства як і большасць яго калегаў лічыў, што балцкі князь Міндоўг захапіў беларускія землі, адсюль яго паняцце "летувіска-руская дзяржава" істотна розніцца ад маёй тэзы пра "ад самых пачаткаў біэтнічную дзяржаву з дамінаваннем усходнеславянскага элементу".

4. Паважаны апанент прытрымліваецца даўняй тэзы расійскай, а потым савецкай гістарыяграфіі пра панаванне летувісаў над русінамі. У якасці аргумента ён апелюе да "рэлігійнай палітыкі вялікіх князёў літоўскіх да і асабліва пасля Крэўскай вуніі 1385 г." Як вядома, вялікія князі стварылі пэўныя палітычныя прывілеі для каталікоў перад прадстаўнікамі іншых канфесій (у тым ліку праваслаўных), але не для летувісаў перад беларусамі. Дастаткова нагадаць, што гэтая дыскрымінацыя датычылася балтаў-праваслаўных вельмі высокага паходжання, якімі былі многія князі Гедымінавічы. Зноў навідавоку стэрэатып мыслення, менавіта прыняцце веравызнання за крытэрый вызначэння этнічнай прыналежнасці. Дзвесце гадоў як усходнія, так і заходнія каланізатары ўкладвалі нам у галовы: "беларусаў няма, ёсць каталікі-палякі і праваслаўныя-рускія". Як бачым на прыкладзе нават гісторыка-прафесіянала, поспеху яны дасягнулі значнага.

5. Паводле У.Пашуты, "сінтэз" грамадскіх інстытутаў Беларусі і Летувы адбыўся пасля заваёвы Беларусі летувіскай дзяржавай. У маёй жа працы тэрмін "балцка-славянкі

[197] Грицкевич А.П. Распределение магнацких и шляхетских владений в Белоруссии по их величине и этнической принадлежности владельцев (XVI в.) // Вопросы истории. Межвед. сборник. Минск, 1978. Вып. 5. С. 94.
[198] Спиридонов М.Ф. "Литва" и "Русь" в Беларуси в 16 в. // Наш Радавод. Гродна, 1996. Ч. 7. С. 208.

сімбіёз" ужыты як сутнасная характарыстыка пачаткаў біэтнічнай дзяржавы (без усялякай заваёвы). Розніца ўяўляецца відавочнай.

6. Меркаванне М.Спірыдонава пра грунтоўнасць рэцэнзіі Э.Гудавічуса на працу М.Ермаловіча з'яўляецца асабістай думкай апанента, якую я не падзяляю. Рэцэнзія вельмі рэзкая і будуецца яна ў асноўным на аксіёмах летувіскай гістарыяграфіі, якія цяжка назваць агульнапрынятымі. Напрыклад, Э.Гудавічус перакананы, што Летува авалодала беларускімі землямі, што сярэднявечная Літва адпавядае сённяшняй Летуве і г.д.

7. Працу В.Насевіча "Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы" сам яе аўтар назваў не навуковай, а навукова-папулярнай. У ёй шмат цікавых думак, палітычныя выдарэнні ў Панямонні падаюцца на шырокім фоне міжнародных падзеяў. Тым не менш аўтар гэтай працы блытаецца ў важнейшых крыніцах па генезісу ВКЛ, часам супярэчыць сам сабе ў асноўных высновах (дэталёва пра гэта я пісаў у БГА, т. 5, сш. 2(9), с. 448-454). Таму ўзнікаюць пэўныя сумненні ў прафесійным падыходзе яе аўтара да праблемы генезы ВКЛ.

Другая частка водгуку М.Спірыдонава ці другі кантэкст рэцэнзіі не ўмяшчаецца ў рамкі навуковай дыскусіі. Апанент пачынае і заканчвае свой выступ сцвярджэннем, што задачай маёй працы ад пачатку было стварэнне "міфа ці нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі", "адраджэнне велічы мінулага Беларусі". Пад час абароны дысертацыі тое ж абвінавачванне ў "свядомым стварэнні міфа" неаднаразова паўтарыў у сваім выступе В.Насевіч[199]. Абодва апаненты ў якасці доказу прыводзілі мой артыкул "Патрабуецца міф" (ЛіМ. 17.04.1992). Паколькі з моманту гэтай публікацыі прайшло некалькі гадоў, варта нагадаць пра яе змест. Гаворка ў артыкуле ішла пра неабходнасць тэрміновай распрацоўкі "агульнай схемы папулярнага варыянта канцэпцыі нацыянальнай гісторыі" і ўвядзенне яе ў сістэму асветы незалежнай беларускай дзяржавы да таго часу, пакуль гісторыкі не распрацуюць "акадэмічную" канцэпцыю. Праблема выкладання гісторыі Беларусі ў той час сапраўды паўстала вельмі востра, пра што сведчыць тая паспешлівасць, з якой літаральна за паўгода ствараліся новыя школьныя падручнікі 1993 г.

Выснова пра "свядомае стварэнне міфа" можа мець месца ў навуковай рэцэнзіі толькі пры ўмове прывядзення важкіх таму доказаў. На жаль, ні ў выступе М.Спірыдонава, ні ў рэцэнзіі В.Насевіча мне не ўдалося знайсці прамой сувязі між крытыкай навуковага характару і гэтым сур'ёзным абвінавачваннем. Цікава, што В.Насевіч, атрымаўшы адказ на сваю эмацыянальную рэцэнзію ў БГА, тут жа (і ўжо намнога спакайней) адгукаецца: "Прынцыповых разыходжанняў няма".

Хачу запэўніць паважанага Міхаіла Фёдаравіча, што я не стаўлю сваёй мэтай стварэнне міфа і доказ велічы мінулага Беларусі. Перакананы аднак, што да сваёй гісторыі належыць адносіцца з пачуццём уласнай годнасці і не разумею, чаму Вы лічыце нормай яе прыніжэнне. Каланіяльная гісторыя Беларусі – гэта тая спадчына савецкай гістарычнай школы, ад якой мы мусім пазбавіцца, калі хочам застацца гісторыкамі свайго народу.

Аляксандр Краўцэвіч

---

[199] Пратакол пасяджэння Савета па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара навук пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі ад 4 снежня 1998 г. С. 13-17.

**ДАКУМЕНТ**

## Антон Луцкевіч аб жыцці і дзейнасці Зыгмунта Нагродскага (1865-1937).

У Цэнтральным Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва ў Менску захоўваецца рукапіс выступлення Антона Іванавіча Луцкевіча на паседжанні Літаратурна-мастацкай секцыі Беларускага навуковага таварыства 4 красавіка 1937 г. (фонд 3, воп. 1, адз.272, арк.1-7адв.). Выступленне было прысвечана памяці аднаго з віленскіх краёўцаў Зыгмунта Нагродскага.

Зыгмунт Нагродскі нарадзіўся ў вёсцы Зулава Свянцянскага ўезду Віленскай губ. Ужо ў маладосці далучыўся да польскага грамадска-палітычнага руху. У 1883 г. разам з братамі Браніславам і Юзафам Пілсудскімі арганізаваў у Вільні тайную вучнёўскую бібліятэку. У далейшым ён даволі ўдала спалучаў нелегальную польскую асветніцкую працу з прадпрымальніцтвам і гаспадарчай дзейнасцю. На пачатку 20 ст. менавіта Зыгмунт Нагродскі з'яўляўся фактычным кіраўніком сістэмы тайнага польскага школьнага навучання на Віленшчыне. Аказваў фінансавую падтрымку польскім і беларускім культурна-асветніцкім праектам. Належаў да краёўцаў. Уваходзіў у віленскія масонскія ложы "Лучнасць" (1910) і "Літва" (1911), якія аб'ядноўвалі мясцовых дзеячаў дэмакратычна-ліберальнай арыентацыі. Актыўна ўдзельнічаў у палітычным жыцці 1919-1921 гг. Быў абраны дэпутам сейма т.з. "Сярэдняй Літвы" (1921). Паступова адышоў ад палітычнай дзейнасці. Не прыняў асноўныя прынцыпы нацыянальнай палітыкі II Рэчы Паспалітай.

Тэкст Антона Луцкевіча дае магчымасць яшчэ раз звярнуць увагу на феномен краёвасці ў беларускай і літоўскай гісторыі. Ён жа знаёміць нас з узаемаадносінамі паміж дзеячамі беларускага Адраджэння і Зыгмунтам Нагродскім, распавядае пра сяброўства паміж апошнім і славутым беларускім паэтам Францішкам Багушэвічам. Апроч гэтага тэкст выступлення выдатна перадае атмасферу другой паловы 30-ых г. 20 ст.

Тэкст друкуецца ўпершыню. Усе асаблівасці арыгіналу захаваныя.

Алесь Смалянчук.

## Зыгмунт Нагродзкі і яго адносіны да беларусаў. Пасьмертныя ўспаміны.

25 сакавіка – у дзень беларускага нацыянальнага сьвята, абход якога пад Польшчай сёлета быў забаронены, - зыйшоў з гэтага свету, Зыгмунт Нагродзкі, пражыўшы 71 год. Сьмерць яго іменна ў гэты дзень мае ў сабе нешта сымбалічнае: людзі тыпу Зыгмунта Нагродзкага ў сучаснай Польшчы, абліччa якой так ярка выявілася ў сказанай забароне нам сьвяткаваць 19-ыя ўгодкі абвяшчэньня незалежнасці Беларусі, запраўды ж прадстаўляюцца, як нейкі анахранізм, і ў новых будаўнічых дзяржаўнага ладу не маюць сімпатыі… Цяпер яны ў Польшчы – лішнія!

Нагродзкі жыў і працаваў на грамадзкай ніве ў тыя часы, калі польскі лёзунг "Za waszą i naszą wolność" меў яшчэ істотнае значэньне і ня служыў, як цяпер, дзеля цынічных аблыжных заяваў польскіх палітыкаў аб "традыцыйнай толеранцыі" да

душаных грубай сілай беларусаў і іншых “mniejszości”. Пакаленьне, да якога належыў Зыгмунт Нагродзкі, ішло запраўды рука аб руку з беларусамі, вядучы барацьбу з варожай да абодвух бакоў Расеяй.

Але і паміма ўплыву панаваўшай тады ў сферы, да якой належаў Нагродзкі, ідэалогіі памяркоўнасці дзеяч меў глыбокі сэнтымент да беларусаў, да іх працы над нацыянальным адраджэньнем. Сын пахтара ў Зулаве – у Пілсудскіх – Зыгмунт Нагродзкі ад першых дзён жыцця ўзрастаў у беларускай атмасферы, сябруючы ня толькі з “панічамі”, але і з сялянскімі дзяцьмі – сваімі равеснікамі. І мовы польская – мова двара, і мова беларуская – мова вёскі, былі роўна блізкія і родныя для яго. У беларускім селяніне бачыў ён свайго брата і за лепшую долю для яго змагаўся тым шляхам, які – на яго погляд – вёў найпрасцей да мэты: шляхам адбудовы колішняй польскай дзяржавы, якая тады прадстаўлялася яму, як ідэал сужыцця народаў і адначасна ідэал сацыяльнае справядлівасці. – Як жа горка разчаравала яго ў гэтай наіўнай веры адбудаваная Польшча!…

Нагродзкі вельмі любіў беларускія народныя песьні і казкі ды сквапна лавіў кожын вершык беларускі, які ці то выходзіў у сьвет у друку, ці пераказваўся ў жывым слове. Але да 80-х г. – па-за творамі Дуніна-Марцінкевіча – блізу нічога ў беларускай мове не друкавалася.

У 1893 ці 94 г. атрымаў Нагродзкі, які жыў тады ў Вільні, першае выданьне вершаў Багушэвіча “Дудка беларуская”. Кніжачка выйшла за граніцай і прыходзіла ў Вільню канспірацыйнай дарогай. “Дудку” прынёс Нагродзкаму Язэп Пілсудскі. Кніжка зрабіла на Нагродзкага велізарнае ўражаньне. Яму ўдалося хутка пазнаёміцца і з аўтарам яе, Багушэвічам, каторы ўжо жыў тады ў Вільні і працаваў, як адвакат. З паэтам Нагродзкі вельмі здружыўся, і яны бачыліся прынамсі раз у тыдзень.

Ідэі Багушэвіча знайшлі ў душы Нагродзкага гарачы водгук. У гутарках прыяцелі абменьваліся думкамі аб літаратурнай творчасці Багушэвіча, і Нагродзкі часам падаваў яму тэмы дзеля вершаў ці апавяданняў у прозе (“Дзядзіна”, “Сьведка” і інш.). “Дудку” Нагродзкі пашыраў сярод сялян, якія прыязджалі па тавары ў Вільню да каапэратывы (на Татарскай вуліцы), дзе Нагродзкі працаваў. Калі-ж першае выданьне “Дудкі” разышлося, Нагродзкі даў сваіх сто рублёў, каб яе перавыдаць, што і было зроблена ў Кракаве. Вершы Багушэвіча Нагродзкі часта дэклямаваў на рамесніцкіх вечарынах у Вільні і пры гэтым выступаў у беларускай сялянскай сьвітцы.

Багушэвіч, як ведама, нядоўга ўжыўся ў Вільні. Тут паміж ім і польскім грамадзянствам, перад усім – польскай адвакатурай узьняліся даволі вострыя канфлікты на ідэйным грунце, і беларускі паэта пакінуў места, ды перабраўся ў свой двор у Кушляны, у Ашмяншчыне. Вільня хутка забылася аб ім, але не забываўся аб паэце Нагродзкі і ад часу да часу заглядаў у Кушляны. Тут некалькі разоў фатаграфаваўся разам з сям’ёй Багушэвіча. Часта карэспандаваў з паэтам, які горка жаліўся яму на сваю самотнасьць, на забыцьцё ўсімі віленскімі знаёмымі і прыяцелямі. Калі ж Багушэвіч памёр (у 1900 г.), Нагродзкі, які сам не мог паехаць на пахаваньне прыяцеля, зарганізаваў дэлегацыю ад віленскіх рамеснікаў (у гэтай сферы Нагродзкі найбольш працаваў культурна і палітычна), каторыя завезлі на труну Багушэвіча вянок з беларускім надпісам – адрыўкам вершу паэты: “Змоўклі песні тыя, што іграў на дудцы…”

Хутка пасля гэтага (у 1901 г.) Нагродзкі быў арыштаваны і сядзеў у “прэдварылцы” (“Дом прэдварыцельнага заключэння”) у Пецярбурзе. Адарваны ад

роднае зямлі, Нагродзкі, відаць, балюча перажываў гэтую разлуку, і ў яго зьявілася ахвота пісаць па-беларуску. Ён тады напісаў гэткі вершык – пад загалоўкам “Да жонкі маёй у Вільні”:

Перастань тужыць, бабулька,
Што мужык твой гіне,
Бо калі Бог не апусьціць,
То не зьядуць сьвіньні.

Яшчэ вырвуся з іх когцяў,
Вярнуся ў хату,
З табой разам ім за гэта
Абдумаць заплату.

І так доўга жыці будзем
У шчаслівай долі,
Аж галоўкі стануць белы,
Як той сьнег у полі.

Верш падпісаны імем Нагродзкага: Зыгмяль – і датованы: “Пецярбург. Прэдварылка. 1901 год.”

Спадзяваньні Нагродзкага хутка здзейсніліся, і ён неўзабаве выйшаў на волю, ды далей вёў сваю працу. А вершык гэты не быў адзіным беларускім творам яго. Калі ў Барэйкаўшчыне ў … годзе (так у рукапісу.-*А.С.*) было адкрыццё памятніка Сыракомлі, у гэтай урачыстасьці прыняў учасьце і Нагродзкі. Апрануўшыся ў беларускую сьвітку, ён сказаў гэткі вершык па-беларуску – уласны свой твор:

Пастароньцеся, братцы мае,
Дайце-ж прыступіцца,
Дайце-ж і мне, хоць у сермязе,
Яму пакланіцца.

Бо і нашым ён быў братам,
І нас любіў шчыра,
І для нас лілася песьня,
Грала яго ліра.

Дайце-ж глянуць на то мейсца,
Адкуль з яго грудзі
Раздаваўся голас вешчы:
“Мілуйцеся, людзі!”

Патуль зваў ён, патуль клікаў
З усёй сваёй сілы,
Аж пакуль не надарваўся,
Ня лёг да магілы.

Закапалі яго людцы,
Глыбай прывалілі,
“Вечны пакой дай му Пане”
У Бога прасілі.

А ён кліча із магілы
І не перастане,
Пакуль усе не абаймуцца,
Міласць не настане.

Вершык гэты вельмі характэрны для ягонага аўтара: тут сфармуляваньне ўсяго грамадскага сьветапогляду Нагродзкага, для цяперашніх часоў у Польшчы запраўды-ж анахранічнага ў вуснах чалавека, які ўсё жыццё сваё працаваў для ідэальнай (тут і далей падкрэслена ў рукапісу.-*А.С.*) Польшчы і так глыбока быў расчараваны <u>рэальнай</u>.

Гэнтая жменька інфармацый аб Зыгмуньце Нагродзкім і адносінах ягоных да беларусаў абаперта на асабістых апавяданьнях яго, якія ўсяго год назад чуў я з ягоных уласных вуснаў, не спадзеючыся, што гэтка хутка прыдзецца пісаць аб Нагродзкім, як аб ценю мінулага... Далей буду адзначаць толькі тое, што сам ведаю,назіраючы над працай Нагродзкага ад 1904 г.

Першы раз спаткаўся я з Нагродзкім на канспіратыўным зьездзе краёвае інтэлігенцыі, які адбыўся ў Вільні ў 1904 г. На гэтым зьездзе апрача групы віленскіх беларусаў, былі і прадстаўнікі Менску: мой брат Іван і я. Іван пазнаёміў мяне з Нагродзкім, з каторым быў ужо знаёмы раней. Але ад першага спатканьня – апрача самога факту яго – у памяці маёй ад Нагродзкага не асталося нічога. Бліжэйшае знаёмства наладзілася толькі ў 1906 г., калі брат і я мусілі пакінуць Менск, уцякаючы ад арышту, і пасяліцца нелегальна, пад выдуманымі прозьвішчамі, у Вільні. Нагродзкі меў ужо тады свой склад гаспадарскіх прыладаў на Завальнай вуліцы і жыў побач, а улетку перабіраўся з жонкай на Бельмонт – на дачу Кадэнацы. Іван вельмі дружыўся з ім і часта заглядаў да яго ў горадзе, а часамі вандраваў і на гэную дачу. З ім і я пару разоў быў у Нагродзкага, дзе прыймалі нас заўсёды вельмі сымпатычна. І як ні ярка выступаў Нагродзкі як барацьбіт за польскую справу, ён вельмі цікавіўся справамі беларускага адраджэнскага руху, спагадаў нам у нашай рабоце і даваў доказы спогаду.

Увосень 1906 г. распачалі мы выдаваньне першага легальнага часопісу ў беларускай мове – “Нашае Долі”, якую хутка замянілі “Нашай Нівай”. Нагродзкі быў адным з першых падпішчыкаў іх і даваў добра платныя абвесткі аб сваім складзе і прадаваных машынах і гаспадарчых прыладах, чым значна дапамагаў выдавецтву. Безумоўна, і для прадпрымальніка Нагродзкага было карысна рэклямавацца ў часопісе, які ішоў на вёску па ўсім нашым краі ў тысячах экзэмплярах. Але гэта была, бадай, ці не адзіная польская фірма, якая карысталася беларускай газэтай, а ад часу да часу друкавала па-беларуску ўкладныя лісткі з рэклямай. Ахвотна даваў нам Нагродзкі і клішэ рысункаў да папулярных брашурак, што пры нашым безграшоўі мела так сама пэўную вагу. Але найважней было тое, што Нагродзкі быў для нас свайго роду “безпрацэнтным банкірам”: у цяжкія мамэнты ён ніколі не адмаўляўся пазычыць на нашыя выдавецтвы колькі сот рублёў, якія мы, ведама, з падзякай варочалі яму ў назначаны тэрмін. Вельмі здружыўся з Нагродзкім такжа Уласаў, які ад

пачатку 1907 г. асеў у Вільні дзеля працы ў "Нашай Ніве" і падпісваў яе, як адказны рэдактар.

У 1906 г. у Пецярбурзе зарганізавалася беларуская выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў нашае ваконцэ". Суполка пастанавіла ў першы чарод перавыдаць творы беларускіх пісьменнікаў XIX ст. – Дуніна-Марцінкевіча і Багушэвіча, а пасля ўжо друкаваць новых нашых паэтаў. У перагаворах з сямьёй Багушэвіча аб прадажы права на перадрук суполкай "Дудкі" і "Смыка" шмат дапамог Нагродзкі. Ён жа памагаў пры ўкладаньні яшчэ аднаго – недрукаванага раней – зборніку вершаў Багушэвіча пад назвай "Беларуская скрыпачка", якую мелася гэтак сама выдаць "Суполка", даставаў опісы не хапаючых вершаў і г.д. З вялікім піетызмам перахоўваў Нагродзкі пісьмы і ўсякія рукапісы Багушэвіча, якія, на вялікі жаль, пазней счэзьлі з яго кватэры – падчас пастою чырвонаармейцаў. Усё гэта было зложана ў асобную папку. Дык магчыма, што чырвонаармеяц-беларус (?) (так у рукапісу.-*А.С.*) узяў яе з мэтай адвезці ў Менск, дзе яна мо і апынулася. У папцы быў і нязвычайна рэдкі экзэмпляр зборнічку вершаў Багушэвіча, т.н. "Тралялёначка".

Трудна пералічыць, бо-ж і ўспомніць немагчыма, тыя дробныя часта ўслугі, якія аказваў Нагродзкі беларускім прадстаўнікам-адраджэнцам (прыкладам, пры арганізацыі тэатру) і якія так ярка выяўлялі яго нязьменна прыхільныя адносіны да нашае справы – навет у мамэнты асабліво вострых напасцяў польскае прэсы на беларускі рух і яго павадыроў. Нагродзкі ведаў людзей нашых і не даваў веры ўсякім нягодным паклёпам, якімі закідалі нас нашыя ворагі розных масьцяў і розных нацыянальнасьцяў.

Урэшце прыйшлі гады вялікае вайны, пасьля – зьменаў улады на нашай зямлі. Нагродзкі то пакідаў Вільню, то зноў сюды варочаўся, ідэйна працуючы для справы адбудовы Польшчы, але адначасна стараючыся ўсюды адзначаць асаблівасці нашага краю і падтрымліваючы федэрацыйную канцэпцыю. Доўга мы з ім ня гутарылі, абменьваючыся толькі паклонамі на вуліцы. Праўду кажучы, мне і не хацелася з ім гутарыць: я баяўся, атуманены неспадзяваным трыўмфам польскае справы, [ён] забыўся аб сваіх колішніх краёвых настроях. Але ў апошнія гады перад сьмерцю Нагродзкага даведаўся я, што ён бываў на беларускіх нацыянальных абходах і ўжо гэты факт зрабіў на мяне добрае ўражаньне.

Год назад я пачаў працаваць над выясненьнем некаторых цёмных для мяне мамэнтаў у жыцьці Багушэвіча і, ведаючы аб блізкіх адносінах да паэта Зыгмунта Нагродзкага з тым большай надзеяй, надумаўся зьвярнуцца аб інфармацыі да апошняга. Мушу сказаць, што свайго кроку я не пашкадаваў. Нагродзкі сустрэў мяне так, як быццам гэта было дваццаць гадоў назад. Больш таго, з кожнага ягонага слова відаць было горкае расчараваньне. "Ці-ж аб такой Польшчы мы лятуцелі? Ці на тое падстаўлялі свае галовы пад усялякія ўдары, каб быць цяпер сьведкамі новае нявολі, у якой апынуліся "меньшасці" – казаў Нагродзкі. Расчараваўся ён і ў Пілсудскім. Не без горычы расказаў мне гэта адданы некалі "Зюку" конспіратар, гатовы жыцьцё сваё паставіць на карту па слову свайго павадыра, што ў першыя гады пасьля ўскрашэньня Польшчы Пілсудскі, прыяжджаючы ў Вільню, заўсёды адведываў яго, бываў у яго на абедзе. Але пасьля – "забыўся" аб ім. "Забыўся", бо забыўся і аб тых ідэалах, за якія некалі змагаўся, бо адмінулага застаўся толькі адзін "фетыш" нязьменны: прыбраны некалі ў паступовую і сацыялістычную вопратку, а цяпер ужо нічым не прыкрыты польскі нацыяналізм. Забыўся Пілсудскі і аб нашым краю, і – аб лёзунгу "równi z

równymi, wolni z wolnymi", "Za naszą i waszą wolność"… Але Нагродзкі заўсёды быў джэнтэльменам і такім астаўся і ў адносінах да свайго колішняга павадыра: беспасрэдне аб ім нічога благога не гаварыў.

Нагродзкі даў мне вычарпаючыі інфармацыі аб сваіх адносінах з Багушэвічам, даў магчымасць перапісаць некалькі неапублікаваных дагэтуль вершаў Багушэвіча – беларускіх і польскіх, пазычыў цікаўныя фатаграфіі дзеля выкарыстаньня. Некаторыя рэчы мусіў спецыяльна даставаць для мяне; на некаторыя пункты даваў адказ, абдумаўшы колькі дзён. Адным словам, рабіў усё магчымае, каб дапамагчы мне адтварыць праўдзівы воблік беларускага паэты, так часта і так няслушна залічанага беларускім грамадзянствам да палякаў. Тры разы меў я з ім доўгія гутаркі на тэмы, зьвязаныя з асобай Багушэвіча, запісваючы точна ўсё, што ён гаварыў мне, і пасьля разам з ім, правяраючы точнасць запісаў.

Нагродзкі ў 1936 г. паказаўся мне зусім такім самым, як і ў 1906, калі я з ім пачаў больш спатыкацца. Як і тады быў ён усё жыцьцё сваё сябрам тэй даваеннай духовай эліты, каторая ў аснову сваёй ідэалёгіі паклала пашану да чалавека, шчыра імкнулася да зьдзесненьня высокіх ідэалаў Вялікай Французскай рэвалюцыі і за сваё найсьвяцейшае заданьне лічыла працу над памнажаньнем і пашырэньнем у масах народных скарбаў культуры.

За гэта чэсць памяці яго!

Вільня. Вялікдзень. 1937. Антон Луцкевіч.

**РЭЦЭНЗІЯ**

**Пётр Эберхардт. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1897-1989. Менск: Беларускі фонд Сораса, 1997. - 278 с.**

У 1995 г. мне ўжо давялося пісаць рэцэнзію на варшаўскае выданне гэтай кнігі (Przemiany narodowościowe na Białorusi. Warszawa,1994). Яна аказалася досыць крытычнай. Кідаліся ў вочы факталагічныя недакладнасці, цяжка было пагадзіцца з некаторымі ацэнкамі падзей беларускай гісторыі. Але галоўная прэтэнзія датычыла канцэптуальнага падыхода Пятра Эберхардта да праблемы вызначэння нацыянальнасці насельніцтва Беларусі канца 19 – першай паловы 20 ст. Ніякіх змяненняў або ўдакладненняў у менскае выданне сваёй кнігі аўтар не ўнёс. Што ж прымусіла другі раз звярнуць увагу на гэтае даследаванне?

Па-першае, сам факт беларускамоўнага выдання. Дзякуючы перакладу, праца вядомага польскага навукоўца можа арганічна ўвайсці ў беларускае навуковае і культурнае жыццё. Па-другое, адбыліся перамены і ў беларускай гістарыяграфіі. Адышоў у мінулае пэўны рамантызм, які быў характэрны для беларускай гістарычнай навукі напрыканцы 80-ых - пачатку 90-ых гадоў. Прыйшло разуменне неабходнасці велізарнай працы па стварэнні **нацыянальнай беларускай гістарыяграфіі.** Сёння кніга прафесара Эберхардта ўспрымаецца па-іншаму.

З пункту погляду гістарыяграфіі праблемы і выкарыстаных даследчыкам крыніц праца напісана ў лепшых традыцыях польскай навукі. Аўтар зрабіў верыфікацыю дадзеных амаль усіх перапісаў, якія датычылі Беларусі. Гэта расійскія перапісы 1897 і 1909 г., нямецкі - 1916 г., польскія - 1919, 1921, 1931 г. і савецкія - 1926, 1937, 1939, 1959, 1970, 1979, 1989 г. У гэтым пераліку не хапае толькі перапісу 1911 г., які праводзіла Міністэрства народнай адукацыі. Пры аналізе крыніц аўтар абапіраўся на шырокую гістарыяграфічную базу (142 пазіцыі ў бібліяграфіі). Пётр Эберхадт выкарыстаў амаль усе польскія выданні (да пачатку 90-ых), якія датычылі “беларускага пытання”. Значнае месца ў гістарыяграфіі займаюць расійскія выданні як дарэвалюцыйныя, так і савецкага часу. Аўтар знаёмы і з працамі беларускіх дэмографаў і гісторыкаў 20-ых – пачатку 90-ых гадоў. На жаль, польскі даследчык завяршыў працу над кнігай яшчэ да выхаду з друку новых абагульняючых работ па гісторыі Беларусі, знаёмства з якімі дапамагло б пазбегнуць пэўных недакладнасцяў і надало б большую грунтоўнасць аўтарскім высновам.

Галоўным аб’ектам увагі сталі змяненні ў нацыянальнай (этнічнай) структуры беларускага грамадства, паказаныя на шырокім фоне гістарычных падзей 20 ст. Аўтар засяродзіў сваю ўвагу пераважна на колькасці і ўзаемадачыненнях палякаў, беларусаў, жыдоў і рускіх.

Уводзіны і раздзел “Нацыянальная структура насельніцтва Беларусі на пераломе 19 і 20 ст.” дазваляюць зразумець сутнасць даследчыцкіх метадаў Пятра Эберхардта. Па-першае, аўтар крытычна падыходзіць да дадзеных практычна ўсіх перапісаў, усведамляючы тыя перашкоды, якія не дазвалялі ім адэкватна адлюстраваць складаную карціну этнічнага жыцця, і праводзіць верыфікацыю

афіцыйных падлікаў. Што датычыць перапісаў пачатку стагоддзя, у якіх адсутнічала пытанне пра нацыянальнасць, аўтар у сваім аналізе карыстаўся пераважна дадзенымі па роднай мове і канфесійнай прыналежнасці. Прычым Пётр Эберхардт не лічыць родную мову істотным крытэрыем для вызначэння нацыянальнасці ў этнічна-змешаных рэгіёнах. На яго думку, непараўнальна большую ролю адыгрываюць звесткі пра канфесійную прыналежнасць. Навуковец вельмі крытычна ставіцца да тэзіса пра існаванне беларусаў-каталікоў у гэтых рэгіёнах.

Па-другое, тэрыторыя Беларусі разглядаецца ў сучасных палітычных межах. Гэта прынцыповая пазіцыя аўтара, які лічыць, што толькі такі падыход дазваляе правесці параўнальны аналіз дэмаграфічных змяненняў у Беларусі на працягу ўсяго 20 ст. Здаецца, што гэты падыход таксама выцякае з пераканання аўтара ў недапушчальнасці рэвізіі (у кожнай форме) сучасных палітычных (дзяржаўных) межаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Там, дзе гэта магчыма, прафесар Эберхардт імкнуўся прааналізаваць структуру нацыянальнага (этнічнага) складу насельніцтва па паветах (раёнах). Гэта, дарэчы, стварыла магчымасць на даволі глыбокім узроўні правесці верыфікацыю дадзеных перапісаў і ўдакладніць этнічныя межы.

Варта звярнуць асаблівую ўвагу на аўтарскі аналіз перапісу 1897 г. Як практычна ўсе польскія даследчыкі Пётр Эберхардт вельмі крытычна паставіўся да яго вынікаў. З дапамогай дадзеных па роднай мове і канфесійнай прыналежнасці ён паспрабаваў зрабіць больш адэкватнае адлюстраванне этнічнай структуры насельніцтва. Пры гэтым прафесар абапіраўся на разлікі Владзімежа Вакара[200], метадалагічныя падыходы якога ён у значнай ступені падзяляе.

Фактычна, Пётр Эберхардт унёс толькі адно, але досыць істотнае ўдакладненне ў разлікі свайго папярэдніка. В.Вакар палічыў украінцамі насельніцтва беларуска-ўкраінскага этнічнага памежжа, якое прызнала сваёй роднай мовай украінскую ("маларускую"). Пётр Эберхардт аднёс іх да беларусаў, звярнуўшы ўвагу, што ва ўсіх наступных перапісах гэтае насельніцтва лічыла сябе беларусамі. У выніку атрымалася, што на пераломе стагоддзяў агульная колькасць цывільнага насельніцтва Беларусі складала 6424,2 тыс. чал. Беларусаў было каля 4356,2 тыс. або 67,8%, жыдоў – 910,9 тыс. або 14,2%, палякаў – 838,9 тыс. або 13,0%, рускіх – 224,5 тыс. або 3,5% (с.45). (Па перапісу 1897 г., калі атаясамліваць нацыянальнасць з дадзенымі па роднай мове, што звычайна рабілі расійскія, беларускія і нямецкія даследчыкі, колькасць беларусаў даходзіла да 4756,8 тыс. або 73,3%, а колькасць палякаў – да 156,5 тыс. або 2,4%. Колькасць расейцаў і яўрэяў была прыблізна той самай.) Пацвярджэннем верагоднасці гэтых разлікаў стаў, на думку П.Эберхардта, перапіс 1909 г., які быў звязаны з земскай рэформай у Беларусі і насіў службовы характар, што сведчыць на карысць яго аб'ектыўнасці. Перапіс паказаў, што рускія, беларусы і ўкраінцы разам складаюць 72,9% насельніцтва Беларусі (5424,1 тыс.), а палякі - 13,2% (983,4 тыс.) (с.62). Але цікава, што ў дачыненні да ўсіх шасці беларуска-літоўскіх губерняў (Віленская, Віцебская, Гарадзенская, Ковенская, Менская і Магілёўская) колькасць палякаў Беларусі і Літвы, вызначаных на падставе дадзеных па роднай

[200] Wakar W. Rozwój terytoryalny narodowości polskiej. Część III. Struktura narodowościowa kresów wschodnich. Kielce, 1917.

мове перапісу 1897 г. (563,8 тыс. або 5,6%), таксама **пацвярджаецца** паказчыкамі перапісу 1909 г. (632,2 тыс. або 5,5%).

Відавочна, што пры ўсім даверы да вынікаў перапісу 1909 г. ён не можа служыць сур'ёзным аргументам, які б пацвярджаў або абвяргаў тыя ці іншыя разлікі. Занадта хуткія перамены адбываліся ў нацыянальным самавызначэнні на самым пачатку 20 ст. Цяжка таксама абвяргаць або пацвярджаць вынікі перапісу 1897 г. з дапамогай дадзеных перапісаў 1916 г. (нямецкія ўлады) і 1919 г. (польскія ўлады). Першы з іх быў арганізаваны такім чынам, што закрануў толькі найбольш актыўную ў грамадскім і палітычным плане частку насельніцтва акупаваных тэрыторый, а другі праводзіўся польскімі ўладамі на Віленшчыне, Гарадзеншчыне, Берасцейшчыне і ў заходняй частцы Меншчыны ва ўмовах ваенных дзеянняў, што, як адзначыў і аўтар кнігі, спрыяла значнаму завышэнню лічбы палякаў. Значная перавага колькасці палякаў над колькасцю каталікоў у некаторых паветах, на думку Пятра Эберхардта, сведчыць пра кан'юнктурнае стаўленне часткі беларускага праваслаўнага сялянства. Верыфікацыя даследчыкам дадзеных колькасці палякаў па перапісу 1919 г. грунтавалася на наступнай пазіцыі: "У выпадку, калі палякаў больш, чым каталікоў, бралася пад увагу лічба насельніцтва каталіцкага веравызнання. У адваротнай сітуацыі, калі каталіцкае насельніцтва пераважала, за галоўны пункт уважалася толькі колькасць палякаў" (с.78). Літоўцы-каталікі былі адмінусаваныя. У выніку колькасць палякаў на тэрыторыі 20 заходніх паветаў Беларусі склала прыблізна 788,9 тыс. чалавек або 23,9% насельніцтва (с.78).

Аўтар упэўнены, што перапісчыкі ў 1897 г. аднеслі да беларусаў жыхароў польскамоўнай зоны, якая ўтварылася ў 70-90-ыя гады 19 ст. на былым беларуска-літоўскім этнічным памежжы. У 1897 г. тут ужо існавала беларуска-польскае і польска-літоўскае памежжа. Даследчык так ахарактарызаваў сітуацыю, якая складвалася ў выніку працэсаў нацыянальнай дыверсіфікацыі: "Селянін-каталік з ваколіцаў Коўна, які ўжываў летувіскую мову, свядома становіцца летувісам. Селянін-каталік, што ўжывае славянскія дыялекты і які жыў на летувіска-беларускім памежжы, становіцца канчаткова палякам, а праваслаўны селянін, што жыве ў межах былой Рэчы Паспалітай, - на вялікай частцы тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага - беларусам. Гэтыя працэсы ў канцы 19 ст. выступалі ўжо ў выразна акрэсленай форме, і толькі праграмна запланаваная антыпольскасць перапісу, праведзенага царскай адміністрацыяй, не дала зафіксаваць гэтага факту. На пераломе 19 і 20 ст. не існавала ўжо дакладнай этнічнай мяжы паміж летувіскім і беларускім народам. Паміж імі сфарміраваўся шырокі нацыянальны пас пераважна польскага характару з цэнтрам у Вільні" (с.31-32). Да гэтага тэзіса аўтар звяртаецца неаднаразова на працягу ўсяго даследавання, надаючы яму вялікую вагу. І гэта цалкам зразумела, бо цэнтрам гэтай тэрыторыі з'яўляецца Вільня. Высновы Пятра Эберхардта грунтуюцца і на выніках экспедыцыі лінгвіста Галіны Турскай па Віленшчыне ў 1934-1935 гг. Даследчыца здолела даказаць, што стварэнне польскамоўнай зоны на беларуска-літоўскім памежжы адбывалася ў трэцяй чвэрці 19 ст.

Разлікі П.Эберхардта могуць стаць пэўнай базай для далейшых даследаванняў, у т.л. і беларускіх навукоўцаў. Але праблема этнічнай структуры насельніцтва Беларусі на рубяжы стагоддзяў застаецца. Наўрад ці яна будзе калі-

небудзь канчаткова вырашана (па меньшай меры, у межах сучаснага паняційнага апарату). Зрэшты, большасць насельніцтва Беларусі таго часу не вызначала ўласную нацыянальнасць у сучасным разуменні гэтага паняцця. Прафесару Эберхардту варта было б распачаць даследаванне з вызначэння паняцця "нацыянальнасць" для розных гістарычных перыядаў. Зразумела, што самасвядомасць беларускага паляка пачатку 20 ст. не тое самае, што самасвядомасць сучаснага паляка з Беларусі. Але пытанне, што ёсць нацыя, у кнізе застаецца без адказу.

Застаецца і праблема беларусаў-каталікоў ці, як часцей піша аўтар, "так званых беларусаў-каталікоў". Ён упэўнены, што на беларуска-польска-літоўскім памежжы "беларусаў-каталікоў" нарадзілі толькі антыпольскія фантазіі расійскага ўрада. І сапраўды, калі нагадаць колькі ўжо напісана беларускімі гісторыкамі на тэму паланізацыі беларусаў праз каталіцкі касцёл, то "беларусы-каталікі" выглядаюць як пэўны нонсэнс. Але застаецца бясспрэчным фактам тое, што большасць дзеячоў беларускага Адраджэння пачатку 20 ст. выйшла з каталіцкіх сямей. Зрэшты, аўтар не сцвярджае катэгарычна, што кожны нелітоўскамоўны каталік - гэта паляк. Пётр Эберхардт дапускае магчымасць існавання беларусаў-каталікоў, але толькі на этнічна чыстых беларускіх тэрыторыях. І ўсё ж такі гэта праблема з'яўляецца больш складанай. Пра беларусаў-каталікоў пісалі ў свой час такія грунтоўныя знаўцы беларуска-літоўскага рэгіёна як Міхал Ромэр[201] і Леон Васілеўскі[202].

Заслугоўвае ўвагі аўтарскі аналіз этнічнай структуры насельніцтва беларускіх зямель у 20-30-ыя гады. Прафесар падверг грунтоўнай верыфікацыі дадзеныя як польскіх, так і савецкіх перапісаў. На выніку перапісу 1921 г., на яго думку, моцна паўплывала перамога Польшчы ў польска-бальшавіцкай вайне. Гэта спрыяла таму, што частка няпольскага насельніцтва (галоўным чынам, частка беларусаў і жыдоў) пачала атаясамліваць нацыянальнасць з дзяржаўнасцю, тым самым дэманструючы лаяльнасць да польскай дзяржавы. Апроч гэтага мела месца штучнае завышэнне колькасці палякаў і змяншэнне колькасці беларусаў. У выніку ўласнай верыфікацыі Пётр Эберхардт прыйшоў да высновы, што палякаў на тэрыторыі беларускіх паветаў Беластоцкага, Наваградскага, Палескага ваяводстваў і Віленскай зямлі пражывала каля 600 тыс. (па афіцыйных выніках перапісу – 1026,7 тыс.), а беларусаў – каля 1350 тыс. (па афіцыйных выніках - 987 тыс.) (с.91). Здаецца, упершыню адзін з польскіх даследчыкаў зрабіў такую значную карэкціроўку афіцыйных падлікаў.

Польскія ўлады таксама не мелі даверу да вынікаў перапісу 1921 г., і таму ў наступным перапісу (1931) пытанне пра нацыянальнасць адсутнічала. Яго месца заняло пытанне пра родную мову. Што ж атрымалася? Беларускую мову прызнала сваёй роднай 1530,4 тыс. чал. (47,7%), польскую - 1278,9 тыс. (39,8%) (с.115). Пётр Эберхардт лічыць, што і ў гэтым выпадку вялікая колькасць людзей назвала ў якасці роднай польскую мову з кан'юнктурных меркаванняў, асцерагаючыся дыскрымінацыі.

---

[201] Römer M. Litwa. Studium odrodzenia narodu litewskiego. Lwów, 1908.
[202] Wasilewski L. Litwa i jej ludy. Warszawa, 1907.

Аўтарская верыфікацыя грунтавалася на спалучэнні дадзеных па канфесійнай прыналежнасці насельніцтва са звесткамі па роднай мове. Прычым Пётр Эберхардт адзначыў пэўную недакладнасць уласных разлікаў, бо “як сярод каталікоў былі беларусы, так і сярод праваслаўных ды асабліва прыхільнікаў іўдаізму былі асобы, якія свядома называлі польскую нацыянальнасць”.(с.179). Да палякаў навуковец адносіў толькі тых каталікоў, якія лічылі роднай мовай польскую. У выніку атрымалася, што на беларускіх землях, якія знаходзіліся ў межах II Рэчы Паспалітай, пражывала 1797,9 тыс. беларусаў (56,1% усяго насельніцтва), 980 тыс. палякаў (30,5%), 283,3 тыс. жыдоў (8,8%), 70,2 тыс. рускіх (2,2%) і інш. (с.123).

З дапамогай вынікаў перапісу 1926 г. у БССР і з улікам натуральнага прыросту Пётр Эберхардт прыйшоў да высновы, што ў 1931 г. на тэрыторыі сучаснай Беларусі пражывала 6124,7 тыс. беларусаў (71,5%), 1087,4 тыс. палякаў (12,7%), 723,5 тыс. жыдоў (8,4%), 483,5 тыс. рускіх (5,6%) і інш. (с.125).

Пры аналізе перапісу 1926 г. аўтар звярнуў увагу на істотную розніцу паміж звесткамі моўнай і нацыянальнай статыстыкі ў дачыненні да палякаў. Толькі 43,2% палякаў карысталіся ў штодзённым жыцці польскай мовай. Даследчык адзначыў, што “ідэнтыфікацыя польскасці не была звязана з мовай. Не абапіралася яна таксама генетычна і традыцыйна на ўзоры польскай народнай культуры, таму што польскасць трымалася на іншых прынцыпах. Акрамя веравызнання, якое было вырашальным фактарам, існавала моцная памяць пра шляхецкія традыцыі Рэчы Паспалітай. Шматлікія нашчадкі дробнае шляхты, раскіданыя па Цэнтральнай і Усходняй Беларусі, хоць і былі моўна асіміляваныя беларускім атачэннем, прызнавалі сябе тады яшчэ за палякаў”.(с.109-112).

Па падліках Пятра Эберхардта, у 1931 г. у БССР пражывала каля 5368,3 тыс. чал.(с.124). Гэтая лічба вельмі важная, бо дапамагае вызначыць памеры тых стратаў, якія панесла Беларусь у выніку камуністычных рэпрэсій, калектывізацыі, голада пачатку 30-ых і інш. Верыфікацыя дадзеных перапісаў 1937 і 1939 гг. дазволіла сцвярджаць, што непасрэдныя і апасродкаваныя страты насельніцтва БССР паміж 1926 і 1937 г. склалі прыблізна 600 тыс. чал. (с.134). Асаблівых каментарыяў тут не патрэбна.

Даволі падрабязна аўтар ахарактарызаваў становішча беларусаў на землях, якія знаходзіліся ў межах польскай дзяржавы. Ён адзначыў, што для польскіх уладаў “галоўнаю палітычнаю мэтаю была паланізацыя так званых паўночна-усходніх крэсаў, якія мелі істотную стратэгічную ролю. Нягледзячы на тое, што польская канстытуцыя гарантавала роўныя правы без увагі на мову і нацыянальнасць, на практыцы прывілеі мела польскае насельніцтва. Польская палітыка ў адносінах да беларусаў была памылковаю і безпаспяховаю. ... На жаль, перамог нацыянальны, так званы інкарпарацыйны падыход”. (с.137) Менавіта гэтая палітыка прывяла да таго, што “на момант выбуху вайны 1939 г. польска-беларускія адносіны былі абцяжараны недаверам і варожасцю”. (с.140).

У 1937 г., на думку даследчыка, на тэрыторыі, якая зараз знаходзіцца ў межах Беларусі, пражывала 8696,6 тыс. чал. Сярод іх беларусаў было 6324,0 тыс. (72,8%), палякаў – 1186,7 тыс. (13,7%), жыдоў – 671,0 тыс. (7,7%) і рускіх – 325,2 тыс. (3,7%) (с.144). На 1939 г. Пётр Эберхардт лічыць досыць верагоднымі

падлікі беларускіх навукоўцаў С.Польскага і С.Мацюніна, якія прапанавалі лічбу 8748,0 тыс. чал. (с.155).

Дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі істотна змянілася за гады другой сусветнай вайны. Польскі даследчык выказаў сумненне ў тым, што страты насельніцтва Беларусі за гэты час сапраўды вызначаюцца лічбай 2,5-3 млн. чал. Ён упэўнены, што гэтая лічба ўвабрала ў сябе сотні тысяч чалавек, якія былі эвакуіраваны з Беларусі на ўсход СССР або былі вывезены нямецкімі акупацыйнымі ўладамі на працу ў Нямеччыну. У ахвяры гітлераўскага рэжыму маглі быць таксама запісанымі жыхары Беларусі, рэпрэсаваныя камуністычнымі ўладамі з 1939 па 1941 г., а таксама пасляваенныя рэпатрыянты з БССР у Польшчу.

Ваенныя страты Беларусі нераўнамерна ахапілі розныя этнічныя групы. Найбольшыя ахвяры панесла жыдоўскае насельніцтва – каля 500 тыс. чал. Страты беларускіх палякаў ацэнены ў 250 тыс. Беларусы і рускія страцілі менш. (с.156).

Аналіз дэмаграфічнай сітуацыі ў БССР у пасляваенныя гады дапамагае зразумець дамінуючыя тэндэнцыі ў нацыянальна-культурным жыцці. Аўтар адзначыў адносна высокі прырост насельніцтва паміж 1959-1989 гг. Колькасць жыхароў Беларусі за эты час узрасла на 2097,2 тыс. і дасягнула лічбы 10151,8 тыс. чал. Прычым кольскасць беларусаў павялічылася на 21%, а рускіх – на 103,6%. А вось колькасць палякаў і жыдоў панізілася: палякаў – на 22,5%, яўрэяў - на 25,4% (с.232-233). Нацыянальна-моўная сітуацыя змянілася наступным чынам: у 1989 г. беларускую мову прызналі роднай 6664,2 тыс. або 65,6% насельнітва (для параўнання: у 1959 г. - 6362,0 тыс. або 82,7%), рускую мову - 3243,2 тыс. або 31,9% (у 1959 г.- 1309,6 тыс. або 16,2%). Дарэчы, у 1897 г. рускую мову назвалі роднай 281,1 тыс. або 4,3% насельніцтва. Гэтыя лічбы выдатна сведчаць пра тое, што найважнейшая праблема сучаснай Беларусі - гэта спыненне працэсу русіфікацыі. На фоне гэтых падлікаў як сапраўдная правакацыя выглядаюць заявы некаторых кіраўнікоў Беларусі пра пагрозу паланізацыі. Зрэшты з 417,7 тыс. палякаў у 1989 г. толькі 55,7 тыс. прызналі польскую мову сваёй роднай. (с.238).

Як разлікі, так і метадалагічныя падыходы польскага даследчыка могуць узбагаціць беларускую гістарыяграфію. Па меншай меры, яны не павінны застацца па-за ўвагай беларускіх гісторыкаў і дэмографаў. Што датычыць роднай мовы як крытэрыя для вызначэння нацыянальнасці, то можна цалкам пагадзіцца з аўтарам: на этнічным памежжы, дзе звычайна пераважаюць змешаныя дыялектныя гаворкі, родная мова не з’яўляецца вызначальным фактарам для нацыянальнай самасвядомасці. Аўтар гэтых радкоў асабіста пераканаўся ў гэтым падчас працы польска-літоўска-беларускай навуковай экспедыцыі на Віленшчыне (чэрвень 1999 г.) і Гарадзеншчыне (верасень 1999 г.).

Варта падкрэсліць і тое, што прафесар Эберхардт зыходзіць з прызнання самабытнасці беларускай гісторыі. У сённяшніх умовах, калі прадстаўнікам нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі зноў прыходзіцца даказваць, што Беларусь мае ўласны гістарычны шлях, які павінен быць адлюстраваны ўласнай гістарыяграфіяй, гэтае перакананне вядомага польскага навукоўца вельмі важнае. Хаця, на жаль, аўтар не здолеў зразумець Беларусь як суб’ект уласнай гісторыі. У кнізе яна з’яўляецца тэрыторыяй “няпэўнага рэлігійнага, моўнага і

нацыянальнага характара” (с.11), што было абумоўлена змаганнем за гэтыя землі паміж “каталіцкай Польшчай і імперскай Расеяй” (с.12). Зрэшты, вінаваціць у гэтым польскага даследчыка нельга, бо і самі беларусы ў сваёй большасці яшчэ не здолелі ўзняцца да іншага бачання сваёй мінуўшчыны.

Пэўны палонацэнтрызм аўтара праявіўся не столькі ў ацэнках тых або іншых падзей беларускай гісторыі, колькі ў павышанай увазе даследчыка да праблемы беларускіх палякаў.

Добрае ўражанне ад кнігі псуюць недакладнасці, ад якіх трэба было пазбавіцца пры падрыхтоўцы беларускамоўнага выдання. Напрыклад, ліквідацыя уніі адбылася ў 1839, а не ў 1840 г. (с.33), Рыжскі дагавор падпісвалі прадстаўнікі ўраду Савецкай Расіі, а не Савецкага Саюза (с.81), падчас гітлераўскай акупацыі беларуская мова не была “адзінай урадавай” мовай (с.153) і г.д. Сур’ёзныя прэтэнзіі можна прад’явіць да перакладчыка і да навуковага рэдактара. Тэкст насычаны паланізмамі. Перакладчык не заўсёды дакладна перадае думку аўтара. Ёсць прэтэнзіі і да структуры кнігі. Чамусьці “Уводзіны” пазначаны як “Раздзел I”. Кідаюцца ў вочы шматлікія памылкі друку.

Другое “спатканне” з кнігай прафесара Пятра Эберхардта адбылося ў цалкам іншых грамадска-палітычных умовах. Ідэя незалежнай беларускай дзяржавы, якая на пачатку 90-ых гадоў стала падмуркам кансалідацыі амаль усіх этнасаў сучаснай Беларусі, у апошнія гады падверглася моцнай рэвізіі з боку палітычнага кіраўніцтва краіны. Беларускамоўнае выданне працы польскага даследчыка ў гэтых умовах набыло значэнне, якое выходзіць далёка за межы чыста навуковай праблематыкі. Пётр Эберхардт сваёй кнігай яшчэ раз нагадаў беларусам пра вялікую каштоўнасць уласнай незалежнай дзяржавы.

Алесь Смалянчук (Гародня)

**Яўген Мірановіч. Навейшая гісторыя Беларусі. Беласток, 1999. – 270 с.**

Па зместу, глыбіні і аб'ёму інфармацыі кнігу беластоцкага беларускага гісторыка Яўгена Мірановіча трэба аднесці да падручнікаў і разглядаць у шэрагу аналагічных прац, што ўбачылі свет у нашай краіне. Прычым, па меншай меры, па некалькіх характарыстыках "Навейшая гісторыя Беларусі" можа быць пэўным узорам для аўтараў нашых падручнікаў.

Па-першае, кніга змяшчае вялікую колькасць інфармацыі па палітычнай гісторыі, падзеях нацыянальна-вызваленчай барацьбы, па гісторыі культуры, чаго яўна не хапае ў айчынных падручніках. Яўген Мірановіч свабодна апераруе фактамі, якія ствараюць аблічча часу і асвятляюць жыццё краіны ў савецкі перыяд. Відавочна, што аўтар не мае ніякіх комплексаў наконт савецкай рэчаіснасці. І гэта спрыяла таму, што на старонках выдання знайшлі сваё адлюстраванне амаль усе падзеі, важныя для разумення беларускай гісторыі 20 ст.

Па-другое, звяртае на сябе ўвагу вялікая колькасць рэальных персанажаў гісторыі. Апроч партый, рухаў, фракцый і г.д. у кнізе прысутнічаюць жывыя людзі. Шэраг імёнаў даўно ўжо прасіліся на старонкі навучальных выданняў (Марыя Магдалена Радзівіл і інш.).

Заслугоўвае павагі пазіцыя аўтара, калі ён распавядае пра беларуска-польскія адносіны. Многія заўвагі Яўгена Мірановіча носяць прынцыповы характар. У прыватнасці, ва ўводзінах ён зазначыў, што на пераломе 19 і 20 ст. узнікненне беларускага нацыянальнага руху ўспрымалася пераважнай большасцю польскай палітычнай эліты як "расійская інтрыга" (с.5). У раздзеле, прысвечаным гісторыі Заходняй Беларусі 1921-1939 гг., аўтар зрабіў выснову, што грамадскія, палітычныя, эканамічныя і нацыянальныя адносіны на тэрыторыі чатырох паўночна-ўсходніх ваяводстваў стварылі атмасферу калоніі (с.79). Прыведзеныя рознабаковыя факты пераконваюць у справядлівасці гэтай заўвагі і сведчаць аб глыбіні разумення гісторыкам гэтай трагічнай і слаўтай ("Грамадаўская рэвалюцыя") старонцы нашай мінуўшчыны.

Шмат месца ў кнізе адведзена гісторыі Рэспублікі Беларусь. Прычым аўтар паспрабаваў вызначыць пэўныя гістарычныя вехі. Беластоцкі гісторык і тут згадаў шмат рэальных удзельнікаў будаўніцтва сувярэннай дзяржавы, ахарактарызаваў намаганні нацыянальнай інтэлігенцыі ў галіне беларускага Адраджэння ў другой палове 80 - пачатку 90-х гг.

Разглядаемы Я.Мірановічам перыяд гісторыі ўтрымлівае вядомую гістарыяграфічную пастку. Гэта яе меў на ўвазе іспанскі філосаф Артэга-і-Гасэт, калі сцвярджаў, што на мінулае трэба глядзець з такой адлегласці, каб не бачыць носа Клеапатры. Аўтар пазбег гэтайersons пасткі. Ён паспрабаваў паказаць падзеі апошніх двух дзесяцігоддзяў 20 ст. не публіцыстычна, а вызначыўшы найбольш характэрнае і сутнаснае для разумення падзей.

"Гісторыя" Я.Мірановіча – гэта яшчэ і інфармацыя да роздуму аб змесце айчынных падручнікаў. Чаму па-за межамі краіны бачаць свет падручнікі па беларускай гісторыі, якія па шэрагу характарыстык даюць "фору" нашым? І гэта прытым, што "погляду з боку", нават погляду беларуса, звычайна не хапае таго, што магчыма адчуць толькі ў сваёй краіне. Амаль у кожным раздзеле кнігі бракуе фактаў, якія адлюстроўваюць штодзённае жыццё людзей. Гэта не віна аўтара. Гэта якраз тое, што павінна быць напісана ў самой краіне.

Зместу кнігі больш адпавядае назва "Найноўшая гісторыя беларускага народа", бо пра іншыя народы краіны распавядаецца вельмі сціпла. Між тым роля жыдоў, украінцаў, палякаў, татар, рускіх у працэсах і падзеях беларускай гісторыі 20 ст. відавочная.

Невядома матывацыя храналогіі, якой прытрымліваецца Я.Мірановіч, калі бярэ пачатак стагоддзя за пачатак найноўшай гісторыі.

Крытычныя заўвагі выклікаюць некаторыя фрагменты кнігі. Напрыклад, перыяд першай святовай вайны ў Беларусі разглядаецца пераважна скрозь прызму нацыянальна-культурнай дзейнасці. Але для разумення становішча Беларусі падчас вайны трэба згадаць і пра актыўныя баявыя дзеянні на нашых землях. Незразумела адкуль з'явілася лічба 1,3 млн. бежанцаў у Расію з беларускіх губерняў на 1916 г.? (с.22) І чаму колькасць прызваных у расійскае войска фармулюецца вельмі цьмяна –"сотні тысяч жыхароў Беларусі"? У даследаваннях найчасцей згадваецца лічба – 635,0 тыс. чалавек[203]. Аналіз архіўных крыніц паказвае, што гэтая колькасць складала 924,0 тыс. чал. за перыяд 1914-1917 гг.

На жаль, павелічэнне інфармацыі канцэптуальнага характару ў адных раздзелах кнігі, цягне за сабою скарачэнне яе ў другіх. У прыватнасці, гэта тычыцца раздзелу аб партызанскім руху. З аднаго боку, раздзел змяшчае звесткі пра тыя падзеі ваеннай гісторыі, якія не дастаткова асветлены ў беларускіх падручніках (Армія Краёва, дзейнасць Вацлава Іваноўскага), а з другога, не хапае самых хрэстаматыйных прыкладаў партызанскай барацьбы. Культурнае жыццё пасляваеннага часу абмежавана паняццем "русіфікацыі". Аднак чытач або вучань, які па падручніку будзе знаёміцца з нашай гісторыяй, не атрымае дастатковых ведаў пра творцаў, працы якіх характарызуюць час і чалавека гэтага часу.

Савецкая рэчаіснасць – ужо мінулае. І зараз у новага постсавецкага пакалення фарміруюцца пэўныя стэрыятыпы яе ўяўлення. Ад складальнікаў падручнікаў і дапаможнікаў перш за ўсё патрабуецца здольнасць пазбегчы штампаў і спрошчванняў, тыпу "элементы расійскага феадальнага права" (пра калектывізацыю – *В.К.*) (с.73) або "пад савецкім скіпетрам" (с.106).

Падручнік – не манаграфія, аднак спіс літаратуры і найбольш значных крыніц у кнізе не быў бы залішнім. Спасылкі даследчыка на "савецкую гістарыяграфію" толькі аслабляюць аўтарскую аргументацыю.

Трэба адзначыць і тое, што аўтар, відавочна, не ставіў задачу метадычнага прыстасавання сваёй кнігі да школьнага выкладання. Вучыць школьнікаў па гэтым падручніку з метадычнага пункту погляду будзе дастаткова складана.

І ўсё ж чытаць кнігу прыемна. Яўген Мірановіч пісаў пра Беларусь з болем і гонарам. У той жа час аўтары большасці беларускіх падручнікаў намерана дыстанцыруюцца ад праблемы. Сустракаецца яшчэ адна загана. Некаторыя даследчыкі проста перайначваюць агульнасавецкую гісторыю на мясцовы беларускі лад. У выніку гісторыя Беларусі савецкага часу нагадвае гісторыю адной з правінцый СССР. У Яўгена Мірановіча адчуваецца беларускасць, якая не перашкаджае, а дапамагае зразумець мінулае Беларусі. Гэтая адметнасць, разам з адзначанымі моцнымі бакамі "Навейшай гісторыі Беларусі", выклікае жаданне выкарыстоўваць яе ў практычнай выкладчыцкай дзейнасці.

Віталь Карнялюк (Гародня).

---

[203] Липинский Л. Крестьянское движение в Беларуси в 1914-1917 гг. Мінск, 1975. С. 75; Łatyszonek O. Białoruskie formacje wojskowe 1917-1923. Bialystok, 1995. S.36; Смальянінаў М. Трагедыя пачатку XX стагоддзя // Беларускі гістарычны часопіс, 1994. №3. С.55.

**М. Біч. Гісторыя Беларусі. Канец 18 ст. - 1917 г. Вучэбны дапаможнік для 8 класа агульнаадукацыйнай школы. Пад рэд. акадэміка Я.Бабосава. Мінск: “Народная асвета”, 1998 – 288 с.; В.А.Мілаванаў. Гісторыя Беларусі. Канец 18 ст. - 1917 г. Вучэбны дапаможнік для 8 класа агульнаадукацыйных школ. Мінск: “Народная асвета”, 1998 – 176 с.**

Ужо амаль дзесяць гадоў настаўнікі гісторыі агульнаадукацыйных школ маюць велізарныя праблемы з вучэбнай літаратурай. Па сённяшні дзень адсутнічае падручнік па гісторыі Беларусі для 8 класа. І вось у мінулым навучальным годзе Міністэрства адукацыі зрабіла важны крок для вырашэння праблемы. Да новага вучэбнага дапаможніка М.Біча далучыўся вучэбны дапаможнік В.Мілаванава. Узнікла сітуацыя альтэрнатывы. Што ўяўляюць сабой з навуковага і метадычнага пункту погляду прапанаваныя дапаможнікі?

Напачатку звернем увагу на адпаведнасць структуры і зместу дапаможнікаў Праграме па гісторыі для базавых агульнаадукацыйных школ, якая з’яўляецца вызначальным дакументам для вывучэння гэтага прадмета.

У настаўніка, які карыстаецца дапаможнікам Міхася Біча, не павінна быць ніякіх праблем з планаваннем вучэбнага працэсу. Вучэбны дапаможнік адпавядае структуры і зместу праграмы. На жаль, гэтага нельга сказаць пра працу Васіля Мілаванава. Адразу кідаецца ў вочы структурная неадпаведнасць. В.Мілаванаў уводзіць дадатковы раздзел (“Беларусь у складзе Расійскай імперыі. 1772 - пачатак 30-х гадоў XIX ст.”) і фактычна прапануе ўласную перыядызацыю гісторыі Беларусі канца 18 ст.-1917 г., якая істотна адрозніваецца ад праграмных патрабаванняў.

Таксама не адпавядае праграме структура і змест асобных раздзелаў. Так, для вывучэння эканомікі Беларусі канца 18 ст. - 50 гадоў 19 ст. Праграма выдзяляе 3 гадзіны, а В.Мілаванаў адводзіць на гэта 6 (?!) параграфаў і асобныя раздзелы яшчэ ў трох. У выніку амаль палову ўсіх тэкстаў двух першых раздзелаў дапаможніка (§1-13) настаўнік павінен разглядзець на трох уроках. Падобны ўхіл назіраецца і далей. У трэцім раздзеле дапаможніка (“Беларусь у перыяд дамanaпалістычнага капіталізму. 1861-1900 гг.”), які ў асноўным адпавядае другому раздзелу Праграмы (“Беларусь у пачатковы перыяд капіталізму. 60-90-ыя гады XIX ст.”) з 8 параграфаў 4 цалкам прысвечаныя праблемам эканамічнага развіцця. У той жа час Праграма прадугледжвае на гэтыя пытанні толькі 3 гадзіны з 9, прызначаных на ўвесь раздзел.

У выніку перанасычанасці дапаможніка эканамічнай праблематыкай В.Мілаванаву проста не хапіла месца для аналізу многіх пытанняў палітычнай, этнічнай і культурнай гісторыі краіны. У дапаможніку адсутнічае важная тэма “Этнічныя працэсы”, толькі адзін параграф адведзены для культуры Беларусі другой паловы 19 ст., а §20 (“Узнікненне беларускай нацыі”) з’яўляецца самым кароткім у дапаможніку. Для “раскрыцця” гэтай складанай і важнай праблемы аўтару хапіла двух (?!) старонак. Затое ў падтэме “Навука” (§12 “Народная адукацыя і навука ў Беларусі. Канец XVIII ст.-1860 г.”) палову тэксту В.Мілаванаў прысвяціў пропаведзям і прамовам архіепіскапа Георгія Каніскага.

Чацвёрты раздзел дапаможніка ахоплівае перыяд пачатку 20 ст. І тут настаўнік, які павінен працаваць у адпаведнасці з праграмай, сутыкнецца з вялікімі цяжкасцямі. Праграма адводзіць 4 гадзіны на вывучэнне падзей рэвалюцыі 1905-1907 гг., а дапаможнік прапануе толькі адзін параграф. Тэма “Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг.” у дапаможніку адсутнічае. Культура Беларусі пачатку 20 ст. разглядаецца ў адным параграфе, а між тым Праграма прадугледжвае правядзенне трох

урокаў па гэтай тэме. Прычым паняцце “Беларускае нацыянальна-культурнае Адраджэнне”, якое з’яўляецца ключавым для гэтай тэмы, у дапаможніку В.Мілаванава нават не згадваецца. Газеце “Наша Ніва” В.Мілаванаў прысвяціў адзін невялікі абзац. Пазіцыі расійскіх урадавых колаў і польскіх груповак па беларускім пытанні не асветлены. Палітычная дзейнасць беларусаў у 1917 г. знайшла асвятленне ў адным маленькім абзацы і г.д. Такім чынам, В.Мілаванаў прадэманстраваў сапраўднае ігнараванне Праграмы па гісторыі.

Як жа стаяць справы з навуковасцю ў асвятленні падзей беларускай гісторыі?

Звернем увагу на канцэптуальныя падыходы абодвух аўтараў. М.Біч у сваім дапаможніку паспрабаваў спалучыць фармацыйны падыход з падыходам цывілізацыйным (культуралагічным). Аднак па многіх пытаннях на першым месцы ў гэтым спалучэнні стаіць фармацыйны падыход, што выклікае пэўныя заўвагі. У прыватнасці, значна большай увагі патрабуюць да сябе нацыянальныя (этнічныя) супольнасці. Жыццё рускіх, палякаў, жыдоў, украінцаў, літоўцаў, татар і г.д. складае неад’емную і вельмі важную частку беларускай гісторыі.

Канцэптуальны падыход М.Біча аб’ектыўна адлюстроўвае сучасны стан беларускай гістарычнай навукі і ў параўнанні з былымі падручнікамі значна ўзбагачае веданне мінуўшчыны. Трэба адзначыць і тое, што спалучэнне фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў з’яўляецца канцэптуальным падмуркам школьных падручнікаў па сусветнай гісторыі. Такім чынам, захоўваецца адзінства падыходаў у асвятленні мінулага Беларусі і ўсяго свету.

М.Біч здолеў выправіць многія хібы першага выдання свайго дапаможніка (1993 г.). Многія праблемы нашай гісторыі ў другім выданні атрымалі больш грунтоўную навуковую ацэнку. Гэтаму паспрыяла як уласная навуковая праца аўтара, так і веданне ім асноўных прац беларускай, расійскай і польскай гістарыяграфіі.

Канцэпцыя В.Мілаванава вяртае нас у школу 60-70-ых гадоў. Сваё асвятленне гісторыі аўтар будуе выключна на фармацыйным падыходзе. У выніку амаль увесь гістарычны працэс канца 18 - пачатку 20 ст. зведзены да гісторыі эканомікі, сацыяльнага прыгнёту і класавай барацьбы. Культурныя і нацыянальныя (этнічныя) аспекты мінулага выглядаюць як нейкі фармалізаваны дадатак. Напрыклад, згадваючы дзеячаў беларускай культуры, аўтар у большасці выпадкаў абмяжоўваецца пералікам імёнаў. Тэкст дапаможніка забруджаны паняццямі і ацэнкамі, якія былі ўведзеныя ў гістарычную навуку яшчэ ідэолагамі сталінізму. У прыватнасці, гэта датычыць асвятлення беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння. Аўтар супрацьпастаўляе дзейнасці Я.Купалы, Я.Коласа дзейнасць “нацыяналістычна настроеных буржуазных пісьменнікаў і крытыкаў Каганца, Гаруна і інш.” (с.156), сцвярджае, што “дробнабуржуазная” БСГ “праводзіла палітыку нацыяналізма і згодніцтва з буржуазіяй і памешчыкамі” (с.125) і г.д. Пры вывучэнні гісторыі пачатку 20 ст. вучням навязваецца ідэалогія партыі бальшавікоў як “ісціна ў апошняй інстанцыі”.

Пытанні ўзнікаюць і пры знаёмстве з аўтарскім асвятленнем ранейшых перыядаў беларускай гісторыі. Напрыклад, аўтар сцвярджае, што “к пачатку 30-ых гадоў (19 ст.- *А.С.*) працэс разлажэння феадалізму перарос у крызіс усёй феадальна-прыгонніцкай сістэмы” (с.33). Тэкст яўна патрабуе тлумачэння, чым “разлажэнне” адрозніваецца ад “крызісу”. На с.4 В.Мілаванаў выказвае думку, што далучэнне да Расіі “дало магчымасць беларускаму народу скінуць з сябе прыгнёт польска-літоўскіх феадалаў”. А на с.8 заяўляе, што пасля далучэння “мясцовыя памешчыкі ... заставаліся поўнымі гаспадарамі сваіх

маёнткаў, свабодна распараджаліся зямлёй і сялянамі гэтых маёнткаў". Узнаўленне аўтарам вядомага тэзіса савецкай гістарыяграфіі пра нацыянальны прыгнёт беларусаў з боку польскіх і літоўскіх феадалаў моцна здзіўляе. Па-першае, добра вядома, што ў 17-18 стст. не назіралася масавага перасялення "польскіх феадалаў" у Беларусь. Па-другое, не менш вядома, што на працягу гэтых стагоддзяў адбылася паланізацыя вышэйшых колаў літоўскага этнасу (як і беларускага). Звычайна, т.зв. "польскія феадалы" з'яўляліся нашчадкамі мясцовай паланізаванай шляхты. Яны валодалі беларускай мовай і лічылі сваёй Радзімай не Польшчу, а беларуска-літоўскі край. Апроч таго, пра які нацыянальны прыгнёт у 17-18 стст. можна казаць, калі нацыі пачынаюць фармавацца толькі ў другой палове XIX ст. Усе гэтыя хібы ў вялікай ступені з'яўляюцца вынікам ігнаравання аўтарам навуковай літаратуры 80 - 90-ых гадоў. Пра гэта сведчыць і прапанаваны В.Мілаванавым спіс "Асноўных крыніц і рэкамендаванай літаратуры" (с.171-172).

Але самае галоўнае, што ў дапаможніку В.Мілаванава беларусы фактычна не з'яўляюцца суб'ектам сваёй гісторыі. Яна здзяйсняецца іх коштам, але без іх актыўнага ўдзелу. Калі гэта сапраўды так, то навошта гэтую гісторыю лічыць беларускай?

Дапаможнік М.Біча адрозніваецца ад "Гісторыі" В.Мілаванава і лепшым метадычным забеспячэннем вучэбнага працэсу. Рубрыкі "Гістарычная даведка", "Галасы мінулага", "Дакументы сведчаць" і інш. ствараюць для настаўніка выдатную магчымасць арганізацыі самастойнай работы вучняў на ўроку. Змешчаныя матэрыялы спрыяюць развіццю самастойнага мыслення, фарміруюць уменне суадносіць факты з тэорыяй. М.Біч значную ўвагу надаў пытанням і заданням да вучэбнага матэрыялу. Прычым сярод іх выразна дамінуе катэгорыя пытанняў, што дапамагаюць авалодваць прыёмамі лагічнага мыслення. Тэкст насычаны табліцамі, схемамі і дыяграмамі, якія служаць як замацаванню ведаў, так і развіццю творчага мыслення. Яны таксама спрыяюць арганізацыі самастойнай працы вучняў. У тэксце дапаможніка М.Біча шырока выкарыстоўваюцца ўнутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі. Да недахопаў дапаможніка можна аднесці толькі пэўную інфармацыйную перанасычанасць тэкстаў шэрагу параграфаў, цяжкі навуковы стыль. Не заўсёды аўтар улічваў псіхолага-педагагічныя асаблівасці падлеткавага ўзросту.

Метадычны апарат дапаможніка В.Мілаванава абмяжоўваецца шрыфтавым вылучэннем паняццяў і найважнейшых палажэнняў, некалькімі схемамі-табліцамі, пытаннямі і заданнямі да матэрыялаў параграфаў. Апошнія звычайна арыентаваны толькі на засваенне тэкстаў. Матэрыялы да ўрокаў абагульнення ведаў (у адрозненні ад дапаможніка М.Біча) адсутнічаюць. Аўтар чамусьці цалкам праігнараваў патрабаванні методыкі выкладання прадмета, як, дарэчы, і патрабаванні ўзроставай псіхалогіі. А гэта вельмі істотны недахоп. Многія параграфы дапаможніка (асабліва, "эканамічныя") церпяць на інфармацыйную перанасычанасць. Нават даросламу чытаць дапаможнік цяжка і нецікава, а ў дзяцей ён будзе выклікаць толькі раздражненне і незадавальненне.

Небяспека яшчэ і ў тым, што распаўсюджванне дапаможніка В.Мілаванава можа быць адным з этапаў паступовай замены беларускай гісторыі гісторыяй "Северо-Западного края России". А ў гэтым выпадку беларусам ізноў, як і сто гадоў назад, будуць навязваць думку, што яны з'яўляюцца толькі сапсаванай палякамі-католікамі часткай "адзінага рускага народу", што яны не маюць сваёй самабытнай гісторыі. Такое "гістарычнае" выхаванне гарантуе, што самастойнай будучыні беларусы ніколі мець не будуць.

Алесь Смалянчук (Гародня)

## Навуковая хроніка.

30 студзеня 1999 г. у Гародні адбыліся **навуковыя чытанні, прысвечаныя 115-м угодкам з дня нараджэння Антона Луцкевіча.** Чытанні былі арганізаваныя Гарадзенскай філіяй БСДГ пры падтрымцы грамадскага аб'яднання "Ратуша". Цікавасць гісторыкаў да асобы Антона Іванавіча Луцкевіча цалкам зразумелая. Гэта адна з ключавых постацей беларускай гісторыі 20 ст. Без грунтоўнага аналізу ягонай дзейнасці немагчыма прэтэндаваць на разуменне многіх праблем гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння пачатку 20 ст. і гісторыі барацьбы за беларускую дзяржаўнасць.

З уступным словам выступіў Уладзімір Хільмановіч, сябра Гарадзенскай філіі БСДГ. Алесь Смалянчук (Гародня) прысвяціў сваё выступленне малавядомым аспектам адносін Антона Луцкевіча да краёвай ідэалогіі, якая займала прыкметнае месца ў грамадска-палітычным жыцці "гістарычнай Літвы" пачатку 20 ст. Ігар Трусаў (Гародня) распавёў пра сяброўства братоў Луцкевічаў з дзеячам літоўскага нацыянальнага руху Ёнасам Басанавічусам. Уладзімір Ляхоўскі (Менск) спыніўся на праблеме "А.Луцкевіч і беларускі нацыянальны асяродак у Гародні ў канцы 1918 - пачатку 1919 г."

Не ўсе з прысутных пагадзіліся з даволі рэзкімі і катэгарычнымі ацэнкамі некаторых дзеячаў беларускага руху, якія прагучалі ў цікавым рэфераце Андрэя Чарнякевіча (Гародня) "Беларускае жыццё ў Гародні вачыма Антона Луцкевіча". У выступленні вядомага беларускага даследчыка з Беластока Алега Латышонка знайшлі асвятленне сустрэчы аднаго з лідараў беларускага руху з Юзафам Пілсудскім. Рэферат Яўгена Міранoвіча (Беласток) быў прысвечаны беларускаму палітычнаму і нацыянальнаму жыццю пасля разгрому Грамады. Янка Трацяк (Гародня) узняў праблему "Антон Луцкевіч (БСГ) і Адам Станкевіч (БХД): на перакрыжаванні думак". Матэрыялы чытанняў будуць выдадзены асобным зборнікам.

Алесь Смалянчук (Гародня)

16-21 мая 1999 г. у Палянчыку (Польшча) адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя **"Праблемы геапалітыкі Цэнтральна-Усходняй Еўропы"**. У працы канферэнцыі ўдзельнічалі географы, палітолагі і гісторыкі Польшчы, Украіны, Літвы, Беларусі, Латвіі, Расіі, Венгрыі, Славакіі, Балгарыі і Германіі. Найбольш прадстаўнічымі былі навуковыя дэлегацыі Польшчы і Украіны. Сярод удзельнікаў канферэнцыі трэба назваць імёны прафесараў Пятра Эберхардта і Марціна Расцішэўскага (Варшава), Святланы Пісарэнка і Сцяпана Трахімчука (Львоў), Адама Елонка (Кракаў) і Гешо Гешава (Сафія). Беларуская навука была прадстаўлена географамі з Бярэсця Сяргеем Арцёменка і Канстанцінам Красоўскім і гісторыкамі з Гародні Алесем Краўцэвічам і Алесем Смаленчуком.

Цэнтральнае месца ў выступленнях і дыскусіях займаў аналіз геапалітычнай сітуацыі Польшчы і постсавецкіх дзяржаў у кантэксце працэсу еўрапейскай інтэграцыі. Таксама разглядаліся праблемы рэгіянальнай палітыкі, памежнага супрацоўніцтва, гаспадарчага развіцця краін Цэнтральна-Усходняй Еўропы і інш. Уздымалася праблема месца Рэспублікі Беларусь у сучаснай еўрапейскай геапалітычнай сітуацыі. Практычна ўсе навукоўцы разглядалі беларускія перспектывы толькі на шляху ўмацавання незалежнасці і суверэнітэту краіны. Рыхтуецца выданне матэрыялаў канферэнцыі.

Алесь Смалянчук (Гародня)

24-25 верасня 1999 г. у г. Рэчыца адбыліся **Міжнародныя Доўнараўскія чытанні**. Другі раз горад, які шануе памяць свайго земляка, вядомага беларускага гісторыка Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага, сустракаў навуковыя дэлегацыі з Беларусі, Украіны, Расіі. Чытанні з'явіліся лагічным працягам канферэнцыі "Жыццё і дзейнасць М.Доўнар-Запольскага", якая праводзілася ў Рэчыцы 1-2 ліпеня 1997 г. Яе ўдзельнікі прынялі рэзалюцыю, у якой адзначылі, што "вывучэнне багатай творчай спадчыны М.Доўнар-Запольскага яшчэ не адпавядае яе вялікаму актуальнаму значэнню і тым задачам, якія стаяць у галіне духоўнага развіцця беларускага, украінскага і рускага народаў". Таму яны прапанавалі, улічваючы навуковае і грамадскае значэнне канферэнцыі, праводзіць рэгулярныя Доўнараўскія чытанні з перыядычнасцю 1 раз у 2 гады.

Слушнасць гэтай прапановы яскрава пацвердзілася ў верасні мінулага года. 25 навукоўцаў з Менска, Гомеля, Гародні, Кіева, Бранска абмяркоўвалі розныя праблемы навуковай спадчыны, а таксама асабістага лёсу М.Доўнар-Запольскага.

Працу канферэнцыі адкрылі выступленні М.Шумейкі (Менск) і І.Мацяш (Кіеў), якія былі прысвечаны дзейнасці М.Доўнар-Запольскага як археографа і архівіста. Даследчыца з Украіны звярнула ўвагу на Кіеўскі і Харкаўскі перыяды архіўнай дзейнасці вядомага навукоўца.

У некалькіх дакладах закраналася праблема разумення М.Доўнар-Запольскім рэлігійных пытанняў: "Царква і духавенства канца 10-13 стст. у працах М.В.Доўнар-Запольскага" (Г.Штыхаў з Менску), "Рэлігія як фактар ідэнтыфікацыі беларускага этнасу" (С.Лях з Гомеля), "М.Доўнар-Запольскі аб уніяцкай царкве і сучасны стан вывучэння праблемы" (З.Яцкевіч з Менску).

Шмат пытанняў і навуковую дыскусію выклікаў даклад А.Кіштымава (Менск), які тычыўся дзейнасці М.Доўнар-Запольскага як заснавальніка і кіраўніка Кіеўскага камерцыйнага інстытута. Аўтар ахарактарызаваў сістэму адукацыі ў гэтай навучальнай установе, адзначыў, што найбольш здольныя студэнты атрымлівалі даволі высокую стыпендыю і мелі магчымасць стажыравацца за мяжой. Даследчык З Бранка (Расія) С.Міхальчанка выступіў з пасведамленнем "М.Доўнар-Запольскі і Я. Ляцкі: гісторыя ўзаемаадносін". Ён адзначыў, што за вывучэннем навуковай дзейнасці вядомага даследчыка нельга забываць пра яго як пра чалавека, паколькі характар моцна ўплывае на навуковую дзейнасць. Такой жа думкі прытрымліваўся Ю.Мыцык (Кіеў), які распавёў пра перапіску Доўнар-Запольскага з Грушэўскім і адзначыў, што гэты пласт матэрыялаў яшчэ чакае свайго даследчыка.

Цікавасць выклікалі даклады В.Мазеца, В.Лебедзевай і В.Скалабана, якія ўтрымлівалі новыя факты пра дзейнасць Доўнар-Запольскага ў час станаўлення дзяржаўнасці (1918–1920 гг.). Актуальнымі і змястоўнымі былі таксама паведамленні Э.Іофе, В.Новак, І.Кітурка, Т.Ліцвінавай, Д.Казлова, І.Вербы, І.Нямкевіча, К.Казака.

Ірына Кітурка (Гародня)

28-30 верасня 1999 г. у Гародні адбыліся паседжанні міжнароднага круглага стала **"Беларусы і палякі: дыялог народаў і культур. 10-20 стст."**

Круглы стол быў ініцыяваны Заходнебеларускім гуманітарным цэнтрам даследаванняў Усходняй Еўропы. Менавіта Цэнтр выканаў галоўную арганізацыйную працу. Апроч яго ў падрыхтоўцы канферэнцыі ўдзельнічала Беларускае гістарычнае

таварыства ў Беластоку (старшыня Алег Латышонак) і факультэт эканомікі і кіравання Гарадзенскага універсітэту.

Падчас круглага стала працавалі тры секцыі: "Беларусы і палякі ў эпоху сярэдніх вякоў і ранняга новага часу (9-18 стст.)", "Беларусы і палякі ў складзе Расійскай імперыі (канец 18 ст.-1917 г.)", "Беларусь і Польшча ў перыяд найноўшай гісторыі (1918-1990 гг.)". Прадметам абмеркавання сталі пытанні, звязаныя з праблемамі этнагенезу беларусаў і палякаў, беларуска-польскім палітычным і культурным узаемадзеяннем у часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай, нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі ўраду Расійскай імперыі адносна народаў Беларусі, сацыяльна-культурнымі, канфесійнымі і этнічнымі працэсамі на беларускіх землях напрыканцы 18-пачатку 20 ст., беларуска-польскіх палітычных і культурных кантактаў і сувязяў у 20 ст. і інш. Варта адзначыць удзел у канферэнцыі вядомых беларускіх навукоўцаў Георгія Галенчанкі, Генадзя Сагановіча, Андрэя Кіштымава, Язэпа Янушкевіча, Мікалая Сташкевіча (усе Менск), Святланы Марозавай, Мікалая Сільчанкі (усе Гародня), Рыгора Лазько (Гомель) ды інш. З польскага боку ўдзельнічалі Рышард Радзік (Люблін), Ежы Крупе, Іеранім Граля, Ежы Мейснер, Эльжбета Смулкова (усе Варшава), Адам Даброньскі, Міхал Гнатоўскі, Ян Мілеўскі (усе Беласток) ды інш.

Дыялог спецыялістаў, не абцяжараных пэўнымі ідэалагічнымі задачамі, паспрыяў выпрацоўцы панарамнай карціны польска-беларускіх узаемадачыненняў за перыяд з X па XX ст. Безумоўным поспехам канферэнцыі стала збліжэнне пазіцый навукоўцаў Польшчы і Беларусі па многіх актуальных і вельмі вострых праблемах узаемаадносін блізкіх славянскіх народаў. Можна меркаваць, што вераснёўскі дыялог будзе спрыяць фармаванню новага пакалення інтэлігенцыі, пазбаўленага варожых стэрэатыпаў.

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваныя ў выглядзе кнігі 8 "Нашага радаводу" (37 д.а.) у першай палове 2000 г.

Правядзенне міжнароднага круглага стала было б немагчымым без фінансавай падтрымкі Фонда імя Стэфана Баторыя (Варшава) і турыстычнай фірмы "Грыта" (Гародня).

Заходнебеларускі цэнтр гуманітарных даследаванняў Усходняй Еўропы плануе ў 2000 г. правесці ў Гародні міжнародную канферэнцыю **"Традыцыі язычніцтва, хрысціянства і антычнасці ў культуры народаў Вялікага Княства Літоўскага. 13-20 стст."**

Дзмітры Караў (Гародня)

20-21 кастрычніка 1999 г. у Вільні адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя **"Асобы, нацыі, грамадства ў Літве на рубяжы 19-20 ст."** Канферэнцыю арганізаваў Інстытут гісторыі Акадэміі Навук Літвы. Яна прысвячалася памяці вядомага дзеяча літоўскага руху Вінцаса Кудзіркі і разглядала праблемы гісторыі Літвы і Польшчы на пераломе стагоддзяў. Цікавасць літоўскіх даследчыкаў да падзей стогадовай даўніны цалкам зразумелая. Менавіта ў той час выпрацоўваліся тэарэтычныя асновы літоўскай дзяржаўнасці і рабіліся першыя практычныя крокі на шляху яе пабудовы.

Першы праблемны блок, які стаў прадметам абмеркавання, быў прысвечаны расійскай імперскай палітыцы ў адносінах да "гістарычнай Літвы". З паведамленнямі выступілі Тэд Вікс (ЗША), аўтар кнігі "Nation and State in late Imperial Russia. Nationalism and Russification on the Western Frontier, 1863-1914" (DeKalb 1996), Дарюс Сталюнас (Літва) і Леанід Гарызонтаў (Расія). Апошні з'яўляецца аўтарам

грунтоўнага даследавання “Парадоксы имперской политики: поляки в России, русские в Польше” (Москва, 1999).

Л.Гарызонтаў звярнуў увагу на тое, што, ствараючы супрацьвагу палякам, імперскія ўлады фактычна давалі шанс з’яўленню “трэцяй сілы” – развіццю літоўскага і беларускага рухаў. Спробу ўладаў на пачатку 20 ст. знайсці ў літоўцах саюзнікаў у барацьбе з польскімі ўплывамі адзначыў таксама амерыканскі даследчык. Дыскусія закранула праблему суадносін палітыкі цэнтра і палітыкі рэгіянальнай адміністрацыі. На думку Д.Сталюнаса, уплыў рэгіёнаў на выпрацоўку палітычнага курса цэнтра быў нязначным. Л.Гарызонтаў прытрымліваецца іншага пункту погляду. У якасці прыклада значнай ролі рэгіянальнай адміністрацыі ён адзначыў канфлікт паміж генерал-губернатарам Мураўёвым і міністрам унутраных спраў Валуевым. Усе выступаючыя прызналі палітыку Расіі па нацыянальным пытанні неэфектыўнай. Аднак трэба звярнуць увагу на тое, што яна была ўсё ж такі даволі паспяховай у дачыненні да беларусаў. Расійскія ўлады здолелі ізаляваць “піянераў” беларускага Адраджэння ад народнай масы.

Другі тэматычны блок закранаў праблемы літоўскага і беларускага нацыянальных рухаў. З дакладамі выступілі Уладас Сірутавічус, Вілма Жалтаўскайтэ, Чэсловас Лаўрынавічус і Рымас Мікныс (усе Літва), Эрык Екабсонс (Латвія) і Алесь Смалянчук (Беларусь). Апошні паспрабаваў прааналізаваць ролю палітычнай ідэалогіі ў беларускім нацыянальна-культурным Адраджэнні. Асобныя тэзісы рэферата (існаванне польскіх і беларускіх краёўцаў у перыяд 1907-1915 гг., дамінаванне ў беларускім руху амаль да 1917 г. ліберальнай ідэалогіі) выклікалі ажыўленую дыскусію. На феномене літоўскага нацыяналізму засяродзіў увагу Антанас Кулакавічус (Літва).

Апошні тэматычны блок (літоўскія даследчыкі Вітаўтас Меркіс і Эльвіра Усачовайтэ, польскі гісторык Бронюс Макаўскас) быў прысвечаны жыццю і дзейнасці Вінцаса Кудзіркі.

Завяршыла канферэнцыю выступленне кіраўніка літоўскага сейма Вітаўтаса Ландсбергіса. Вядомы палітык адзначыў вялізарную ролю Вінцаса Кудзіркі, назваўшы літоўскі рух “рухам Кудзіркі”. На прыкладзе біяграфіі “піянера” літоўскага Адраджэння В.Ландсбергіс засяродзіў увагу прысутных на праблеме: асоба – грамадства.

Алесь Смалянчук (Гародня)

12-13 лістапада 1999 г. у Гародні адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя **“Культура Гарадзенскага рэгіёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа”**. Арганізавала яе кафедра беларускай культуры Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. У рабоце канферэнцыі ўзялі ўдзел 86 навукоўцаў, сярод іх 9 замежных. На пленарным паседжанні выступілі з дакладамі, прысвечанымі канцэптуальным праблемам вывучэння полікультурнага сумежжа, такія вядомыя даследчыкі, як прафесар А.Пяткевіч (Гародня), доктар хабілітаваны А.Баршчэўскі (Беласток), прафесар А.Станкевіч (Гомель), доктар А.Глагоўская (Беласток). Усе дакладчыкі падкрэслівалі асаблівую практычную значнасць і актуальнасць вынесенай на абмеркаванне канферэнцыі праблематыкі ў сучасных палітычных і культурных рэаліях. У далейшым работа канферэнцыі праходзіла па 4 асобных секцыях.

На секцыі “Археалогія, этнаграфія, фалькларыстыка” было прачытана 20 дакладаў. Больш за палову з іх склалі выступленні, прысвечаныя пытанням археалогіі і старажытнай гісторыі Гарадзеншчыны. Прычым прысутнічалі практычна ўсе вядучыя ў гэтай галіне беларускія спецыялісты – А.Краўцэвіч, М.Чарняўскі, Я.Звяруга, А.Мядзведзеў, А.Іоў, С.Піваварчык і інш. Падчас дыскусіі былі абмеркаваны асноўныя палажэнні канцэпцыі гісторыі Гарадзеншчыны ў старажытнасці і сярэднявеччы. Другая палова дакладаў на гэтай секцыі прысвячалася праблемам этнаграфіі і фалькларыстыкі. Вызначыліся высокім тэарытычным узроўнем выступленні Г.Энгелькінг “Этналагічныя і этнаграфічныя даследаванні на Гарадзеншчыне” і І.Крука “Жыллёвая прастора беларусаў у кантэксце міфа-паэтычнай мадэлі свету”.

У рабоце секцыі “Гісторыя культуры” ўзялі ўдзел 22 навукоўцы. Асаблівую дыскусію выклікаў канцэптуальны даклад С.Куль-Сяльверставай “Феномен ліцвінскай культуры як праблема гісторыі і культуралогіі”. Цікавыя праблемы фармавання і развіцця беларускай нацыянальнай свядомасці і ўзаемадзеяння розных нацыянальных культур былі ўзнятыя ў дакладах У.Ляхоўскага, Э.Екабсона, Я.Мірановіча, А.Латышонка, С.Токця, Я.Трацяка, С.Габрусевіча, В.Мазеца, Я.Разенблата.

На секцыі “Мастацтвазнаўства і нумізматыка” працавалі 15 навукоўцаў. Тэматыка тычылася пытанняў архітэктуры, выяўленчага і ўжытковага мастацтва, а таксама нумізматыкі Гарадзеншчыны. Асаблівую цікавасць выклікалі даклады Т.Габрусь, А.Трусава, Г.Барвенавай, В.Рабцэвіча, К.Філіпава. У завяршэнннe работы секцыі было прынята рашэнне ўтварыць Беларускае нумізматычнае таварыства.

На секцыі “Мовазнаўства і літаратуразнаўства” было прачытана 17 дакладаў. Аб’ектам абмеркавання сталі мовазнаўчыя і літаратуразнаўчыя аспекты культуры Гарадзеншчыны. З цікавымі дакладамі пра адметнасці ў мове перасяленцаў з паўночна-ўсходніх земляў ІІ Рэчы Паспалітай у Заходнюю Польшчу выступілі даследчыкі са Шчэцына Б.Франкоўска-Козак і А.Белхняроўска. Найбольшая колькасць дакладаў прысвячалася моўным аспектам культуры Гарадзеншчыны.

На пачатак 2000 г. запланавана выданне зборніка матэрыялаў канферэнцыі.

Сяргей Токць (Гародня)

У Беластоку 26-27 лістапада 1999 г. адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя **“Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў 1939-1941 гадах”**. У яе рабоце ўзялі ўдзел каля 20 беларускіх і польскіх гісторыкаў з Беластока, Бярэсця, Варшавы, Гомеля, Гародні, Кентшына, Менска. Сярод удзельнікаў былі такія вядомыя навукоўцы як Аляксей Літвін, Ігар Кузняцоў, Яўген Міраловіч, Алег Латышонак, Алена Глагоўская і інш.

Адной з цэнтральных і найбольш дыскутаваных праблем стала праблема “саветызацыі” Заходняй Беларусі пасля далучэння да СССР, суадносіны гэтага працэсу з беларусізацыяй і іншымі накірункамі нацыянальна-культурнай палітыкі савецкай улады ў акрэслены перыяд. Вялікая ўвага была нададзена такім пытанням, як беларуская гістарыяграфія падзей 1939 г., прававыя аспекты далучэння Заходняй Беларусі да СССР, прапагандысцка-агітацыйная дзейнасць савецкіх уладаў, рэлігійная палітыка, палітыка ў галіне адукацыі і г.д. Удзельнікі канферэнцыі падчас дыскусіі

фактычна пагадзіліся, што беларусізацыя культурнага жыцця, як і іншыя накірункі нацыянальнай палітыкі савецкай улады, былі падпарадкаваны правядзенню саветызацыі мясцовага грамадства, насаджэнню камуністычнай ідэалогіі ва ўсіх сферах культуры і грамадскага жыцця.

Пасля завяршэння работы канферэнцыі 28 лістапада 1999 г. адбылося паседжанне круглага стола, прысвечанага абмеркаванню перспектыў развіцця беларускай гістарыяграфіі. Яго ўдзельнікі пагадзіліся з неабходнасцю правядзення ў наступным годзе тэарэтычнай канферэнцыі па гэтай праблеме, а таксама прыйшлі да агульнай думкі пра патрэбу заснавання таварыства беларускіх гісторыкаў, якія будуць працягваць традыцыі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі.

Сяргей Токць (Гародня)

KAMUNIKAT.org

## Кніжны анонс.

**Prof. Heinrihs Strods. Latvian National Guerilla Warfare. 1944-1956. Part II. Documents and Materials.- Riga, 1998, 600p. Price Ls 6,50.**

**(Праф. Генрыкс Стродс. Латвійскі нацыянальны партызанскі рух.1944-1956. Частка II. Дакументы і матэрыялы. Рыга, 1998, 600 с. Кошт 6,50 латаў.)**

У 1996 г. выдавецтва "Preses nams" апублікавала кнігу прафесара Генрыкса Стродса "Латвійскі нацыянальны партызанскі рух. 1944-1956. (576 с., наклад 2 тыс. п.). Наклад цалкам разышоўся. Кніга атрымала 16 пазітыўных рэцэнзій у Латвіі і за яе межамі.

Выдавецтва "Preses nams" апублікавала другую частку кнігі праф. Г.Стродса "Латвійскі нацыянальны рух. 1944-1956. Дакументы і матэрыялы". Выданне ўтрымлівае 142 дакументы з архіваў Латвіі (ЦК Лат.КП, НКВД Лат.ССР і інш.), Германіі (Генеральны штаб германскай арміі, Рэйхскамісарыят усходніх зямель і інш.), Англіі (Міністэрства замежных спраў і інш.), Расіі (НКУС, МГБ, Галоўнае ўпраўленне ўнутраных спраў і інш.). Дакументы раней не друкаваліся.

Упершыню друкуюцца таксама матэрыялы асобных латвійскіх нацыянальных партызанскіх фарміраванняў: уставы, загады, дырэктывы (у т.л. на выпадак вайны паміж СССР і Заходнімі дзяржавамі), лістоўкі і падпольныя выданні. Сярод дакументаў звяртаюць на сябе ўвагу апісанні ваенных аперацый, якія праводзіла НКУС і МГБ СССР супраць нацыянальнага партызанскага руху, даклады камандзіраў знішчальных батальёнаў і спецыяльных баявых груп. Таксама кніга ўтрымлівае сакрэтныя дакументы ЦК Лат.КП, якія датычаць рэпрэсій супраць насельніцтва Латвіі, дэпартацыі ў Сібір у 1949 г. і інш. Беларускага чытача могуць асабліва зацікавіць дакументы, якія распавядаюць пра рэйды латвійскіх партызан на тэрыторыі Беларусі, пра іх кантакты з беларускім нацыянальным партызанскім рухам у пасляваенны перыяд.

Выданне складаецца з 5 раздзелаў і 23 параграфаў. Усе дакументы друкуюцца ў перакладзе на латвійскую мову. Даведкавы раздзел утрымлівае інфармацыю аб удзельніках партызанскага руху. Таксама змешчаны спіс выкарыстаных архіўных фондаў і спіс надрукаваных дакументаў на англійскай мове.

Кнігу можна заказаць у выдавецтве "Preses nams" (Balasta dambis 3, LV – 1981, Riga, Latvia).

## КРАЯЗНАЎСТВА

### Археалагічныя даследаванні ў басейне ракі Шчары

**Васіль Супрун (Слонім)**

Аўтарам гэтага паведамлення археалагічныя даследаванні ў басейне ракі Шчары – буйнейшага левага прытоку Нёмана – праводзіліся ў асноўным з 1963 да 1970 года. Разведкай былі ахоплены Слонімскі, часткова Дзятлаўскі, Івацэвіцкі, Баранавіцкі, Ляхавіцкі і Зэльвенскі раёны. Пры гэтым ставілася мэта, па магчымасці, паўней выявіць і апісаць усе археалагічныя помнікі краю. На даследаванай тэрыторыі ўпершыню было адкрыта і ўведзена ў археалагічную навуку каля дзвюхсот раней невядомых помнікаў розных гістарычных эпох: ад мезалітычных стаянак людзей да селішчаў і могільнікаў сярэднявечча. Сабрана вялікая колькасць пад'ёмнага матэрыялу: адшчэпаў і вырабаў з крэменю, каменных вырабаў, керамікі, металічных і іншых знаходак. Многія аб'екты шурфаваліся, а многаслойны помнік Русакова-ІІ і курганы каля Орлавіч Слонімскага раёна раскопваліся. Справаздачы аб гэтых работах захоўваюцца ў Архіве Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Сярод даследаванай тэрыторыі найбольш цікавай і багатай у археалагічным сэнсе аказалася Слонімшчына. Размешчаная ў басейне сярэдняга цячэння Шчары, якая ў найдаўнейшыя часы служыла вадзяной магістраллю між Палессем і Панямоннем, яна ўжо ў эпоху неаліту была заселена даволі шчыльна. У гэтым раёне выяўлена каля 30 стаянак каменнага веку і эпохі бронзы, больш за 60 селішчаў пазнейшых часоў, каля 10 рознaчасовых гарадзішчаў і сховішчаў, нямала курганных груп і могільнікаў. Гэта больш, чым у суседніх Баранавіцкім, Зэльвенскім і Пружанскім раёнах разам узятых. Слонімшчына – своеасаблівы археалагічны запаведнік.

Стаянкі першабытных людзей тут выяўлены каля наступных населеных пунктаў: Паўлава (правы бераг р.Дымаркі), Навікі (урочышча Вулашно), Едначы (хутар Янава), Ніз (урочышча Гарадзішча), Паўлавічы (левы бераг р.Шчары), Прырэчча (урочышча Драшкава), Камлявічы (урочышчы Загор'е і Вомша), Ферадкі (урочышча Лазавыя), Міцькавічы (урочышчы Яловікі і Хваіна), Талькаўшчына (на правым беразе р.Шчары і ў поплаве), Лабазоўка (на месцы кар'ера), Слонім (на ўрочышчах Скубішоўка, Дубы, Соміна, Сабачоўка), Чапялёва (урочышчы Соміна і Гараб'ёва горка), Шылавічы (урочышчы Ніўка, Палачышча, Хвядоўшчына, Турэц), Русакова (урочышчы Літоўскі груд і Завала), Клепачы (абапал возера Бяздоннага), Нагуевічы (левы бераг р.Ісы). Акрамя таго, каменныя і крамянёвыя прылады працы ў розныя часы знаходзілі і каля вёсак Дзераўная, Забулле, Міжэвічы, Навасёлкі, Асабнякі і іншых.

Памеры і аддаленасць стаянак ад вадаёмаў залежалі ад рэльефу мясцовасці, але звычайна яны займалі невялікую плошчу (100 х 50м) і размяшчаліся на пясчаных берагах буйных рэк ці іншых вадаёмаў. Найбольш характэрнымі знаходкамі тут з'яўляліся крамянёвыя пласцінкі, рэтушаваныя скрабкі, разцы, праколкі, наканечнікі стрэлаў, рубячыя прылады, каменныя адбойнікі і фрагменты глінянага вострадоннага посуду ручной лепкі з прымесямі ў гліне раслліннасці ці каменнай жарствы (у познім неаліце).

Неабходна адзначыць, што чыстыя неалітычныя ці з эпохі бронзы помнікі

сустракаюцца рэдка. Часцей на іх наслойваліся матэрыялы іншых археалагічных эпох. Тым больш, што рэзкага размежавання паміж эпохамі неаліту і бронзы ні ў часе, ні ў матэрыяльнай культуры не існавала. Раздзяленне праведзена ўмоўна.

Найбольш характэрнымі для эпохі бронзы з’яўляюцца наступныя прыкметы: вырабы з крэменю становяцца больш дасканалымі, разнастайнымі, часамі падшліфаванымі; на каменных прыладах прыкметна імітацыя кантаў пры іх шліфоўцы; кераміка становіцца пласкадоннай або з закругленым днішчам, больш шырокага асартыменту і формаў; знікаюць дамешкі раслінасці ў гліне, бо дамешваецца толькі жарства, зрэдку – пясок; сустракаецца посуд з заштрыхаванай паверхняй. Селішчы нібы крыху пашыраюць свае памеры і прасоўваюцца ўглыб раней неабжытых тэрыторыяў, на меншыя рэкі.

Да стаянак-селішчаў эпохі бронзы можна аднесці археалагічныя помнікі, выяўленыя каля вёсак Едначы (Янава), Камлявічы (Вомша), Ферадкі (Чартавыя), Парэчча (Буслаўка). Прырэчча (Драшкава), Міцькавічы (Хваіна), Васілевічы (Кут), Талькаўшчына (на поўдзень ад фермы), Чапялёва (Соміна), Шылавічы (Турэц, Студзяніца), Шундры (Вуглы), Русакова (Літоўскі груд). На тэрыторыі Слоніма да гэтай групы помнікаў можна аднесці селішча ва ўрочышчы Дубы. Магчыма, што да позняй бронзы можна аднесці і селішчы каля вёсак Дзераўная (Пукрэўшчына, Карпаўшчына), Забулле (Селішча).

У т.зв. жалезным веку, які пачынаецца прыблізна з 6 ст. да н.э. і цягнецца да 8 ст. н.э., селішчы распаўсюджваюцца амаль на ўсю тэрыторыю раёна. У гэты час інтэнсіўна асвойваецца земляробства, чаму спрыяла вынаходства жалеза, якое паступова замяняла крамянёвую індустрыю. У раннім жалезным веку традыцыйна яшчэ бытавалі і многія вырабы з крэменю, бо на Слонімшчыне выплаўка жалеза з мясцовай балотнай руды была шырока асвоена толькі недзе на рубяжы нашай эры. Найбольш значныя асяродкі, звязаныя з гэтым новым промыслам, размяшчаліся каля вёсак Навасёлкі (Паўлаўскага сельсавета), Мілошавічы і Ражавічы. Тут выяўлены сляды шматлікіх каменных домніц, гліняныя соплы, шлак і асобныя знаходкі крыцы. Былі, відаць, такія прымітыўныя домніцы і ў іншых месцах, але асноўны цэнтр па выплаўцы жалеза існаваў паблізу Навасёлак (урочышча Вепраўка).

Селішчы, датаваныя гэтым часам, асабліва познім жалезным векам, выяўлены каля Асабнякоў, Васілевіч, Глоўсевіч, Дзераўной, Забулля, Кавалёў, Казловіч, Лабазоўкі, Масілавіч, Мікэвіч, Мялькнавіч, Мілошавіч, Навасёлак, Парэчча, Рахавіч, Салянікоў, Талькаўшчыны, Шылавіч, Ягнешчыц і іншых вёсак.

Гэтыя паселішчы былі зусім не падобныя на сучасныя вёскі. Яны не мелі ніякай сістэмы планіроўкі. Жыллё размяшчалася побач з гаспадарчымі пабудовамі. У курных хатах месціліся вялікія сем’і, якія складаліся з некалькіх пакаленняў родзічаў. У хатах без акон ачаг размяшчаўся побач з дзвярыма. Ён быў крыху заглыблены ў мацерык і абложаны каменнем. Такія ачагі,  дыяметрам каля аднаго метра, выяўлены на селішчах Студзяніца, Соміна, Косаўскі тракт. Памеры вёсак залежалі ад колькасці жыхароў і ўмоў прыдатных для земляробства і жывёлагадоўлі. У гэты час людзі ўжо карысталіся калодзежамі-ямамі, якія капаліся побач з рэкамі, крыніцамі, забалочанымі месцамі і ў выпадку неабходнасці паглыбляліся да 3-5 метраў. Такія ямы-калодзежы выяўлены каля Сыпанай гары паблізу Палатніцы і на гарадзішчы Куроўска гара паблізу Талькаўшчыны.

Кераміка ў гэты перыяд становіцца больш грубай і рыхлай, няроўна абпаленай і

больш прымітыўна арнаментаванай. Паверхня яе штрыхуецца неахайна. Відавочна, што працэс штрыхоўкі (загладжвання) паверхні посуду праводзіўся не пасля падсушкі, а ў час лепкі і фармоўкі. Магчыма, што найбольш здольныя ўмельцы пераключыліся на вырабы з жалеза, якое стала найбольш прэстыжным і каштоўным. У гліну, каб не трэскалася пры сушцы, замест жарствы дамешваўся пясок.

Недзе ў палове I тысячагоддзя н.э. на Слонімшчыне з'явіліся першыя гарадзішчы-сховішчы. Мясцовае насельніцтва, напалоханае нейкай нечаканай вонкавай пагрозай, вымушана было выкарыстоўваць суседнія цяжкадаступныя ўзвышшы як сховішчы. Магчыма, што пры гэтым узводзіліся нейкія часовыя заслоны. Сляды ад іх не захаваліся, аднак на вяршынях і ля падножжаў такіх узвышшаў-сховішчаў сустракаецца кераміка. Такія гарадзішчы-сховішчы на тэрыторыі сучаснай Слонімшчыны існавалі паблізу Азярніцы (Татарская гара), Вераб'евіч (Бяседа і Гострая горка), Дзераўной (Старжаная гара), Палатніцы (Сыпаная гара), Прырэчча (Драшкава), Талькаўшчыны (Куроўска гара), Чапялёва (Гарадок), Чамяроў (Малева), Шылавіч (Турэц), у Слоніме (Бахмутка, Пясчанка. Лыса гара).

Прыцягвае ўвагу, што ў той жа час з'яўляецца шэраг новых паселішчаў, якія маглі быць вынікам падсялення прышлага насельніцтва.

Другі прыліў насельніцтва заўважаецца напрыканцы I тысячагоддзя, калі ізноў з'яўляецца шмат новых селішчаў і гарадзішчаў. На гэты раз абарончыя ўмацаванні з землянымі валамі і ровамі ўзводзіліся або на месцах былых сховішчаў, або на новых узвышшах ці іх мысах. Гарадзішчы 10-13 стст. захаваліся каля Слоніма (Косаўскі тракт), Збочна (Гарадзішча), Асабнякоў (Акоп), Высацка, Нізоў (Гарадзішча), Талькаўшчыны (Куроўшчына або Курава). На гэтых старажытных умацаваннях прыкметны сляды культурных напластаванняў, што сведчыць аб працяглым іх выкарыстанні нашымі продкамі. Ёсць і сляды неаднаразовых пажараў.

Селішчы феадальнага часу выяўлены каля большасці сучасных вёсак. Некаторыя вёскі аб'ядналі ў сабе па некалькі былых селішчаў. Утварыліся контуры вуліц.

Асобную групу археалагічных помнікаў утвараюць курганныя і старажытныя грунтовыя могільнікі. Курганы на Слонімшчыне захаваліся каля горада Слоніма (урочышча Соміна), вёсак Баравікі (на могілках), Ганькі (на ўскрайку суседняга лесу). Едначы (паўскрай дарогі ў в.Ніз, у лесе), Кавалі (пры палявой дарозе ў в.Дзераўная*), Нагуевічы (ва ўрочышчы Івішчы, у лесе), Орлавічы (на могілках), Піронім (на ўскрайку лесу пры дарозе ў в.Войневічы), Рахавічы (на могілках і побач з імі), на могілках былой в.Багданавічы, Талькаўшчыны (2 км на ўсход ад вёскі, у лесе), Шундры (у лесе, 1,5 км на паўднёвы-захад ад вёскі). У апошні час былі знішчаны курганныя могільнікі ў Васілевічах, Дзераўной, Паўлаве, Паўлавічах (раскапаны В.Сядовым), Рышчыцах.

Усе курганы Слонімшчыны круглыя ў плане, вышынёй ад 0,6 да 2,0 і дыяметрам 4-16 м (акрамя аднаго дугападобнага кургана вышынёй каля 1,0 і даўжынёй 24 м паблізу в. Паўлава). Побач з вёскай Юхнавічы ўзвышаецца да 2 м старажытны курган-могільнік з мноствам пахаванняў, дыяметр круглага ў плане могільніка каля 27 м. На паверхні яго меліся камені. Вакол некаторых курганных насыпаў прыкметны ровікі.

Улічваючы розначасовыя раскопкі, можна меркаваць, што пахаванні пад

* Два курганы раскапаны Ф.Гурэвіч у 1955 г.

курганамі ў гэтай мясцовасці праводзіліся прыблізна з 11 да 17 ст. Але адначасова бытавала і традыцыя звычайных ямных пахаванняў. Ёсць могільнікі і з суцэльнай каменнай вымасткай паверхні грунтовых магіл (Куцэйкі, Клепачы побач з возерам Бяздонным, хутар Выбар побач з Навасёлкамі). Пад курганамі ж пахаванні праводзіліся па рознаму абраду: у ямах глыбінёй 40-60 см, на паверхні мацерыка і непасрэдна ў насыпах (упускныя). Пры раскопках аднаго з курганаў у Орлавічах выяўлены чатыры нябожчыкі, пахаваныя ў розныя часы. Адзін – у падкурганнай яме глыбінёй 50 см, астатнія – упускныя. Курган мог быць сямейнай грабніцай.

Даследаванні могільнікаў дазваляе выказаць меркаванне, што насельніцтва тут прытрымлівалася неадналькавых рытуальных традыцый, а гэта значыць, было змешаным. На жаль, праблема гэтая застаецца невывучанай. Аналіз дадзеных разведкі прыводзіць да думкі, што край неаднаразова падсяляўся прышэльцамі як з поўдня, так і з поўначы. Адно з апошніх такіх падсяленняў (магчыма з поўдня) можна датаваць 13 ст.

Што ж далі аўтару згаданыя археалагічныя даследаванні?

1. Выяўлена, што ў старажытнасці р.Шчара была адной з важнейшых водных магістраляў, якія злучалі басейн Дняпра з Панямоннем (Прыпяць з Нёманам).

2. Археалагічны матэрыял дазваляе выказаць новыя думкі пра паходжанне назвы “Услонім”, а таксама пра заснаванне Слоніма і шэрагу іншых населеных пунктаў.

3. Атрыманыя матэрыялы даюць падставы лічыць, што тэхналагічны прыём штрыхавання (загладжвання змочаным пэндзлем сценак глінянага посуду) не абарваўся ў 5 ст. н.э., як лічаць некаторыя даследчыкі, а выкарыстоўваўся на даследаванай тэрыторыі да прымянення ганчарнага круга. Праўда, у рэдкіх выпадках і зменлівых формах.

4. На аснове вышэйсказанага можна выказаць думку, што т.зв. штрыхаваная кераміка не была атрыбутам ці галоўнай прыкметай археалагічнай культуры балтаў, як сцвярджаюць многія вучоныя, а з’яўлялася толькі рэгіянальнай асаблівасцю керамічнай вытворчасці славян. Помнікі Слонімшчыны сведчаць, што ўзнікла яна напрыканцы неаліту.

5. Балцкі субстрат на Слонімшчыне і ў Пашчар’і не прасочваецца, а ёсць асобныя, больш познія пранікненні балцкай культуры.

# Мяцеж ці паўстанне?
# Выступ Міхала Глінскага падчас вайны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ у 1507-1508 гг.

**Валеры Шэйфер (Гародня)**

Імя Міхала Глінскага вядомае ў гісторыі. Паспрабуем разглядзець яго дзейнасць у кантэксце суперніцтва Масквы і Вільні за т.зв. "старажытнарускую спадчыну". У гэтым суперніцтве М.Глінскі адыграў неадназначную ролю. Узброены выступ на землях Беларусі і Літвы пад кіраўніцтвам М.Глінскага ў савецкай гістарыяграфіі традыцыйна ацэньваўся як этап змагання народных мас Беларусі супраць прыгнёту летувіскіх і польскіх феадалаў за уз'яднанне з рускім народам.

Суперніцтва Масквы і Вільні ўпершыню востра праявілася падчас маскоўска-літоўскіх войнаў канца 15-першай трэці 16 ст. (1492-1494, 1500-1503, 1507-1508, 1512-1522 і 1534-1537 гг). Да выступлення Глінскага ўжо адбыліся два ўзброеныя сутыкненні, прайграных ВКЛ. Толькі ў вайне 1500-1503 гг., па падліках польскага гісторыка Л.Каланкоўскага, ВКЛ страціла каля 25 % тэрыторыі[1]. Да Маскоўскай дзяржавы адышлі ўсе землі ў вярхоўях р.Акі і Чарнігава-Северская зямля з гарадамі Чарнігаў, Старадуб, Пуціўль, Рыльск, Ноўгарад-Северскі, Гомель, Любеч, Почап, Трубчэўск, Радагошч, Бранск, Мцэнск, Любуцк, Сярпейск, Масальск. А таксама значная частка Смаленскай і Віцебскай зямель з такімі стратэгічна важнымі гарадамі як Дарагабуж, Белая, Тарапец[3], а "вязни на реке Ведроше поиманые при Москве зостали"[4]. Разам са стратай значных тэрыторый вялікі князь Аляксандр Казіміравіч (1492-1506) вымушаны быў фармальна прызнаць тытул маскоўскіх уладароў – "гасудар усяе Русі", што як бы легалізавала правы апошніх на захопленыя ўсходнія землі ВКЛ. Уплывы апошняга ва ўсходнеславянскім рэгіёне значна аслабелі.

Наспявала трэцяя вайна. Нягледзячы на перамір'е, канфлікты працягваліся, а пасольствы ВКЛ у Маскве ніяк не маглі дабіцца заключэння міра. У лютым-сакавіку 1504г. паслы ВКЛ прапанавалі Івану III заключыць мір на ўмовах 1494 г., нават без звароту зямель, захопленых Маскоўскім бокам у папярэдняй (1500-1503 гг.) вайне. Аднак і такая пазіцыя сустрэла рэзкае пярэчанне маскоўскага гаспадара, які паўтарыў вядомую з перамоваў 1503 г. формулу аб тым , што ўся "Руская зямля" з'яўляецца яго "отчынай", і мір не будзе падпісаны, пакуль вялікі князь Аляксандр не адмовіцца ад яе.

Перамовы зайшлі ў тупік, але перамір'е захавалася. Тым часам памерлі абодва манархі. На маскоўскі трон уступіў сын Івана III Васіль III (1505-1533), які ў адносінах да ВКЛ працягваў палітыку бацькі. Пасля смерці вялікага князя Аляксандра ён нават

---

[1] Kolankowski L. Polska Jagiełłonów. Dzieje polityczne. Olsztyn, 1991. S. 133-134; Некаторыя даследчыкі, у прыватнасці, К.В.Базілевіч (Внешняя политика Русского централизованного государства. Вторая половина XV в. Москва, 1959), Харашкевіч А.Л. (Русское государство в системе международных отношений конца XV-начала XVI в. Москва, 1980) выдзяляюць як асобныя войны 1487-1492, 1512-1517, 1517-1518 гг.

[3] Любавский М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. Москва, 1915.С. 205

[4] Хроника Литовская и Жамойтская // Полное собрание русских летописей (у далейшым ПСРЛ). Москва, 1975, Т. 32. С. 101. У цытаваным фрагменце размова ідзе пра бітву на р. Ведраш 14 ліпеня 1500 г., у якой 35-40-тыс. маскоўскае войска перамагло 4-тыс. войска ВКЛ. Найвышэйшы гетман К.І.Астрожскі трапіў у палон, у якім прабыў да 1507 г.

паспрабаваў праз сваю сястру, вялікую княгіню літоўскую Алену Іванаўну высунуць сваю кандыдатуру на віленскі трон, але поспеху не меў[5]. Хроніка Мацея Стрыйкоўскага паведамляе, што на вялікакняскі трон прэтэндаваў таксама Міхал Глінскі[6]. Гэтую звестку абвергнуў германскі дыпламат Жыгімонт Герберштэйн, які назваў яе плёткай, створанай ворагамі і зайздроснікамі Глінскага[7]. Сучасны польскі гісторык К.Пяткевіч заўважыў, што негатыўная ацэнка дзейнасці М.Глінскага ўзята з хронік, напісаных пасля яго пераходу на маскоўскі бок. Безумоўна, гэтая падзея моцна паўплывала на яго ны вобраз у гістарыяграфіі[8].

Так ці інакш, але частка магнатэрыі ВКЛ сапраўды зайздросціла прывілеяванаму становішчу Міхала Глінскага пры двары вялікага князя Аляксандра Казіміравіча, імкнулася аслабіць яго ўплывы і не дапусціць новага ўзвышэння. Магчыма, адсюль і пайшлі чуткі пра вялікакняскія амбіцыі Глінскага. У гэтым ворагі Глінскага імкнуліся пераканаць новаабранага вялікага князя Жыгімонта Казіміравіча.

Міхал Глінскі выехаў з Вільні сустракаць новага вялікага князя са світай у 800 вершнікаў[9]. Ужо гэтым, на думку Герберштэйна, ён прызнаў Жыгімонта Казіміравіча “сапраўдным гаспадаром”. Каранацыя апошняга 20 кастрычніка 1506 г. адбылася спакойна і без якіх-небудзь перашкод з боку Глінскага. Але, відавочна, недавер вялікага князя да ўплывовага магната заставаўся.

Новы вялікі князь з ухвалы Паноў-рады пачаў падрыхтоўку да вяртання зямель, захопленых Маскоўскай дзяржавай. Аднак справу ўскладніў унутраны канфлікт у Вялікім Княстве Літоўскім, які выліўся ва ўзброеннае супрацьстаянне, ініцыятарам якога стаў Міхал Глінскі. Была ў гэтым таксама і віна Жыгімонта Казіміравіча, які не пажадаў разгледзець справу гэтага дзяржаўнага дзеяча па абвінавачванні яго ў дзяржаўнай здрадзе, чым закрануў гонар апошняга. Канфлікт паміж магнатамі распачаўся яшчэ ў часы вялікага князя Аляксандра. Ён быў справакаваны як асабістымі амбіцыямі (сутыкненне паміж Міхалам Глінскім і трокскім ваяводам Янам Забярэзінскім), так і дзяржаўнай праблемай (умовы Мельніцкай уніі 1501 г.). Вялікі князь Аляксандр толькі прыглушыў гэты канфлікт, які ў 1507 г. успыхнуў ізноў і стаўся этапам чарговай маскоўска-літоўскай вайны.

Каб разабрацца ў гэтых падзеях, трэба звярнуцца да радаводу Глінскага. Яго род паходзіў ад татарына Алексы (Leksy), які прыехаў на службу да вялікага князя Вітаўта. Па дадзенай яму вотчыне г.Глінску (у Смаленскай зямлі) частка нашчадкаў Алексы стала пісацца Глінскімі[10]. Іншыя прадстаўнікі роду атрымалі валоданні ў цэнтральнай і заходняй частцы ВКЛ. Яны парадніліся з праваслаўнымі родамі Вялікага Княства - Меляшковічамі, Дражджамі, Храптовічамі і інш.[11] Адносіны паміж рознымі галінамі Глінскіх практычна не падтрымліваліся[12].

---

[5] Хорошкевич А. Л. Русское государство в системе международных отношений конца XV-начала XVI в. Москва, 1980. С. 117.

[6] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmudska i wszystkiej Rusi. Warszawa, 1846. T.II. S.373.

[7] Герберштейн С. Записки о Московии. Москва, 1988. С. 188.

[8] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiełłończyka: Studja nad dziejami państwa i społeczeństwa na przełomie XV i XVI w. Poznań, 1995. S. 222.

[9] Герберштейн С. Записки о Московии. С.188-189.

[10] Бычкова А.Е. Беларуские предки Ивана Грозного // Наш радавод. Гродна, 1991. Кн. III. Ч. III. С.468 ; Pietkiewicz K. Wielkie księstwo Litewskie…S. 98-99; Kosiński A. Przewodnik heraldyczny. Kraków, 1877. Cz. II. S. 130-133.

[11] Pietkiewicz K. Wielkie księstwo Litewskie…

[12] Бычкова М.Е. Беларуские предки Ивана Грозного. С. 468-469.

Міхал Львовіч Глінскі (1470-24.09.1534) яшчэ юнаком быў адпраўлены за мяжу, дзе пражыў 12 гадоў. У Германіі служыў пры двары імператара Максіміліяна, вызначыўся ў войску саксонскага курфюрста Альбрэхта падчас вайны ў Фрызіі, прайшоў усе прыступкі вайсковай службы. Затым вучыўся ў Італіі, дзе прыняў каталіцтва. Наведаў таксама Іспанію. У выніку ён атрымаў добрую адукацыю, валодаў асноўнымі еўрапейскімі мовамі, засвоіў прыгожыя манеры і навыкі вайскоўца. Верагодна, у 1497 г. ён удзельнічаў у т.зв. "чарнаморскай выправе" Яна Альбрэхта, пасля якой ізноў вярнуўся ў Германію.

На сталае жыхарства ў ВКЛ Міхал Глінскі прыехаў напрыканцы 1498 або напачатку 1499 г. Кар'еру першапачаткова рабіў з дапамогай брата Івана, які з 1495 г. быў намеснікам ошскім і пералюмскім. Міхал хутка прасоўваўся па прыступках службовай лесвіцы. У 1499 г. ён стаў маршалкам дворным. Разам з ім у эліту ВКЛ уваходзіў цэлы шераг яго родзічаў. Іван Львовіч Глінскі ў 1501 г. стаў маршалкам гаспадарскім і харунжым літоўскім, а ў 1505 г. – кіеўскім ваяводам і адначасова намеснікам бельскім. Другі з братоў - Васіль "Сляпы" з 1500 па 1505 г. з'яўляўся намеснікам васілішскім і падстолім літоўскім, у 1505 г. старостам і ключнікам берасцейскім. Апроч гэтага Міхал Глінскі ўладкаваў на Лідскае намесніцтва свайго стрыечнага брата Андрэя Аляксандравіча Дражджа, што, па звестках хронікі Быхаўца[13], стала непасрэднай прычынай канфлікта Глінскага з трокскім ваяводам Янам Забярэзінскім. Апошні выступіў у абарону папярэдняга намесніка Юрыя Ільініча[14].

Пры двары вялікага князя Аляксандра Міхал Глінскі займаў высокае становішча. Жыгімонт Герберштэйн нават лічыў, што манарх "усе складаныя справы вырашаў паводле яго меркавання"[15]. Глінскія мелі вялізныя зямельныя валоданні. Міхал Глінскі атрымаў ад гаспадара двары ў Троках і Вільні, Ляжкава ў Мярэцкай воласці, а ў 1505 г. - Тураў, Ганёндз і Райгарад, а яго брат Васіль - дом у Вільні, Забалоцце ў Васілішскім пав., Клявіцкі дзесятак - у Ваўкавыскім пав. і інш. Іван Глінскі атрымаў двор Вяйсейе (Wejseje) ў Пералюмскім павеце[16]. М.Стрыйкоўскі сцвярджаў, што Глінскія трымалі ў сваіх руках амаль палову Вялікага Княства Літоўскага, што і выклікала незадавальненне шляхты[17].

Цяжка ўстанавіць дакладную прычыну яго канфлікту з Янам Забярэзінскім. Беларуска-літоўскія летапісы ва ўсім абвінавачваюць Міхала Глінскага, не разбіраючы сутнасці праблемы. Больш глыбока, але з тых жа самых пазіцый, асвятляюць падзеі "Хроніка Быхаўца"[18] і Хроніка Мацея Стрыйкоўскага[19]. Ж. Герберштэйн, выводзіў канфлікт з дробязі: Забярэзінскі, быццам бы, пабіў слугу Глінскага, пасланага за збожжам для каралеўскіх коней [20].

---

[13] Хроніка Быхаўца // Беларускія летапісы і хронікі. Мінск, 1997. С. 160.
[14] Госцеў А.П., Швед В.В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116-1990). Гродна, 1993. С. 48-49; Зимин А.А. Россия на пороге нового времени. Очерки политической истории России первой трети XVI в. Москва, 1972. С. 86 ; Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska… S. 321.
[15] Герберштейн С. Записки о Московии. С. 87.
[16] Цыт. па: Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990. С.15; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie … S.99.
[17] Stryjkowski M . Kronika Polska, Litewska… S. 322.
[18] Хроніка Быхаўца ... С. 160-163.
[19] Stryjkowski M Kronika Polska, Litewska…S. 321, 343, 352.
[20] Герберштейн С. Записки о Московии. С.188.

Фактам застаецца тое, што ў 1503 г. Глінскі абвінаваціў Забярэзінскага ў арганізацыі замаху на яго жыццё[21]. Справа дайшла да гаспадарскага суда. Вялікі князь Аляксандр ухіліўся ад сцвярджэння віны аднаго з бакоў і загадаў панам памірыцца. Са звароту вялікага князя да абодвух паноў відаць, што і Глінскі не застаўся ў даўгу і, магчыма, таксама пагражаў замахам на жыццё Яна Забярэзінскага і двух яго сыноў [22].

Але Глінскі ўсе роўна заставаўся фаварытам Аляксандра Ягелончыка, і той, па яго просьбе, перадаў Ліду, "што была пад Ільінічамі", Андрэю Драждж у [23]. Юрый Ільініч звярнуўся да радных паноў біскупа віленскага Войцеха Табара, віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла, трокскага ваяводы Яна Забярэзінскага, жамойцкага старосты Станіслава Яновіча, полацкага ваяводы Станіслава Глябовіча, смаленскага намесніка Станіслава Кішкі. Яны, па звестках "Хронікі Быхаўца", не саступілі Ліды Драждж у "простаму чалавеку, а Ільінічу пакінулі, бо бачылі, што ў прывілеі напісана: гаспадар нікому не можа прывілеяў даваць, акрамя тых, хто з гербам". Вялікі князь быў разгневаны.[24] Па версіі Мацея Стрыйкоўскага, М.Глінскі ўвесь час намаўляў Аляксандра адпомсціць за непаслушэнства. Храніст, наогул, лічыў Глінскага "злым духам", які сеяў варожасць паміж шляхтай і манархам[25].

Аляксандр Казіміравіч выклікаў свавольных паноў на сейм у Бярэсце ў 1505 г. з намерам іх пакараць. Па намове Глінскага ў Забярэзінскага была адабрана пасада трокскага ваяводы, Ільініч быў схоплены і пасаджаны ў астрог, а Панам-радзе "загадана яму на вочы [вялікаму князю} не трапляць"[26]. Па звестках Стрыйкоўскага, каронны гетман Ян Ласкі папярэдзіў паноў, і яны не ўвайшлі ў Берасцейскі замак, што выратавала іх ад арышту. Да польскіх магнатаў была паслана просьба дапамагчы ўрэгуляваць канфлікт. Урэшце, Ян Ласкі і Ян з Асвенціма ўгаварылі Аляксандра змяніць гнеў на літасць[27].

Быў склікані спецыяльны сейм у Радоме, на які прыбыла дэлегацыя на чале з біскупам В.Табарам. Кароль і вялікі князь згадзіўся яе прыняць, і біскуп Табар сказаў палымяную прамову: "Міласцівы каролю! Без падстаўны гнеў твой гаспадарскі на нас быў з нагавору некаторых людзей, бо мы супраць цябе, гаспадара нашага, не стаялі, але баранілі правы ды прывілеі свае, каб яны за намі засталіся. А таму, міласцівы гасудару, як пастыр ваш і тутэйшага панства, я павінен за тым сачыць і цябе адводзіць ад таго, каб ты, гаспадар наш, правы нашыя і прывілеі, выдадзеныя нам, захаваў. А, калі хто захоча іх скасаваць, Божа, адпомсці кожнаму такому"[29]. Атрымаўшы абяцанне гаспадара вырашыць канфлікт у час бліжэйшага прыезду ў Вільню, дэлегацыя вярнулася ў ВКЛ Але хутка пасля гэтага Аляксандра разбіў параліч, і сваё абяцанне ён не стрымаў.

Спрэчкі з-за пасады лідскага намесніка былі толькі адной з прычын канфлікту паміж магнатамі і манархам. Другая, больш глыбокая прычына крылася ў адносінах да Мельніцкай уніі 1501 г. Па ўмовах уніі літоўская шляхта ўдзельнічала ў выбарах польскага караля, а Польшча ў выпадку небяспекі, павінна была дапамагчы ВКЛ. Але

---

[21] Цыт. па: Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie …S. 114
[22] Тамсама
[23] Хроніка Быхаўца ... С.160.
[24] Тамсама. С.161.
[25] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska…S. 321.
[26] Хроніка Быхаўца ... С. 161.
[27] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska…S. 322.
[29] Хроніка Быхаўца ... С. 161; Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska…S. 325.

не ўся шляхта падтрымала унію. У гэтай сітуацыі на баку манарха і уніі апынуліся Міхал Глінскі, Міхал Заслаўскі і Юрый Гальшанскі. Супраць выступілі біскуп Войцех Табар, Ян Забярэзінскі, Станіслаў Кішка, Станіслаў Яновіч (Кязгайла) і Станіслаў Глябовіч[29]. Яны расцанілі акт уніі як пагрозу незалежнасці ВКЛ з боку Кароны.

Такім чынам, канфлікт паміж магнатамі ўплёўся ў канфлікт паміж вялікім князем і шляхтай. Далейшыя спрэчкі вакол Мельніцкай уніі прывялі да кампрамісу. Урэшце, у гэтай справе найбольш пацярпелі Ю.Гальшанскі і Ю.Ільініч. Не ўсе пасады былі вернуты Яну Забярэзінскаму. Пакуль быў жывы вялікі князь Аляксандр, канфлікт апошняга з Глінскім не перарастаў у адкрытае сутыкненне. Калі ж на прастол быў абраны Жыгімонт, Ян Забярэзінскі пачаў адкрыта абвінавачваць Глінскага ў здрадзе, у імкненні заняць самому месца вялікага князя[30]. Міхал Глінскі некалькі разоў звяртаўся да Жыгімонта, каб той разабраўся і зняў з яго такія цяжкія абвінавачванні, але вялікі князь усё цягнуў з апраўданнем. Не дапамагло нават пасрэдніцтва венгерскага караля Уладзіслава, брата Жыгімонта Казіміравіча. Нарэшце самалюбівы князь заявіў каралю, што “зробіць такое, пра што з часам пашкадуе і ён сам і сам кароль ”[31]. Сказаў і зрабіў.

У Маскву быў накіраваны ганец з лістом да Васіля ІІІ, у якім Міхал Глінскі паведамляў, што калі вялікі князь маскоўскі дасць грамату з гарантыяй захавання ўсіх земляў і маёмасці, то ён гатовы перайсці на яго бок з усімі крэпасцямі, якімі валодае і якія яшчэ захопіць сілай ці ўгаворыць здацца. Васілю ІІІ карысна было прыдбаць такога саюзніка як Глінскі, і ён згадзіўся на ўсе ўмовы.

Міхал Глінскі стаў распаўсюджваць у ВКЛ чуткі, што ўсіх праваслаўных збіраюцца перахрысціць. Пры гэтым ён спасылаўся на звесткі, атрыманыя нейкім Фёдарам Калантаевым ад маршалка Івана Сапегі. (Сам Ф.Калантаеў не прызнаў гэта падпрысягай[32].)

Глінскі абапіраўся ў асноўным на праваслаўную шляхту. Вялікая колькасць удзельнікаў была парадненa ці звязана з родам Глінскіх[33]. Крымскі хан Менглі-Гірэй таксама быў гатовы падтрымаць хутчэй мяцежнага князя, якога ён ведаў яшчэ па пасольству 1493 г. у Крым, чым Жыгімонта. Вёў Глінскі перамовы і са Стэфанам, “господарём волошскім”.

Планы выступлення выношваліся з лета 1507 г. Пачалося ж яно расправай над Забярэзінскім адразу пасля ад’езду Жыгімонта Казіміравіча на сейм у Кракаў. Праз сваіх шпегаў Міхал Глінскі даведаўся, што вораг знаходзіцца ў маёнтку пад Гародняй. 2 лютага 1508 г., пераправіўшыся праз Нёман з 700 вершнікамі, ён атачыў яго. Сябра Глінскага немец Шляйніц з людзьмі ўварваўся ў жылыя пакоі. Забярэзінскага схапілі і загадалі нейкаму татарыну забіць яго (“сцяць”)[34]. Пасля нарады ў Наваградку Глінскія вырашылі рухацца на Вільню. У гэты момант Міхал Глінскі меў 2 тыс. узброеных людзей[36].

---

[29] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie …S. 117.
[30] Герберштейн С. Записки о Московии. С. 189; Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska…S. 330-333.
[31] Герберштейн С. Записки о Московии. С.189; Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska…S. 325.
[32] Акты, относящіеся къ исторіи Южной и Западной России, собранные и изданные археографической комиссией. Т.I (1361-1598). Санкт-Петербург, 1863. С. 35.
[33] Кром М.М. Меж Русью и Литвой. Западнорусские земли в системе международных отношений конца XV-первой трети XVI вв. Москва, 1995. С. 62.
[34] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska…S. 345; Хроника Литовская и Жмойтская…С. 102-103; Герберштейн С. Записки о Московии. С. 189.
[36] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska…S. 346.

Цэнтрам мецяжа стала Тураўшчына, спадчыннае валоданне Міхала Глінскага. У Тураве яго войскі правялі тры тыдні. Менавіта сюды, імкнучыся выйграць час, Жыгімонт накіраваў свайго пасла Яна Касцевіча з абяцаннем Глінскім "всякую управу учинити в их делах с литовскімі паны". Але Глінскія згадзіліся весці перамовы толькі з Альбрэхтам Гаштольдам і паведамілі Жыгімонту, што будуць чакаць яго да Саборнай нядзелі (12 сакавіка 1508 г.) [37].

Даведаўшыся аб падзеях у ВКЛ, Васіль ІІІ спешна накіраваў у Тураў свайго дзяка Мікіту Губу Маклакова, які быў з посольствам у ВКЛ яшчэ ў 1503 г. і добра ведаў сітуацыю ў Літве. Ён перадаў мяцежнікам прапанову Васіля ІІІ перайсці на яго бок. Адказу ад Жыгімонта Глінскія не атрымалі. Яны палічылі сябе вольнымі ў адносінах да гаспадара і накіравалі ў Маскву грамату з просьбай да Васіля ІІІ прыняць іх у сваё падданства і дапамагчы ў барацьбе з Жыгімонтам[38].

Пасля гэтага з Турава войска Глінскіх рушыла ўглыб ВКЛ. Сваяк Міхала Глінскага мазырскі ваявода Якуб Івашанцаў адчыніў браму Мазыра. У той жа час да мяцежнікаў прыбыў пасол ад Менглі-Гірэя з прапановай перайсці на крымскую службу і абяцаннем самога Кіева. (Дарэчы з Жыгімонтам Менглі-Гірэй таксама захоўваў сяброўства[39]). М.Глінскі разлічваў на частцы тэрыторыі ВКЛ стварыць Вялікае Княства Рускае, але вырашыў, што лепш мець рэальную дапамогу Масквы, чым мройныя абяцанні Крыма. Тым больш, што Мікіта Губа Маклакоў прывёз станоўчы адказ ад Васіля ІІІ і паведамленне пра пасылку на дапамогу маскоўскага войска пад началам Васіля Шамяціча. Маскоўскі гаспадар абяцаў пакінуць за Глінскімі ўсе гарады, якія тыя захопяць. Пасля гэтага ў маі 1506 г. Глінскія прынеслі прысягу на вернасць Васілю ІІІ[40].

Пакуль ішлі перамовы, Міхал Глінскі захапіў Клецк. Пазней "пристали теж до него княжата Друцкие и князь Михаил Мстиславский з замком своим, той з Друцким, а сей Мстиславским, так теж и оршанци, ...Гомель поддалися ему"[41]. У Клецк да Глінскага прыбыў новы маскоўскі пасол Шыгона-Паджогін, а таксама пасол ад "гаспадара валошскага" з завярэннем у сяброўстве. Тым часам Васіль Глінскі дзейнічаў у раёне Кіева. Ён асадзіў Жытомір і Оўруч, імкнуўся схіліць сабраную тут праваслаўную шляхту на бок свайго брата, абяцаючы, што калі Міхал Глінскі стане вялікім князем літоўскім, то адродзіць "манархію кіеўскую"[42]. Але гэтыя гарады не падаліся мяцежнікам.

10 сакавіка з Масквы выйшла галоўнае маскоўскае войска (50-60 тыс.чал.) пад камандаваннем Юрыя Захар'іна. Дзвюма калонамі яно накіравалася на Смаленск. На Полацкую зямлю ішлі наўгародскія палкі Д.Шчэні і Рыгора Захар'іна. Са з'яўленнем маскоўскіх войскаў мяцеж перакінуўся да Оршы і зліўся з агульнымі аперацыямі маскоўскіх ваяводаў[43]. Пад Оршай маскоўскія войскі злучыліся, але далей углыб ВКЛ не пайшлі.

---

37 Зимин А.А. Россия на пороге нового времени... С. 87.

38 Тамсама.

39 ЛМ. Книга записей VIII. С. 120.

40 Зимин А.А. Россия на пороге нового времени... С. 87.

41 Хроніка Литовская и Жмойтская ... С. 102-103.

42 Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska...S. 346.

43 Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994. С. 65.

З Северскай зямлі ў маі на Літву выйшлі войскі маскоўскіх ваявод Васіля Шамяціча, Івана Адоеўскага і Івана Варатынскага. Нарэшце, і да самога Міхала Глінскага быў пасланы невялікі атрад князя А.Ф.Алёнкі Алабышава з мурамцамі. Адной з першапачатковых задач, якую ставілі перад сабой князі Глінскія, быў захоп Менска і Слуцка. Да Менска быў накіраваны атрад Зміцера Жыжамскага. Пасля Троіцы (11 чэрвеня) Міхал Глінскі сам пачаў наступленне ў тым жа накірунку. У хуткім часе пад Менск падыйшлі і войскі Васіля Шамяціча з боку Бабруйска. 12 чэрвеня на Слуцк рушылі палкі князя І.Дражджа. Перадавыя атрады князя Андрэя Трубяцкога і князя Андрэя Лукомскага рабілі разведку ў накірунку Наваградка.

Пад Менскам аб'яднанае войска беспаспяхова стаяла два тыдні. Сюды прыбыў маскоўскі пасол Юрый Замяцін з паведамленнем аб руху войскаў Д.Шчэні і Р.Захар'іна. Няўдача спасцігла Глінскага пад Слуцкам і пад Копылем. Узяцце Слуцка для Глінскага было б ідэлагічнай падставай для стварэння "Кіеўскай манархіі", бо князі Слуцкія-Алелькавічы з'яўляліся нашчадкамі кіеўскага князя Алелькі (Аляксандра) Уладзіміравіча з дынастыі Альгердавічаў[44]. Міхал Глінскі, які не быў жанаты, разлічваў угаварыць ці змусіць удаву княгіню Анастасію выйсці за яго замуж. Але нічога з гэтага не выйшла. Раззлаваны князь загадаў спустошыць валоданні Алелькавічаў. Самаўладныя дзеянні М.Глінскага адштурхнулі ад яго частку прыхільнікаў-магнатаў. Большасць магнатэрыі да яго справы ставілася абыякава або нават варожа[45].

Але для караля і вялікага князя становішча доўгі час заставалася досыць цяжкім. Каб яго выправіць, Жыгімонт накіраваўся з Кароны ў ВКЛ. У канцы мая ён быў у Бярэсці, у сярэдзіне чэрвеня накіраваўся ў Слонім, а потым - у Менск[46]. Гаспадар энергічна збіраў ваенныя сілы. І пакупова з'явіліся першыя прыкметы пералому. Ужо ў маі Канстанцін Астрожскі заняў Тураў. У Лідзе збіралася шляхецкае апалчэнне. Сюды паспяшаўся і Жыгімонт з 3-4 тыс. палякаў. Камандуючым аб'яднанымі сіламі (15-16 тыс.чал.) быў прызначаны К.Астрожскі[47].

А вось надзеі Глінскага на дапамогу з боку Менглі-Гірэя не спраўдзіліся. У рашаючую хвіліну хан толькі не аказаў ніякай дапамогі войскам Глінскіх, але нават накіраваў свае сілы ў раён Ноўгарад-Северскіх зямель у тыл маскоўскім войскам. Праўда, баючыся выступлення нагайцаў у сваім тыле (у выніку распачатых перамоваў нагайцаў і Васіля III), вымушаны быў адступіць.

У той жа час пачалі наступленне войскі ВКЛ. Ужо 20 чэрвеня яны вызвалілі ад аблогі Менск і накіраваліся да Барысава, дзе ў той час знаходзіўся сам Глінскі. У сярэдзіне ліпеня ліцвіны выйшлі на бераг Дняпра, каля Оршы, куды сцягваліся таксама войскі Глінскага і ягоных маскоўскіх саюзнікаў. З 12 па 22 ліпеня войскі стаялі адно насупраць другога, пасля чаго маскоўскія ваяводы адышлі спачатку да Мсціслаўля і Карачава, а затым да Вязьмы. Буйныя маскоўскія сілы на чале з В.Д.Холмскім былі пасланыя пад Дарагабуж на пачатку верасня 1508 г. і ўзялі горад, пакінуты войскамі ВКЛ. Данііл Шчэня прывёў да прысягі маскоўскаму князю Тарапец[48].

---

[44] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska…S. 346; Хроника Литовская и Жмойтская …С. 103.

[45] Кром М. М. Меж Русью и Литвой… С. 62

[46] Зимин А.А. Россия на пороге нового времени… С. 89.

[47] Сагановіч Г.М. Ад Ведрашы да Крапіўны // З гісторыяй на "Вы ". Мінск, 1994. Вып. 2. С. 175; Сагановіч Г.М. Айчыну сваю баронячы. Канстанцін Астрожскі. Мінск, 1992. С. 32.

[48] Зимин А.А. Россия на пороге нового времени... С. 90.

Міхал Глінскі, даведаўшыся пра рух гаспадарскіх войскаў, накіраваўся ў Маскву, дзе разлічваў дамовіцца з Васілём III аб новай ваеннай падтрымцы. Сваіх прыхільнікаў князёў З.Жыжамскага, І.Азярэцкага і А.Лукомскага са скарбам ён пакінуў у Почапе. Перамовы для Глінскага не далі поспеху. Маскоўскі ўладар фактычна адмовіўся ад ягоных паслуг, хоць яшчэ 28 жніўня паслаў імператару Максіміліяну грамату, у якой паведаміў аб прыняцці ў свае падданства князя Міхала Глінскага. У грамаце выказвалася пажаданне заключэння дамовы з Імперыяй, якая б прадугледжвала сумесныя дзеянні супраць Жыгімонта[49].

Глінскі жадаў вялікай бітвы і абяцаў ваяводам Васіля III перамогу, калі яны будуць яго слухацца[50]. Пасля некалькіх сутычак маскоўскае войска пераправілася на левы бераг Дняпра і размясцілася ў лесе. Аднак уначы з 13 на 14 ліпеня яно адступіла ў бок Дуброўны і далей на паўднёвы ўсход[51]. Жыгімонт вырашыў не праследаваць іх, а пайсці на Смаленск, пакінуўшы невялікі атрад прыкрыцця на правым беразе Дняпра. Са Смаленска К.Астрожскі і М.Фірлей на чале польскага войска, рушылі адваёўваць Севершчыну. Поспеху гэты рэйд не меў, бо гетманы не ладзілі паміж сабой. Войска вярнулася ў Смаленск[52]. Мсціслаўль, Крычаў, Орша вярнуліся пад уладу гаспадара.

Для працягу вайны ВКЛ не мела сродкаў. Жыгімонт вырашыў распачаць перамовы. Васіль III згадзіўся. 19 верасня 1508 г. у Маскву прыбыло вялікакняскае пасольства на чале з полацкім ваяводам Станіславам Глябовічам. Паслы патрабавалі вяртання да межаў, якія былі пры Казіміры Ягайлавічы і Васілю Цёмным[53]. Аднак, каб дыктаваць умовы трэба было мець сілы, якіх у ВКЛ не было. 8 кастрычніка быў падпісаны "вечны мір", які замацоўваў адыход да Маскоўскай дзяржавы земляў, захопленых ёй у ходзе войнаў 1492-1494 і 1500-1503 гг. Абодва манархі абавязаліся "быти везде заодин" на ўсіх ворагаў акрамя Менглі-Гірэя "царя перекопьского", "не вступатіся" у "отчыны" адзін аднаго. Князі Глінскія і іх прыхільнікі атрымалі права свабодна выехаць з ВКЛ[54], але без сваіх зямельных валоданняў, якія былі канфіскаваныя і раздаваліся шляхце ВКЛ. Да Літвы вярталіся землі, захопленыя падчас вайны 1507-1508 гг.

У канчатковым выніку з ВКЛ на службу да Васіля III уцяклі сам Міхал Глінскі, яго браты Іван і Васіль "Сляпы", стрыечны брат Андрэй Дрождж, князі Іван Азярэцкі, Зміцер і Васіль Жыжамскія, Андрэй і Васіль Аляксандравы, Міхал Гогін, Іван Друцкі, Пётр Фурс з братам Фёдарам і Якуб Івашанцаў[55].

26 лістапада ў Вільню выехала маскоўскае пасольства ў складзе Р.Ф.Давыдава, канюшага І.А.Чаляднiна, сакольнічага М.С.Кляпіна і дзяка Мікіты Губы Маклакова. Пасля зацвярджэння Жыгімонтам "вечнага міру" (1 сакавіка 1509 г.) яны вярнуліся ў Маскву. Хутка пасля гэтага 31 сакавіка 1509 г. вялікакняскім паслам удалося дабіцца ад апошняга звароту палонных, захопленых у бітве на р.Ведрашы ў 1500 г.[56]

---

[49] Тамсама.
[50] Хроника Литовская и Жмойтская … С. 103.
[51] Сагановіч Г. М. Ад Ведрашы да Крапіўны … С. 176.
[52] Там жа.
[53] ЛМ. Книга записей VIII. С. 122-123.
[54] Базилевич К.В. Внешняя политика Русского централизованного государства. Вторая половина XV в. Москва, 1952. С. 39-40; ЛМ. Кніга записей VIII. С.125-128; Хроника Литовская и Жмойтская …С. 103; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie… C. 242-243.
[55] Зимин А.А. Россия на пороге нового времени… С. 91.
[56] Тамсама.

Такім чынам, вайна 1507-1508 гг. скончылася для ВКЛ без тэрытарыяльных стратаў, але і вярнуць страчанае раней не ўдалося. У гэтай вайне сітуацыя для Літвы была моцна ўскладнена ўнутраным разладам, звязаным з дзеяннямі магнацкай групоўкі на чале з М.Глінскім. Выступленне М.Глінскага можна ацаніць як авантуру вельмі амбіцыйнага магната, які страціўшы сваё становішча пры вялікім князі і абражаны несправядлівым абвінавачваннем, вырашыў адпомсціць крыўдзіцелям, перакінуўшыся на варожы бок. Прычыны гэтай здрады насілі асабісты характар.

Але высокага становішча ў чужой дзяржаве Міхал Глінскі не дамогся. Не дапамаглі нават ягоныя паслугі маскоўскаму боку падчас Смаленскіх кампаній у вайну, якая распачалася ў 1512 г. У 1514 г. пры спробе перайсці на бок ВКЛ (пасля папярэдняга памілавання Жыгімонтам Казіміравічам) М.Глінскі быў кінуты ў маскоўскі астрог. Вызвалены перад смерцю Васіля III ён хутка ізноў трапіў за краты, дзе і памёр 24 верасня 1534 г.

KAMUNIKAT.org

## Штрыхі да партрэта гісторыка Юзафа Ярашэвіча (1793-1860).

**Тадэвуш Шылабрыт (Гародня).**

У апошнія гады ў айчыннай гістарычнай навуцы адбываецца інтэнсіўны пошук новых падыходаў да вывучэння мінулага. Але і сёння навукоўцы, на жаль, не шмат увагі надаюць праблемам гісторыі гістарычнай навукі. Застаюцца незаслужана забытымі многія гісторыкі, якія ў свой час шмат зрабілі дзеля распрацоўкі гісторыі Беларусі. Да іх ліку можна аднесці і Юзафа Ярашэвіча.

Ён нарадзіўся 22 студзеня 1793 г. у мястэчку Бельск-Падляскі Гарадзенскай губерні ў сям'і судовага пісара Бенядзікта Ярашэвіча[204]. Па дасягненню адпаведнага ўзросту хлопчыка аддалі вучыцца ў Беластоцкую гімназію, якую той паспяхова скончыў 30 чэрвеня 1812 г.[205] Яшчэ пад час навучання ў гімназіі будучы гісторык марыў працягваць вучобу. Але часова гэтыя планы былі перакрэслены ваенным паходам Напалеона на Расію.

З адступаючымі рускімі войскамі Вільню пакінула і частка выкладчыкаў універсітэта. Аднак афіцыйна навучальная ўстанова працягвала існаваць. Уводзіліся нават новыя прадметы. На факультэце маральна-палітычных навук А.Капеллі ўвёў у праграму навучання Кодэкс Напалеона[206]. Аднак большасць выкладчыкаў вырашала асабістыя праблемы, а некаторыя, у т.л. і рэктар універсітэта Ян Снядэцкі, заняліся справай адраджэння незалежнасці ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Фактычна, цэлы год Віленскі універсітэт працаваў толькі намінальна. Зразумела, што ў такі неспакойны час і сам Юзаф Ярашэвіч не мог адправіцца ў Вільню. Але юнак не адмовіўся ад сваёй мары. У 1813 г. ён прыехаў у былую сталіцу ВКЛ, дзе ў хуткім часе быў прыняты на аддзяленне маральных навук маральна-палітычнага факультэта "на собственном иждивении"[207]. Тады ж будучы даследчык прадставіў дакументы аб сваім шляхецкім паходжанні[208].

Адной з лепшых кафедр на факультэце была кафедра гісторыі, якую ўзначальваў Іяхім Лялевель[209]. Загадчык кафедры звярнуў увагу на здольнага студэнта. Хутка паміж імі склаліся добрыя адносіны, якія захаваліся на ўсё жыццё. Біблейскую гісторыю выкладаў Міхал Баброўскі, які шмат працаваў у Ватыканскай і іншых бібліятэках Еўропы. Менавіта пад іх непасрэдным уплывам Ю.Ярашэвіч пачаў цікавіцца гісторыяй права ВКЛ.

За час навучання ва універсітэце Юзаф Бенядзіктавіч праявіў сябе як адказны і здольны студэнт ва ўсіх навуках, за што 24 чэрвеня 1816 г. атрымаў узнагароду[210]. У гэтым жа годзе ён паспяхова вытрымаў экзамены спачатку на кандыдата, а пасля і на магістра права[211]. Аб гэтым сведчыць дыплом за № 2426 ад 30 верасня 1816 г.[212] Ян

---

[204] Vilniaus universiteto bibliotekos. Rankraščiu skyrius. F 2 KS 75. P. 64-65 (далей VUB RS). (Бібліятэка Віленскага універсітэта. Рукапісны аддзел. F2 KS 75. P. 64-65)
[205] Тамсама. F 2 KS 136. P 142-143.
[206] Beavois D. Szkolnictwo polskie na ziemiach litewsko-ruskich 1803-1832. Rzym-Lublin, 1991. T. 1. S. 248.
[207] VUB RS. F 2 KS 137. P 570-571.
[208] Тамсама. F 2 KS 75. P 64-65.
[209] Zasztowt L. Kresy 1832-1864. Szkolnictwo na ziemiach litewskich i ruskich dawnej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1997. S. 49.
[210] VUB RS. F 2 KS 140. P 598-599.
[211] Тамсама. F 2 KS 132. P 388-389.
[212] Тамсама. F 2 KS 141. P 515-516.

Снядэцкі рэкамендаваў здольнага выпускніка ў якасці хатняга настаўніка ў сям'ю папячыцеля Віленскай навучальнай акругі Адама Чартарыйскага. Невядома па якіх прычынах, але Ю.Ярашэвіч не прыняў прапановы.

Праз годён працаваў настаўнікам права ў Валынскай гімназіі ў Крамянцы (цяпер Цярнопальская вобл. Украіны)[213]. Пазней гімназія была пераўтворана ў Крамянецкі ліцэй. З 1809 г. тут выкладаў І.Алдакоўскі (пазней прафесар права ў Віленскім універсітэце), якога Ігнат Даніловіч называў "возродителем науки права" у Літве і на Валыні. Батаніку ў ліцэі выкладаў А.Анджэёўскі, які ва ўспамінах пісаў, што заняткі Ю.Ярашэвіча адрозніваліся высокім узроўнем, а сам выкладчык быў асабліва папулярным сярод вучняў[214]. Польскі гісторык М.Ролле адносіў Юзафа Бенядзіктавіча да ліку найлепшых настаўнікаў "валынскай школы."

У Крамянцы Юзаф Ярашэвіч праявіў сябе таксама як выдатны метадыст-творца. Экзамен па праву ў яго праходзіў у выглядзе судовага працэсу. Паміж вучнямі размяркоўваліся ролі, пры дапамозе якіх выпускнікі павінны былі паказаць свае веды па прадмету. На такі экзамен звычайна збіралася шмат людзей з мястэчка. Сярод іх былі і вядомыя юрысты. Адзін з іх М.Сакалоўскі пасля такога экзамену звярнуўся да настаўніка: "Дарагі прафесар, дух Чацкага над вамі вітае, і гэта нас радуе. Мы радуемся за вучняў. Акрамя таго і для мяне старога юрыста гэта быў добры ўрок…"[215]. Пра высокі ўзровень яго най метадычнай падрыхтоўкі сведчыць таксама падрыхтаваны І.Ярашэвічам разам з М.Хоньскім "Projekt do ustaw sądów rozjemczych między uczniami gimnazjum wołyńskiego ustanowic się mających". "Праект" быў выдадзены ў 1818 г.[216]

У Крамянцы гісторык сустрэўся і пасябраваў з М.Вішнеўскім, які аказаў значны ўплыў на ягоныя погляды. Не забываў Юзаф Бенядзіктавіч і сваіх старых знаёмых. Ён вёў перапіску з Іяхімам Лялевелем. Асноўная тэма перапіскі – праблемы гісторыі статутаў ВКЛ. Ю.Ярашэвіч сцвярджаў, што статуты з'яўляліся ўзорамі прававой думкі тагачаснай Еўропы.

Адыход І.Даніловіча і І.Лялевеля з Віленскага універсітэта ў сувязі са справай філаматаў стварыў праблему кадраў на факультэце маральна-палітычных навук. У такой сітуацыі нельга было не звярнуць увагу на Юзафа Ярашэвіча, які ў той час яшчэ характарызаваўся ўладамі як "способен и достоин к повышению по службе"[217]. У 1826 г. ён быў запрошаны выкладаць права ва універсітэце. Тады ж у часопісе "Dziennik warszawski" была апублікавана яго першая гістарычная праца "Пра ўплыў хрысціянскай рэлігіі на цывілізацыю славян".

Малады прафесар выкладаў грамадзянскае і крымінальнае права ВКЛ і Каралеўства Польскага. У Вільні ён зблізіўся з І.Анацэвічам і А.Каравіцкім. Аднак першы з іх хутка быў высланы з Вільні за ўдзел ў арганізацыі нелегальнага таварыства "Сармацкае племя". У выніку з 1828 г. Ю.Ярашэвіч быў вымушаны выкладаць за калегу яшчэ і курс дзяржаўнай статыстыкі. Яго лекцыі сучаснікі ацэньвалі вельмі высока. Адзін з іх, Л.Яноўскі, у прыватнасці, пісаў: "Усе прызнавалі, што І.Ярашэвіч быў цудоўным прафесарам і выдатным прамоўцам. Свае прадметы ён выкладаў красамоўна і заўсёды меў шмат слухачоў"[218]. На занятках прафесар прымушаў

---

[213] Тамсама. F 2 K S 137. P 570-571.
[214] Andrzejowski A. Ramoty starego Dediuka o Wołyniu. Wilno, 1862. T. 4. S. 9-10.
[215] Тамсама. S. 11.
[216] VUB RS. F 83-20. P. 227-229.
[217] Тамсама. F 2 K S 142. P 366-367.
[218] Janowski L. W promieniach Wilna i Krzemieńca. Wilno, 1923. S. 106.

студэнтаў думаць і дэманстраваць грунтоўныя веды. Курс І.Ярашэвіча пачынаўся з шырокага агляду гісторыі ВКЛ і Польшчы. Выкладчык аналізаваў крыніцы, ацэньваў погляды іншых вучоных, знаёміў студэнтаў са старажытнымі помнікамі права[219].

У 1828 г. рэктар В.Пелікан у сувязі з 250-годдзем заснавання універсітэта прапанаваў Ю.Ярашэвічу зрабіць даклад аб культуры Літвы і значэнні Віленскага універсітэта ў жыцці краю. Даклад быў зроблены ў канцы чэрвеня 1828 г. Прафесар узняў цэлы шэраг актуальных праблем ад гісторыі балтаў і да гісторыі культуры і адукацыі ў ВКЛ. Даклад выклікаў шырокі рэзананс сярод выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта і прыцягнуў увагу шырокіх колаў насельніцтва горада.

Прыкладна ў гэты ж час Юзафа Ярашэвіча наведаў яго былы калега з Крамянецкага ліцэя А.Анджэёўскі. У сваіх успамінах ён адзначыў, што ў канцы 20-х гадоў XIX ст. у Віленскім універсітэце склаліся тры прафесарскія групы. “Старэйшыя” гуртаваліся вакол загадчыка кафедры фізіялогіі медыцынскага факультэта М.Міаноўскага. Лідэрам другой групы быў сам рэктар В.Пелікан. “Групу маладых” складалі пераважна маладыя выкладчыкі[220]. Анджэй Снядэцкі і Юзаф Ярашэвіч не ўваходзілі ў гэтыя групоўкі, але карысталіся іх павагай. На савеце універсітэта ўважліва слухалі меркаванні Юзафа Бенядзіктавіча. Яго прамовы адрозніваліся яснасцю думкі, шчырасцю і высокім узроўнем ведаў”[221].

У 1825-28 гг. на маральна-палітычнам факультэце вучыўся Юлюш Славацкі, будучы вядомы польскі паэт. Маці паэта ў 1827 г. пакінула Вільню. Аўтара будучай паэмы “Міндоўг” апякаў Юзаф Ярашэвіч. Магчыма, менавіта пад уплывам свайго апекуна Ю.Славацкі і напісаў гэтую паэму.

Падчас сваёй выкладчыцкай дзейнасці гісторык працягваў працу, распачатую Ігнатам Даніловічам, па збору крыніц па гісторыі Беларусі і іх крытычнаму аналізу. Асабліва высока ён ацэньваў крыніцы па гісторыі права, бо быў упэўнены, што менавіта яны дапамагаюць лепш зразумець духоўнае жыццё народа. У 1830 г. Іяхім Лялевель атрымаў з Вільні ад свайго былога вучня польскамоўны тэкст Першага статуту ВКЛ, знойдзены ў Віленскім манастыры кармелітаў[222].

Пасля падаўлення паўстання 1830-31 г. універсітэт у Вільні быў зачынены. Віленскую інтэлігенцыю воляй пераможцаў раскідалі па вышэйшых навучальных установах Масквы, Пецярбурга і Кіева, а некаторыя былыя выкладчыкі, у т.л. і Ю.Ярашэвіч наогул перасталі займацца педагагічнай дзейнасцю.

Царскія ўлады запатрабавалі ад В.Пелікана даць характарыстыку былым сваім калегам па універсітэту. Рэктар усіх падзяліў на тры групы: 1) надзейныя, 2) сумніўныя і 3) ненадзейныя. Асабліва адмоўна былі ахарактарызаваны прафесары Л.Бароўскі, І.Фонберг, А.Вырвіч, А.Снядэцкі і Ю.Ярашэвіч. Прычым апошні ўяўляў сабой, на думку рэктара, “личность неправильно мыслящую”. Яшчэ адну характарыстыку Юзафу Бенядзіктавічу даў Міхал Каяловіч: “У Заходняй Расіі стала складацца невялікая партыя польскіх людзей… Яны задумалі прывесці (у навуцы) да самастойнасці Заходняй Расіі… Яны ўзялі старую ідэю палітычнай незалежнасці

[219] Тамсама. S. 105
[220] Andrzejowski A. Ramoty starego Dediuka o Wołyniu. Wilno, 1862. T. 4. S. 158.
[221] Тамсама. S. 159.
[222] Janulaitis A. Ignas Danilavičius. Lietuvos bei jos teises istorikas. Kaunas, 1932. T. 1. P. 153.

Літвы і разлічвалі, што Заходняя Расія здолее выпрацаваць гэтую самастойнасць пры той жа польскай цывілізацыі…”[223].

У выніку таленавіты выкладчык і навуковец працяглы час заставаўся без працы. Нарэшце, апякун Віленскай навучальнай акругі Г.Карташэўскі прапанаваў яму ўвайсці ў склад толькі што створанага Часовага школьнага камітэта. Акрамя прафесара права, у камітэт увайшлі М.Палінскі (старшыня), П.Кукальнік і І.Лабойка. Камітэт займаўся асветай і справамі, звязанымі з ліквідацыяй Віленскага універсітэта[224]. Роля Ю.Ярашэвіча ў Камітэце была зведзена да мінімуму. Ён займаўся толькі распрацоўкай праграм для сярэдніх школ і вырашэннем некаторых адміністрацыйных пытанняў[225].

Атрымаўшы пенсію, прафесар вярнуўся ў свой родны Бельск. Аднак і там ён працягваў займацца навуковай дзейнасцю. Аб гэтым сведчаць яго артыкулы ў часопісах “Atheneum”, “Biruta”, “Znicz”, тэксты якіх былі часткова выкарыстаны пры напісанні асноўнай працы Юзафа Ярашэвіча “Вобраз Літвы з пункту гледжання цывілізацыі з найстаражытнейшых часоў і да канца 18 ст.”[226] Яна была выдадзена ў Вільні ў 1844-45 г. у трох частках на 830 старонках. Пры стварэнні “Вобразу Літвы…” аўтар карыстаўся дадзенымі Літоўскай метрыкі і працамі І.Анацэвіча, Т.Нарбута, К.Богуша, М.Карамзіна, Е.Фойгта.

Праца Юзафа Ярашэвіча цалкам арыгінальная. На першым плане стаяла асвятленне сацыяльнага жыцця грамадства, узроўню ягоных ведаў і навыкаў у рамястве, гандлі, земляробстве. Даследчык адкінуў прынятую ў тагачаснай гістарыяграфіі перыядызацыю па гадах панавання князёў або каралёў. У першым томе ён апісаў жыццё і побыт балтаў часоў паганства. Другі том пачынаўся з увядзення каталіцтва ў ВКЛ і завяршаўся рэфармацыяй. У наступным томе Ю.Ярашэвіч зрабіў аналіз дзейнасці езуітаў у краі. Там жа ён распавёў пра рэформы А.Тызенгаўза. Найважнейшай падзеяй ў 18 ст., па яго меркаванні, была забарона дзейнасці ордэна езуітаў у Рэчы Паспалітай і стварэнне Адукацыйнай камісіі.

На пачатку сваёй працы Ю.Ярашэвіч ахарактарызаваў клімат, геаграфічныя ўмовы, фізіялагічны тып жыхароў старажытнай Літвы, промыслы і рамёствы балтаў часоў паганства. Ён першым з гісторыкаў адзначыў, што балты не прышлы народ, а аўтахтоны, якія жылі на сваіх землях з 3 ст. н.э.[227] Пры гэтым даследчык падкрэсліў іх цесныя адносіны са славянамі[228]. Гісторык крытыкаваў Вінцэнта Кадлубка і Адама Нарушэвіча за іх погляды на балтаў як на дзікуноў. Ю.Ярашэвіч лічыў, што людзі, якія ведаюць земляробства, жывёлагадоўлю, рамёствы не могуць быць на нізкім узроўні развіцця[229].

У 11 ст., на думку аўтара, летувісы пачалі заваёўваць славянскія землі. Гэта быў час узвышэння князёў і з’яўлення ўмоваў для ўзнікнення феадалізму. Гісторык, нягледзячы на характэрны для яго крытычны падыход да крыніц, у дадзеным выпадку шмат у чым даверыўся легендарнай частцы метрыкі ВКЛ. Так, пачатак феадалізму даследчык звязваў з імем легендарнага Эрдвіла Манцівілавіча (1065 г.)[230]. Пры гэтым

[223] Коялович М. Чтенія по исторіи Западной Россіи. Санкт-Петербург, 1884. С. 16-17.
[224] Zasztowt L. Kresy 1832-1864… S. 103.
[225] Тамсама. S. 100, 251.
[226] Jaroszewicz J. Litwa pod względem cywilizacyi od czasów najdawniejszych do końca wieku XVIII. Wilno, 1844-1845. T. 1-3.
[227] Тамсама. T. 1. S. 15.
[228] Тамсама. T. 1. S. 2.
[229] Тамсама. T. 1. S. 67.
[230] Тамсама. T. 1. S. 122-123.

узнікненне самога феадалізму ён тлумачыў унутранымі прычынамі, і, у першую чаргу, ленным атрыманнем зямлі[231]. Менавіта ў такіх умовах і ўзнікла ВКЛ, у якім акрамя паганства, шырока была распаўсюджана праваслаўная вера. Далучэнне "рускіх зямель" да Літоўскай дзяржавы, лічыў Ю.Ярашэвіч, было вельмі важным момантам у развіцці цывілізацыі, таму што гэтыя землі знаходзіліся на больш высокай ступені развіцця.

Значнай падзеяй у развіцці краю, на думку гісторыка, сталася прыняцце каталіцтва балтамі. Гэта дапамагло ўберагчыся ад агрэсіі крыжакоў і захаваць раўнавагу паміж рознымі цывілізацыямі, якія аказвалі ўплыў на ВКЛ[232]. Люблінскую унію даследчык ацэньваў станоўча. Сама унія паміж ВКЛ і Польшчай, на яго думку, была ініцыіравана літоўскай шляхтай, якая хацела атрымаць тыя самыя прывілеі, што і польская шляхта. Супраць выступілі, лічыў Ю.Ярашэвіч, толькі магнаты беларуска-літоўскага краю, якія баяліся страціць сваё пануючае становішча[233]. Аднак і пасля уніі ВКЛ захавала некаторыя адрозненні ад Польскага каралеўства, а менавіта стыль жыцця і ўласнае права.

У 16 ст. хутка ішло развіццё эканомікі Літоўскай дзяржавы. Адбыліся істотныя змены ў аграрным ладзе, што спрыяла значным поспехам у развіцці культуры, асабліва ў галіне права і асветы. Хаця для сялян гэта абярнулася ўстанаўленнем прыгонніцтва.

Для развіцця цывілізацыі даследчык лічыў вельмі важным распаўсюджанне ідэй Рэфармацыі. Але напрыканцы 16 ст. сітуацыя ў ВКЛ пачала змяняцца не ў лепшы бок. Для барацьбы з іншадумствам і асабліва пратэстантызмам быў запрошаны ордэн езуітаў. Пасля з'яўлення езуітаў амаль усе сацыяльныя і культурныя працэсы Ю.Ярашэвіч характарызуе толькі скрозь прызму дзейнасці ордэну. На гэту асаблівасць "Вобраза Літвы…" крытычна глядзелі М.Балінскі, М.Валынец і іншыя гісторыкі 19 ст. Аднак ніхто з іх так глыбока не прааналізаваў сістэму злоўжыванняў езуітаў у нашым краі, як гэта зрабіў Юзаф Бенядзіктавіч. На думку Ю.Ярашэвіча, ордэн езуітаў, захапіўшы ў свае рукі амаль усю сістэму адукацыі ў ВКЛ, пачаў тармазіць развіццё навукі. Пры гэтым гісторык не адмаўляў, што на пачатку сваёй дзейнасці ў Літоўскай дзяржаве езуіты зрабілі некаторыя пазітыўныя крокі для развіцця цывілізацыі. Але, на яго думку, іх дзейнасць у 17-18 стст. гэтыя поспехі звяла да нуля. За 200 гадоў дзейнасці ў ВКЛ, сцвярджаў Ю.Ярашэвіч, езуіты далі толькі аднаго гісторыка (Каяловіча) і аднаго паэта (Сарбевія), але і тыя праславіліся толькі ўсхваленнем папы, каралёў і феадалаў.

У апошнім раздзеле "Вобраза Літвы…" Юзаф Бенядзіктавіч прааналізаваў дзейнасць Антонія Тызенгаўза, якая прыйшлася на час падрыхтоўкі да рэфармавання ўсей Рэчы Паспалітай[234]. Сярод рэформ Ю.Ярашэвіч выдзяліў стварэнне Адукацыйнай камісіі, першага ў Еўропе міністэрства адукацыі, якое распаўсюджвала сваю ўладу на ўсю тэрыторыю дзяржавы[235]. Яе дзейнасць ён ацэньваў станоўча, але пры гэтым не замоўчваў і недахопаў.

---

[231] Тамсама. Т. 1. S. 125.
[232] Тамсама. Т. 2. S. 15.
[233] Тамсама. Т. 2. S. 77-79.
[234] Тамсама. Т. 3. S. 141-142.
[235] Тамсама. Т. 3. S. 148-149.

Пасля выхаду ў свет сваёй асноўнай працы Юзаф Бенядзіктавіч актыўна працягваў займацца навуковай дзейнасцю. Ён не жыў замкнёным жыццём правінцыяла. Вёў перапіску з І.Анацэвічам, падтрымліваў адносіны з добрым знаўцам крыніц М.Баброўскім, мясцовым бібліяфілам І.Трэмбіцкім. Гісторык цікавіўся археалогіяй, сумесна з Тэадорам Нарбутам праводзіў раскопкі на Замкавай гары ў Беластоку. У адным з лістоў С.Даўкантасу Т.Нарбут дзяліўся сваімі планамі на будучае і пісаў, што ўвесну разам з Ю.Ярашэвічам яны будуць раскопваць у Беластоцкім лесе яцвяжскія могільнікі.

29 красавіка 1855 г. з дапамогай графа Яўстаха Тышкевіча быў атрыманы дазвол з Пецярбурга на стварэнне ў Вільні археалагічнай камісіі. Разам з арганізацыяй навуковай дзейнасці Камісія павінна была спрыяць згуртаванню інтэлектуальнай эліты краю. Ю.Ярашэвіч быў абраны пастаянным сябрам камісіі. Беларускі даследчык Генадзь Каханоўскі ў сувязі з гэтым заўважыў: “Дзякуючы навуковым і папулярызатарскім працам Яўстаха і Канстанціна Тышкевічаў, Адама Кіркора, Уладзіслава Сыракомлі, Юзафа Ярашэвіча і інш. даследчыкаў, а таксама дзякуючы іх грамадскай дзейнасці, археалогія зрабіла прыкметны крок да вылучэння з гістарычнай навукі ў самастойную галіну ведаў”[236].

Гісторык у той жа час пісаў артыкулы пра культуру “паганскай” Літвы, пра гісторыю Бельскага павета і горада Драгічына і інш. Заснаванаму музею ў Вільні Ю.Ярашэвіч падараваў сваю археалагічную калекцыю.

Памёр гісторык у родным Бельску 1 лютага 1860 г.[237] Ягоная прыкметная роля ў развіцці беларускай гістарыяграфіі не выклікае сумненняў. Застаецца толькі спадзявацца, што сучасныя даследчыкі звернуць належную ўвагу на гэтую асобу, і яна займе адпаведнае месца ў аналах беларускай гісторыі.

[236] Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX ст. Мінск, 1984. С. 72.
[237] Warutos kalendorius // Waruta. 1998. Jausio 31. P. 4. (Каляндар Варуты // Варута. 31 студзеня 1998 г. С. 4).

## Юзаф Ядкоўскі і яго роля ў стварэнні кнігазбору Гарадзенскага гісторыка-археалагічнага музея

**Ванда Шоцік (Гародня)**

Некаторыя крыніцы канца 30-ых гадоў 20 ст. падаюць, што кнігазбор Гістарычнага музея ў Гародні ў перадваенны час налічваў звыш 40 тысяч тамоў выданняў канца 15 – пачатку 20 ст. на розных еўрапейскіх мовах па многіх галінах ведаў. Сярод іх больш дваццаці інкунабулаў. Да нас дайшло менш палову. Астатнія страчаны ў 40-ыя і асабліва ў 50-ыя гады ўжо савецкага часу. Балюча і сорамна, што знішчэнне адбылося ў мірны час па прычыне культурнай непісьменнасці і палітычнай слепаты. Асабліва балюча, калі чытаеш матэрыялы 20-30-ых гг. з архіваў музея і бачыш колькі сіл і намаганняў патраціў на збіранне гэтай каштоўнай бібліятэкі заснавальнік і першы дырэктар музея Юзаф Ядкоўскі.

Юзаф (Іосіф Іосіфавіч) Ядкоўскі – археолаг, гісторык мастацтва, нумізматык, знаўца гісторыі Гародні і Гарадзеншчыны нарадзіўся 20 снежня 1890 года ў Гародні. Пасля заканчэння па-дамініканскай гімназіі, ён паехаў у Маскву і паступіў у Вышэйшую школу мастацтваў. З адкрыццём Маскоўскага Археалагічнага інстытута перайшоў туды дзеля вывучэння археалогіі, але не пакінуў і Школу мастацтваў. Яму як здольнаму студэнту дазволілі свабоднае наведванне лекцый. Падчас вучобы праявіў цікавасць да гісторыі мастацтва і матэрыяльнай культуры сярэднявечча. Хутка яму прапанавалі працаваць у інстытуце лабарантам. Юзаф добра маляваў, чарціў і быў адмысловым фатографам.

У вольны час і канікулы Юзаф Ядкоўскі наведваў музеі Масквы, Пецярбурга, Ноўгарада, Вільні, вывучаў іх фонды. На лета прыязджаў ў Гародню, дзе працягваў даследаваць гісторыю свайго краю. Пісаў артыкулы, друкаваўся ў гістарычных часопісах, газетах Вільні, Варшавы, Кракава. Некалькі артыкулаў па археалогіі былі напісаны і надрукаваны яшчэ ў гімназічныя гады. З маленства збіраў нумізматычную і археалагічную калекцыі, друкі.

У 1912 г. Ю.Ядкоўскі скончыў Археалагічны інстытут з адзнакай і тытулам “вучонага археолага”. Яго запрасілі на працу ў Румянцаўскі музей. Неўзабаве абараніў дысертацыю па Літоўскай грыўне і атрымаў званне “Действительный член Института Археологии “.

Шмат працаваў. Вывучаў фонды музеяў, складаў каталогі помнікаў гісторыі і мастацтва, якія былі вывезены з Беларусі і Польшчы. Вырашыў скласці і надрукаваць у некалькіх тамах “Збор польскіх помнікаў у Расіі”. Ім было сабрана шмат фактаграфічнага матэрыялу, зроблена больш за тысячу фотаздымкаў, малюнкаў, чарцяжоў, але грошай на гэтае выданне не знайшлося ні ў Варшаве, ні тым больш у Маскве. Уласных сродкаў ледзь хапала на збор матэрыялаў.

Ён вярнуўся ў Гародню. Маскоўскае Археалагічнае таварыства, сябрам якога з’яўляўся Ядкоўскі, надало яму паўнамоцтвы кансерватара па Гарадзенскай, Менскай і Віленскай губернях. На радзіме Юзаф Ядкоўскі “з галавой акунуўся” у працу: ездзіў па губернях, даследаваў, інвентарызаваў помнікі гісторыі і мастацтва, шукаў і знаходзіў грошы на іх рамонт і кансервацыю. Ён літаральна выратаваў каштоўны іканастас 17 ст. з Супрасля, які трапіў у Маскву. Яго намаганнямі ацалеў касцёл у

Гарадзішчы з фрэскамі Лукаша Хубля. Ён даследаваў замкі ў Міры, Крэве, рабіў чарцяжы і малюнкі. Разам з Вандалінам Шукевічам праводзіў раскопкі ў Начы, Берштах, Троках, з Талькам-Грынцэвічам – у Ланкішках. Даследаваў палацы ў Свяцку, Дубічах і, вядома, кожны раз вяртаўся ў Гародню, у горад, які жывіў яго душу, даваў яму новыя сілы і натхненне. І дзе б ён ні бываў, адусюль прывозіў кнігі. Ядкоўскі вёў улік прыватных, кляштарных, касцельных бібліятэк. Ім была ўжо сабрана неблагая бібліятэка пераважна гістарычнага накірунку.

Юзаф Ядкоўскі імкнуўся здзейсніць даўнюю мару – адкрыць Гістарычны музей. Дзеля гэтага ён збіраў кнігі, археалагічныя, нумізматычныя, этнаграфічныя рэчы і шмат іншага. Планы перакрэсліла Першая святовая вайна. Баючыся страціць свае зборы, Ю.Ядкоўскі не падпарадкаваўся загаду аб эвакуацыі з Гародні. Ён застаўся ў горадзе і, каб выжыць, працаваў санітарам у вайсковым шпіталі, часамі выязджаючы на фронт. Гэты перыяд асвятляюць яго пісьмы да археолага і выкладчыка Віленскага універсітэта Вандаліна Шукевіча.

У 1920 годзе Юзаф Ядкоўскі прапанаваў уладам горада стварыць Камісію апекі над помнікамі гісторыі і мастацтва (накшталт Варшаўскай). “Шэсць разбуральных гадоў вайны, інтэрвенцыі, безуладдзя і руйнавання знішчаюць здабытак краю”,- пісаў ён у сваёй дакладной запісцы. Староста горада Казімір Рагалевіч падтрымаў ідэю і абяцаў дапамогу.

Першае арганізацыйнае паседжанне Камісіі апекі над помнікамі гісторыі і мастацтва адбылося 14 сакавіка 1920 г. На ім быў зацверджаны склад камісіі, у якую ўвайшлі Гарадзенскі староста К.Рагалевіч, павятовы інжынер В.Герман, школьны інспектар і мастак І.Ванатоўскі, губернскі архівіст А.Гедройць, разьбяр па дрэву І.Вільк, нумізмат Л.Вільконскі і сам Юзаф Ядкоўскі, абраны адказным сакратаром. Тут жа ён падаў разгорнуты план работы Камісіі, які і быў зацверджаны.

На паседжаннях Ядкоўскі выказваў прапанову за прапановай. Ён падрыхтаваў тэкст адозвы да жыхароў Гарадзеншчыны і Беласточчыны аб ратаванні помнікаў гісторыі і мастацтва: “Наш край абрабаваны з нашай культурнай спадчыны. Раскрадзена наша багацце, наша душа, наш здабытак. Давайце збіраць, ратаваць і ахоўваць тое, што яшчэ засталося…” Сам Юзаф Ядкоўскі даследаваў архівы, бібліятэкі касцёлаў, кляштараў, дзяржаўных установ, якія за гады вайны і рэвалюцыі расцягнуты і абрабаваны.

Крамы і лаўкі былі перапоўнены стосамі архіўных матэрыялаў, кніг з разцягнутых бібліятэк, якія ўжываліся як упаковачная папера. Дзе па знаёмству, дзе за невялікія ўласныя грошы, а дзе і з дапамогай паліцыі Ядкоўскі літаральна выцягваў з крамаў стосы кніг, архіўных дакументаў, ратуючы іх ад згубы.

Дабіўшыся легітымацыі ад Рымска-каталіцкай кансісторыі ў Вільні на права дагляду гарышчаў, падвалаў архіваў і бібліятэк кляштараў і касцёлаў, Ю.Ядкоўскі разам з І.Ванатоўскім часта вярталіся з экспедыцый з актамі аб неправільным захаванні каштоўных архіўных матэрыялаў і рэдкіх друкаў. У выніку матэрыялы перадаваліся ў Камісію, дзе інвентарызаваліся і каталагізаваліся.

На паседжанні Камісіі апекі 22 сакавіка 1920 года Юзаф Ядкоўскі паведаміў, што частка каштоўнай па-дамініканскай бібліятэкі ў Гародні знаходзіцца ў езуіцкім касцёле, а таксама ў доме ксяндза Жэброўскага, і што дырэктар мужчынскай гімназіі Панк збіраецца далучыць іх да бібліятэкі гімназіі. Кнігі гэтыя надзвычай рэдкія і каштоўныя, зрабіў выснову Юзаф Ядкоўскі, і іх неабходна перадаць у Камісію апекі.

Пазней яны будуць перададзены ў створаны музей, каб служыць навукоўцам для даследавання гісторыі і культуры краю. Камісія ўхваліла гэтую прапанову.

У ксяндза Жэброўскага Юзаф Ядкоўскі здолеў дабіцца згоды на перадачу кніг. Цяжэй было пераканаць дырэктара гімназіі Панка. І ўсё ж такі з дапамогай мясцовых уладаў удалося і гэта. Урэшце рэшт дакументы былі падпісаны і зацверджаны Гарадзенскім старостам К.Рагалевічам. На чатырох фурманках Ядкоўскі перавёз кнігі ў будынак староства, дзе месцілася Камісія апекі. Кнігі былі заінвентарызаваны.

Другую частку кніг, якія належалі бібліятэцы кляштара дамініканаў, Ядкоўскі знайшоў у Яўрэйскай гарадской бібліятэцы. Работнікі бібліятэкі паспяшаліся заінвентарызаваць кнігі і паставіць на іх свае штампы, але знішчыць экслібрысы і штампы дамініканаў не паспелі. Справа зацягнулася, але Ядкоўскаму ўсё ж такі ўдалося забраць кнігі і перавезці іх у Камісіі апекі.

У пошуках кнігазбору гарадзенскіх дамініканаў Юзаф Ядкоўскі наведаў усе бібліятэкі горада, размаўляў з уладальнікамі прыватных бібліятэк. У выніку пошукаў былі знойдзены па-дамініканскія кнігі ў Гарадзенскай публічнай бібліятэцы, у архіве магістрата і некаторых іншых установах. Загадчыца публічнай бібліятэкі Эпштэйн ужо пасля візіту Ядкоўскага і, даведзенага да яе рашэння Камісіі апекі аб звароце кніг, заінвентарызавала іх, парушыўшы загад гарадскіх уладаў аб вяртанні помнікаў гісторыі і культуры. “Кнігі захоўваюцца ў падвальных сырых памяшканнях, раскрадаюцца. Да таго ж пані Эпштэйн пачала ставіць аляпаватыя штампы нават на гравюрах. Гэтыя кнігі ўласнасцю публічнай бібліятэкі ніколі не былі, а таму павінны быць вернуты,”- піша чарговую дакладную Ядкоўскі. І тут ён дамогся свайго.

Яшчэ доўга Ядкоўскі знаходзіў кнігі з былой па-дамініканскай бібліятэкі. Аднак уратаваць усе кнігі не ўдалося. “З 10-тысячнага кнігазбора па-дамініканскай бібліятэкі ледзь удалося ўратаваць 905 тамоў,” – са скрухай зазначыў ён.

Але якія гэта былі кнігі! Апранутыя ў скуру фаліянты 16-18 стст. – “Illustrim imagines. Roma 1517; Trebelius Teodosius. Latinae lingvae universae promptuarium. Basileae, 1545; Despauterius Joannis. Arsversivcatorja Joannis Despauterij Niniuitae. Argentoratus 1512; Lukanus. Civillis Belli. Venetiis, 1502 (альдына); Pontanus Joannis. Amorum libri. Venetiis, 1518 (альдына) і шэраг іншых з паметамі “Prohibitum” (забаронена), з уладальніцкімі надпісамі, штампамі, экслібрысамі вядомых дзеячаў еўрапейскай культуры. Адзначым кнігі, якія паходзяць з прыватнай бібліятэкі Віленскага суфрагана Георгія Альбінуса, якая сталася асновай кнігазбору Віленскага універсітэта ў 1570 г.

Аб рабоце Камісіі апекі, аб яе клопатах, пошуках і знаходках, аб стварэнні Гістарычнага музея ў Гародні Юзаф Ядкоўскі пісаў артыкулы ў газету “Echo Grodzieńskie” і ў іншыя выданні. Шмат хто з гарадзенцаў адгукнуўся і актыўна дапамагаў працы Камісіі. Яны паведамлялі адрасы знаходжання помнікаў, іх стан. Некаторыя прыносілі кнігі, рукапісы, мапы, планы Гародні і ваколіц і інш. Першым быў сам Ядкоўскі. Яшчэ на арганізацыйным паседжанні Камісіі апекі ён ахвяраваў у фонды будучага музея рукапісны фаліянт “Protokoły Konstytucyi Sejmu Grodzieńskiego 1793 roku” (арыгінал) – унікальны зборнік дакументаў. Ён і зараз захоўваецца ў фондах музея. Сябра Камісіі апекі І.Ванатоўскі перадаў 34 рукапісныя дакументы 17-18 стст., якія датычылі сям’і Пачобутаў-Адляніцкіх і шэраг каштоўных друкаў.

Пошук працягваўся. Паліцыя паведаміла, што ў падвале дома Камінскай на Тэатральнай плошчы знаходзяцца нейкія музейныя рэчы. Юзаф Ядкоўскі з

прадстаўніком паліцыі наведаў дом і знайшоў зборы (звыш 500 адзінак) археалогіі, арніталогіі, геалогіі, архіўных матэрыялаў і кніг. Сярод іх "Прывілей Аўгуста III рыбацкаму цэху ў Гародні" на пергамене. Сярод кніг аказаліся экзэмпляры са штампамі ўласнай бібліятэкі Ядкоўскага (яго зборы былі раскрадзены ў 1915 годзе, калі ён працаваў санітарам). "Уладальніца" супрацiўлялася і нават выставіла рахунак у 1200 марак за "захаванне" збораў на працягу 5 гадоў (1915-1920), але ўсё ж такі была вымушана іх вярнуць. Усе гэтыя зборы былі перавезены ў староства і заінвентарызаваныя.

На чарговым паседжанні Камісіі апекі Ядкоўскі паведаміў, што знойдзены кнігі, якія гінуць ад вільгаці на гарышчы летняга памяшкання клуба "Муза" па вул. Кірхавай. Было вырашана кнігі прыняць, паразумеўшыся з кіраўніцтвам. Перамовы вёў сам Юзаф Ядкоўскі. Ён, як ніхто іншы, умеў пераканаць чалавека. Да таго ж яго ведалі, як чалавека адукаванага і цалкам адданага справе. Ён умеў пашыраць і падтрымліваць знаёмствы. Так, графіня Марта Красінская з Пуслоўскіх менавіта яму перадала для будучага музея свой каштоўны кнігазбор у 10 тысяч тамоў, які Ядкоўскі збіраўся перавезці ў Гародню.

Але планы парушыла савецка-польская вайна. 19 ліпеня 1920 г. фронт дакаціўся да Гародні. Камісія апекі тэрмінова эвакуіравала самыя каштоўныя зборы за Нёман на станцыю Ласосна і далей у Влацлавэк. Эвакуацыяй займаліся намеснік старосты Ст.Нітаслаўскі, інжынер В.Герман і сам Юзаф Ядкоўскі.

Як толькі ўсталяваўся мір, Камісія апекі ізноў аднавіла сваю працу. 17 верасня 1921 г. адбылося чарговае (пасля перапынку ў 15 месяцаў) паседжанне. Ізноў трэба было шукаць і збіраць расцягнутае. Памяшканне староства, дзе заставалася частка збораў, было разгромлена. Сябра Камісіі апекі А.Гедройць, які застаўся ў горадзе, памёр. Савецкія ўлады перавезлі ўсе зборы на вул. Гарохавую 4, у дом Геллера і там адкрылі музей. Што не трапіла ў экспазіцыю, было перададзена школам горада.

Ю.Ядкоўскі лічыў, што экспанаты савецкага музея з вул. Гарохавай назаўсёды згублены. Але праз некаторы час яны былі знойдзены на гарышчы гэтага ж дома. Значна даўжэй, а часта і безвынікова, прыйшлося збіраць кнігі, раздадзеныя па школах. Не без вялікіх намаганняў і дапамогі К.Рагалевіча, які выдзеліў з бюджэта горада 17 тысяч марак, былі прывезены раней эвакуаваныя каштоўнасці з Влацлавэка.

Каб паскорыць збіранне матэрыялаў і знайсці сродкі для далейшай работы па ахове і кансервацыі помнікаў гісторыі і мастацтва, Юзаф Ядкоўскі прапанаваў зрабіць выставу з таго, што ўжо сабрана. Ён звярнуўся да гарадзенцаў, каб дапамаглі ўласнымі "скарбамі". Заклік падзейнічаў. Шмат хто з гаражан прапанаваў на выставу свае сямейныя каштоўнасці: падсвечнікі, жывапісныя палотны, нумізматыку, слуцкі пояс і інш. Маёр Дарашкевіч перадаў план Гародні 1825 года і каштоўную рэдкую кнігу часоў Сігізмунда III, т.зв. "Зельнік Сенюка" (Marcin Sieniuk. Nauka leczenia. Kraków, 1563).

Выстава "Памяткі краю і Старой Гародні" была адкрыта 18 верасня 1921 г. На адкрыцці Юзаф Ядкоўскі дзякаваў усім і гаварыў, што, нягледзячы на цяжкасці, якія давялося перажыць, сапраўдныя грамадзяне і патрыёты заўсёды будуць ахоўваць і зберагаць сваю спадчыну. Ён ізноў узняў пытанне пра стварэнне Гістарычнага музея ў Гародні на Замкавай гары. Наведалі выставу і кіраўнікі польскай дзяржавы - Юзаф Пілсудскі і Эдвард Рыдз-Сміглы. Яны таксама ахвяравалі значную суму грошай і абяцалі падтрымку. Ю.Ядкоўскі не памыліўся ў сваіх спадзяваннях, адкрываючы гэту

выставу. Шмат хто з гарадзенцаў ахвяраваў будучаму музею грошы, каштоўнасці і іншыя рэчы, што пазычылі на выставу. Многія з іх і сёння знаходзяцца ў экспазіцыях абласнога гісторыка-археалагічнага музея. Захаваўся і “Zielnik Sieniuka”.

Ужо ў чэрвені 1922 года было прынята рашэнне аб стварэнні Гістарычнага музея ў Гародні, а сабраныя экспанаты вырашана было пакласці ў яго аснову. Памяшканне адвялі ў будынку староства па вул. Э.Ажэшкі. У жніўні Юзаф Ядкоўскі быў прызначаны дырэктарам музея. Яго даўняя мара збылася. Зараз трэба было “адваяваць” у войска Стары Замак і тут змясціць усе зборы.

Некалькі гадоў жыцця аддаў Ядкоўскі барацьбе за Стары Замак, за яго ўпарадкаванне, умацаванне Замкавай гары, стварэнне экспазіцый музея. Пры гэтым ён не пакідаў даследчай працы, пісаў навуковыя артыкулы (апублікавана больш за 100), працаваў над манаграфіямі, вёў археалагічныя раскопкі, займаўся выдавецкай дзейнасцю і працягваў збіраць помнікі гісторыі і культуры краю.

Лепшую залу ў Старым Замку дырэктар прызначыў пад бібліятэку. Па ўласных чарцяжах заказаў століяру-чырвонадрэўшчыку Нестару Улейчыку шафы і паліцы, а гравёру Салавейчыку – латунныя таблічкі на іх. Гэтыя шафы і сёння можна ўбачыць у аддзеле рэдкай кнігі і старадрукаў Гарадзенскага гісторыка-археалагічнага музея..

За ўсімі музейнымі справамі Ядкоўскі не забываў збіраць кнігі. Наведванне антыквараў Львова, Вільні, Кракава, Варшавы – гэта быў адзін са звычайных яго абавязкаў як дырэктара музея і галоўнага захавальніка фондаў. Сярод дакументаў яго архіва нямала квіткоў на закупы кніг з адрасамі: “Antykwarjat Polski w Warszawie H.Wildera”, “Księgarnia i skład nót J.Zawadzkiego w Wilnie” і шэраг інш. У антыквара К.Фішэра ў Варшаве закупіў шэсць тамоў Т.Нарбута, творы Э.Паўловіча, шэсць гравюр Карпінскага і інш.

Юзаф Ядкоўскі вёў перапіску з музеямі Масквы, Варшавы, Львова. Прасіў падзяліцца дублетнымі асобнікамі, прапанаваў абмен на дублеты з музейнага кнігазбору. Знаёмыя з Вільні, Кракава і Варшавы дасылалі яму новыя выданні, часта з дарункавымі надпісамі аўтара і выдаўцоў. Ён трымаў цесную сувязь з архівамі. Пісаў у Вільню: “Прашу даслаць адзін асобнік “Archiwów Akt dawnych w Wilnie”, у Варшаву: ”Нам не хапае 2-га тома „Skarbiec dyplomatów J. Daniłowicza.”, у Львоў: “Прашу даслаць Каталог збораў музея Дзедушыцкіх” і г.д. Архіўныя рукапісныя кнігі, якія ўтрымлівалі звесткі па гісторыі Гарадзеншчыны, ён заказваў скапіраваць (перапісаць) для бібліятэкі музея.

Дамаўляўся з выдаўцамі аб дасылцы новых каталогаў і выданняў па мастацтву, па гісторыі ВКЛ і Польшчы, каталогаў бібліятэк; заказваў экслібрысы для старэйшай часткі кнігазбору; аддаваў кнігі і газеты ў пераплёт, а пашкоджаныя друкі і рукапісы ў рэстаўрацыю; правёдзіў “пасадку” мапаў на палатняную аснову і г.д. З зайздроснай настойлівасцю Ядкоўскі патрабаваў вярнуць пазычаную ў музеі кнігу, неаднаразова напамінаючы пра гэта лістамі.

Не забываў ён, які водгук і карысць даюць выставы, а таму наладзіў выставу кніг з калекцыі Пуслоўскіх-Красіньскіх, якую перавёз з маёнтка Свіслач (каля Гародні) і ўладкаваў на Старым Замку. “Gazeta Warszawska” падала інфармацыю, што ў Гародні ў нядзелю “na Starym Zamku Królewskim odbędzie się pokaz części darów Marty Krasińskiej, ofiarowanych Grodno”.

Паказаць сапраўды было што. Выданні канца 15 - пачатку 20 ст. па філасофіі, тэалогіі, дакладных навуках, прыжыццёвыя выданні французскіх асветнікаў,

манаграфіі вядомых гісторыкаў і натуралістаў, энцыклапедычныя выданні і сярод іх першае выданне Вялікай французскай энцыклапедыі. Уражвалі таксама перыядычныя выданні Вільні, Кракава, Варшавы, Масквы, Парыжа.

Пасля такой выставы многія гарадзенцы і госці пажадалі папоўніць бібліятэку музея сваімі дарункамі. Ежы Цытажыньскі, Стэфан Урублеўскі, Гарбачэўскія, Гінтаўты, Макалінскі, Прушынскі, Штайман і шмат іншых злажылі дарункі ў кнігазбор музея.

Юзаф Ядкоўскі перадаў у бібліятэку музея ўласныя кнігі. Гэта былі выданні розных часоў, нават кнігі з дарункавымі надпісамі гімназісту-выдатніку Ядкоўскаму ад выкладчыкаў гімназіі гісторыка і краязнаўцы Яўстахія Арлоўскага, ад пратаіерэя Дзікава, ад В.Манасеіна, навукоўцаў З.Чыжова, В.Прохарава, В.Трутоўскага, М.Янчука, В.Шукевіча, ад сваіх сяброў і калегаў… Нягледзячы на змены ўладаў і дзяржаўную прыналежнасць Гародні, Ю.Ядкоўскі не пераставаў збіраць музейную бібліятэку. Пры гэтым ён фарміраваў яе як навуковую, аддаючы перавагу гістарычным працам. Каштоўнасць гэтага кнігазбору цяжка пераацаніць, як, дарэчы, і ролю збіральніка Юзафа Ядкоўскага.